БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

Факультэт міжнародных адносін

*Серыя “Вучоныя Беларусі”*

# Прафесар У.Е.Снапкоўскі

# У авангардзе знешнепалітычных даследаванняў Беларусі

Мінск
“Права і эканоміка”
2025

УДК 327 (476)
ББК 66.4
П68

Серыя заснавана ў 2021 г.

Рэкамендавана да друку
Вучоным саветам факультэта міжнародных адносін БДУ

Аўтар і складальнік У.Е.Снапкоўскі

Пад рэдакцыяй А.В.Шарапы і Р.Р.Лазько

П68 **Прафесар** У. Е. Снапкоўскі : У авангардзе знешнепалітычных даследаванняў Беларусі / аўтар і склад. У.Е.Снапкоўскі; Пад рэд. А. В. Шарапы і Р. Р. Лазько; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. – Мінск : Права і эканоміка, 2025. – 200 с. – (Серыя “Вучаныя Беларусі”)
ISBN 978-985-887-237-3.

Кніга пра жыццё і навукова-педагагічную дзейнасць вядомага беларускага гісторыка, доктара гістарычных навук, прафесара кафедры міжнародных адносін БДУ Уладзіміра Еўдакімавіча Снапкоўскага складаецца з аўтабіяграфічных нататак, успамінаў і артыкулаў калег па працы, біябібліяграфічнага паказальніка.

Выданне будзе карысна студэнтам, выкладчыкам, вучоным, дыпламатам і спецыялістам у галіне міжнародных адносін і знешнепалітычнай гісторыі Беларусі, бібліёграфам.

**УДК 327 (476)**
**ББК 66.4**

**ISBN 978-985-887-237-3**

© У. Е. Снапкоўскі, 2025
© Афармленне. ВТАА “Права і эканоміка”, 2025

## ЗМЕСТ

АД АЎТАРА І СКЛАДАЛЬНІКА 3

Глава 1. АЎТАБІЯГРАФІЯ 5

1.1. Асноўныя даты жыцця і творчасці 5
1.2. З успамінаў пра сям'ю і маладыя гады 15
1.3. Начала внешнеполитической экспертизы 25
1.4. Гісторыя кафедры і факультэта міжнародных адносін БДУ праз бачанне аднаго з "бацькоў-заснавальнікаў" 33

Глава 2. БІЯГРАФІЯ І ГІСТАРЫЯГРАФІЯ 51

2.1. А.В.Шарапа. Тры дзесяцігоддзі нашай сумеснай працы на кафедры і факультэце міжнародных адносін 51
2.2. Р.Р.Лазько. На пярэднім краі беларускай гістарычнай навукі 56
2.3. В.А. Астрога. Прафесар У.Е. Снапкоўскі. Шлях ад германскай да беларускай гісторыі: 1976 – 1989 гг. 62
2.4. М.В.Стралец. У.Е. Снапкоўскі як заснавальнік новага кірунку ў беларускай гістарычнай навуцы 66
2.5. А.А.Чалядзінскі. Слова аб юбіляры, калезе, вучоным і выкладчыку 71
2.6. А.В.Гурын. У.Е. Снапкоўскі і гістарыяграфія навукі аб міжнародных адносінах 75
2.7. С.А. Лашкевіч. Прафесар У.Е. Снапкоўскі як даследчык, выкладчык, навуковы кіраўнік і настаўнік 78
2.8. М.В.Стралец. Интервью с В.Е.Снапковским в связи с 80-летием ООН: Важнейшее направление в деятельности белорусской дипломатии 81
2.9. Віншаванне У.Е.Снапкоўскаму ў сувязі з 70-годдзем з дня нараджэння ад кіраўніцтва факультэта і кафедры міжнародных адносін БДУ 86
2.10. З пратакола пасяджэння кафедры міжнародных адносін ад 22 мая 2024 г. (аб юбілеі прафесара У.Е.Снапкоўскага) 88

Глава 3. БІЯБІБЛІЯГРАФІЯ 90

3.1. Спіс навуковых публікацый У.Е.Снапкоўскага (1979-2024) 90
3.2. Сто асноўных публікацыі У.Е.Снапкоўскага (1984-2024) 129
3.3. Спіс рукапісных прац, газетных артыкулаў і рэцэнзій на кнігі 139
3.4. Рэцэнзіі на кнігі У.Е.Снапкоўскага (поўныя тэксты) 143
3.5. Навуковая школа праф. У. Е. Снапкоўскага 188
3.6. Літаратура аб жыцці і дзейнасці 190
3.7. Анкета для біябібліяграфічнага паказальніка «Гісторыкі Беларусі. Хто ёсць хто ў гістарычнай навуцы» (2002 г.) 192

ТЭМАТЫЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК ПРАЦ У.Е.СНАПКОЎСКАГА 197

# АД АЎТАРА І СКЛАДАЛЬНІКА

Кніга апісвае старонкі жыцця і творчасці аднаго з беларускіх гісторыкаў, якому давялося жыць і працаваць на пераломе гістарычных эпох. Па сваім жанры яна мае аўтабіяграфічны, біяграфічны і бібліяграфічны характар. Праца ўключае хроніку важнейшых падзей жыцця, навуковай і педагагічнай дзейнасці, якія каментуюцца і характарызуюцца на прыкладзе найбольш значных у жыцці і творчасці з'яў і здзяйсненняў, навукова-адукацыйных традыцый і навацый. Аўтар і складальнік дзяліцца ўспамінамі з розных перыядаў жыцця, якія датычацца перш за ўсё прафісійнай, навукова-педагагічнай працы. Яны ахопліваюць студэнцкія і аспіранцкія гады, працяглыя часы працы ў Акадэміі навук Беларусі (1976-2000) і Беларускім дзяржаўным універсітэце (праца на пасадзе прафесара з 1993 г.).

У аўтабіяграфічны раздзел уключана кароткая інфармацыя пра асноўныя падзеі жыцця і творчасці. Біяграфічна-гістарыяграфічны раздзел прадстаўлены ўспамінамі, ураджаннямі і рэфлексіямі калег па працы і вучняў (прадстаўнікоў навуковай школы даследчыкаў знешнепалітычнай гісторыі Беларусі). Бібліяграфічны раздзел уключае навукаметрычныя дадзеныя: храналагічны спіс навуковых прац за 1979–2024 гг., спіс асноўных публікацый, рэцэнзіі на манаграфіі, падручнікі і зборнік дакументаў, спіс прадстаўнікоў навуковай школы, літаратуру аб юбіляры.

Выданне падрыхтавана ў сувязі з 70-годдзем з дня нараджэння і 45-годдзем навукова-педагагічнай дзейнасці аўтара і складальніка, які адзначыў юбілей 22 мая 2024 г. Прадстаўленая ў кнізе біяграфічная і бібліяграфічная інфармацыя аб галоўных этапах і падзеях жыцця і навукова-педагагічнай дзейнасці паказвае на прыкладзе аднаго з вучоных-гісторыкаў важныя моманты развіцця беларускай гістарычнай навукі на пераломным этапе, які ахоплівае канец XX і пачатак XXI ст. Дакументы і матэрыялы зборніка адлюстроўваюць станаўленне беларускай школы міжнародных даследаванняў пасля дасягнення Беларуссю незалежнасці. У гэтым сэнсе, але не толькі ў ім, дадзенае выданне будзе карысным для студэнтаў, выкладчыкаў, гісторыкаў і гістарыёграфаў, палітолагаў і міжнароднікаў, шырокага кола чытачоў, якія цікавяцца гісторыяй Беларусі, яе міжнароднымі адносінамі і знешняй палітыкай у розныя часы.

Хацеў бы падрэсліць, што навуковыя дасягненні і набыты прафесіянальны вопыт выкладчыка і даследчыка ў галіне міжнародных адносін здабыты падчас працы ў дзвюх вядучых навуковых і адукацыйных установах нашай краіны – Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (Інстытут гісторыі і Прэзідыум) і Беларускім дзяржаўным універсітэце (кафедра новай і навейшай гісторыі і кафедра міжнародных адносін), даследаванняў і пошукаў у бібліятэках і архівах Беларусі і замежных дзяржаў, знешнепалітычнай экспертызы і ў выніку актыўнага замежнага супрацоўніцтва.

# Глава 1. АЎТАБІЯГРАФІЯ

## 1.1. Асноўныя даты жыцця і творчасці

**1954** нарадзіўся 22 мая у г. Віцебску. Бацька Снапкоўскі Еўдакім Афанасьевіч (1908-1984) усё жыццё адпрацаваў пажарнікам, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, быў контужаны. Маці Снапкоўская (дзявочая прозвішча Дзіклова) Вера Іванаўна (1911-2002) працавала хатняй прыслугай, разнарабочай, хатняй гаспадыняй. Бацькі выхавалі пяцярых дзяцей (чатырох сыноў і дачку). Я быў апошнім сярод дзяцей.

**1961** Пайшоў у першы клас сярэдняй школы № 7 г. Віцебска.

**1971** Закончыў 10 клас сярэдняй школы № 20 г. Віцебска (зараз гімназія № 4).

**1971** 1 верасня паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**1976** скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Атрымаў кваліфікацыю настаўніка гісторыі і грамадазнаўства.

**1976** жнівень-кастрычнік працаваў настаўнікам гісторыі і грамадазнаўства Пальмінскай сярэдняй школы Гарадоцкага раёна Віцебскай обл., куды быў накіраваны па размеркаванні пасля заканчэння БДУ.

**1976** лістапад паступіў у аспірантуру Інстытута гісторыі АН БССР па спецыяльнасці “Усеагульная гісторыя”.

**1979** першая публікацыя навуковага артыкула “Некаторыя праблемы міжнароднага прызнання ГДР і нармалізацыі адносін паміж дзвюма германскімі дзяржавамі” у часопісе “Весці Акадэміі навук Беларускай ССР. Серыя грамадскіх навук”. 1979. № 2.

**1979** лістапад паспяхова закончыў аспірантуру Інстытута гісторыі АН БССР з прадстаўленнем кандыдацкай дысертацыі да абароны.

**1979-1981** малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР.

**1980** сакавік абараніў у спецсавеце пры БДУ дысертацыю на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па тэме “Палітыка ГДР у адносінах ФРГ – важны элемент разрадкі міжнароднай напружанасці (1970-я гады)” (спецыяльнасць 07.00.03—Усеагульная гісторыя).

**1980-1993** выкладаў на ўмовах пагадзіннай аплаты і па сумяшчальніцтву розныя курсы па новай і навейшай гісторыі краін Еўропы і Амерыкі, Азіі і Афрыкі на кафедры новай і навейшай гісторыі гістарычнага факультэта БДУ.

**1980** 10 кастрычніка ажаніўся з Міхалькевіч Святланай Валянцінаўнай (выпускніцай філалагічнага факультэта БДУ).

**1981-1982** старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР.

**1982** 12 красавіка нарадзіўся сын Віктар.

**1982—1988** вучоны сакратар Аддзялення грамадскіх навук АН БССР. Адначасова працягваў працаваць старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі АН БССР на грамадскіх пачатках.

**1985** Выхад у свет першай кнігі “Белорусская ССР в ООН (1945-1985 гг.)”.

**1988-1989** --старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР.

**1989-1992** дактарант Інстытута гісторыі АН БССР/НАН Беларусі.

**1993** студзень, абараніў у спецсавеце пры Інстытуце гісторыі НАН Беларусі дысертацыю на суісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук па тэме “Знешнепалітычная дзейнасць Беларускай ССР (1944-1953 гг.)” (спецыяльнасць 07.00.02—Айчынная гісторыя).

**1992—1993** старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

**1993** 1 верасня пачаў працаваць прафесарам кафедры міжнародных адносін гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**1993—1995** вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі (па сумяшчальніцтву).

**1994** Выданне манаграфіі “Путь Беларуси в ООН. 1944 --1945 гг”, дзе зроблены наватарскі аналіз праблемы членства савецкіх саюзных рэспублік у ААН і на міжнародных пасляваенных канферэнцыях. Упершыню ў гістарыяграфіі постсавецкіх дзяржаў, уключаючы Расію, даследавана праблема першапачатковага членства савецкіх саюзных рэспублік (на прыкладзе Беларускай ССР і Украінскай ССР) у Арганізацыі Аб’яднаных Нацый. На падставе дакументаў знешняй палітыкі СССР, ЗША, Вялікабрытаніі і іншых дзяржаў, уключаючы БССР і УССР, паказаны складаны і цярністы шлях дзвюх саюзных рэспублік у лік дзяржаў-заснавальніц ААН.

**1994-1998** прафесар Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры (па сумяшчальніцтву).

**1994-1996** –вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута Еўропы РАН (па сумяшчальніцтву).

**1994-1995** удзельнік міжнароднага праекта “Фарміраванне эліты ў посткамуністычнай Еўропе” (галоўная арганізацыя –Мічыганскі ўніверсітэт, ЗША). Удзельнік Міжнароднай канферэнцыі па гэтай тэме ў Мічыганскім універсітэце (лістапад 1994 г.), дзе выступіў з дакладам “Фарміраванне эліты ў постсавецкай Беларусі”.

**1995** 24 красавіка нарадзіўся сын Сяргей.

**1995** кастрычнік прысваенне Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь вучонага звання прафесара па кафедры міжнародных адносін.

**1995-2000** загадчык аддзела нацыянальных і міжнародных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі (па сумяшчальніцтву).

**1996** 3-месячная навуковая стажыроўка ў Хумберсайдскім універсітэце (г.Хал, Вялікабрытанія) па курсу "Масавая і міжнародная камунікацыя" у межах праграмы Еўрапейскага Саюза "Темпус".

**1997** Выданне манаграфіі "Знешнеплітычная дзейнасць Беларусі: 1944—1953 гг". У кнізе па-новаму асэнсаваны пытанні знешнепалітычнай і дыпламатычнай дзейнасці Беларускай ССР у даследаваны перыяд, у тым ліку яе удзел у абмеркаванні праблем міжнароднай бяспекі ў ААН, на Парыжскай мірнай канферэнцыі 1946 г., роля і месца ў ажыццяўленні знешнепалітычнай лініі СССР, узаемаадносіны са спецыялізаванымі ўстановамі ААН. Адкрыты шэраг малавядомых у беларускай гісторычнай навуцы старонак, такіх як дапамога ЮНРРА (Адміністрацыі аднаўлення і дапамогі Аб'яднаных Нацый) Беларускай ССР у 1945-1947 гг., дыпламатычная барацьба вакол вызначэння беларускага ўчастка савецка-польскай граніцы ў 1944-1945 гг., рэпатрыяцыя насельніцтва паміж БССР і Польшчай і інш.

**1998** 3-месячная навуковая стажыроўка (запрошаны вучоны) ў Інстытуце Гарымана Калумбійскага ўніверсітэта (Нью-Йорк, ЗША) у межах урадавай праграмы ЗША "Актуальныя праблемы" (адміністратар – Міжнародны даследчы і адукацыйны савет (IREX).

**1998-2008** каардынатар навуковага праекта "Беларуска-расійскія адносіны: праблемы і перспектывы", які Факультэт міжнародных адносін БДУ рэалізаваў разам з Інстытутам міжнародных палітычных і эканамічных даследаванняў Расійскай академіі навук у выглядзе дзесяці "круглых сталоў" у Маскве і Мінску.

**1999** красавік Удзельнік міжнароднай навуковай канферэнцыі "Беларусь і яе значэне для Расіі, Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Захаду" (Гарвардскі універсітэт, ЗША), дзе выступіў з дакладам аб беларуска-расійскіх адносінах.

**2001** адзін з распрацоўшчыкаў Канцэпцыі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, якая была адобрана калегіяй Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь і ўвайшла пазней у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні асноўных кірункаў унутранай і знешняй палатыкі Рэспублікі Беларусь», прыняты Нацыянальным сходам у 2005 г.

**2002-2003** навуковыя стажыроўкі ў Грынвічскім універсітэце (Лондан) па курсу "Стварэнне новых модуляў у еўрапейскіх даследаваннях" у межах праграмы Еўрапейскага Саюза "Темпус".

**2002** навуковая стажыроўка ў Вучэбна-навуковым інстытуце міжнародных адносін Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Тараса Шаўчэнкі.

**2003-2004** Публікацыя першага ў навуковай і адукацыйнай літаратуры падручніка (навучальнага дапаможніка) "Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі: Вучэб. дапам. для студэнтаў фак. міжнар. адносін: У 2 ч. Ч. 1. Ад пачаткаў дзяржаўнасці да канца ХУІІІ ст.; Ч. 2. Ад канца ХУІІІ да пачатку ХХІ ст". Выданне ўяўляе сабой вучэбна-метадычнае і навуковае забеспячэнне новай вучэбнай і навуковай дысцыпліны "Гісторыя знешняй

палітыкі Беларусі”, якая чыталася аўтарам з 1993/1994 па 2022/2023 навучальныя гады на аддзяленні (з 1995 г. на факультэце) міжнародных адносін БДУ.

**2003** лаўрэат прэміі імя акадэміка РАН В.А. Капцюга Сібірскага аддзялення РАН за выданне калектыўнай манаграфіі беларускіх і расійскіх гісторыкаў «Очерки истории белорусов Сибири» (2001 г.).

**2005** навуковая стажыроўка ў Дыпламатычнай акадэміі МЗС РФ (Масква).

**2007** Выданне кнігі “Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь: курс лекцый”, дзе зроблена адна з першых у беларускай навукова-адукацыйнай літаратуры спроб падагуліць 15-гадовы перыяд станаўлення знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь.

**2008** кастрычнік лаўрэат прэміі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта имя першага рэктара БДУ, акадэміка У.І.Пичэты за падрыхтоўку цыкла вучэбных і навуковых работ па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі.

**2008-2015** Выданне гісторыка-дыпламатычнага зборніка “Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.): зб. дак. і матэрыялаў. У 4-х т”. З’яўляўся распрацоўшчыкам канцэпцыі зборніка, адным са складальнікаў, членам рэдкалегіі, навуковым рэдактарам, аўтарам прадмовы да ўсяго выдання, аўтарам уводзінаў да кожнага з тамоў, адным з аўтараў каментарыяў. Публікацыя зборніка стала магчымай у выніку рэалізацыі інавацыйнага праекта, выкананага па лініі Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, дзяржаўным заказчыкам якога з’яўлялася Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Выдавецтвам “Юніпак” апублікавана 4-томнае выданне з пяці кніг, куды ўвайшлі 1216 дакументаў і матэрыялаў з архіваў Беларусі, Вялікабрытаніі, Германіі, Літвы, Польшчы і Расіі, а таксама з гісторыка-дыпламатычных выданняў замежных дзяржаў, якія дагэтуль былі малавядомыя і цяжкадаступныя для беларускіх чытачоў. Праект рэалізаваны на кафедры міжнародных адносін ФМА БДУ пад кіраўніцтвам праф. А.В.Шарапы.

**2008-2015** Выданне гісторыка-дыпламатычнага зборніка “Знешняя палітыка Беларусі: Зб. дак. і матэрыялаў. Т. 8 (1996 — 2000 гг.)”, “Знешняя палітыка Беларусі: Зб. дак. і матэрыялаў. Т. 9 (2001 — 2005 гг.)”, Знешняя палітыка Беларусі: Зб. дак. і матэрыялаў. Т. 10 (2006 — 2010 гг.)”. З’яўляўся адным са складальнікаў, членам рэдкалегіі, адным з аўтараў уводзінаў да кожнага з тамоў, адным з аўтараў каментарыяў. У тры тамы зборніка ўвайшла 601 дакументальная крыніца, выяўленая на сайтах урадавых устаноў, перыядычным друку, дакументальных выданнях. Выпускам 10-га тома выданне завершана. Выданне рэалізавана на кафедры міжнародных адносін ФМА БДУ.

**2009** Публікацыя кнігі “Беларуска-расійскія адносіны: зб. навук. артыкулаў”, дзе разглядаюцца пытанні фарміравання і развіцця беларуска-расійскіх адносін у 1990-я і пачатку 2000-х гадоў. Змешчаны навукова-аналітычныя агляды прэсы і выніковыя дакументы круглых сталоў

беларускіх і расійскіх вучоных па актуальных і перспектыўных пытаннях двухбаковых адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй. У выданні прадстаўлена аўтарская канцэпцыя беларуска-расійскіх адносін – канцэпцыя “стратэгічнага партнёрства” і саюзных адносін паміж дзвюма суверэннымі дзяржавамі, якія павінны затавацца самастойнымі суб’ектамі міжнароднага права. Гэта адна з першых спроб навуковага адлюстравання гэтых адносін у беларускай гістарыяграфіі.

**2012-2013** Выданне зборніка “Государственные границы Беларуси. Сборник документов и материалов. В 2 т. Т. 1. (март 1917 – ноябрь 1926); Т. 2. (ноябрь 1926–декабрь 2010) (с электронным приложением)”. З’яўляўся адным са складальнікаў, членам рэдкалегіі, аўтарам уводзінаў да кожнага з тамоў, адным з аўтараў каментарыяў. У зборнік увайшло 346 дакументаў і матэрыялаў пераважна з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, а таксама з апублікаваных дакументальных выданняў. Электронны дадатак да 2 тома змяшчае аўтарскую калекцыю карт Беларусі і яе пагранічча з архіваў Беларусі і Польшчы. Выданне рэалізавана на кафедры міжнародных адносін ФМА БДУ.

**2013** Прысваенне ганаровага звання “Заслужаны работнік БДУ”.

**2013** Публікацыя манаграфіі “Беларуска-польскія адносіны (1918-1989 гг.): Даследаванні, дакументы, ілюстрацыі і карты”, дзе прадстаўлены ключавыя праблемы ўзаемаадносін паміж беларускім і польскім народамі на працягу амаль усяго XX ст. Гэта першае ў беларускай навуковай літаратуры даследаванне асноўных этапаў гэтых адносін і сувязей з распрацоўкай іх перыядызацыі ў 1944-1989 гг.

**2013** Публікацыя навучальнага дапаможніка “История внешней политики Беларуси”, які выйшаў у серыі БДУ “Класічнае ўніверсітэцкае выданне”. У кнізе ўпершыню дадзена сістэматызаванае выкладанне знешнепалітычнай гісторыі Беларусі ад пачаткаў беларускай дзяржаўнасці да пачатку XXI ст. на рускай мове. Дапаможнік уяўляе сабой скарочанае, перапрацаванае і актуалізаванае выданне кнігі “Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі” у 2 частках, якая выйшла ў 2003-2004 гг.

**2013-2015** Намеснік кіраўніка навуковага праекта Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў (БРФФД) “Літоўска-беларускія адносіны ў гістарычнай палітыцы Литоўскай Рэспублікі і Рэспублікі Беларусь”. У выніку супрацоўніцтва кафедры міжнародных адносін БДУ з навукоўцамі Інстытута міжнародных адносін Вільнюскага ўніверсітэта раскрыты змест паняцця «гістарычная палітыка» і вылучаныя яго асноўныя структурныя элементы. Выяўлены асаблівасці рэалізацыі гістарычнай палітыкі ў розных дзяржавах свету, у тым ліку ў Расіі, Польшчы, Германіі, Украіне, Літве. Прааналізаваны асноўныя этапы і тэндэнцыі развіцця гістарычнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Выдзелены асноўныя групы гістарычных наратываў у Беларусі, вызначаны асаблівасці іх выкарыстання ў кантэксце развіцця беларускай дзяржаўнасці ў XX – пачатку XXI ст. Выяўлена і ацэнена значэнне гістарычнай спадчыны Вялікага княства

Літоўскага і Рэчы Паспалітай у фарміраванні гістарычнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

**2014 22 мая** Навуковыя чытанні на факультэце міжнародных адносін БДУ, прысвечаныя 60-годдзю з дня нараджэння прафесара кафедры міжнародных адносін доктара гістарычных навук У.Е.Снапкоўскага **“**Адкрываючы новыя далягляды ў знешнепалітычных даследаваннях Беларусі”. Уручэнне юбіляру ганаровай граматы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**2014 верасень** вылучэнне Вучоным саветам БДУ кандыдатуры У.Е.Снапкоўскага для ўдзелу ў выбарах у члены-карэспандэнты НАН Беларусі па спецыяльнасці “Гісторыя Беларусі”. На выбарах у Аддзяленні гуманітарных навук і мастацтваў, што адбыліся ў лістападзе, заняў сярод групы кандыдатаў высокае другое месца. Удзел у выбарах і вынікі галасавання сталі дэманстрацыяй дасягненняў прадстаўніка і стваральніка навуковай школы знешнепалітычнай гісторыі Беларусі.

**2015** падрыхтаваў тыпавыя вучэбныя праграмы для студэнтаў першай ступені вышэйшай адукацыі “Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі” і “Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь”, якія зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**2015-2017** Кіраўнік навуковага праекта БРФФД «Белорусская ССР учредитель ООН: документы и материалы (1943-1945 гг.)». У выніку выканання тэмы падрыхтаваны зборнік дакументаў і матэрыялаў аб членстве савецкіх саюзных рэспублік у міжнародных арганізацыях у перыяд з ліпеня 1943 г. па 31 снежня 1945 г. У зборнік уключана 105 адзінак дакументаў і матэрыялаў, якія адлюстроўваюць асноўныя этапы пастаноўкі і вырашэння пытання аб уключэнні савецкіх саюзных рэспублік у лік першапачатковых дзяржаў-членаў новай міжнароднай арганізацыі. Падборка дакументаў увайшла ў манаграфію “Союзные республики и советская дипломатия: из истории борьбы СССР за первоначальное членство УССР и БССР в ООН (1943 - 1945 гг.)” (2022 г.).

**2016–2020** Кіраўнік навукова-даследчай працы “Знешнепалітычная дзейнасць Беларускай ССР (1919-1991 гг.): новыя даследчыя падыходы і рашэнні” задання 1.1.05 “Усеагульная гісторыя. Беларусь і свет: міжнародныя адносіны, дыпламатыя, дыяспара” падпраграмы “Гісторыя і культура” Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў (ДПНД) “Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства” на 2016–2020 гг. Раскрыты сутнасць, галоўныя кірункі і канкрэтна-гістарычныя асаблівасці знешнепалітычнай дзейнасці БССР. Асноўная выснова даследавання заключаецца ў тым, што знешнепалітычная дзейнасць БССР - гэта міжнародная актыўнасць савецкай саюзнай рэспублікі, якая не была незалежнай і суверэннай дзяржавай. БССР, як і іншыя саюзныя рэспублікі, заставалася залежнай ад цэнтральных органаў улады СССР і не магла рэалізоўваць свае знешнепалітычныя паўнамоцтвы ў поўнай ці дастатковай меры. Выкананае даследаванне, як адзначана ў выніковай справаздачы, будзе

садзейнічаць больш адэкватнаму разуменню ролі, месца і значэння Беларускай ССР як адной з заснавальніц СССР і адной саюзных рэспублік у складзе савецкай шматнацыянальнай дзяржавы. Знешнепалітычны вопыт БССР (як пазітыўны, так і негатыўны), яе кадравы дыпламатычны патэнцыял, які дастаўся ў спадчыну новай незалежнай дзяржаве - Рэспубліцы Беларусь, мае немалаважнае значэнне для паспяховай міжнароднай дзейнасці сучаснай Беларусі. Апублікаваны манаграфія, зборнік дакументаў, 29 навуковых артыкулаў.

**2017** Публікацыя манаграфіі “Шлях скрозь стагоддзе: беларуска-польскія адносіны 1918-2017 гг.”, у якой адлюстраваны шэраг ключавых тэм і пытанняў беларуска-польскіх адносін і сувязей у XX і пачатку XXI ст. Разгледжаныя ў ёй пытанні і выкарыстаныя навукова-метадычныя прыёмы (падзагалоўкі і высновы ў тэксце параграфаў і глаў, гістарыяграфічныя агляды, перыядызацыя, храналогія важнейшых падзей у гісторыі беларуска-польскіх адносін за сто год, спіс літаратуры па праблеме, паказальнікі) надаюць працы статус абагульняючага навуковага даследавання і адначасова акадэмічнага падручніка. У манаграфіі адлюстравана сучаснае навуковае бачанне беларуска-польскіх адносін, якое склалася сярод акадэмічнага кола беларускіх гісторыкаў (прадстаўнікі дзяржаўных і недзяржаўных адукацыйных устаноў Беларусі).

**2018-2019** Атрымальнік двух даследчых грантаў праекта Еўрапейскага саюза “МОСТ” “Візіт у Беларускую бібліятэку і музей імя Францыска Скарыны, Лондан, Злучанае Каралеўства” і “Правядзенне далейшых даследаванняў у Нацыянальным архіве Вялікабрытаніі па гісторыі англа-беларускіх адносін у першай палове XX ст.” Праведзены даследаванні ў Нацыянальным архіве Вялікабрытаніі, Беларускай бібліятэцы і музеі імя Ф.Скарыны, Бібліятэцы Лонданскай школы эканомікі і паліітычных навук, Бібліятэцы Інстытута славянскіх і ўсходнееапейскіх даследаванняў Лонданскага гарадскога ўніверсітэта аб англа-беларускіх адносінах і дзейнасці беларускай эміграцыі ў Вялікабрытаніі ў XX ст. У Нацыянальным архіве вывучаны фонды Форын офіса (дыпламатычная перапіска) і матэрыялы дзейнасці брытанскіх дэлегацый на Парыжскай мірнай канферэнцыі 1919-1920 гг. Сабраны багаты архіўны матэрыял аб адносінах брытанскага ўрада да Беларусі і БНР, знешнепалітычнай дзейнасці БССР у 1920-1940-я гг., палітыцы і планах англійскага ўрада адносна Беларусі ў гэты перыяд, асабліва ў гады Другой сусветнай вайны і адразу пасля яе. Рэалізацыя грантаў ЕС была дапоўнена трыма камандзіроўкамі ў Лондан па тэме Дзяржаўнай праграмы навуковых дасдедаванняў.

**2018** Публікацыя зборніка дакументаў “Węzeł polsko-białoruski 1918–1921: Dokumenty i materiały” (Польска-беларускі вузел 1918–1921: дакументы і матэрыялы). Праца выдадзена Інстытутам палітычных даследаванняў Польскай Акадэміі навук намаганнямі галоўнага навуковага супрацоўніка інстытута прафесара Войцеха Матэрскага (галоўны рэдактар) і прафесара БДУ Ул. Снапкоўскага (абодва складальнікі тома). Зборнік змяшчае 501

дакумент з архіваў Беларусі, Вялікабрытаніі, Літвы, Польшчы, Расіі і ЗША і апублікаваных крыніц. Дзесяткі дакументаў апублікаваны ўпершыню. Праца адкрывае новую старонку ў польскай і беларускай гістарыяграфіі, уводзячы ў навуковы абарот тэрмін "польска-беларускі вузел". Гэта паняцце адлюстроўвае глыбокія супярэчнасці, што ўзніклі ў 1918-1921 гг. сярод польскіх і беларускіх палітычных колаў у пераломны час станаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці Польшчы і Беларусі.

**2019** сакавік. Удзельнік праграмы ЕС "Эразмус плюс", у межах якой у Вышэйшай школе эканомікі ў Варшаве прачытаны кароткі курс лекцый па знешняй палітыцы Рэспублікі Беларусь, адбылося знаёмства з супрацоўнікамі Інстытута сусветнай эканомікі і прэзентацыя манаграфіі "Шлях скрозь стагоддзе: беларуска-польскія адносіны 1918-2017 гг."

**2020** Публікацыя дапаможніка "Традыцыі і навацыі ў знешнепалітычных даследаваннях Беларусі". У кнізе разглядаюцца тэарэтыка-метадалагічныя і вучэбна-метадычныя аспекты новай навуковай і вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі". Аналізуюцца пытанні, звязаныя з фармаваннем знешнепалітычнай гісторыі Беларусі як новага кірунка гістарычных даследаванняў, яго ўкараненнем у навучальны працэс ВНУ, узаемаадносінамі паміж гістарычнай палітыкай і гістарычнай навукай у Беларусі. Аўтар разгледзеў пытанні метадалогіі, гістарыяграфіі і крыніцазнаўства знешнепалітычнай гісторыі Беларусі, паказаў фарміраванне і развіццё двух асноўных цэнтраў даследаванняў знешнепалітычнай дзейнасці Беларусі – Інстытута гісторыі НАН Беларусі і кафедры міжнародных адносін БДУ, у складзе якіх ён працаваў з канца 1970-х гг.

**2020-2021** Член пастаяннай экспертнай групы з беларускага боку ў Міжнароднай навукова-экспертнай серыі анлайн-семінараў, прысвечаных ацэнцы стану і перспектыў расійска-беларускіх адносін і Саюзнай дзяржавы (Масква, люты - ліпень 2021 г.). Арганізатары праекта - Інстытут Еўропы Расійскай акадэміі навук і Асацыяцыя знешнепалітычных даследаванняў імя А.А. Грамыкі (АВІ) пры падтрымцы Факультэта міжнародных адносін БДУ. Аўтар дакладаў, удзельнік дыскусій і прапаноў у выніковы дакумент.

**2021–2025** Кіраўнік навукова-даследчай працы «Беларуская ССР у ААН: савецкая дыпламатыя, беларускі стыль (1946-1991 гг.)» задання 12.1.6 "Усеагульная гісторыя, міжнародныя адносіны і геапалітыка» падпадпраграмы «Гісторыя» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» на 2021-2025 гады. За тры гады выканання тэмы (2021-2023) кіраўніком тэмы апублікаваны 2 манаграфіі, 4 дапаможнікі і шэраг навуковых артыкулаў у беларускіх і замежных выданнях.

**2021** Публікацыя дапаможніка «Анализ внешней политики Республики Беларусь». Праца з'яўляецца першым навучальным выданнем у Беларусі для магістрантаў па праблематыцы знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. У ім праведзена паглыбленае даследаванне шэрагу ключавых праблем знешнепалітычнай дзейнасці краіны за 30-гадовы перыяд развіцця па шляху

незалежнасці. Аўтарам выяўлены і апісаны сутнасныя характарыстыкі асноў знешняй палітыкі Беларусі, прааналізаваны важнейшыя дзяржаўна-прававыя акты ў сферы нацыянальнай бяспекі, знешняй і ваеннай палітыкі, прадстаўлены ключавыя напрамкі двухбаковых адносін і шматбаковых дыпламатый Рэспублікі Беларусь.

**2021** Публікацыя манаграфіі «Белорусская ССР в ООН: отряд советской дипломатии в действии». Праца прысвечана маладаследаванай у навуковай літаратуры проблеме ўдзелу саюзных рэспублік у агульнасаюзнай знешняй палітыцы і дыпламатыі, якую аўтар лічыць феноменам у гісторыі міжнародных адносін 1940-1980-х гадоў. Уклад саюзных рэспублік (патэнцыяльны і рэальны) раскрываецца на прыкладзе ўваходджання Беларускай ССР у склад першапачатковых дзяржаў-членаў ААН і наступнай дзейнасці рэспублікі ў ААН і яе спецыялізаваных установах. Гэта ўдзел прасочваецца на працягу ўсёй гісторыі ўзаемаадносін СССР з гэтай міжнароднай арганізацыяй: ад стварэння ААН да распаду СССР. Аўтар, апіраючыся на дасягненні «археаграфічнай» і «гісторыяграфічнай рэвалюцый» канца XX ст., адкрывае новыя старонкі гісторыі міжнародных адносін перыяду халоднай вайны, пераглядаючы старыя падыходы і ацэнкі, у тым ліку свае. Гэта дазволіла прадставіць больш поўную і насычаную рознымі фарбамі карціну внешнепалітычнай гісторыі СССР і БССР паслявоенага часу. Прапанаваны новы тэрмін, які больш поўна і ўсебакова адлюстроўвае рэальнае месца і ролю рэспублікі ў знешнепалітычным курсе СССР як унітарна-федэратыўнай дзяржавы. Ён гучыць як «беларускі отрад савецкай дыпламатыі», што паказвае прынцыповую залежнасць знешнепалітычнай дзейнасці саюзнай рэспублікі ад федэральнага цэнтра, так і яе пэўную самастойнасць у правядзенні дыпламатычнай лініі савецкага кіраўніцтва.

**2021** Публікацыя калектыўнай манаграфіі “Даследаванне міжнародных адносін і развіццё замежных сувязей у Беларускім дзяржаўным універсітэце: 1921-2021 гг.”, выдадзенай да 100-годдзя БДУ (старш. рэдкалегіі А.В.Шарапа). З’яўляўся адказным рэдактарам, членам рэдкалегіі, аўтарам уводзін, параграфаў аб развіцці даследаванняў у галіне знешнепалітычнай гісторыі Беларусі ў даследчыцкай і выкладчыцкай працы вучоных БДУ за стогадовы перыяд існавання ўніверсітэта. У працы, падрыхтаванай супрацоўнікамі факультэта міжнародных адносін БДУ, прааналізаваны даследаванне міжнародных адносін і практыка развіцця замежнага супрацоўніцтва ў БДУ у 1921-2021 гг.

**2022** Публікацыя манаграфіі “Союзные республики и советская дипломатия: из истории борьбы СССР за первоначальное членство УССР и БССР в ООН (1943 - 1945 гг.)”. Кніга выйшла пад грыфамі трох устаноў: БДУ, Інстытута Еўропы РАН і Асацыяцыі знешнепалітычных даследаванняў імя А.А.Громыко. Праца асвятляе асноўныя падзеі дыпламатычнай гісторыі Другой сусветнай вайны, звязаныя з праблемай міжнароднага прадстаўніцтва і першапачатковага членства саюзных рэспублік СССР у ААН. У кніге аўтар

падводзіць вынікі 40-гадовага вывучэння ўдзелу саюзных рэспублік, перш за ўсё БССР, у знешнепалітычнай і дыпламатычнай дзейнасці Совецкага Саюза. Праведзенае даследаванне, якое дапаўняецца главой з падборкай дакументаў знешняй палітыкі СССР, США, Вялікабрытаніі і іншых дзяржаў, мае, як адзначаецца ў рэцэнзіях, наватарскі характар. Яно ўносіць істотны ўклад у фарміраванне новых падыходаў і ацэнак да вывучэння гісторыі савецкай дыпламатыі і знешнепалітычнай дзейнасці былых саюзных рэспублік, Украінскай ССР і Беларускай ССР, якія сталі незалежнымі дзяржавамі.

**2022-2023** Публікацыя дапаможнікаў для англамоўных магістрантаў "Fundamentals of the foreign policy of the Republic of Belarus: Manual for English-speaking graduate students" (Асновы знешняй політыкі Рэспублікі Беларусь) і "Belarus between East and West (relations with Russia, China and the European Union): Manual for English-speaking students of the second stage (Master's Degree)" (Беларусь паміж Усходам і Захадам: адносіны з Расіяй. Кітаем і Еўрапейскім саюзам), які навучаюцца па спецыяльнасці "Міжнародныя адносіны". У гэтых вучэбных матэрыялах разглядаюцца тэарэтычныя і канцэптуальныя аспекты знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, якія аналізуюцца праз прызму развіцця і рэалізацыі знешнепалітычнай стратэгіі беларускага дзяржавы. Іх змест накіраваны на паглыбленае вывучэнне знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, і ў прыватнасці на выяўленне найбольш сутнасных характарыстык яе навукова-тэарэтычных, канцэптуальных асноў. У другой працы разгледжаны адносіны Беларусі з дзвюма буйнымі і ўплывовымі дзяржавамі свету --Расіяй і Кітаем, як і інтэграцыйным аб'яднаннем – Еўрапейскім саюзам.

**Са справаздачы аб вучэбнай і навуковай дзейнасці за 2023 год.** Вучэбная нагрузка на 2022-2023 навучальны год - 81 гадзіна лекцыйных і 20 гадзін семінарскіх заняткаў. Агульны памер нагрузкі -795 гадзін. Кіраўніцтва 5 дыпломнымі, адной магістарскай і 9 курсавымі працамі. Складанне вучэбных праграм 4-х новых курсаў для студэнтаў бакалаўрыята і магістратуры. Правядзенне заняткаў на беларускай, рускай і англійскай мовах. Апублікавана 12 навуковых прац: два навучальных дапаможніка (у тым ліку адзін на англійскай мове) і 10 навуковых артыкулаў. Сярод іх 8 вышла за мяжой (у Расіі, Вялікабрытаніі і ЗША), 5 артыкулаў у ВАКаўскіх выданнях і да іх прыраўненых (Расіі і Вялікабрытаніі). Два артыкулы індэксаваны ў Скопус. Навуковы рэдактар адной манаграфіі, аўтар 4-х выдавецкіх рэцэнзій, 2-х "сляпых" рэцэнзій для часопісаў БДУ, водгука на аўтарэферат доктарскай дысертацыі і 2-х рэкамендацыйных водгукаў для паступлення ў дактарантуру. Удзельнік 2-х міжнародных навуковых канферэнцый і 2-х міжнародных навуковых семінараў і аднаго рэспубліканскага навуковага семінара (Беларусь, Расія, ЗША). Навуковы кансультант 2-х дактарантаў і 3-х аспірантаў, сярод якіх два з Кітая. Чытаў курсы для студэнтаў бакалаўрыята: "Сярэдняя Еўропа ў міжнародных адносінах", "Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь"; для магістрантаў -"Мадэляванне знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь" (для руска/беларускай

і англамоўнай магістратуры). Кіраваў навуковай працай студэнтаў. Член рэдкалегіі 4-х навуковых перыядычных выданняў (Расіі, Польшчы і Украіне). Індэкс Хірша ў Гугл Схолар -12; i10-индекс -14.

**2020-2024 гады**. Вучэбная, навуковая і выхаваўчая праца на пасадзе прафесара і побытавае жыццё па-за рамкамі службовых абавязкаў вяліся ва ўмовах пандэміі каранавіруса (якім перахварэў разам з жонкай і сынамі) і міжнароднай палітычнай турбулентнасці.

**2024 22 мая**. Святкаванне 70-гадовага юбілея. Выстаўка кніг у чытальнай залі бібліятэкі ФМА. 24 мая віншаванне Вучонага савета ФМА БДУ.

**Са справаздачы аб вучэбнай і навуковай дзейнасці за 2024 год.** Вучэбная нагрузка на 2023-2024 навучальны год - 83 гадзін лекцыйных і 76 гадзін семінарскіх заняткаў. Агульны памер нагрузкі 801 гадзіна. Кіраўніцтва 4 дыпломнымі, адной магістарскай і 11 курсавымі працамі. Абнаўленне і актуалізацыя 4-х вучэбных праграм: для студэнтаў 1 курса «Внешняя политика Республики Беларусь», 3 курса «Средняя Европа в международных отношениях” і магістрантаў (5 курса) «Моделирование внешней политики Республики Беларусь» (руска/беларускаязычная магистратура) «Моделирование внешней политики Республики Беларусь» (5 курс, англоязычная магистратура). Апублікавана 15 навуковых прац: адзін навучальны дапаможнік, адно даведачнае, навукова-папулярнае выданне і 13 навуковых артыкулаў. Выступіў з дакладамі і паведамленнямі на 6 міжнародных навуковых канферэнцыях і 3 міжнародных круглых сталах, адной рэспубліканскай навуковай канферэнцыі і 2 рэспубліканскіх навуковых семінарах. Навуковы кансультант двух дактарантаў, навуковы кіраўнік двух кітайскіх аспірантў і аднага кітайскага магістранта. Праводзіў выхаваўчую, ідэялагічную працу са студэнтамі і аспірантамі. Яе важнай часткай было выданне навукова-папулярнай брашуры пра гісторыю развіцця валейбола ў АН БССР/НАН Беларусі і секцыі/клуба ветэранаў акадэмічнага валейбола, дзе быў адказным рэдактарам (“Мастацтва гульні ў сеткі”).

## 1.2. З успамінаў пра сям’ю і маладыя гады

Дасягненні ў прафісійнай дзейнасці былі атрыманы дзякуючы многім людзям і чыннікам (фактарам), якія ўплывалі на фарміраванне, развіццё і функцыяніраванне вучонага, выкладчыка, чалавека і грамадзяніна.

На першае месца трэба паставіць сям’ю, жонку і дзяцей. 45 год мы ідзем разам па жыцці з жонкай Святланай. Калі казаць пра сутнасць жыцця, якая заключаецца перш за ўсё ў прадаўжэнні рода, то з гэтым мы справіліся, прадоўжыўшы роды Снапкоўскіх, Навіцкіх і Міхалькевічаў. Мы нарадзілі і выхавалі двух сыноў - Віктара і Сяргея. Віктар стварыў уласную сям’ю і нарадзіў двух сыноў. Ён працуе ў кампутарнай кампаніі. Сяргей пакуль што кавалер, жыве з бацькамі і дапамагае ім. Ён скончыў факультэт міжнародных

адносін і магістратуру па культуралогіі у БДУ, займаецца паракладамі і рэдагаваннем тэкстаў.

Святлана Валянцінаўна – выдатны вучоны ў галіне гісторыі адукацыіі, педагагічнай думкі, культуры і культуралогіі Беларусі. Яна адзіны ў Беларусі двойчы доктар навук сярод жанчын (па гісторыі і педагогіцы). Дыпломы дактароў атрыманы ў дзвюх дзяржавах –Беларусі і Расіі. Працуе прафесарам на факультэце сацыякультурных камунікацый БДУ. Святлана мае вельмі багаты і разнастайны вопыт арганізацыйнай, грамадскай, адукацыйнай і навуковай дзейнасці ў навучальных установах Беларусі, Расіі і Польшчы. Раней жонка працавала ў БДУ (кафедра педагогікі), Нацыянальным інстытуце адукацыіі, Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыіі, БДПУ імя М.Танка, намеснікам старшыні Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў Расіі, дарадцай рэктара БДУ.

Працы Святланы па гісторыі адукацыйнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю (сучаснай Беларусі і Літвы) ў XIX – пачатку XX ст. я выкарыстоўваю ў лекцыях і публікацыях па знешнепалітычнай гісторыі Беларусі адзначанага перыяду. Апошнія манаграфіі С.В.Снапкоўскай пра пераемнасць і наватарства ў галіне адукацыі, педагогікі і культуры, піянерская праца пра культурную бяспеку Рэспублікі Беларусь, выдадзеная пад яе рэдакцыяй, нараджаліся ў выніку абмеркавання і дыскусій паміж супругамі, прафесарамі БДУ. А да іх тэхнічнага рэдагавання і афармлення мелі дачыненне абодва сыны, малодшы – бакалаўр міжнародных адносін і культуролаг і старэйшы -спецыяліст у галіне кампутарных тэхналогій. Віктар і Сяргей дапамагалі і мне ў розных справах з наборам тэкстаў, іх перакладам і наладжваннем кампутарных праграм.

***Дзяцінства і школьныя гады***. Я нарадзіўся ў шматдзетнай сям'і і правёў дзяцінства ў даволі складаных ці нават цяжкіх умовах пасляваеннага аднаўлення і развіцця абласного горада Віцебска. Кажучы пра складаныя ўмовы, хачу адзначыць, што наша сям'я з сямі чалавек (бацькі і пяцера дзяцей) на вул. 19-й Гарадоцкай адносілася да ліку незабяспечаных ці беднаватых. Бацьку і маці цяжкавата было пракарміць і забяспечыць на нейкім мінімальным узроўні сваіх дзяцей, асабліва ў першыя пасляваенныя гады. Але неяк спраўляліся. Пра мяне маці і браты з жартам казалі, што я "пяты лішні", "паскрёбыш", але на самой справе мяне ўсе любілі як самага малодшага. Маці казала, што ў мяне жыццё значна лепшае, чым у старэйшых сястры і братоў. Я выхоўваўся дома, у садок не хадзіў, дзяцінства праходзіла на вуліцы, а летам на Заходняй Дзвіне. Галоўны цяжар сямейнай нагрузкі цягнула маці.

У мяне захаваўся ліст ў рэдакцыю Беларускага радыё ад 8 кастрычніка 1991 г. у сувязі з яе надыходзячым 80-годдзем. Прывяду яго цалкам: "4 лістапада б. г.спаўняецца 80 год з дня нараджэння нашай маці і бабулі Снапкоўскай Веры Іванаўны, якая жыве ў г. Віцебску. За яе плячыма цяжкае, але цікавае і ў пэўным сэнсе гераічнае жыццё. (Дадам тут, што яна была

акрамя гераіні па жыцці маці-гераіняй, нарадзіўшы і выхаваўшы пяцярох дзяцей). Шматлікія перамены лёсу, якім так багата гісторыя нашай краіны і нашай роднай Беларусі на працягу ХХ ст., адбіліся і на яе асабістым жыцці.

Гаротнае сялянскае дзяцінства ў адной з вёсак Віцебскай вобласці, бедната, жабрацтва, праца на прамысловых прадпрыемствах Віцебска. У гады вайны наша маці разам з дзецьмі – Алай і Лёням- пакутвала на акупіраванай ворагам тэрыторыі, а бацька змагаўся на фронце. Радаснай была сустрэча нашых бацькоў у 1945 г. у Віцебску. У пасляваенныя часы маці зноў цягнула цяжкую лямку і ў сям'і і на працы. У 1946 г. наша сям'я павялічылася: нарадзіліся двайняты –Віця і Вася, у 1954 г. паявіўся на свет яшчэ адзін сын –Валодзя.

Шмат сіл, любові, ласкі, гаспадарчай выдумкі прыклала наша маці, каб выхаваць нас чэснымі і працавітымі грамадзянамі. У 1984 г. памёр наш бацька. Але маці не засталася адна. Мы, яе дзеці, заўсёды побач. Кожна год мы збірамся ўсе разам. Да роднай хаты прыезджаюць са сваімі сем'ямі сыны Віктар з Барысава і Уладзімір з Мінска. Астатнія члены нашай вялікай сям'і жывуць у Віцебску. Разам з маці яе юбілей сусракаюць 5 дзяцей, 7 унукаў і 3 праўнукі.

Мы жадаем нашай дарагой матулі і бабулі здароўя, дабрабыту, мацярынскага шчасця.

Просім выканаць для нашай маці песню "Арэнбургская пуховая хустка" ці "Бацькоўскі дом".

Па даручэнні дзяцей, унукаў і праўнукаў Снапкоўскай В.І. ліст напісаў яе наймалодшы сын Уладзімір. 8 кастрычніка 1991 г. У.Снапкоўскі".

Ліст рэдакцыя атрымала і песню для маці "Оренбургский пуховый платок" выканала. Слухалі песню ўсёй сям'ёй у Віцебску, Мінску і Барысаве.

Навучыўся чытаць у першым класе, чаму дапамагаў старэйшы брат Лёня. Ён увогуле быў маім выхавацелем, дапамагаў і правяраў выкананне хатніх заданняў, сачыў, каб не выраваў лісты з дзённіка з дрэннымі адзнакамі ці запісамі настаўніцы аб паводзінах. Былі і такія ў малодшых класах. У сярэдніх і старшых класах стаў вычыцца значна лепш і закончыў школу моцным харашыстам. У атэстаце пераважалі выдатныя адзнакі, асабліва па гуманітарных дысцыплінах. Пасля 8 класаў спрабаваў паступіць у Віцебскі палітэхнікум, але па матэматыцы атрымаў "тройку" і не прайшоў па высокім конкурсе (па сачыненні была "чацвёрка").

У 9-10 класах зрабіў моцны рывок наперад у вучобе, чаму вельмі паспрыяла новы класны кіраўнік Эла Маісееўна Баскіна. Застаюся ўдзячны ёй за педагагічны талент і майстэрства зносін з вучнямі. Яна здолела абудзіць у мяне веру ў сябе і паставіць на шлях пераадолення комплексу непаўнавартасці, вылучаючы на ролю лідэра класа. Сустракаўся з Элай Майсееўнай і пасля школы. Па яе запрашэнні прыезджаў на святкаванне 50-годдзя нашай 20-й СШ у 1989 г. Апошні раз выпадкова сустрэліся ў Віцебску ў 1992 г. перад яе ад'ездам з сям'ей у ЗША. Яна запрасіла мяне з сынам дадому, дзе пазнаёміла з мужам.

Да Э.М.Баскінай класнай кіраўніцай была Тамара Фёдараўна Сафроненка, настаўніца хіміі. Добры і вопытны педагог, аднак, як зразумеў пазней, калі сам стаў педагогам, ёй было цяжка спраўляцца з адпетымі хуліганамі нашага класа, якіх яна павінна была выпусціць з заканчэннем 8 класа. У 9 класе з іх адыходам настаўнікам і вучням стала лягчэй працаваць і вучыцца. Муж Т.М.Сафроненкі быў начальнікам каманды пажарнай аховы, дзе працаваў мой бацька. Пра гэта я даведаўся ўжо пасля школы. Бацька ўваходзіў у склад бацькоўскага камітэта і прыносіў удзячнасці са школы за добрую вучобу і паводзіны сына. Сам ён меў здаецца пачатковую ці няпоўную сярэднюю адукацыю, вучыўся слабавата і лічыў добрай адзнакай здавальняючую ацэнку, называючы яе “дзяржаўнай”. За маёй вучобай не сачыў, паколькі гэты абавязак узяў на сябе брат Лёня, і канечне бацька, як і маці, былі задаволены вучобай сына.

Любоў да гісторыі прывіла Людміла Міхайлаўна Гінзбург. Падабаліся яе ўрокі па ўсеагульнай гісторыі, асабліва часоў Французскай буржуазнай рэвалюцыі і навейшай гісторыі, гісторыі СССР часоў Вялікай Айчыннай вайны. Беларускую гісторыю памятую вельмі цьмяна, напэўна выкладалася нецікава. Здаецца ў 10-м класе праходзілі стварэнне БССР і гэта “канстытуіраванне” давалася цяжка, асабліва абрэвіатуры накшталт “Облисполкомзап”. Нецікавасць да прадмета з боку настаўніка перадавалася вучням. Правінцыяльны падыход да гісторыі Беларусі пераважаў і на гістарычным факультэце БДУ нягледзячы на харызматычную постаць прафесара Л.С.Абецэдарскага.

Фізіка і прыродазнаўчыя навукі давалі цяжэй. Сапраўдным карыфеем у педагогіцы і выхаванні вучняў, якія не хацелі вучыцца і парушалі парадак, лічу настаўніка фізікі Рамана Навумавіча Парціна. Як яму ўдавалася падтрымліваць высокую дысцыпліну сярод хуліганскіх класаў нашай віцебскай ускраіны з адвязнымі парушальнікамі, захоўваючы і перадаючы вучням любоў да фізікі, якую лічыў самай лепшай навукай? З ім сустрэўся нейдзя ў верасні 1998 г. падчас наведвання школы, дзе Р.М.Парцін працягваў працаваць настаўнікам. Ён запрасіў у клас, каб выпускнік школы і яго вучань, ужо прафесар БДУ, выступіў перад новым пакаленнем беларусаў. Вельмі цёплая і кранальная была наша сустрэча.

Настаўнік фізкультуры Брын (не памятую імя і імя па бацьку) падвышаў маю адзнаку да пяцёркі, калі я не мог пераправыгнуць гімнастычнага каня, за выдатныя веды спартыўнай статыстыкі, якой я захапляўся, запісваючы ў сшытках спартыўных герояў і іх дасягненні. Вывучэнне гісторыі спорту было першай школай аналізу і сістэматызацыі ведаў. Спартыўныя дасягненні СССР, ГДР і іншых краін стымулявалі моцны грамадскі інтарэс да гэтай галіны культуры і чалавечай актыўнасці. Калі пачынаўся чэмпіянат свету па хакеі, дзе часта перамагала савецкая зборная, настрой павышаўся, а яе перамогам вельмі радаваўся са сваімі сябрамі-аматарамі спорту. У рэспубліканскім радыёконкурсе знатакоў спорта я

атрымаў другое месца, саступіўшы нейкай дзяўчыне здаецца з Гомеля. Па пошце прыслалі ўзнагароду – настольную гульню ў тэніс.

Любоў да чытання з'явілася ў сярэдніх класах. Чытаў безсістэмна, што траплялася пад рукі ці пад вочы. Іх "пасадзіў", чытаючы па начах у ложку, і нейдзя з 7-га класа стаў насіць акуляры. Любіў чытаць пра вайну і партызан, потым надайшла чарга фантастыкі і гістарычнай прозы. Кнігі браў з раённай бібліятэкі каля гарнізоннага ўнівермага, дзе зараз музей М.Шагала. Пра яго ў школьныя гады не ведаў. Але пра могілкі яго настаўніка Ю.Пэна было добра вядома, бо яны знаходзіліся недалёка ад дома на Сямёнаўскіх могілках. Прыносіў у рукзаку кнігі і раздаваў для чытання маім вулічным сябрам. Самае цікаве, што ніхто не губляў кнігі і заўсёды мне іх вярталі. У раённую бібліятэку хадзілі і мае старшыя сябры. Пра гэта і шмат іншае ўспаміналі ў апошнія гады падчас маіх наведванняў Віцебска і роднай вуліцы з сябрамі дзяцінства і юнацтва Дзімам Глушнёвым, Толям Івановым, Грышам Гусаковым, Жэням Супруненкам. Толя Іваноў падарыў кнігу пра Віцебск, дзе змешчана біяграфічная нататка пра мяне з фотаздымкам як аднага з вядомых віцеблянаў.

Паступленне ў БДУ аказалася нечаканым для бацькоў, школьных настаўнікаў і, можна сказаць, мясцовай грамадскасці на ўзроўні вуліцы і Чыгуначнага раёна. У БДУ не паступалі і выдатнікі з чырвоным дыпломам, а тут нейкі харашыст з-за Полацкага базара выскачыў. Маці вулічнага сябра, якая раней часам неяк здзеквалася з маіх паводзінаў як завадатара дрэнных спраў, недагледжанага і не добра апранутага бацькамі "мальца", стала праяўляць нечаканую павагу. У яе вачах бачылася і нейкая зайздрасць. Калі я вярнуўся стомленны пасля ўступных экзаменаў дахаты і радасна паведаміў маці, што паступіў ва ўніверсітэт, яна не ўзрадавалася. Самы малодшы сын, на якога спадзявадася, што ён будзе з ёй на старасці, адлятаў з бацькоўскага гнязда. Пазней, калі стаў маладым прафесарам, і нават раней, маці прызнала мой жыццёвы выбар і ганарылася сынам.

Пасля заканчэння сярэдняй школы ў Віцебску прайшло ўжо больш за 50 год, але памяць пра школьныя гады захавалася ў душах і сэрцах аднакласнікаў. У чэрвені 2018 г. група аднакласнікаў (Валя Карнышова, Надзя Рапапорт, Коля Руднеў і Валя Субоціна (гэта наша класная сямейная пара) і я) сустрэліся ў Віцебску, каб паглядзець адзін на аднаго, успомніць школьнае дзяцінства і юнацтва, наступныя гады і дзесяцігоддзі жыцця. Я далучыўся да сустрэчы на наступны дзень, бо быў у камандзіроўцы, а раней звярнуўся да аднакласнікаў с настальгічным лістом па электроннай пошце.

З Надзяй Рапапорт-Клюшкінай, якая жыве ў Ізраілі з 1994 г., мы перапісваемся і падтрымліваем цёплыя, сяброўскія адносіны. Успамінаем школьныя гады, сустрэчы ў Ленінградзе і Віцебску пасля школы, абменіваемся ўражаннямі пра сучаснае жыццё ў нашых дзяржавах. З Колям і Валей сустракаліся ў Віцебску і Маскве, дзе яны жывуць, калі быў там у камандзіроўках. З Валей Карнышовай сустракаемся і камунікуем праз Інтэрнет і тэлефон у Мінску. З Віцем Гадлеўскім сустракаюся падчас

наведвання Віцебска і перадаю праз яго прывітанне сваім аднакласнікам. Родную школу, зараз 4-ю гімназію, апошні раз наведаў у жніўні 2021 г., пакінуўшы сваю візітоўку для верагодных кантактаў. У жніўні 2023 г. наведаў Віцебскую абласную бібліятэку, чытачом якой быў з канца 1960-х гг. і куды заглядваў падчас студэнцкіх канікулаў і пазней. Перадаў свае кнігі з дарчым надпісам, дзе настальгічна ўзгадаў сваё наведванне чытальнай залі ў маладым узросце. Ганаруся апошнімі прэзентацыямі сваіх кніг у бібліятэцы.

***Студэнцтва.*** Любоў і павага да гісторыі як навукі і настаўніцы жыцця заклалася ў студэнцкія гады на гістарычным факультэце БДУ. Атрыманне ведаў і пазнанне жыцця адбывася ў сяброўскім коле аднагрупнікаў і аднакурснікаў: разам з Генам Космачам, Толям Шутко, Леням Жыхарам, Валодзям Бузоўкіным, сябрамі па інтэрнацкім пакоі, студэнцкай парце і бібліятэчным стале. Гістарычныя веды і грамадскія ўяўленні ў студэнцкія гады і пазней прывівалі і фарміравалі прафесары Л.М.Шнеерсон, Р.М.Трухноў, дэцэнты М.Г.Елісееў, В.І.Сініца і інш.

Пра свае студэнцкія гады я пісаў ва ўспамінах пра Г.А. Космача, студэнцкага сябра і пазнейшага добрага прыяцеля, доктара гістарычных навук, прафесара, спецыяліста ў галіне навейшай гісторыі Германіі і Аўстрыі. З Генам Космачам я пазнаёміўся і потым блізка сыйшоўся на першым курсе гістарычнага факультэта БДУ, куды паступіў у 1971 г. Мы апынуліся ў адной групе, дзе Гена стаў выдзяляцца добрымі адказамі на семінарскіх званятках. Я першы курс правёў на прыватнай кватэры ў Серабранцы, дзе дзяліў пакоў разам з маім старэйшым сябрам, земляком Мішам Зуевым, які мяне апякаў. Мы ў Віцебску жылі на адной вуліцы і разам правялі дзіцячыя і юнацкія гады. Міша адслужыў на флоце, дзе аблучыўся, у выніку чаго заўчасна памёр у 1976 г. Я, віцебскія сябры Мішы і яго аднакурснікі па філасофскаму аддзяленню вельмі шкадавалі па ім. Пасля заняткаў вечарамі я вяртаўся на аўтобусе ў Серабранку, дзе жыў на пр. Ракасоўскага насупраць кінатэатра “Салют”. Пасля плошчы Ванеева пачыналася крамешная цемра і гэты мікрараён толькі пачынаўся забудоўвацца. У Серабранку я вярнуўся 12 гадоў пазней, калі на вул. Пляханава атрымаў кааператыўную кватэру, куды перабраўся разам з жонкай і гадавалым старэйшым сынам.

На другім курсе мне далі месца ў інтэрнаце на Свярдлова, куды я прыходзіў яшчэ першакурснікам. Памятую вялікі пакой, дзе стаяла каля 20 ложкаў студэнтаў нашага курса. Тут былі старэйшыя хлопцы пасля арміі, сярод якіх выдзяляўся Валодзя Бузоўкін, наш стараста курса. З ім я пасябраваў на агульнай глебе любові да валейбола. Валодзя гуляў за зборную БДУ, я за зборную факультэта і аднойчы наша каманда стала чэмпіёнам універсітэта. З трэццяга курса мы з Генам сталі жыць у адным утульным пакоі на другім паверсе (комната № 49), дзе нас было пяць чалавек (Гена Космач, Толя Шутко, Вася Асіпёнак, Віця Цярэшка і я). Я быў самы малодшы, паступіўшы ва ўніверсітэт адразу пасля школы. Гена быў на год старэйшы. Толя, Вася і Віця адслужылі ў арміі і былі старэйшымі за нас на 5-6 год.

Гена выдзяляўся мэтанакіраванасцю і цвёрдасцю характара. Быў старэйшы за мяне на год, паступіўшы ў БДУ з другога захода. Пасля няўдачы з першым паступленнем працаваў у роднай школе, добра падрыхтаваўся да ўступных экзаменаў і іх паспяхова здаў. За вучобу Гена ўзяўся без раскачкі, вучыўся выдатна і атрымаў чырвоны дыплом. Я цягнуся за ім, але два першых курса быў "харашыстам", атрымліваючы чацвёркі і пяцеркі.

Любоў да гісторыі і адчуванне прыналежнасці да важнасці і значнасці гістарычных ведаў, якія перадавалі выкладчыкі, прыйшлі на трэцім курсе, калі лекцыі сталі чытаць выкладчыкі кафедры новай і навейшай гісторыі, па якой мы з Генам сталі спецыялізавацца. З задавальненнем канспекціраваў лекцыі маладога выкладчыка, кандыдата гістарычных навук В.І.Сініцы, які стаў маім навуковым кіраўнікам па курсавых і дыпломнай працах. Але сапраўднае захапленне адчуў ад лекцый загадчыка кафедры, прафесара Льва Міхайлавіча Шнеерсона, прысвечаных другому перыяду новай гісторыі краін Еўропы і Амерыкі. Пра гэта я напісаў у артыкуле аб лектарскім майстэрстве Л.М.Шнеерсона, гэтага выдатнага выкладчыка, вучонага і вельмі прыемнага чалавека, якога лічу сваім настаўнікам. Яго канспект лекцый, дзе ўсё запісана амаль слова ў слова, захоўваецца ў мяне па сённяшні дзень. Мае пачуцці наконт выкладчыкаў падзяляў і Гена, які выбраў сябе навуковым кіраўніком прафесара Рыгора Маркавіча Трухнова. Гена стаў займацца аўстрыйскім рабочым і камуністычным рухам 1910--30-х гадоў (аўстрамарксізмам), чаму была прысвечана яго дыпломная праца, а потым і кандыдацкая дысертацыя.

Л.М.Шнеерсон запрасіў мяне на кафедру пасля абароны кандыдацкай дысертацыі, дзе я спасцігаў азы выкладання і педагагічнага майстэрства. Скажу адразу, для мяне гэта быў нялёгкі шлях. Самае цяжкае для маладога выкладчыка заключалася ў тым, як падрымліваць дысцыпліну і ўвагу студэнцкай аўдыторыі, даючы адначасова неабходны вучэбны матэрыял па праграме. За 12 гадоў працы на кафедры пагадзіннікам і сумяшчальнікам у якасці дацэнта таму-сяму з педагагічнага майстэрства навучыўся і вопыту паднабраўся, выкладаючы на гістфаку і журфаку, дзе чытаў лекцыі для замежных студэнтаў. З імі было лягчэй працаваць. Час перабудовы з яе абвостранным і крытычным успрыняццем айчыннай і замежнай гісторыі і скідваннем аўтарытэтаў паставіў цяжкія пытанні нават перад вопытнымі і масцітымі выкладчыкамі і прафесарамі. Прафесар Л.М.Шнеерсон, лекцыямі якога захаплялася не адно пакаленне гісторыкаў, неяк шчыра са слязьмі на вачах прызнаўся майму калезе Аляксандру Чалядзінскаму: "Меня не слушают!"

Леў Міхайлавіч цёпла вітаў мяне у сувязі з прыходам на прафесарскую пасаду на кафедру міжнародных адносін, адзначыўшы, што нарэшце я дасягнуў сваёй мэты пастаяннай працы ў БДУ, чаму ён спрыяў. Мы разам удзельнічалі ў працы Вучонага савета гістарычнага факультэта, дзе ён ставіў пытанні аб неабходнасці інтэграцыі беларускай гісторыі ў кантэкст еўрапейскай і сусветнай, у тым ліку ў сферы міжнародных адносін. Наша апошняя сустрэча адбылася ў 1994 г., калі ён абыходзіў гістфак на

Чырвонаармейскай, развітваючыся з выкладчыкамі перад ад’ездам з сям’ёй у ЗША. Я толькі што даведаўся пра гэта і пры развітанні не ведаў, што сказаць. З узрушэннем сказаў, што нам будзе вельмі не хапаць яго. У яго вачах праблiснула слязінка...

На 4-м курсе да плеяды любімых выкладчыкаў далучыліся дацэнты кафедры новай і навейшай гісторыі Міхаіл Герасімавіч Елісееў і Даніїл Сяргеевіч Клімоўскі. М.Елісееў прыцягваў да сябе моцнай энергетыкай, аратарскім майстэрствам, камунікабельнасцю і ўменнем працаваць са студэнтамі. Пасля 3-га курса Гена ў складзе групы студэнтаў, якую ўзначальваў М. Елісееў, ездзіў у ГДР, дзе пазнаёміўся з універсітэцкім жыццём і ўдасканаліў веды нямецкай мовы. Міхаіл Герасімавіч займаўся адносінамі паміж дзвюма германскімі дзяржавамі і ў 1975 г. выдаў кнігу “Бонн и ГДР”, чытаў спецкурс па гэтай тэматыцы, якая пазней стала роднай і для мяне, калі я напісаў і абараніў кандыдацкую дысертацыю пра палітыку ГДР адносна ФРГ у 1970-я гады. Ён быў строгім выкладчыкам, але Генам і мной апекаваўся як здольнымі студэнтамі і цікавіўся нашымі справамі, па неабходнасці дапамагаў. Пазней, пасля заканчэння ўніверсітэта ў мяне з ім склаліся добрыя, прыязныя, даверлівыя адносіны, якія працягваліся аж да яго заўчаснага зыходу з жыцця ў 1997 г. М.Г.Елісееву я прысвяціў тэкст успамінаў з нагоды яго 70-годдзя ў 2010 г.

Прафесар Р.М.Трухноў таксама быў неардынарнай асобай сярод выкладчыкаў кафедры і ўсяго гістарычнага факультэта, прыцягваючы да сябе адкрытасцю і ўласцівымі яму паводзінамі, асабліва абаронай сваіх пітомцаў, што пісалі пад яго кіраўніцтвам дыпломныя працы і дысертацыі. Памятаю, як на гэтай глебе загадчык кафедры Шнеерсон стрымліваў і супакоіваў свайго сябра-калегу Трухнова, які даволі рэзка выказаўся ў адрас свайго вучня Л.В.Лойкі за тое, што той пакрытыкаваў кандыдацкую дысертацыю яго аспіранткі. У гэтым сэнсе Гена мог адчуваць сябе як за камяннай сцяной. Не ведаю, як Гена сышоўся з прафесарам, але тэму дыпломнай працы Рыгор Маркавіч яму выбраў з перспектывай, якая потым перарасла ў кандыдацкую дысертацыю пад яго ж кіраўніцтвам. На 4-м курсе дзякуючы рэгулярнай працы з вучэбнай і навуковай літаратурай мы з Генам ужо шмат што ведалі, калі можна так сказаць пра неабсяжны працэс пазнання, і выдзяляліся сярод іншых студэнтаў. Мае адзнакі пайшлі ўверх і я стаў амаль што выдатнікам, хаця чырвонага дыплома не атрымаў.

У працэсе навучання і авалодвання гістарычнымі ведамі мы з Генам ішлі рознымі шляхамі, дапаўняючы адзін аднаго. Ён з уласцівай яму сялянскай практычнасцю і прагматызмам мэтанакіравана ішоў ўглыб, што праяўлялася ў глыбокім веданні нямецкай мовы на перакладчыцкім узроўні і грунтоўнай даследчыцкай распрацоўцы тэмы дыпломнай працы на падставе нямецкамоўнай літаратуры і дакументаў. На 4-5 курсах ён ужо працаваў з літаратурай спецфондаў бібліятэкі БДУ і Дзяржаўнай бібліятэкі БССР і пазнаёміў мяне з загадчыцай чытальнай залы Ленінкі, куды я канечне доступу не меў, але зазірнуць на паліцы схаваных у спецхране кніг было

вельмі цікава. Гена меў акрэсленую мэту стаць вучоным, хаця мне аб гэтым не казаў, і ўпэўнена ішоў па выбранаму шляху.

Я такой мэты ў студэнцкія гады не меў і не думаў неяк сур'ёзна над сваёй будучыняй. Захапляўся навейшай гісторыяй, філасофіяй, мастацкай гістарычнай прозай, прыгожым пісьменствам. Чытаў шмат, але больш несістэмна. Калі Гена ішоў углыб, то я пашыраў свае веды з розных гуманітарных дысцыплін. Магчыма, гэта не было апраўдана і шмат часу было згублена напэўна дарэмна, аднак і тады, і ў будучым выпрацаваны шырокі погляд на гуманітарыстыку, любоў хадзіць паміж бібліятэчных паліц і чытаць энцыклапедыі дапамагалі хутка арыентавацца ў акіяне навуковай літаратуры.

***Аспірантура і Інстытут гісторыі.*** Пасля заканчэння ўніверсітэта Гену пакінулі ў БДУ, я паехаў па размеркаванні ў вёску Пальмінка Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці ў сярэднюю школу настаўнікам гісторыі і грамадазнаўства. Аднак родная кафедра новай і навейшай гісторыі дала мне рэкамендацыю ў аспірантуру, якую здавалася немагчыма было выкарыстаць, паколькі трэба быдо адпрацаваць два гады па размеркаванні. Дзякуючы шчасліваму збегу абставін, выдатным адзнакам пры паступленні ў аспірантуру Інстытута гісторыі АН БССР і дапамозе добрых людзей, пра што скажу ніжэй, у лістападзе 1976 г. я быў залічаны ў аспірантуру.

Адбыўся новы, вельмі значны, не пабаюся сказаць лёсавызначальны паварот у жыцці, які прадвызначыў далейшы шлях у галіне навукі і вышэйшай адукацыі. Пачалася праца над кандыдацкай дысертацыяй пад кіраўніцтвам вядомага савецкага германіста, выхадца з Беларусі В.Ц.Фаміна, да якога ездзіў у камандзіроўкі ў Маскву. У бібліятэках, асабліва ў спецфондах, знаходзіў асноўную літаратуру па тэме дысертацыі аб адносінах паміж ГДР і ФРГ. У аспіранцкім пакоі на вул. Акадэмічнай жылі спачатку ў чатырох, потым удваіх разам з Валерыям Каржуевым, які рыхтаваў дысертацыю па хіміі. Мы сябравалі і разам праводзілі вольны час. Паступленне ў аспірантуру і навуковую працу лічыў шчаслівым момантам у жыцці, таму настроўваў сябе на тое, каб апраўдаць давер, аказаны Інстытутам гісторыі,і падрыхтаваць дысертацыю ў тэрмін, з чым паспяхова справіўся.

Залічэнне ў аспірантуру запатрабавала адлічэння (адмацавання) з працы настаўніка ў Гарадоцкім раёне, што здавалася амаль невыканальнай задачай. Яна была вырашана дзякуючы загадчыку сектара еўрапейскіх сацыялістычных краін Інстытут гісторыі Васілю Сямёнавічу Талстому і асабліва навуковаму супрацоўніку сектара Марыі Георгіеўне Крэканэ, за што застаюся ўдзячным гэтым цудоўным людзям, якіх ужо няма на гэтым свеце. Сектар, потым аддзел замежных сувязей БССР, нарэшце аддзел нацыянальных і міжнародных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі стаў для мяне родным на працягу 24 гадоў, да канца 2000 г. Апошнія пяць гадоў я ўзначальваў аддзел на ўмовах сумяшчальніцтва, працуючы на асноўнай

працы ў БДУ. У інстытуце прайшоў ступенькі ад аспіранта да загадчыка аддзела, абараніўшы кандыдацкую і доктарскую дысертацыі.

У сценах інстытута сталеў, набіраўся ведаў, розуму і мудрасці, вучоных ступеняў, званняў і пасад разам з калегамі па сектару/аддзелу і іншых падраздзяленняў – А.Лядневай, Т.Папоўскай, А.Літвіным, М.Кошалевым, М.Смальянінавым, В. Голубевым, П.Лойкам. Уплыў на фарміраванне нацыянальнай свядомасці і авалоданне беларускай мовай аказвалі В.Талстой і Л.Мірачыцкі, у межах інстытута – М.Біч, Г.Штыхаў, В.Мялешка і іншыя супрацоўнікі майго і старэйшага ўзросту. Дырэктары інстытуту П.Петрыкаў і М.Касцюк кожны ва ўласцівай сябе манеры і стылі ўздзейнічалі на супрацоўнікаў, заахвачваючы іх да навуковай працы, і фарміруючы грамадска-палітычную пазіцыю. Гэта асабліва характэрна для Міхаіла Паўлавіча Касцюка, дырэктарства якога прыпала на часы перабудовы і незалежнасці.

У 1982 г. адбылася яшчэ адна важная падзея ў жыцці – прызначэнне вучоным вучоным сакратаром Аддзялення грамадскіх навук АН БССР. На гэта павышэнне паўздзейнічаў шэраг чыннікаў – паспяховая абарона кандыдацкай дысертацыі па актуальнай міжнароднай тэматыцы, праца старшым навуковым супрацоўнікам, грамадская актыўнасць (стаў кандыдатам у члены КПСС). Праца ў Прэзідыўме АН БССР адкрывала новыя гарызонты ў навукова-арганізацыйнай, прафісійнай і грамадскай дзейнасці. Працаваў пад кіраўніцтвам акадэміка-сакратара Аддзялення грамадскіх навук моваведа Мікалая Васільевіча Бірылы, дапамагаючы яму ў арганізацыі і каардынацыі дзейнасці акадэмічных гуманітарных інстытутаў і ўстаноў. Тут мяне прынялі ў партыю, а ў 1985-1988 гг. абралі сакратаром партыйнай арганізацыі Прэзідыўма АН БССР, дзе на ўліку было  каля ста камуністаў. Сакратарства прыпала на часы перабудовы, калі давялося разглядаць персанальныя справы кіраўнікоў Акадэміі навук. За тры з паловай гады прайшоў цяжкую, адказную і важную ў сваім жыцці школу кіраўніцтва партыйным калектывам цэнтральнага апарата АН БССР. Шэсць з паловай гадоў працы ў Прэзідыўме АН БССР шмат чаму навучылі, дадалі каштоўнага вопыту камунікацыі з вядучымі вучонымі ў галіне гуманітарных і іншых навук, якія ўваходзілі ў сістэму Акадэміі навук. З’явілася ўпэўненасць у сваіх сілах, здольнасцях і магчымасцях, што падштурхнула да напісання доктарскай дысертацыі.

У студзені 1993 г. абараніў доктарскую дысертацыю. У першыя гады незалежнасці з іх сацыяльна-эканамічным крызісам і моцнай пераменай умоў жыцця, адтокам кадраў з навукі гэта аказалася магчымым для маладога вучонага ва ўзросце 38 гадоў. Ад працы над дысертацыяй і яе зместу атрымаў творчае задавальненне. Асноўны тэкст напісаў летам 1991 г., у тым ліку падчас адпачынку ў акадэмічным асяродку “Іслач” разам з сынам Віктарам. Там жа давадаўся пра жнівеньскі путч, скарацечнасць якога пережыў за горадам. Перабудова і незалежнасць дазвалялі падымаць новыя пласты гістарычнага матэрыялу і кардынальна пераасэнвоўваць зробленае раней,

адмаўляючыся ад стэрэатыпаў, догмаў і старых падыходаў, якія насаджаліся ў папярэднія дзесяцігоддзі.

Вялікай школай палітычнага аналізу бягучых падзей, якія на самой справе ператвараліся ў рэвалюцыйны гістарычны паварот, сталі семінары ў Інстытуце Еўропы АН СССР у 1990-1991 гг., дзе разам з вучонымі РСФСР і іншых саюзных рэспублік набіраўся ведаў і вопыту асэнсавання імклівых і непрадказальных змен у адносінах паміж саюзным цэнтрам і рэспублікамі. Апошні семінар адбыўся праз тыдзень пасля Белавежскіх пагадненняў. Халоднаму палітычнаму рэалізму нас вучыў намеснік дырэктара Інстытута Еўропы Сяргей Аляксандравіч Караганаў, прадказваючы нібыта Касандра ўзброенны канфлікт паміж Расіяй і Украінай. А ўкраінскія калегі казалі пра неабходнасць для Украіны захавання ядзернай зброі. Школа Караганава, як і ўкраінская ўпартасць у адстойванні нацыянальных інтарэсаў, якія дарэчы толькі акрэсліваліся, навучылі фарміраваць, прадстаўляць і публічна абараняць беларускае разуменне сваіх інтарэсаў і патрэбнасцей у пазнейшых дыскусіях з расійскімі вучонымі і міжнароднымі экспертамі. У пачатку 1990-х з'явіліся і мае першыя навуковыя агляды па актуальных міжнародных праблемах, звязаных з распадам СССР, і станаўленнем знешняй палітыкі незалежнай Беларусі.

Гістарычныя падзеі, звязаныя з распадам СССР і абвяшчэннем незалежнасці Беларусі, супалі з асабістымі паваротнымі момантамі ў жыцці-абаронай доктарскай дысертацыі і пераходам на працу ў БДУ на кафедру міжнародных адносін, аб чым будзе гаворка ў асобным сюжэце.

## 1.3. Начала внешнеполитической экспертизы

***Рефлексии с первых лет независимости***. Как известно, решающим толчком для распада СССР стал августовский путч. О нем я узнал из телесообщений на отдыхе в уже упоминаемой «Ислочи» под Раковым около Минска. Со мной был портативный телевизор «Горизонт», неоднократно выручавший в получении информации. Было чувство тревоги и страха перед возвращением мрачных времен советского прошлого и репрессий, о которых мы много узнали в годы перестройки и гласности. Своей личной вины перед партией и советской властью не чувствовал. В 1982 г. вступил в КПСС, в 1985-1988 гг. был секретарем партийной организации Президиума АН БССР с количеством коммунистов около ста человек. На учете в парторганизации состояли президент, вице-президенты и главный ученый секретарь АН БССР, секретарь парткома с правами райкома. На мою долю выпали персональные дела президента Николая Борисевича, главного ученого секретаря Президиума Владимира Пилиповича, секретаря парткома Леонида Колыхана, академика Петра Ящерицына, которые получили строгие выговоры и выговоры за недостатки в работе, слабое руководство Академией наук и ее партийной организацией и «личную нескромность». Для молодого секретаря парторганизации это были нелегкие поучительные уроки жизни и политики.

Я увидел партию изнутри как карающий меч, который в годы перестройки в соответствии с новой линией ЦК КПСС был направлен в идейно-воспитательных целях и против руководителей.

Как историк и коммунист идеи и политику перестройки разделял и поддерживал где-то инстинктивно, где-то горячо и сознательно, особенно в части, касающейся раскрытых «белых пятен» и темных сторон советской истории. В Институте истории присоединился к сторонникам курса на национальное возрождение, участвовал в разработке национальной концепции истории Беларуси, постепенно через известную «трасянку» перешел на белорусский язык в общении с коллегами по работе и подготовке текстов, а затем и в преподавательской работе. Институт истории был в авангарде перестроечных процессов, некоторые его сотрудники стали депутатами Верховного Совета и активными членами парламентской оппозиции БНФ.

Придание Декларации о государственном суверенитете статуса конституционного закона 25 августа 1991 г. считается провозглашением независимости Беларуси, которая еще называлась БССР. Переименование государства в Республику Беларусь произошло 19 сентября. Тогда же были утверждены новые государственные символы страны. Орган Верховного Совета газета «Народная воля» вышла 26 августа с большим заголовком «Беларусь стала незалежнай». Однако ощущения прихода независимости не было. Верх брали чувства победы над путчем, освобождения от власти всесильной Москвы (союзного центра), какой-то внутренней опустошенности и вымученной свободы после запрета КПСС. Впереди виделся путь новоогаревского процесса и создания конфедерации в виде Союза суверенных государств, в которой Беларусь играла бы более заметную роль, чем одна из союзных республик в составе СССР.

Ощущение и растущее понимание того, что республика становится независимой, пришли после беловежских соглашений. Когда кортеж машин, сопровождавших прибывшего в Минск президента России Бориса Ельцина проезжал по площади Ленина, я проводил семинарские занятия со студентами на 6 этаже главного корпуса БГУ. Многие прильнули к окнам, чтобы посмотреть, конечно не зная, что будет через два дня. Когда по телевидению сообщили о прекращении существования СССР и создании СНГ, то у меня как историка было понимание важности исторического момента. С другой стороны, сохранялись опасения и тревоги, что эта «игра в независимость» (термин Иосифа Сталина, употреблявшийся в начале 1920-х гг. относительно тенденций к самостоятельности советских республик) может закончиться, имея в виду усиление имперских настроений в руководстве новой России.

По внутренним ощущениям, процесс перехода от «хомо советикус» к статусу сознательного гражданина независимой Беларуси занял несколько лет и завершился где-то во второй половине 1990-х гг. Важными вехами в этом процессе были референдумы 1995 и 1996 гг., начало опасной

интеграционной игры с Россией, повышение личного социального статуса (степень доктора наук и звание профессора), поездки за границу на Запад (Великобритания и США) и контакты с белоруской диаспорой. Значительную роль в формировании и укреплении исторического самосознания и национальной идентичности сыграло преподавание курса «История внешней политики Беларуси», начатое в 1993 г. Разработка учебной программы, изучение литературы и источников, чтение лекций, издание учебников, подготовка статей, участие в конференциях, научное руководство курсовыми, дипломными работами, а затем диссертациями, общение со студентами и коллегами по работе – все это и другое, связанное с преподавательской, научной и общественной активностью влияло на формирование и кристаллизацию цельной исторической картины белорусской государственности, особенно ее внешнеполитических аспектов. Эту картину в системном виде попытался отразить в учебных пособиях по внешнеполитической истории Беларуси.

Начало 1990-х, как и все десятилетие, часто характеризуются как «страшное время» распада, кризиса, геополитической катастрофы, разгула преступности, анархии и коррупции. Ряд из этих явлений, закономерно присущих глубокому кризису после распада сверхдержавы, имел место и продолжался в первые годы президентского правления. На устойчивый экономический рост и относительную политическую стабильность страна вышла в начале 2000-х гг. У автора как очевидца и активно-пассивного участника событий это время не вызывает отрицательных ассоциаций. Продукты получали по карточкам или талонам, но на мою семью из трех человек (с женой и 10-летним сыном в 1992 г.) молока и сметаны давали столько, что мы не могли это быстро осилить. Голода или ощущения угрозы его наступления не было. За это надо сказать искреннее спасибо правительству В.Кебича и властям столицы. Для национальной интеллигенции и сторонников возрождения это было время духовного подъема и раскрепощения, творческого общения и солидарности. Нехватку колбасы мы компенсировали духовной пищей и новыми ощущениями свободы.

В начале декабря 1991 г. (перед беловежскими соглашениями) был в командировке в Москве. Авторитетные российские источники пишут, что тогда город был на грани голода и запасов продовольствия хватало буквально на неделю. Таких ощущений у меня не было, хотя помнил времена 10-летней давности, когда привозил из Москвы не только деликатесы. На этот раз я привез коллегам из Института Европы АН СССР, где проходил наш научный семинар, кусок сыра и передал его организатору семинара, заместителю директора института Сергею Караганову, который положил его в институтский холодильник под сводами старого особняка на Моховой.

Начало 1990-х гг. связано с активным проведением политики белорусизации. После того как белорусский язык получил статус государственного языка развернулось его внедрение в публичную сферу,

образование, науку и культуру. В соответствии с принятыми в 1992 г. решениями парламента и правительства предусматривались меры финансовой и материальной поддержки изданий, радио-и телепередач, образовательной и научной деятельности на белорусском языке.

В сентябре 1993 г. я начал работу профессором кафедры международных отношений Белорусского государственного университета (БГУ). На первой лекции я обратился к студентам с вопросом, на каком языке читать предмет «Актуальные проблемы международных отношений и внешней политики Республики Беларусь». К преподаванию на белорусском языке я был подготовлен годами предшествующей работы в Академии наук (Институте истории и Президиуме, в Отделении общественных наук), тем не менее еще не овладел им в достаточно высокой степени. Студенты, а это были лучшие учащиеся, отобранные на Отделение международных отношений в результате жесткого конкурса, ответили, что хотели бы слушать лекции на белорусском языке, а в случае затруднений готовы помогать преподавателю. Такой выбор отвечал как моим образовательным целям и языковым предпочтениям, так и планам руководителей исторического факультета (декана Петра Шупляка и заведующего кафедрой международных отношений Александра Шарапы), пригласивших меня для работы со студентами на белорусском языке. Перед началом учебного года, находясь в академическом доме отдыха «Ислочь», я подготовил на родном языке курс лекций по истории международных отношений периода с конца XVIII до середины XIX вв., который также читал студентам. Перевод, в котором помогал живший рядом в комнате мой студенческий преподаватель этнографии, профессор, сотрудник академического института Искусствоведения, этнографии и фольклора Михаил Пилипенко, был в основном выполнен с известного советского издания «История дипломатии».

Так началась моя преподавательская деятельность на белорусском языке на факультете международных отношений БГУ, образованном в 1995 г. Отношение общества, особенно его образованных слоев, к языку менялось и здесь рубежом стал майский референдум 1995 г. Изменения в языковой, образовательной и культурной политике отразились на качестве усвоения белорусского языка со стороны выпускников школ, которые приходили учиться на престижный ФМО БГУ. Новое поколение абитуриентов знает его хуже, а количество тех, кто им хорошо овладел, сократилось. Еще одна проблема заключается в том, что совсем малое количество преподавателей читает свои предметы на белорусском языке. Языковая политика в области преподавания связана конечно и с иностранными студентами (из Китая и Средней Азии), которые окунаются в Беларуси в русскоязычную среду и к ней лучше подготовлены, чем к обучению на белорусском языке.

Личное восприятие внутренней и внешней политики властей, как и общественно-политической атмосферы того времени было более осознанным и четким по сравнению с началом 90-х гг. Перед глазами разворачивались страницы учебника политологии по стране, начавшей переход от союзной

республики к статусу независимого государства, от молодой парламентской демократии к президентской республике. Сильная президентская власть представляется как неизбежная фаза в драматическом и длительном пути постсоветской и посткоммунистической трансформации белорусского общества и государства. Чтение и анализ белорусской, российской и западной политической периодики, публицистики и научной литературы, которые преломлялись через участие в общественно-политической жизни, преподавательскую и научную деятельность, давали ответы на многие злободневные вопросы. С другой стороны, жизнь ставила новые проблемы, требовавшие нестандартных подходов и решений, как и осознанного личного выбора.

***Начала внешнеполитического анализа.*** Во второй половине 1991 г. участвовал в трех научно-общественно-политических семинарах в Москве, посвященных обсуждению актуальных вопросов международных отношений и внешней политики суверенных государств. Два семинара были организованы Институтом Европы АН СССР (в июле и декабре), третий - международной общественной организацией «Хельсинкская гражданская ассамблея» (13-14 августа). Характерно, что эти мероприятия проходили накануне исторических событий (августовского путча и беловежских соглашений). По их результатам в январе 1992 г. я написал записку министру иностранных дел П.Кравченко, посчитав важным сообщить свое мнение о результатах обсуждения и высказав свои предложения. Она сохранилась в личном архиве и ряд ее положений позволю здесь воспроизвести. Спустя 30 лет я узнал от бывшего министра, что она ему неизвестна, а возможно, он об этом не помнит. С учетом той большой загруженности министра и невысокого статуса отправителя, это вероятно самая адекватная реакция. Тем более, что некоторые предложения (о сохранении ядерного оружия и сдержанном отношении к нейтралитету) не отвечали тогдашним политическим реалиям.

Чем были интересны эти семинары? Постановкой вопросов, составом участников, результатами обсуждения. В семинарах, организованных Институтом Европы, приняли участие политологи из России, Украины, Беларуси, Латвии, Эстонии и Татарстана. Мы обсудили вопросы национальной безопасности суверенных государств в условиях распада Советского Союза, возможные пути и способы координации внешнеполитической деятельности бывших субъектов СССР. Именно так звучали вопросы, поставленные в порядок дня.

Интересное содержание имела дискуссия на семинаре «Будущее Советского Союза после окончания холодной войны», организованном Хельсинкской гражданской ассамблеей. Эта организация была создана в 1990 г. со штаб-квартирой в Праге. На нем обсуждались проблемы соотношения демократии и национализма, обеспечения прав человека, национальных меньшинств на территориях бывших республик СССР, возможные формы и средства помощи демократическим силам со стороны западной

общественности в создании демократического общества в территории СССР. На указанных выше встречах я был единственным представителем Беларуси (в ранге старшего научного сотрудника Института истории АН БССР) и выступал по вопросам национальных интересов и национальной безопасности Беларуси в условиях распада СССР, внешнеполитическим аспектам суверенитета Беларуси.

Делегация от Украины на семинарах в Институте Европы была более многочисленной (3-5 человек) и основным предметом обсуждения и спорным вопросом была проблема будущего Украины и российско-украинских отношений. Украинские коллеги выступали с позиций независимости Украины и благоприятных перспектив ее развития с учетом высокого статуса республики в составе СССР, ее геополитических и геостратегических возможностей в Европе и на международной арене. Имея в виду размещение на ее территории большого потенциала ядерного оружия, что делало Украину третьей ядерной державой после США и России, они считали, что их страна должна сохранить его на своей территории и проводить политику ядерного сдерживания по всем азимутам, взяв за образец Францию (стратегия обороны по всем азимутам). Российские ученые, представленные не только Институтом Европы, но и другими академическими институтами и центрами, обращали внимание на уязвимые места Украины. Крым, насколько помню, как-то не затрагивался, но проблема Восточной Украины (Донбасса) с русскоязычным населением была поставлена и активно обсуждалась.

С.Караганов, ведущий дискутант с российской стороны, заявлял, что независимая Украина не “переварит” Донбасс, который останется для нее чужеродным телом. Из-за проблем с русскоязычным населением Украины между ней и новой Россией может возникнуть вооруженный конфликт. Эта запись осталась в моих заметках. Долгие годы она вызывала ощущения какого-то фантастического апокалипсиса, насколько сама мысль о войне между русскими и украинцами представлялась чудовищной и невероятной. Сегодня, спустя 30 лет, С.Караганов искренне пишет, что не рад своим предсказаниям и российской военной операции на Украине. Об этом он написал и мне, когда я вспомнил о наших теплых профессиональных и личных отношениях и сотрудничестве с Институтом Европы РАН. В сентябре 2022 г. я поздравил С.Караганова с 70-летием и напомнил о наших встречах и разговорах. Честно сказал и том, как мой украинский друг в Киеве, известный историк, воспринимает Россию, лежа в квартире под обстрелами. Сергей Александрович ответил теплым письмом с предложением продолжить наши давние дискуссии и обсуждения.

В записке в адрес П.Кравченко предлагались для обдумывания и возможной реализации несколько идей. 1. Провозглашенному принципу нейтралитета противоречит нахождение на территории Беларуси ядерного оружия, а сам принцип создает определенный вакуум безопасности Беларуси, ограничивает ее внешнеполитическое пространство. Поэтому “белорусской

дипломатии не нужно активно продвигать принцип нейтралитета Беларуси на международной арене”.

Второе предложение было прямо навеяно результатами обсуждения ядерного фактора на семинарах и заявлеными тогда позициями ученых России, Украины и Казахстана. Отмечалось, что ни одно из ядерных государств кроме Украины и Беларуси (позиция Казахстана оставалась неясной) не ставит вопроса о его добровольном и одностороннем уничтожении. Исходя из этого, а также из-за непредсказуемого развития событий в России и ее отношений с Украиной, национальным интересам Беларуси не соответствовала бы быстрая и односторонняя утрата ядерного статуса. Указывалось, что обострение отношений между Россией и Украиной из-за Черноморского флота не исключает того, что Киев может изменить свои намерения в отношении ядерного оружия на территории Украины.

Мой вывод по этому вопросу был следующий: “Беларуси не нужно торопиться прощаться с ядерным оружием, находящимся на ее территории. Очевидно, что первоочередное признание Беларуси США среди других ядерных государств бывшего Союза обусловлено прежде всего ее ядерным статусом. Быстрое уничтожение или вывод МБР и тактического ядерного оружия приведет к закономерному снижению интересов к Беларуси со стороны США, как и Запада в целом. Ее реальный авторитет будет уменьшаться по мере сокращения ядерного потенциала. Когда его совсем не станет, Беларусь может занять очень скромное место во внешнеполитических приоритетах США и Европы”.

Третье предложение касалось необходимости для Беларусь более активно использовать свое геополитическое положение, учитывая напряженные российско-украинские отношения, для выполнения миссии миротворца и примирителя соседних славянских республик. Поскольку эти отношения несут в себе большой потенциал конфликтов и угроз, то в конфликтных ситуациях Украина (в большей степени) и Россия (в меньшей степени) будут считать Беларусь своим сторонником или даже судьей. «Это приведет к повышению роли Беларуси во внешнеполитических приоритетах Москвы и Киева. Белорусской дипломатии было бы хорошо дистанцироваться от российско-украинских противоречий и споров и поддерживать самые лучшие отношения с этими славянскими государствами, не жертвуя белорусскими интересами. Таким образом, Беларусь сможет оправдать свое предназначение как место между Востоком и Западом».

В 4-м пункте предлагалось активизировать прибалтийское направление белорусской внешней политики, сделав акцент на идее Балтийско-Черноморского союза. Несмотря на всю проблематичность создания такого объединения, МИД Республики Беларусь мог бы определенным образом поддержать этот проект, что дало бы действующему правительству Беларуси повод для достижения общенационального соглашения с оппозицией БНФ по одному из ключевых вопросов - о белорусских союзах и союзниках.

Пятое предложение касалось проблемы национальных меньшинств на территории бывшего СССР, которая, как отмечалось, представляет собой величайшую военно-стратегическую угрозу Содружеству независимых государств и источник нынешних и будущих военных конфликтов. С точки зрения международных отношений Беларусь сегодня является страной национальной стабильности, где нет никаких нарушений прав меньшинств. Аналогичного отношения к своим соотечественникам руководство Республики Беларусь могло ожидать и от других государств, где проживают белорусы. В связи с этим предлагалось, не скрою, в довольно категорической форме, но оправданная тогдашними политическими реалиями и моим исследовательским опытом изучения белорусской диаспоры формулировка: «Белорусская дипломатия, государственные и правительственные органы Республики Беларусь должны считать одним из внешнеполитических приоритетов защиту прав и интересов белорусов за границами Отечества (Бацькаўшчыны)».

В ходе семинара, организованного Хельсинкской гражданской ассамблеей, представители Югославии, Венгрии, Чешской и Словацкой Союзной Республики, Великобритании, Индии, Голландии проявили значительный интерес к опыту решению проблем национальных меньшинств в Беларуси. Представители этой организации выступили с предложением организовать в Минске семинар по вопросам жизни и деятельности меньшинств в Беларуси и Польше и попросили меня передать это предложение Министерству иностранных дел Республики Беларусь с тем, чтобы оно могло стать одним из организаторов такого семинара, что и было сделано в записке. В 1992 г. группа членов этой организации приезджала в Минск, встречалась с работниками МИДа, представителями национальных сообществ, однако о результатах поездки мне неизвестно.

В заключении автор предложил создать группу экспертов при МИДе по внешнеполитическим проблемам, одной из целей которой была бы разработка концепции внешней политики. С учетом явного дефицита профессиональных исследователей международной деятельности Беларуси я предложил и собственные услуги в деле проведения «независимой белорусской внешней политики и дипломатии». Копию записки нашел недавно в своих бумагах. При внимательном прочтении мне показалось, что некоторые мысли и предложения, высказанные 30 лет назад, сохранили свое значение, особенно касающиеся ядерного оружия, нейтралитета, российско-украинского конфликта и роли Беларуси в его урегулировании. Содержание записки П.Кравченко я недано опубликовал.

Другая записка “Беларусь и проблемы обеспечения обще- и центральноевропейской безопасности” была подготовлена для Украинского центра исследований международной безопасности и отправлена в Киев в августе 1994 г. Она была написана по результатам состоявшейся весной в Киеве международной конференции по просьбе украинских коллег. Документ был большим по объему (16 маш. стр.) и включал такие темы, как

новое геополитическе положение Беларуси после распада СССР, внешнеполитические постулаты страны (цели, задачи, принципы и приориттеты), инициативы Минска в области европейской безопасности, предложения оппозиции БНФ в Верховном Совете, Беларусь и проблемы координации политики безопасности и сотрудничества в Центральной Европе, новые подходы Беларуси и Украины к проблемам европейской безопасности после избрания президентами А.Лукашенко и Л.Кучмы. Судьба этой записки мне также неизвестна. Каких-то следов или ссылок на документ в литературе встречать не приходилось. С Украинским центром исследований международной безопасности дальнейших контактов не имел и предложений о сотрудничестве с его стороны не поступало.

В целом международное научное сотрудничество было установлено и успешно развивалось с российскими коллегами. Оно институционализировалось работой по совместительству в должности ведущего научного сотрудника в Институте Европы РАН, что считал большой честью для себя и прекрасной интеллектуальной школой. В течение нескольких лет я готовил аналитические материалы по проблемам внутренней и внешней политики Беларуси, белорусско-российских отношений. Позднее они нашли отражение в моих журнальных и книжных публикациях. Первые публикации по актуальным проблемам внешней политики Беларуси вышли в 1993 г., навеянные результатами участия в московских семинарах. Что касается первых опытов внешнеполитического анализа, то они были полезными не только для инициатора записки в белорусский МИД, но, полагаю и для этого ведомства, поскольку в ряде выступлений П.Кравченко в 1992-1993 и последующих годах он неоднократно обращался к теме ядерного оружия и невозможности, опасности его сохранения и хранения на территории страны. Тогда это была консолидированная позиция политического и военного руководства Беларуси.

К середине 1990-х гг. зарубежные контакты расширились за счет связей с представителями белорусской диаспоры в Великобритании и США, английскими, американскими, немецкими и польскими учеными, историками и политологами. К концу десятилетия и началу нового века они приобрели более устойчивый, системный и регулярный характер, что благотворно отражалось в преподавательской и научно-исследовательской работе.

### 1.4. Гісторыя кафедры і факультэта міжнародных адносін БДУ праз бачанне аднаго з “бацькоў-заснавальнікаў”

З 1 верасня) 1993 г. я пачаў працаваць прафесарам кафедры міжнародных адносін гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У кастрычніку 1995 г. быў створаны факультэт міжнародных адносін БДУ, куды ўлілася кафедра як асноватворная адзінка аддзялення міжнародных адносін ФМА. У 2022 г. кафедра адзначыла сваё 30-годдзе, у

2020 г. факультэт сустрэў свой 25-гадовы юбілей. Да гэтах дат былі выдадзены сборнікі навуковых артыкулаў і іншыя публікацыі. У 2021 г. БДУ адзначыў сваё стагоддзе, якое наш факультэт уганараваў кнігай пра развіццё міжнародных адносін і замежных сувязей ва ўніверстэце.

Я прымаў удзел ва ўсіх гэтых юбілейных выданнях, дзе падзяліўся гістарыяграфічнымі аглядамі і думкамі пра пачаткі і развіццё міжнародных, знешнепалітычных даследаванняў у Беларусі. У зборніку да 30-годдзя кафедры міжнародных адносін быў надрукаваны мой артыкул пра пачаткі дзейнасці кафедры, шэраг сюжэтаў з якога ўключаны ў гэты тэкст. У верасні 2023 г. разам з прафесарам А.В.Шарапам, былым загадчыкам кафедры і дэканам ФМА, мы прадставілі даклад на навуковай канферэнцыі пра асноўныя этапы гісторыі кафедры і факультэта міжнародных адносін. Яго палажэнні і высновы таксама адлюстраваны ў тэксце.

Кафедра міжнародных адносін была створана ў 1992 г., факультэт на тры гады пазней. Кафедра дала пачатак факультэту, перадаўшы яму сваю назву. У складзе факультэта кафедра застаецца асноватворнай структурнай адзінкай, вызначаючы галоўныя кірункі яго дзейнасці: вучэбнай, навуковай, выхаваўчай. Па сваім колькасным і галоўнае якасным складзе з высокай доляй прафесараў і дактароў навук яна з’яляецца вядучай. Этапы гісторыі кафедры цесна звязаны з гісторыяй развіцця факультэта, асабліва ў першае дзесяцігоддзе. Потым гэтыя дзве структурныя адзінкі ў складзе БДУ паступова набылі ўласную дынаміку развіцця і сталі больш самастойнымі. Факультэт пашырыўся, маючы сёння 6 аддзяленняў. Гэта было звязана з шэрагам прычын як аб’ектыўнага, так і суб’ектыўнага характару.

Калі казаць пра гісторыю кафедры, то яе можна падзяліць на некалькі этапаў. Галоўным крытэрыям перыядызацыі пры гэтым выбраны лінейна-гістарычны ці арыфметычны – падзел 30-гадовай гісторыі кафедры на дзесяццігоддзі, што дазваляе выдзеліць больш ці менш раўназначныя па часе этапы яе дзейнасці. Аднак храналагічныя межы этапаў не зусім дакладна будуць адпавядаць 10-гадовым адрэзкам і гэтыя межы могуць умяшчаць некалькі падзей ці этапных адзнак.

***Першае дзесяццігоддзе кафедры ахоплівае 1992-2002 гг.*** Этап 1990-х гг. закрываецца такой важнай падзеяй, як абарона ў снежні 2000 г. дзвюх доктарскіх дысертацый супрацоўнікамі кафедры М.Часноўскім і В.Шадурскім. Першае дзесяццігоддзе існавання кафедры можна назваць *вызначальным пачаткам,* які прадвызначыў далейшае паспяховае развіццё ўласна кафедры і ўсяго факультэта. Упершыню ў гісторыі Беларусі было створана вучэбнае і навуковае падраздзяленне ў складзе вядучага нацыянальнага ўніверсітэта, якое займалася выкладаннем, даследаваннем, падрыхтоўкай спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй і навукова-педагагічных кадраў (кандыдатаў і дактароў навук) у галіне міжнародных адносін. З цягам часу (у другім і асабліва трэццім дзесяццігоддзях) важным кірункам дзейнасці кафедры стала падрыхтоўка спецыялістаў-міжнароднікаў з ліку замежных грамадзян і кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі.

Важную ролю ў стварэнні кафедры, а пазней і факультэта, адыгралі чатыры прафесары, дактары гістарычных навук (А.Шарапа, А.Разанаў, А.Чалядзінскі, У.Снапкоўскі) і дацэнт, кандыдат гістарычных навук Л.Лойка. Доктарам навук і прафесарам ён стаў у 2003 г., займаючы з 1996 г. пасаду загадчыка створанай ім кафедры дыпламатычнай і консульскай службы. Л. Лойка зразумела адыйшоў у бок ад спраў нашай кафедры, але працягваў уплываць на стратэгічныя кірункі развіцця кафедр і факультэта, маючы добрыя дзелавыя адносіны з А.Шарапам і прафесарамі кафедры. Згаданая вышэй пяцёрка вучоных і выкладчыкаў склала ядро кафедры, вакол якога стала фарміравацца шырэйшае кола выкладчыкаў і супрацоўнікаў кафедры і факультэта, а таксама даследчыкаў міжнародных адносін і знешняй палітыкі Беларусі і замежных дзяржаў, якія ў сваю чаргу стварылі беларускую школу міжнародных адносін.

Да галоўных вынікаў першага дзесяцціґоддзя кафедры трэба залічыць тое, што ў 1990-я гг. былі вызначаны асноўныя і галоўныя кірункі вучэбна-метадычнай дзейнасці: сфарміраваны вучэбны план спецыяльнасці па гісторыі міжнародных адносін і вучэбныя праграмы базавых і спецыяльных дысцыплін. Пачалася распрацоўка навуковых кірункаў, арыентаваная на даследаванне знешнепалітычнай гісторыі Беларусі і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, вузлавых пытанняў міжнародных адносін у Еўропе і свеце, знешняй палітыкі асобных дзяржаў. Усталяваліся сувязі з замежнымі партнёрамі (універсітэцкімі кафедрамі і даследчымі цэнтрамі) у Германіі, Расіі, ЗША, Вялікабрытаніі. У 1996 г. пачалося выданне першага перыядычнага органа па міжнародных адносінах і міжнародным праве (“Беларускага часопіса міжнароднага права і міжнародных адносін”), манаграфій і вучэбнай літаратуры. У 1998 г. быў створаны і разгарнуў актыўнасць спецсавет па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацыі па спецыяльнасці “Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі”.

Спачатку кафедра была невялікім калектывам на чале з загадчыкам прафесарам А.В.Шарапам. У яе склад уваходзілі прафесары А.А.Разанаў і А.А.Чалядзінскі, дацэнт Л.В.Лойка, пару выкладчыкаў, сакратары В.В. Алейнікава і Н.А.Дабржанская. Сёння некаторых з іх няма з намі на гэтым свеце (Л.В.Лойка), А.А.Чалядзінскі перайшоў у 2017 г. на працу ў іншую навучальную ўстанову, Н.Дабржанская знаходзіцца на заслужанным адпачынку. У верасні 1993 г. у склад кафедры на пасаду прафесара быў залічаны аўтар гэтых радкоў, перайшоўшы пераводам у БДУ з Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

Паколькі разам з утварэннем кафедры і факультэта быў пакладзены інстытуцыянальны пачатак новай спецыяльнасці “Міжнародныя адносіны”, вакол якой узнік шэраг іншых, звязаных з дзейнасцю адпаведных аддзяленняў ФМА, то ў сваіх разважаннях я буду закранаць развіццё гэтага новага для незалежнай Беларусі навуковага кірунку, які ў наменклатуры навуковых спецыяльнасцей называецца “Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі” і адносіцца да гістарычнай навукі. Аднак спецыфіка

навукі аб міжнародных адносінах заключаецца ў тым, што яна мае комплексны міждысцыплінарны характар і не абмяжоўваецца гістарычнай навукай. Бліжэй за ўсё да гістарычных даследаванняў па міжнароднай тэматыцы стаіць палітычная навука, якая мае адпаведную спецыяльнасць у сваёй наменклатуры, звязаную з міжнароднымі адносінамі. У дзейнасці кафедры гісторыя і паліталогія цесна пераплецены паміж сабой, што праяўляецца ў адукацыйнай і навуковай дзейнасці, як і ў кадравым складзе супрацоўнікаў, дзе прадстаўлены дактары гістарычных, палітычных і філасофскіх навук.

Рэкрутацыя новых супрацоўнікаў у склад кафедры была звязана з іх адукацыйным, навуковым і практычным (дыпламатычным) вопытам працы ў галіне міжнародных адносін. Падобны вопыт у кіраўніка кафедры і яе першых прафесароў і дацэнтаў меўся, хаця і ў рознай ступені. А.В.Шарапа працаваў прарэктарам БДУ па замежных сувязях і абараніў абедзве свае дысертацыі па нямецкай тэматыцы ў ГДР. А.Разанаў займаўся праблемамі міжнароднай бяспекі і абараніў доктарскую дысертацыю ў Маскве. А.Чалядзінскі вывучаў пасляваенны фашызм у Лацінскай Амерыцы і таксама абараніў доктарскую дысертацыю ў Маскве. Абодва прыйшлі на кафедру з Мінскай вышэйшай партыйнай школы (МВПШ) пры ЦК КПБ, якая ў 1990 г. была пераўтворана ў Інстытут паліталогіі і сацыяльнага кіравання (ІПСК) КПБ, дзе А.Чалядзінскі раней ўзначальваў кафедру сусветнай палітыкі. Л.Лойка пасля працы на гістфаку БДУ, дзе абараніў кандыдацкую дысертацыю па польскім рабочым класе, прайшоў дыпламатычную школу пры савецкім пасольстве ў Варшаве, а потым таксама працаваў дацэнтам у ІПСК.

Паколькі кафедра стваралася для падрыхтоўкі дыпламатаў для беларускага МЗС, нацыянальная беларуская тэматыка ў галіне міжнародных адносін павінна была стаць адным з галоўных кірункаў у выкладчыцкай і даследчай працы яе супрацоўнікаў. Аднак сярод першага набору, які прыступіў да працы ў 1992-1993 навучальным годдзе, падобных спецыялістаў не было, хаця Л.Лойка ўжо праяўляў схільнасць да гісторыі дзяржаўнасці Беларусі і сучасных праблем беларуска-польскіх адносін. У той час у Беларусі існавала адно навуковае падраздзяленне, якое займалася знешнепалаітычнай гісторыяй Беларусі. Гэта быў аддзел гісторыі замежных сувязей БССР Інстытута гісторыі НАН Беларусі, які пасля 1991 г. быў перайменаваны ў аддзел нацыянальных і міжнародных адносін. Пасля заканчэння інстытуцкай аспірантуры я працаваў у яго складзе з 1979 г., абараніўшы кандыдацкую (адносіны паміж ГДР і ФРГ у 1970-я гг.) і доктарскую (знешнепалітычная дзейнасць Беларускай ССР у 1944-1953 гг.) дысертацыі.

З А.В.Шарапам быў знаёмы з сярэдзіны 1980-х гг., што было звязана з яго куратарствам у якасці прарэктара БДУ над падрыхтоўчым факультэтам для замежных грамадзян, дзе выкладчыкам працавала мая жонка Святлана. Другая наша сустрэча адбылося нейдзя ў чэрвені 1992 г., калі я прыйшоў у

яго прарэктарскі кабінет пасля атрымання на пасяджэнні аддзела рэкамендацыі доктарскай дысертацыі да абароны і прапанаваў сваю кандыдатуру для сталай працы на кафедры міжнародных адносін, пра стварэння якой ведалі ўжо многія.

Акрамя даследчага “актыва” па беларускай знешнепалітычнай тэматыцы, статуса старшага навуковага супрацоўніка акадэмічнага інстытута, вопыта навукова-арганізацыйнай работы вучоным сакратаром Аддзялення грамадскіх навук АН БССР, беглага валодання беларускай мовай і навыкамі камунікацый на англійскай і польскай мовах (размоўную нямецкую паспеў забыць) за плячыма кандыдата ў прафесары кафедры быў 12-гадовы досвед выкладчыцкай працы на гістарычным факультэце БДУ па кафедры новай і навейшай гісторыі. З 1980 г. па запрашэнні загадчыка кафедры прафесара Л.М.Шнеерсона я вёў заняткі на ўмовах пагадзіннай аплаты, а потым на чвэрць стаўкі дацэнта. Апошні “актыў” (праца “пагадзіннікам” і па сумяшчальніцтве) быў не вельмі пераканаўчы для будучага загадчыка кафедры, пра што А.Шарапа казаў неаднаразова і пазней, аднак іншыя мае дасягненні і заслугі несумненна былі ўзятыя пад увагу.

Мы развіталіся з дамоўленасцю, што пасля абароны доктарскай дысертацыі і яе зацвярджэння ВАКам я буду запрошаны на пасаду прафесара кафедры на сталую працу ў БДУ. Дамовіліся і аб падрымцы кантактаў паміж супрацоўнікамі кафедры і майго аддзела, які пачынаў даследаванне гісторыі беларускай дыяспары і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Пазней асабіста пазнаёміўся з А.Разанавым і А.Чалядзінскім, якіх ведаў па іх публікацыях. З Л.Лойкам быў знаёмы са студэнцкіх часоў, калі ён праводзіў семінарскія заняткі ў нашай групе па навейшай гісторыі. Пазней мы працавалі разам на кафедры новай і навейшай гісторыі гістфака БДУ.

Пры экспертызе доктарскай дысертацыі вядучай навуковай установай быў выбраны родны БДУ, а водгук быў абмеркаваны і зацверджаны на кафедры міжнародных адносін за подпісам загадчыка А.В.Шарапы. Праект водгука абмяркоўвалі разам з А.Разанавым, які быў намеснікам загадчыка кафедры па навуковай працы. На маю абарону (студзень 1993 г.) кафедра дэлегавала А.Чалядзінскага, які актыўна падтрымліваў дысертанта, на якога “наязджаў” член-карэспадэнт НАНБ П.Ц.Петрыкаў за неасцярожныя выказванні пра Беларускую Народную Рэспубліку. Важкі голас у патрымку суіскальніка выказаў афіцыйны апанент, прафесар, доктар юрыдычных навук Ю.П.Броўка, з якім мы пазней усталявалі цёплыя сяброўскія адносіны і разам доўгі час працавалі на ФМА.

Пасля зацвярджэння дысертацыі расійскім ВАКам я паставіў пытанне аб пераходзе ў БДУ перад дырэктарам Інстытута гісторыі М.П.Касцюком. Мяркую, што ён быў падрыхтаваны да гэтага крока, паколькі ведаў пра дзейнасць новай кафедры, яе патрэбы ў кваліфікаваных кадрах і мае сувязі з гістфакам БДУ. Маё рашэнне было ўспрынята Міхаілам Паўлавічам з пэўным шкадаваннем, бо дырэктар не хацеў губляць маладога доктара навук, выхаванага ў інстытуце, свайго аднадумца і паплечніка, і адначасова з

разуменнем, паколькі я пераходзіў на працу, якая мела агульнадзяржаўнае значэнне, маючы на ўвазе падрыхтоўку беларускіх дыплпматаў. Я выказаў жаданне застацца ў аддзеле на палову стаўкі вядучага навуковага супрацоўніка, якое было адразу прынята М.П.Касцюком і які сам выступіў з такой сустрэчнай прапановай. Такім чынам з 1 верасня 1993 г. я пачаў працу прафесарам кафедры міжнародных адносін БДУ, у 1995 г. атрымаў вучонае званне прафесара па кафедры міжнародных адносін, нададзенае Міністэрствам адукацыі. Дыплом прафесара ўручыў міністр адукацыі В. Стражаў. Адначасова працягваў працаваць па сумяшчальніцтве ў Інстытуце гісторыі НАНБ, дзе ў 1995-2000 гг. узначальваў аддзел нацыянальных і міжнародных адносін.

***Пра "бацькоў-заснавальнікаў" і кадравае папаўненне***. Пасля атрымання незалежнасці краіна адчувала кадравы голад на спецыялістаў у галіне міжнародных адносін і палітычных навук. З гэтым была звязана прапанова дэкана філасофскага факультэта БДУ прафесара А.М.Елсукова ўзначаліць кафедру паліталогіі пасля таго, як яе першы загадчык прафесар А.М.Байчораў быў запрошаны на працу ў МЗС. Пасля пэўных хістанняў і роздумаў я адмовіўся, палічыўшы, што не пацягну гэты навуковы кірунак і адказную пасаду загадчыка. Я быў цалкам задаволены новай працай на кафедры міжнародных адносін і не жадаў пакідаць любімай знешнепалітычнай тэматыкі даследаванняў.

У далейшым мае даследчыя інтарэсы цесна перасякаліся з палітычнай навукай, даследаваннямі ўнутранай і знешняй палітыкі Беларусі, Расіі, Польшчы, Украіны і іншых дзяржаў. Разам з калегамі па кафедры А.Разанавым. А.Чалядзінскім і А.Шарапам мы сталі стваральнікамі Беларускай асацыяцыі палітычных навук, якую ўзначаліў член-карэспандэнт НАНБ У.А.Бабкоў, а пазней наша прафесарская тройка ўвайшла ў склад доктарскага спецсавета БДУ па палітычных навуках. Там мы прадстаўлялі спецыяльнасць "23-00-04 – Палітычныя праблемы міжнародных адносін, глабальнага і рэгіянальнага развіцця". З часам адзін за другім (першым быў А.Чалядзінскі, потым я, затым А.Разанаў) па сваёй ці чужой волі мы былі вымушаны пакінуць гэты спецсавет.

У маёй працоўнай біяграфіі перыяд 1993-1996 гг. быў прыкметны на цікавыя службовыя прапановы. Адна з апошніх зыходзіла ад загадчыка новай кафедры дыпламатычнай і консульскай службы нашага факультэта Л.Лойкі, створанай у 1996 г. У яе складзе не было дактароў навук і ён прапанаваў перайсці на кафедру, дзе я б мог чытаць блізкія мне курсы па гісторыі і сучасных праблемах знешняй палітыкі Беларусі. Пасля роздумаў я вырашыў застацца на кафедры міжнародных адносін, не жадаючы пакідаць блізкае сяброўскае прафесарскае асяроддзе і сваіх напрацовак па дысцыплінах, якія ў любым выпадку спатрэбілася б мадыфікаваць з улікам спецыфікі новай кафедры. Мяркую, што А.В.Шарапа мог быць задаволены маім рашэннем. Была ў той час яшчэ адна вельмі цікавая кар'ерная прапанова ці кадравая прыкідка з боку кіраўніцтва БДУ (рэктара Ф.М.Капуцкага і першага

прарэктара П.Д.Кухарчыка), якая мела больш зандажны характар і не атрымала развіцця ў выніку закулісных інтрыг. Магчыма пазней пра гэта будзе мной напісана больш падрабязна.

Пра шлях на кафедру яе “бацькоў-заснавальнікаў” было сказана вышэй. Калі абагуліць працэс нашай рэкрутацыі, атрымлівалася наступная карціна. Заг. кафедры быў прызначаны з пасады прарэктара, маючы вопыт кіраючай працы ў галіне міжнародных сувязей БДУ і добра ведаючы нямецкую мову. Л.Лойка, А.Разанаў і А.Чалядзінскі прыйшлі з МВПШ-ІПСК. Там у свой час выкладаў і А.Шарапа. Я быў запрошаны з Інстытута гісторыі НАНБ. Усе за выключэннем А.Шарапы, які скончыў Мінскі педінстытут, мелі дыпломы гістфака БДУ. А.Разанаў ведаў англійскую мову, А.Чалядзінскі – іспанскую, Л.Лойка –польскую, я ў той час асвойваў англійскую і польскую мовы. Да праблематыкі міжнародных адносін бліжэй знаходзіліся А.Разанаў (заходнія канцэпцыі праблем міжнароднай бяспекі) і У.Снапкоўскі (знешнепалітычная дзейнасць БССР у пасляваенныя гады). Л.Лойка, А.Чалядзінскі і А.Шарапа пераходзілі да даследавання праблем міжнародных адносін праз унутраную тэматыку гісторыі замежных краін і рэгіёнаў (Польшчы, ГДР, Лацінскай Амерыкі).

Паміж намі існаваў фармальны і нефармальны падзел працы і функцыянальных абавязкаў. АА.Шарапа ажыццяўляў кіраўніцтва кафедрай, да якога ў 1995 г. дадаліся абавязкі дэкана ФМА. У 1998 г. ён узначаліў першы ў Беларусі дактарскі спецсавет па спецыяльнасці 07.00.05 (зараз 07.00.15) –Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі, у склад якога ўвайшлі ўсё прафесары кафедры і іншыя вядучыя вучоныя-міжнароднікі з універсітэтаў Мінска.

А.Чалядзінскі быў намеснікам загадчыка кафедры па вучэбнай працы і паспяхова цягнуў гэты вялікі і адказны ўчастак, абапіраючыся на ўласны багаты досвед загадчыка кафедры МВПШ. Ён меў добрыя сувязі з калегамі па-за межамі кафедры і факультэта, у тым ліку з Масквы, якія ўмела выкарыстоўваў у вучэбных і навуковых інтарэсах нашага ўніверсітэта.

А.Разанаў быў намеснікам загадчыка кафедры па навуковай працы і шмат рабіў па развіцці даследаванняў у галіне міжнародных адносін і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Ён завязаў кантакты з амерыканскімі вучонымі і прыняў удзел у першых сумесных публікацыях і міжнародных праектах, прайшоўшы стажыроўкі ў шэрагу ўніверсітэцкіх цэнтраў ЗША. На жаль у далейшым яны не атрымалі развіцця ў сувязі з пагаршэннем адносін Беларусі з Захадам і згортваннем навукова-адукацыйных праграм. А.Разанаў і А.Чалядзінскі наведалі Кіеў, дзе азнаёміліся з вопытам працы Украінскага інстытута міжнародных адносін, атрымаўшы ад украінскіх калегаў вучэбныя планы і праграмы. Пазней, у 2002 г. стажыроўку ў гэтым інстытуце прайшоў і я.

На мяне выпаў “цяжар”, прыемны абавязак і грамадска-адукацыйная місія, пра якую пастаянна нагадваў А.В.Шарапа, весці беларускую тэматыку (гістарычную і сучасную) у працы кафедры і часткова факультэта,

падтрымання сувязей з установамі НАН Беларусі, пашырэння беларускай мовы ў навучальным працэсе і навуковых даследаваннях. Частку гэтай працы, асабліва беларускага напрамку, мы дзялілі з Л.Лойкам, які вылучаўся смелымі наватарскімі ініцыятывамі ў выдаведкіх справах, сувязях з беларускай грамадскасцю, польскімі вучонымі і дзелавымі коламі. На кафедру я таксама прынёс вопыт супрацоўніцтва з расійскімі міжнароднікамі, асабліва Інстытута Еўропы РАН, дзе некалькі гадоў працаваў вядучым навуковым супрацоўнікам па сумяшчальніцтве.

На падставе гэтага вопыту нарадзілася ініцыятыва круглых сталоў паміж беларускімі і расійскімі вучонымі па праблемах беларуска-расійскіх адносін, пачатая ў выніку маёй сустрэчы ў Маскве ў канцы 1997 г. з дырэктарам Цэнтра параўнаўчых палітычных даследаванняў Інстытута міжнародных палітычных і эканамічных даследаванняў РАН прафесарам Б.А.Шмялевым. Першы такі круглы стол адбыўся ў лютым 1998 г. у Маскве, потым яны праводзіліся па штогод па чарзе ў нашых сталіцах і завяршаліся прыняццем выніковых дакументаў, якія мы друкавалі і накіроўвалі ў свае МЗС, заканадаўчыя і дырэктыўныя органы. Апошні, дзесяты прайшоў ў лістападзе 2008 г. у Мінску.

Прычынамі спынення гэтай вельмі важнай формы супрацоўніцтва можна лічыць зразумелыя спасылкі на недахоп фінансавання на камандзіроўкі дэлегацый (5-6 чалавек). Разам з тым у нас на факультэце і ў расійскіх калег адчувалася пэўная вычэрпальнасць праекта беларуска-расійскай інтэграцыі, асабліва ў той час, калі пачаліся крызісныя з’явы і гандлёвыя войны паміж Мінскам і Масквой. Гэтыя негатыўныя моманты разам з несумненнымі дасягненнямі ў справе развіцця раўнапраўных адносін паміж Беларуссю і Расіяй удзельнікі круглых сталоў адзначалі ў сваіх дакладах і ў выніковых дакументах.

У сярэдзіне і другой палове 1990-х гг. кафедру папоўнілі дацэнты С.Ф.Свілас, Л.М.Хухлындзіна, М.Э.Часноўскі, В.Г.Шадурскі, шэраг маладых выкладчыкаў. Крыніцы папаўнення былі таксама розныя. С.Свілас прыйшла з вопытам працы ў школах і інстытутах Мінска, Л.Хухлындзіна – з гістфака БДУ, В.Шадурскі – з пасады начальніка аддзела замежных сувязей БДУ; ён жа стаў першым дактарантам кафедры. М.Часноўскі вярнуўся ў БДУ пасля працы ў пасольстве Беларусі ў Варшаве, дзе выконваў абавязкі паверанага ў справах. Ён не пажадаў працягнуць дыпламатычную кар’еру ў цэнтральным апараце МЗС на пасадзе загадчыка аддзела і стаў намеснікам дэкана ФМА па вучэбнай рабоце.

Тэматыка даследаванняў гэтай чацвёркі дацэнтаў не выходзіла на стадыі напісання кандыдацкіх дысертацый, якое прыпала на савецкі час, на праблемы міжнародных адносін і знешняй палітыкі. Яна абмяжоўвалася пытаннямі гісторыі ГДР (С.Свілас) і навейшай гісторыі БССР у трох астатніх. Адукацыйны і даследчыцкі кірункі кафедры і факультэта прымусілі калег перайсці да даследавання міжнародных адносін і выкладання адпаведных курсаў. Развітанне з падпольным рухам у акупаванай немцамі Беларусі

(Л.Хухлындзіна) і сацыяльнай палітыкай у ГДР (С.Свілас) было зроблена хутка і без шкадаванняў. Аб тым, што гэта адбылося на высокім узроўні, сведчыць абарона доктарскіх дысертацый па міжнароднай тэмытыцы М.Часноўскім, В.Шадурскім і С.Свілас, высокая якасць навуковай кваліфікацыі і дасягненні ў кар’ернай лесвіцы Л.Хухлындзінай.

Да залічэння некаторых супрацоўнікаў у склад кафедры меў пэўнае дачыненне і я. Са Святланай Свілас быў знаёмы са студэнцкіх гадоў, калі разам вучыліся ў адной групе. Яе высокі ўзровень ведаў і агульнай гуманітарнай адукацыі, атрыманы ў элітнай мінскай школе, адрозніваўся ад тых, што атрымалі выпускнікі-выдатнікі абласных, раёных ці вясковых сярэдніх школ. Нам з Генам Космачам было за кім цягнуцца і ў наступныя гады (другім і трэціх курсах) мы, як мяркую, хутка скарачалі разрыў, актыўна працуючы ў бібліятэцы і студэнцкім інтэрнаце. Пасля заканчэння ўніверсітэта Святлана прайшла добрую і нялёгкую школу працы настаўніцай у школах і каледжах Мінскай вобласці і Мінска, паспеўшы абараніць кандыдацкую дысертацыю. А.Шарапа звычайна раіўся з намі наконт рэкрутацыі новых супрацоўнікаў кафедры, таму мой голас на карысць аднагрупніцы таксама меў значэнне.

У першыя гады XXI ст. на кафедру перайшоў А.В.Ціхаміраў, з якім мы разам працавалі ў адным аддзеле Інстытута гісторыі НАНБ. Пасля майго зыходу з пасады загадчыка аддзела Аляксандр прыняў эстафету ў свае рукі, кіруючы аддзелам ўсеагульнай гісторыі і міжнародных адносін, які ў той час ужо моцна скараціўся. Тэматыка гісторыі беларускай дыяспары адыйшла на задні план, падрыхтаваныя рукапісы засталіся невыдадзенымі. Я працягваў кантакты з родным аддзелам і асабліва з новым загадчыкам. Па ўзгадненні і разам з Аляксандрам Віктаравічам мы паступова ўцягвалі А.Ціхамірава ў працу нашай кафедры. Тут ён бачыў большыя магчымасці дя сваёй творчай навуковай і выкладчыцкай дзейнасці, таму вырашыў перайсці на пасаду ўніверсітэцкага дацэнта. З яго прыходам навуковы патэнцыял кафедры ўзмацніўся і наша тройка (А.Шарапа, я і А.Ціхаміраў) стала ядром творчых калектываў беларускіх даледчыкаў па падрыхтоўцы зборнікаў дакументаў па знешнепалітычнай гісторыі Беларусі XX і пачатку XXI ст.

Калі пры кафедры адкрылася аспірантура, наша прафесарская чацвёрка абмяркоўвала кандыдатуры найбольш дастойных выпускнікоў ФМА і іншых маладых асоб, якія жадалі стаць на шлях навукі і выкладчыцкай дзейнасці. Першым кандыдацкую дысертацыю ў нашым спецсавеце абараніў аспірант кафедры А.І.Гардзейчык, які прыехаў з Украіны (1998 г.). Пасля абароны ён зрабіў паспяховую дыпламатычную кар’еру як раз у галіне беларуска-расійскіх адносін. Потым надыйшла чарга А.В.Русаковіча, Д.Л.Шэвялёва і У.В.Фральцова (2000-2001 гг.). Яны паспяхова абаранілі свае працы, а потым сталі і дактарамі гістарычных навук у галіне міжнародных адносін (А.Русаковіч і У.Фральцоў).

Першым маім кандыдатам навук стаў А.В.Гурын, выпускнік нашай кафедры, якому я прапанаваў распрацоўку тэмы пра даследаванне

міжнародных адносін у Беларусі. Гістарыяграфіяй гэтай праблемы я займаўся з 1980-х гг. Пасля стварэння кафедры і факультэта міжнародныя даследаванні пачалі вельмі хутка развівацца. Бачачы гэты працэс, разумеў, што ўжо аднаго дзесяцігоддзя будзе дастаткова, каб прысвяціць яму кандыдацкую дысертацыю. А каб паказаць традыцыю, уключыў у тэму 1980-я гг. Атрымалася вельмі змястоўная, багата фундзіраваная фактамі, спісамі, дыяграмамі і табліцамі праца, паспяхова абароненая А.Гурыным у 2005 г. Я быў задаволены і ўзрадаваны, калі пасля давалі доўгага перапынку і роздумаў Аляксандр Валер’евіч апублікаваў манаграфію ў 2022 г. і паступіў у дактарантуру на нашу кафедру пры маім навуковым кансультаванні.

Першы этап у 30-гадовай гісторыі кафедры ўмоўна ахоплівае першае дзесяцігоддзе яе існавання, хаця ніякіх юбілейных мерапрыемстваў з гэтай нагоды не праводзілася. Тое ж самае датычылася і 20-годдзя кафедры, якое на маёй памяці прайшло даволі непрыкметна ў 2012 г. А гэты год стаў прыкметным, паколькі наш факультэт пераехаў у новы будынак, дзе размяшчаецца і зараз. Упершыню мы адзначылі юбілей кафедры ў 2017 г., калі правялі навуковую канферэнцыю і апублікавалі яе матэрыялы асобнай кнігай.

У якасці пачатковага этапа гісторыі кафедры можна выдзеліць 1990-я гг., узяўшы за пункт адліку нараджэнне незалежнай Беларусі ў 1991 г. Гэта палітычная падзея паклала пачатак самастойнай знешняй палітыкі і дыпламатыі беларускай дзяржавы, якія рэалізоўваліся Міністэрствам замежных спраў, якому былі патрэбны нацыянальныя дыпламатычныя кадры. Дзеля іх падрыхтоўкі з ініцыятывы МЗС і ўласна міністра П.К.Краўчанкі ўзнікла кафедра міжнародных адносін як ядро будучага факультэта. У бацькоў-заснавальнікаў кафедры было добрае разуменне таго, чаму ўзнікла наша падраздзяленне і якую адукацыйную, грамадзянскую і нацыянальна-патрыятычную місію мы павінны выконваць. Пра гэта гаварылася ў нашых гутарках, на пасяджэннях кафедры і публічна на канферэнцыях і ў друку.

Этап 90-х гг. закрываецца такой важнай падзеяй, як абарона ў снежні 2000 г. дзвюх доктарскіх дысертацый супрацоўнікамі кафедры М.Часноўскім і В.Шадурскім. Гэтым актам кафедра, ФМА, спецсавет па абароне і пазней беларускі ВАК падвялі своеасаблівы вынік працэсу фарміравання нашага падраздзялення, зацвердзіўшы першых дактароў гістарычных навук у галіне міжнародных адносін. Хутка два дактары і прафесары ўзялі новыя высоты ў сістэме вышэйшай адукацыі, калі адзін стаў рэктарам Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта (М.Часноўскі), а другі дэканам факультэта міжнародных адносін (В.Шадурскі).

***Другое дзесяцігоддзе гісторыі кафедры ахоплівае 2002-2012 гг.*** 2012 год прыкметны такімі падзеямі, як пераезд факультэта ў новы будынак на вуд. Ленінградскай і святкаванне 20-цігоддзя кафедры, хаця ўрачыстасцей у гэтай сувязі не было. Гэты этап кафедра і факультэт правялі на вул. Акадэмічнай і праф. А.Шарапа мог бы шмат цікавага расказаць, як ён

змагаўся за гэты шматпавярховы будынак у цэнтры Мінска насупраць Батанічнага саду.

У другое дзесяцігоддзе кафедра пашырылася колькасна і вырасла якасна. Яна прырасла адным доктарам навук (Ю.І.Малевіч) і групай кандыдатаў навук. Па навуковым профілю кафедры абараніў доктарскую дысертацыю загадчык кафедры міжнароднага турызму Л.М.Гайдукевіч. На гэты этап прыпадае распрацоўка новых вучэбных планаў і праграм (тыпавых і вучэбных), як і стандарта спецыяльнасцей новага пакалення, што рабілася ў межах кафедры і факультэта. На нашу думку, у гэты час кафедра ператварылася ў вядучы адукацыйны і даследчы цэнтр па міжнародных адносінах у Беларусі.

Супрацоўнікамі кафедры выдадзены першыя ў Беларусі навучальныя дапаможнікі для вышэйшай школы па гісторыі і тэорыі міжнародных адносін, гісторыі знешняй палітыкі Беларусі, сусветнай палітыцы. Я апублікаваў навучальны дапаможнік «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» (у 2-х частках на беларускай мове і асобнай кнігай на рускай мове), дзе сістэматычна выкладаецца гісторыя беларускай знешняй палітыкі і дыпламатыі ад пачаткаў дзяржаўнасці да канца ХХ ст. За серыю навуковых і вучэбных прац па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі мною атрымана ў 2008 г. прэмія БДУ імя першага рэктара У.І.Пічэты.

Пра падрыхтоўку вучэбнага дапаможніка хацелася б сказаць тут асобна, хаця аб гэтым ёсць і адпаведная публікацыя. Запатрабаванасць курса па знешнепалітычнай гісторыі Беларусі (гэты тэрмін я ужываю як аналог назве «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі») была выклікана найважнейшай палітычнай падзеяй ў гісторыі Беларусі ХХ ст.: абвяшчэннем незалежнасці Беларусі. Пасля 5-гадовага чытання лекцый і правядзення семінараў актуальнасць публікацыі вучэбнай кнігі ўзрасла, хаця тэрмін “актуальнасць” не падабаецца ў сувязі з яго двухсэнсоўнасцю. Але несумненна, што запыт (адукацыйны, навуковы, грамадска-палітычны) на публікацыю сістэматызаванага курса быў дастаткова вялікі. Як вядома, кафедра міжнародных адносін ствaралася для падрыхтоўкі дыпламатаў для Міністэрства замежных спраў новай незалежнай дзяржавы. А беларускі дыпламат, як і ўвогуле дыпламаваны спецыяліст у галіне міжнародных адносін, павінен быў ведаць гісторыю знешнепалітычнай дзейнасці і дыпламатыі беларускіх дзяржаў. Таму гэта дысцыпліна станавілася адной з асноўных вучэбных прадметаў нашай кафедры. На яе выкладанне адводзіўся цэлы навучальны год (70 гадзін лекцыйных заняткаў) з залікам і экзаменам.

Галоўныя цяжкасці падрыхтоўкі лекцый і выкладання матэрыялу былі звязаны з першымі тэмамі курсу, прысвечанымі перыяду сярэднявякоўя: старажытнабеларускім княствам і Вялікаму княству Літоўскаму. Літаратуры, асабліва беларускай, па знешнепалітычнай дзейнасці гэтых першых дзвюх гістарычных форм беларускай дзяржаўнасці фактычна не было. Каб у гэтым пераканацца, дастаткова паглядзець праграму курса «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» і планы семінарскіх заняткаў, упершыню выдадзеных

мной у БДУ ў 1996 г. З публікацый, найбольш блізкіх да тэматыкі міжнародных адносін, у іх згадваліся працы беларускіх даследчыкаў М. Доўнар-Запольскага, М.Ермаловіча, У.Насевіча, У.Пічэты, Я.Юхо, расійскіх гісторыкаў Л.Аляксеева, І.Грэкава, В.Пашуты і некаторых іншых.

Мне як даследчыку міжнародных адносін і знешнепалітычнай гісторыі Беларусі пасляваеннага часу (ХХ ст.) давялося ісці ўглыб вякоў, да пачаткаў беларускай дзяржаўнасці, аваладваць новымі, невядомымі ці малавядомымі дагэтуль пластамі гістарычнага матэрыялу, спасцігаць спецыфічную тэрміналогію і метадалогію даследавання сярэдневяковага перыяду. Але гэта былі не толькі асабістыя цяжкасці. Сотні беларускіх гісторыкаў і прадстаўнікоў іншых гуманітарных навук, натхнёныя запісам ў Канстытуцыі аб глыбокіх гістарычных традыцыях беларускай дзяржаўнасці, і вымушаныя так ці інакш прыстасоўвацца да новых патрабаванняў часу можна сказаць рынуліся ў сівую даўніну, каб даведацца пра пачаткі нашай гісторыі і яе наступныя этапы.

Праз 5-6 гадоў пасля пачатку выкладання прадмету заканамерна паўстала пытанне аб выданні падручніка (вучэбнага дапаможніка). Трэба было даць студэнтам, выкладчыкам, дыпламатам, спецыялістам у галіне міжнародных адносін, шырокаму колу чытачоў, хто цікавіўся гісторыяй знешняй палітыкі і дыпламатыі Беларусі, сістэматызаваны навуковы агляд знешнепалітычнай гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Да таго ж у канцу 1990-х гг. значна пашырылася кола крыніц і літаратуры па нашаму прадмету. Пачала выдавацца "Энцыклапедыя гісторыі Беларусі", выйшлі з друку "Нарысы гісторыі Беларусі", якія выконвалі ролю першага ўніверсітэцкага падручніка па айчыннай гісторыі, прайшлі абарону першыя кандыдацкія дысертацыі, з'явіліся першыя манаграфічныя даследаванні па знешняй палітыцы ВКЛ і БССР. Штуршком для напісання дапаможніка, і даволі моцным для мяне, сталі замежныя стажыроўкі ў Вялікабрытаніі і ЗША. Трохмесячнае знаходжанне спачатку ў Хале (Хумберсайдскі ўніверсітэт, 1996 г.), потым у Нью-Ёрку (Калумбійскі ўніверсітэт, 1998 г.) у рамках праграм акадэмічных абменаў значна ўзбагаціла мае веды і вопыт даследчыцкай і выкладчыцкай працы, а галоўнае, прыдалі ўпэўненасці ў тым, што такая сур’ёзная задача мне па сілах. Знаёмства з англамоўнай літаратурай, гістарычнымі даследаваннямі беларускай эміграцыі яшчэ раз пераканала ў тым, што за мяжой, як і на Радзіме, няма сінтэзаваных, абагульняючых работ па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі ці нават па асобных яе перыядах.

Пры напісанні кнігі давялося вырашыць шэраг навукова-метадалагічных і вучэбна-метадычных задач. Быў вызначаны аб’ект і прадмет вучэбнага курсу «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» як навуковай дысцыпліны. Распрацавана перыядызацыя знешнепалітычнай гісторыі Беларусі ад пачаткаў дзяржаўнасці да канца ХХ ст., у аснову якой пакладзена перыядызацыя гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Ажыццёўлена выяўленне і раскрыццё сфер праяўлення (рэалізацыі) знешняй палітыкі і дыпламатыі

беларускіх дзяржаў і дзяржаўна-падобных утварэнняў. Новых падыходаў запатрабавала навейшая гісторыя Беларусі. Пасля распаду Расійскай імперыі беларуская дзяржаўнасць адрадзілася ў дзвюх формах: Беларускай Народнай Рэспублікі і Беларускай ССР. Наступны перыяд у гісторыі знешняй палітыкі Беларусі ахоплівае 1918-1991 гг.: ад абвяшчэння незалежнасці БНР да распаду СССР і спынення існавання БССР.

Навучальны курс храналагічна завяршаецца 1991 годам, канцом існавання СССР і БССР і абвяшчэннем незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Аднак заключнай главой кнігі з'яўляецца раздзел аб знешняй палітыцы Рэспублікі Беларусь, дзе даецца агульная характарыстыка асноў і напрамкаў знешнепалітычнай актыўнасці новай незалежнай дзяржавы. У праграме навучання ёсць асобны прадмет "Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь", які мае сваю вучэбную літаратуру. Гэта зроблена з мэтай паказу ўсяго гістарычнага шляху беларускай дзяржаўнасці ад пачаткаў да класічнай формы сучаснай дзяржавы, якую набывае Беларусь пасля атрымання незалежнасці ў 1991 г.

Выданне падручніка для студэнтаў па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі, няхай сабе ў сціплай форме навучальнага дапаможніка ў 2003-2004 і 2013 гг., адкрыла новыя далягляды ў знешнепалітычных даследаваннях беларускіх і замежных вучоных і акадэмічных выкладчыкаў. У ім прадстаўлена канцэпцыя знешнепалітычнай гісторыі Беларусі ад пачаткаў дзяржаўнасці да канца XX ст., якая базіруецца, наколькі да гэтага імкнуўся аўтар, на навуковых падыходах і метадалагічных парадыгмах, уласцівых для беларускай нацыянальнай школы даследчыкаў міжнародных адносін.

Важным этапам ў фарміраванні навукова-метадычнай базы для сістэмна навучання гісторыі міжнародных адносін з'явілася публікацыя ў 2004-2018 гг. супрацоўнікамі кафедры навучальнага дапаможніка «История международных отношений» у 4 томах, прытым 4 том выйшаў у чатырох частках, дзе прадстаўлены дакументы і матэрыялы па ўсіх перыядах прааналізаванай у папярэдніх тамах гісторыі міжнародных адносін з канца XVIII да канца XX ст. А.А.Чалядзінскі апублікаваў першы ў краіне курс лекцый па тэорыі міжнародных адносін (2004 г.). А. В. Шарапа выдаў навучальны дапаможнік з грыфам Міністэрства адукацыі аб палітычных сістэмах Германіі, Аўстрыі і Швейцарыі (2007 г.).

Новым і прыярэтэтным напрамкам дзейнасці кафедры міжнародных адносін стала праца над падрыхтоўкай і выданнем гісторыка-дакументальных зборнікаў дыпламатычных дакументаў. У выніку створана ўнікальная серыя з трох зборнікаў дакументаў і матэрыялаў па знешнепалітычнай гісторыі Беларусі ў 1914-2010 гг. у 9 т. (10 кн.), выдадзеная ў 1997-2014 гг. Выданнем названай серыі супрацоўнікі кафедры міжнародных адносін замацавалі прыярытэт беларускай школы міжнародных даследаванняў у вывучэнне гісторыі знешняй палітыкі і дыпламатыі Беларусі і міжнародных адносін ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне ў XX і пачатку XXI ст.

Заўважальнымі падзеямі на гэтым этапе гісторыі кафедры і факультэта былі: першая навуковая канферэнцыя “Беларусь у сучасным свеце” (2002 г.), першы зборніка навуковых прац студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў ФМА (2008 г.), першая канферэнцыя маладых вучоных ФМА “Міжнародныя адносіны: гісторыя, тэорыя, практыка (2010 г.), першы выпуск “Трудов Факультета международных отношений” (2010 г.). На новы ўзровень выйшлі міжнародныя сувязі кафедры і факультэта. Працягваў сваю працу беларуска-расійскі круглы стол па праблемах адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй, які паспяхова фінішыраваў ў 2008 г. 10-й сустрэчай у Мінску. У 2003 г. пачаліся сустрэчы беларускіх і польскіх вучоных па праблемах адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Польскай Рэспублікай, якія, змяніўшы фармат, працягваліся да 2018 г. У гэтых навуковых публікацыях і міжнародных канферэнцыях прымаў удзел і аўтар гэтых радкоў.

Важнай падзеяй у гісторыі кафедры і факультэта з’явілася змена дэкана. У верасні 2008 г. новым дэканам ФМА стаў прафесар В.Шадурскі, змяніўшы А.Шарапу, які працягваў заставацца загадчыкам кафедры. Паміж абодвума кіраўнікамі ўсталяваліся канструктыўныя адносіны, што былі на карысць кафедры і факультэта. У гэтым дзесяцігоддзі выявілася і пэўная вычэрпанасць працы кафедры і факультэта па падрыхтоўцы і атэстацыі кадраў вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці 07.00.15 “Гісторыя міжнародных адносін і знешняй паліыкі”. Спыніў сваю дзейнасць спецсавет па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый пад старшынствам А.В.Шарапы, ядром якога былі прафесары кафедры. Наша спецыяльнасць была ўключана ў пералік спецыяльнасцей спецсавета на базе гістарычнага факультэта БДУ. Выпускнікі нашай кафедры і кафедры дыпламатычнай і консульскай службы маглі абараняць дысертацыі і па палітычных навуках. Але па агульным прызнанні, спыненне працы нашага спецсавета адбілася не ў лепшы бок пры падрыхтоўцы кандыдатаў і дактароў навук па міжнародных адносінах, інстытуцыянальным ядром якой ‘яўляецца кафедра міжнародных адносін БДУ.

***Трэцяе дзесяцігоддзе гісторыі кафедры ахоплівае 2012-2022 гг.*** Яно сімвалічна завяршылася рэспубліканскім навуковым семінарам “Даследаванне міжнародных адносін у Рэспубліцы Беларусь” (кастрычнік 2022 г.), на якім супрацоўнікі кафедры ва ўрачыстай і адначасова рабочай абстаноўцы адзначылі 30-годдзе існавання кафедры. Па выніках семінара выдадзены электронны зборнік матэрыялаў канферэнцыі.

Мінулае дзесіцігоддзе было багатае на розныя падзеі, інстытуцыянальныя і кадравыя змены ў жыцці кафедры і факультэта. У 2015 і 2020 гг. ФМА адзначыў свае 20-ці і 25-гадовыя даты. У 2017 г. кафедра міжнародных адносін упершыню ўрачыста адзначыла 25-годдзе, прысвяціўшы гэтаму Рэспубліканскую навукова-практычную канферэнцыю. У гэтае дзесяцігоддзе супрацоўнікі кафедры абаранілі тры доктарскія дысертацыі (У.В.Фральцоў, А.В.Русаковіч, С.Ф.Свілас). Яе склад папоўніўся

двума дактарамі навук (А.М.Байчораў і М.Э.Часноўскі). У студзені 2021 г. кафедра дасягнула найлепшага якаснага складу, маючы 10 дактароў навук.

На жаль, пазней наша кафедра панесла страты, у тым ліку незваротныя. У 2017 г. працу на кафедры спыніў адзін з яе заснавальнікаў, прафесар А.А.Чалядзінскі, перайшоўшы на іншае месца працы. У 2017-2023 гг. ён працаваў загадчыкам кафедры палітaлогіі і эканомікі Інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва, а з мая 2023 г. працуе галоўным навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі НАНБ. У сакавіку 2021 г. пасаду дэкана і прафесара кафедры пакінуў В.Шадурскі. У кастрычніку пайшоў з жыцця ў выніку каранавіруса прафесар Э.М.Часноўскі, які ў 2015-2021 гг. працаваў загадчыкам кафедры. У сакавіку 2021 г. новым дэканам ФМА прызначана дацэнт, кандыдат палітычных навук А.А.Дастанка, якая дэгэтуль працавала начальнікам Галоўнага упраўлення адукацыйнай дейнасці БДУ. У верасні кафедру ўзначаліла прафесар, доктар палітычных навук Ю.І.Малевіч.

У 2021-2022 гг. у межах аптымізацыі структуры ФМА у склад кафедры ўлілася кафедра дыпламатычнай і консульскай службы. На факультэте былі створаны дзве новыя кафедры даследчыцкага профіля: еўразійскіх даследаванняў і комплекснага вывучэння КНР, у склад якіх увайшлі некаторыя супрацоўнікі кафедры міжнародных адносін і былой кафедры дыпламатычнай і консульскай службы. Адбыліся змены ў складзе Вучонага савета ФМА. Значныя перамены закранулі сферу вучэбна-выхаваўчай, навукова-даследчай і ідэалагічнай работы, а таксама кадравай палітыкі. Усе гэтыя мерапрыемствы праводзіліся ў кантэксце дзяржаўнай адукацыйнай палітыкі, якая дыктавалася палітычнымі абставінамі і абвастрэннем міжнароднай абстаноўкі.

Гэтае дзесяцігоддзе лічу самым паспяховым у сваёй навуковай і выкладчыцкай працы. Надыйшоў час збіраць плён з папярэдніх гадоў і дзесяцігоддзяў дзейнасці ў Акадэміі навукі і БДУ, замежнага супрацоўніцтва і выдавецкай працы. Пачатак гэтай дэкады быў даволі цяжкім, звязаным з траўмамі на валейбольнай пляцоўцы і аперацыямі на ахілавым сухажыллі на абедзвюх нагах. Давялося спыніць рэгулярныя заняткі валейболам, што разам з траўмамі паўплывала на агульны стан фізічнага і псіхічнага здароўя. Спатрэбіўся пэўны час, каб прызвычаіцца да новых умоў фізічнай актыўнасці без заняткаў два разы на тыдзень у спартыўнай залі. Кампенсацыяй сталі сустрэчы ветэранаў валейбольнай секцыі ў сяброўскай атмасферы.

У 2012-2015 гг. наш часовы творчы калектыў (ЧНК) на чале з А.В.Шарапам завяршыў вялікі даследчы праект па выданні зборнікаў дакументаў па знешнепалітычнай гісторыі Беларусі XX і пачатку XXI ст. Мы закончылі тры выдавецкія серыі: “Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.)”, “Государственные границы Беларуси (1917-2010 гг.)” і “Знешняя палітыка Беларусі (1917-2010 гг.)”. Я быў намеснікам кіраўніка ЧНК, членам рэдкалегій і адказным рэдактарам зборнікаў

дакументаў. Для працы “Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў” сабраў значную частку матэрыялаў з архіваў Вялікабрытаніі, Польшчы і Расіі, публікацый дакументаў знешняй палітыкі суседніх і заходніх дзяржаў.

Творчым дасягненнем лічу публікацыю навучальнага дапаможніка “История внешней политики Беларуси”, які выйшаў у серыі БДУ “Класічнае ўніверсітэцкае выданне” ў 2013 г. Была задумка выдання дапаможніка пад грыфам Міністэрства адукацыі, аднак пасля строгай экспертызы ў Цэнтры вучэбнай кнігі РІВШ ад гэтага плана давялося адмовіцца. Спецыялістаў па знешнепалітычнай гісторыі Беларусі не знайшлося, а рэцэнзіі з боку выкладчыкаў грамадзянскай гісторыі Беларусі (прафесара Беларускага тэхналагічнага ўніверсітэта і дэцэнта Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта) змяшчалі сур’ёзныя заўвагі, з якімі не мог пагадзіцца. Пасля дапрацоўкі рукапісу і па рэкамендацыі Цэнтры вучэбнай кнігі вырашыў вярнуцца да пенатаў роднага БДУ, які выдаў працу пад грыфам Вучэбна-метадачнага аб’яднання па гуманітарнай адукацыі па шэрагу спецыяльнасцей міжнароднага профілю. Праца атрымала разгорнутую станоўчую рэцэнзію польскага гісторыка ў “Беларускім гістарычным аглядзе”, была добра ўспрынятая на Украіне паводле водгукаў мясцовых вучоных і публікацыі раздзела з кнігі пра знешнюю палітыку Рэспублікі Беларусь у зборніку Інстытута гісторыі Украіны НАН Украіны. “История внешней политики Беларуси” мае самы высокі індэкс цытавання сярод маіх прац у Гугл Схолар, апярэджваючы беларускамоўнае выданне.

Удзельнічаў ў рэалізацыі двух навуковых праектаў Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў: як намеснік кіраўніка праекта “Літоўска-беларускія адносіны ў гістарычнай палітыцы Литоўскай Рэспублікі і Рэспублікі Беларусь” і кіраўнік праекта “Белорусская ССР учредитель ООН: документы и материалы (1943-1945 гг.)”. З’яўляўся кіраўніком навукова-даследчай працы “Знешнепалітычная дзейнасць Беларускай ССР (1919-1991 гг.): новыя даследчыя падыходы і рашэнні” Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2016-2020 гг. і навукова-даследчай працы “Беларуская ССР у ААН: савецкая дыпламатыя, беларускі стыль (1946-1991 гг.)” Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2021-2025 гг. Вынікам сталі дзве манаграфіі аб першапачатковым членстве саюзных рэспублік у ААН і дзейнасці БССР у ААН, чатыры дапаможнікі і шэраг навуковых артыкулаў у беларускіх і замежных выданнях.

У гэтае дзесяцігоддзе адным з прыярытатаў навуковых даследаванняў і выдавецкай працы лічыў публікацыю абагульняючых прац па гісторыі беларуска-польскіх адносін і сувязей у XX і пачатку XXI ст. Гэта адлюстравалася ў выданні дзвюх манаграфій у Мінску і зборніка дакументаў “Węzeł polsko-białoruski 1918–1921: Dokumenty i materiały” (Польска-беларускі вузел 1918–1921: дакументы і матэрыялы) у Варшаве.

У манаграфіях паказаны вузлавыя праблемы і неўралагічныя кропкі адносін паміж дзвюма народамі і дзяржавамі, дадзены гістарыяграфія,

перыядызацыя, храналогія важнейшых падзей у гісторыі беларуска-польскіх адносін за сто год. Дакументальны зборнік, галоўную ролю ў падрыхтоўцы і выданні якога адыграў В.Матэрскі, стаў першым вопытам сумеснага выдання польскім і беларускім вучоным дакументаў па навейшай гісторыі Польшчы і Беларусі. Мая ініцыятыва па сустрэчы стагоддзя беларускай (БНР) і польскай дзяржаўнасці была падтрымана Інстытутам палітычных даследаванняў ПАН, што вылілася ў выданне капітальнай працы і ўвядзенне ў навуковы абарот паняцця “польска-беларускі вузел”.

Польскую тэматыку працягваў даследаваць як удзельнік праграмы ЕС “Эразмус плюс” (сакавік 2019 г.), у межах якой у Вышэйшай школе эканомікі ў Варшаве прачытаў лекцыі па знешняй палітыцы Рэспублікі Беларусь і беларуска-польскіх адносінах, знайшоў цікавыя дакументы ў архіве Вышэйшай школы эканомікі аб адносінах Польшчы да РСФСР, БССР, СССР у пачатку 1920-х гг.

У 2018-2019 гг. некалькі разоў наведваў Лондан па двух даследчых грантах праекта Еўрапейскага саюза “МОСТ”. Правёў даследаванні ў Нацыянальным архіве Вялікабрытаніі, Беларускай бібліятэцы і музеі імя Ф.Скарыны, Бібліятэцы Лонданскай школы эканомікі і паліітычных навук, Бібліятэцы Інстытута славянскіх і ўсходнееарапейскіх даследаванняў Лонданскага гарадскога ўніверсітэта аб англа-беларускіх адносінах і дзейнасці беларускай эміграцыі ў Вялікабрытаніі ў ХХ ст. Рэалізацыя грантаў ЕС была дапоўнена трыма камандзіроўкамі ў Лондан со сродкаў Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь і за ўласны кошт.

Пэўным падсумаваннем даследаванняў і выкладання новай навуковай і вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі” з’явілася публікацыя дапаможніка “Традыцыі і навацыі ў знешнепалітычных даследаваннях Беларусі” (2020). Па форме і зместу кніга ўяўляе сабой не толькі вучэбны дапаможнік, але і манаграфічнае даследаванне, гістарыяграфічны агляд і бібліяграфічны даведнік пра фармаванне знешнепалітычнай гісторыі Беларусі як новага кірунка гістарычных даследаванняў, яго ўкараненне ў навучальны працэс беларускай вышэйшай школы.

Яшчэ адным вынікам выкладчыцкай і даследчай працы стаў дапаможнік «Анализ внешней политики Республики Беларусь», падрыхтаваны для магістрантаў (2021). Выданне працы – гэта водгук на 30-годдзе незалежнасці Беларусі і яе знешняй палітыкі і дыпламатыі. У кнізе прааналізаваны дзяржаўна-прававыя і навукова-канцэптуальныя асновы знешняй палітыкі краіны, ахарактарызаваны важнейшыя дзяржаўна-прававыя акты ў сферы нацыянальнай бяспекі, знешняй і ваеннай палітыкі (Канстытуцыя, Канцэпцыі націянальная бяспекі, Ваенныя дактрыны, Закон аб асновных кірунках унутраннай і знешняй палітыкі, асноватворныя дакументы аб знешнепалітычным і ваенным супрацоўніцтве паміж Беларуссю і Расіяй). Дадзена перыядызацыя знешнепалітычнай дзейнасці, паказаны асаблівасці двухбаковай і шматбаковай дыпламатыі краіны.

У новае, чацвёртае дзесяцігоддзе свайго існавання калектыў кафедры ўступіў у пераломны час, дэманструючы разуменне сваёй высокай місіі, адказнасці за важны ўчастак адукацыйнай, навуковай і выхаваўчай дзейнасці ў межах БДУ і ўсёй краіны.

За больш чым 30-гадовы час працы на кафедры аўтарам назапашаны багаты вопыт выкладчыцкай і даследчай працы, навукова-арганізацыйнай дзейнасці і міжнароднага супрацоўніцтва. Ён уключае ў сябе лекцыі і семінарскія заняткі са студэнтамі і магістрантамі, навуковае кіраўніцтва курсавымі і дыпломнымі работамі, падрыхтоўку кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Замежныя навуковыя сувязі развіваліся праз удзел у міжнародных і нацыянальных адукацыйных і навуковых праектах, лекцыі і практычныя заняткі са студэнтамі замежных універсітэтаў, выступленні з дакладамі і паведамленнямі на міжнародных і нацыянальных навуковых канферэнцыях, семінарах і школах.

Экспертная праца праяўлялася ў падрыхтоўцы заключэнняў, прапаноў і запісак у адрас МЗС, Міністэрства абароны і Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, выступленнях ў сродках масавай інфармацыі, школах, тэхнікумах і дзяржаўных установах Беларусі.

Даследчая актыўнасць была накіравана на выкананне інавацыйных праектаў па лініі Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях і Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў, працу ў архівах і бібліятэках Беларусі, Вялікабрытаніі, Германіі, ЗША, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны, публікацыю манаграфій, навучальных дапаможнікаў і вучэбных праграм, зборнікаў дакументаў, артыкулаў, рэцэнзій, гістарыяграфічных аглядаў.

Назапашаныя веды, кампетэнцыі, уменні і навыкі дапамагаюць як уласнаму прафісійнаму дасканаленню, так і служаць на карысць падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне міжнародных адносін, а таксама навуковых кадраў (кандыдатаў і дактароў навук) і ўніверсітэцкіх выкладчыкаў (дацэнтаў і прафесароў). Жыццё і праца ў эпоху радыкальных перамен самым непасрэдным чынам паўплывалі на маю навуковую і выкладчыцкую працу, якая сумяшчала традыцыі і навацыі ў даследаваннях і вучэбна-метадычнай працы. Да гэтага трэба дадаць фарміраванне новай дзяржаўнай ідэнтычнасці і нацыянальнай свядомасці, якія адбываліся праз пераадоленне комплекса “хомо советыкус” і правінцыйнага мыслення.

## Глава 2. БІЯГРАФІЯ І ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

*А.В.Шарапа, доктар гістарычных навук, прафесар кафедры міжнародных адносін БДУ*

### 2.1. Тры дзесяцігоддзі нашай сумеснай працы на кафедры і факультэце міжнародных адносін

З 1 верасня 1993 г. Уладзімір Еўдакімавіч Снапкоўскі працуе прафесарам кафедры міжнародных адносін БДУ. На кафедру я запрасіў яго ў першы год яе дзейнасці (1992), калі разам з прафесарамі А.А.Разанавым і А.А.Чалядзінскім і дацэнтам Л.В.Лойкам мы шукалі высокакваліфікаванага спецыяліста ў галіне знешнепалітычнай дзейнасці Беларусі. Выпуснік дактаранты Інстытута гісторыі АН БССР (НАН Беларусі), які ў чэрвені 1992 г. прадставіў да абароны сваю доктарскую дысертацыю пра знешнепалітычную дзейнасць Беларускай ССР у 1944–1953 гг., яе ніхто іншы падыходзіў да нашых запатрабаванняў і планаў. З У.Снапкоўскім быў знаёмы раней па яго працах аб адносінах паміж ГДР і ФРГ і крыху асабіста. Калі ён прапанаваў уласную кандыдатуру для працы на кафедры і паведаміў пра свае дасягненні ў навуковай і выкладчыцкай сферы, я пагадзіўся, маючы на ўвазе, што дзякуючы новаму прафесару будзе закрыты важны кірунак дзейнасці нашай кафедры. Пасля паспяховай абароны дысертацыі і яшчэ перад яе зацвярджэннем ВАК Расійскай Федэрацыі (лістапад 1993 г.) у верасні 1993 г. У.Е.Снапкоўскі быў прыняты на пасаду прафесара кафедры. З тых часоў мы разам працуем на кафедры і факультэце міжнародных адносін, створаным у 1995 г.

За гэты час прафесар У. Е. Снапкоўскі стаў вядомым і аўтарытэтным беларускім вучоным у галіне даследавання гісторыі знешняй палітыкі і дыпламатыі Беларусі ў ХХ – пачатку ХХІ ст. Ён адкрыў новы кірунак у гістарычнай навуцы і вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у галіне гісторыі і міжнародных адносін – гісторыю знешняй палітыкі Беларусі. У.Снапкоўскі – стваральнік беларускай навуковай школы даследчыкаў знешнепалітычнай гісторыі Беларусі. Аўтар больш за 400 апублікаваных навуковых і навукова-папулярных прац, у тым ліку 369 навуковых, сярод іх 8 манаграфій, 9 навучальных дапаможнікаў, 10 зборнікаў дакументаў, 342 артыкулы ў навуковых часопісах і калектыўных манаграфіях (па стане на 1 студзеня 2024 г.).

Кола яго навуковых інтарэсаў ахоплівае знешнюю палітыку і дыпламатыю беларускіх дзяржаў ХХ і пачатку ХХІ ст. (Беларускай ССР, БНР, Рэспублікі Беларусь) і ранейшых гістарычных эпох (знешняя палітыка ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Беларусь у складзе Расійскай імперыі),міжнародныя адносіны ХХ і пачатку ХХІ ст., дзейнасць ААН і іншых міжнародных арганізацый, гістарыяграфію ўсеагульнай гісторыі і міжнародных адносін у Беларусі, паліталагічныя праблемы станаўлення сучаснай беларускай эліты, фарміраванне нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў, пытанні сучаснай

міжнароднай камунікацыі). Шэраг артыкулаў надрукаваны за мяжой (Аўстрыя, Вялікабрытанія, ЗША, Германія, Літва, Польшча, Расія, Украіна). Некаторыя з іх індэксіраваны ў базе Скопус.

У. Е. Снапкоўскі распрацаваў новую вучэбную і навуковую дысцыпліну «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» і ўпершыню выдаў дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па гэтым прадмеце (2003-2004 гг.). Рускамоўная версія выдання выйшла ў 2013 г. у серыі «Класічнае ўніверсітэцкае выданне». Ім апублікаваны першы курс лекцый для студэнтаў ФМА па знешняй палітыцы Рэспублікі Беларусь (2006 г.). У Беларусі і за мяжой вядомы даследаванні У.Е.Снапкоўскага па знешнепалітычнай дзейнасці Беларускай ССР у 1944–1953 гг., асабліва яго глыбокі наватарскі аналіз праблемы членства савецкіх саюзных рэспублік у ААН і на міжнародных пасляваенных канферэнцыях. Гэтаму прысвечана яго манаграфія, выдадзеная сумесна БДУ, Інстытутам Еўропы РАН і Асацыяцыяй зненепалітычных даследаванняў імя. А.А.Грамыкі (2022 г.).

Вучоны адкрыў і такую малавядомую беларускім чытачам старонку, як дапамога АРА (Амерыканская адміністрацыя дапамогі) Беларусі ў 1919-1923 гг. і асабліва ЮНРРА (Адміністрацыі дапамогі і аднаўлення Аб’яднаных Нацый) Беларускай ССР у 1945–1947 гг., чаму прысвечаны шэраг яго артыкулаў і дакументальных публікацый. 45-гадовы этап дзейнасці БССР у ААН адлюстраваны ў абагульняючай манаграфіі пра беларускі атрад савецкай дыпламатыі (2021). Прафесар плённа распрацоўвае праблематыку сучасных беларуска-расійскіх і беларуска-польскіх адносін, аб чым сведчаць асобныя зборнікі навуковых артыкулаў і манаграфіі, выдадзеныя ў 2009, 2013 і 2018 гг.

Разам са сваім калегамі па кафедры міжнародных адносін Уладзімір Еўдакімавіч унёс вялікі ўклад у падрыхтоўку да друку і наступную публікацыю зборнікаў дакументаў і матэрыялаў па знешнепалітычнай гісторыі Беларусі ў XX – пачатку XXI ст.: «Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991)» у 4 т., «Знешняя палітыка Беларусі (1996–2010 гг.)», т. 8–10, «Государственные границы Беларуси (1917–2010)» у 2 т. У выніку архіўных пошукаў і працы з літаратурай, у тым ліку перакладчыцкай і рэдакцыйнай, апублікаваны больш за тры тысячы дакументаў і матэрыялаў з архіваў Беларусі, Вялікабрытаніі, Германіі, Літвы, Польшчы і Расіі, а таксама з гісторыка-дыпламатычных выданняў замежных дзяржаў.

Я быў кіраўніком часовых творчых калектываў па выкананні гэтых важных навуковых праектаў, а У. Е. Снапкоўскі маім намеснікам і адказным сакратаром рэдкалегій, якія ажыццяўлялі выданне зборнікаў дакументаў. Па яго ініцыятыве быў разпрацаваны інавацыйны праект «Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991)» у 4 т., выкананы пры фінансавай падтрымцы Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях у 2005-2008 гг. У 2008-2015 гг. пад грыфам БДУ, МЗС і Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь наша кафедра выдала 4-томнік дакументаў і матэрыялаў, дзе

упершыню былі сабраны сотні архіўных крыніц і апублікаваных дакументаў пра палітыку замежных дзяржаў адносіна Беларусі у перыяд паміж пачаткам Першай сусветнай вайны ў 1914 г. і абвяшчэннем незалежнасці Рэспублікі Беларусь у 1991 г.

Каб атрымаць гэты інавацыйны праект, мне давялося прыкласці шмат намаганняў і заручыцца падтрымкай міністра замежных спраў С.М.Мартынава і кіраўніцтва Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях. У конкурсным адборы праектаў, што праходзіў у Доме ўрада, у яго абарону выступалі мы разам з У.Е.Снапкоўскім, маючы на руках ліст у падрымку ад міністра С.Мартынава. Канцэпцыя зборніка, распрацаваная прафесарам, была прызнаная адпавядаючай высокім патрабаванням камісіі і наш праект быў уключаны ў пералік работ з дзяржаўнай падтрымкай. Пры выкананні праекта мой калега і падначалены ўзяў на сябе значны цяжар па арганізацыі і каардынацыі працы паміж удзельнікамі ЧНК, супрацоўнікамі нашай кафедры, іншых кафедр ФМА, Інстытута гісторыі НАНБ, БДПУ, Нацыянальнага архіва, іншых устаноў г.Мінска і Гомеля. Ім была праведзена рэдакцыйная і перакладчыцкая праца пры тлумачэнні дакументаў з англійскай, нямецкай і польскай моў на беларускую мову.

Падчас камандзіровак у Маскву і Варшаву вучоны сабраў вялікі архіўны матэрыял і дакументы знешняй палітыкі замежных дзяржаў, якія потым былі апрацаваны, перакладзены і ўключаны ў адпаведныя тамы. Кожны год наш калектыў “выдаваў на гара” электронны дыск з гатовым томам, які я як кіраўнік ВНК прадстаўляў у МЗС. У.Снапкоўскі потым даводзіў том да стадыі публікацыі, працуючы з выдавецтвам “Юніпак”. Паколькі фінансаванне праекта не распаўсюджвалася на выданне зборніка, то гэтую справу мы рабілі за кошт уласных рэзерваў і сродкаў. Таму тыраж быў мізэрным (50 экз.), аднак МЗС і вядучыя бібліятэкі Беларусі мы забяспечылі. У.Снапкоўскі падчас камандзіровак у Маскву, Варшаву, Кіев і Лондан перадаў у бібліятэкі па аднаму экзпемпляру гэтага рэдкага выдання. Наша плённае супрацоўніцтва працягнулася падчас выдання зборнікаў дакументаў па знешняй палітыцы Беларусі і дзяржаўных граніцах Беларусі. Другі том зборніка пра граніцы Беларусі мае ўнікальны электронны дадатак у выглядзе геаграфічны і топаграфічных карт, якія сабраныя вучоным з архіваў і бібліятэк Беларусі і Польшчы.

У.Снапкоўскі яшчэ да прыходу на кафедру назапасіў каштоўны вопыт супрацоўніцтва з Інстытутам Еўропы РАН, дзе працаваў вядучым навуковым супрацоўнікам па сумяшчальніцтву і рыхтаваў аналітычныя матэрыялы пра развіццё беларуска-расійскіх адносін. Гэты вопыт трансфарміраваўся ў круглыя сталы паміж беларускімі і расійскімі вучонымі, якія пачаліся ў 1998 г. у Маскве з візіту нашай дэлегацыі ў Інстытут міжнародных палітычных і эканамічных даследаванняў (ІМПЭД) РАН. Ініцыятыва такіх мерапрыемстваў нарадзілася падчас сустрэчы У.Снапкоўскага з дырэктарам Цэнтра параўнаўчых палітычных даследаванняў ІМПЭД РАН прафесарам Б.А.Шмялевым. Круглыя сталы праводзіліся штогод у нашых сталіцах і

завяршаліся прыняццем выніковых дакументаў, якія мы друкавалі на беларускай і рускай мовах і накіроўвалі ў свае Міністэрствы замежных спраў, заканадаўчыя і дырэктыўныя органы, навуковыя часопісы. У. Снапкоўскі з'яўляўся каардынатарам навуковага праекта "Беларуска-расійскія адносіны: праблемы і перспектывы" з беларускага боку, прымаў актыўны ўдзел ва ўсіх дзесяці круглых сталах, выступаючы з грунтоўнымі дакладамі. Разам з нашым вядомым спецыялістам у галіне міжнароднага права праф. Ю.П.Броўкам ён "шліфаваў" і дапрацоўваў праекты заключных дакументаў шляхам абмену факсамі з Б.Шмялевым, якія падпісваліся кіраўнікамі дэлегацый (мной і Б.Шмялевым). Выніковыя дакументы круглых сталоў разам са сваімі дакладамі і публікацыямі У.Снапкоўскі сабраў у кнізе пра беларуска-расійскія адносіны (2009).

Супрацоўніцтва з расійскім вучонымі-міжнароднікамі працягвалася і пасля спынення круглых сталоў. Мой калега ўдзельнічаў у ім праз камандзіроўкі у Маскву па навуковых праектах, стажыроўку ў Дыпламатычнай акадэміі МЗС Расійскай Федэрацыі, публікацыі ў расійскіх выданнях, падрымкай сувязей з Б.Шмялевым і яго калегамі з ІМЭПД РАН. У апошнія гады аднавіліся кантакты нашай кафедры з Інстытутам Еўропы РАН, аб чым сведчыць удзел У.Снапкоўскага і іншых супрацоўнікаў у Міжнароднай навукова-экспертнай серыі анлайн-семінараў, прысвечаных ацэнцы стану і перспектыў расійска-беларускіх адносін і Саюзнай дзяржавы. Як член пастаяннай экспертнай групы з беларускага боку ён выступаў аўтарам дакладаў, удзельнікам дыскусій і прапаноў у надрукаваны выніковы дакумент.

Супрацоўніцтва кафедры з міжнародных адносін замежнымі вучонымі ажыццяўлялася пры выкананні навуковага праекта Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў (БРФФД) "Літоўска-беларускія адносіны ў гістарычнай палітыцы Литоўскай Рэспубліке і Рэспублікі Беларусь" (2013-2015 гг.). Гэтую тэму пад маім кіраўніцтвам (намеснікам быў У.Снапкоўскі) мы выканалі разам з вучонымі Інстытута міжнародных адносін Вільнюскага ўніверсітэта. У шэрагу артыкулаў і выдадзенай на літоўскай мове калектыўнай манаграфіі даследчыкі дзвюх краін прааналізавалі асаблівасці гістарычнай палітыкі ў Беларусі і іншых дзяржавах свету, у тым ліку Літве, Расіі, Польшчы, Германіі і Украіне.

За апошнія 10 гадоў, якія прайшлі пасля майго артыкула, напісанага ад імя кафедры і факультэта да 60-годдзя У.Е.Снапкоўскага, яго дасягненняў на ніве навукі і адукацыі прыбавілася. Нешта і скарацілася, маючы на ўвазе нагрузку і членства ў навуковых саветах і камісіях. Мы разам працавалі ў спецыялізаваным савеце па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па гісторыі знешняй палітыкі і міжнародных адносін, дзе я быў старшынёй, а ён адзін час вучоным сакратаром. За гады працы савета (1998-2012) падрыхтаваны і зацверджаны больш за 30 дысертацый. Прафесар падрыхтаваў пецярых кандыдатаў і двух доктароў гістарычных навук, якія складаюць ядро яго навуковай школы.

Хацеў бы адзначыць уклад майго калегі ў падрыхтоўку калектыўнай манаграфіі “Даследаванне міжнародных адносін і развіццё замежных сувязей у Беларускім дзяржаўным універсітэце: 1921-2021 гг.”, выдадзенай да 100-годдзя БДУ. Ён зрабіў значны кавалак працы як адказны рэдактар, член рэдкалегіі, аўтар уводзін, двух параграфаў аб развіцці даследаванняў у галіне знешнепалітычнай гісторыі Беларусі ў даследчыцкай і выкладчыцкай працы вучоных БДУ за стогадовы перыяд існавання ўніверсітэта. Арганізацыйнае і фінансавае забеспячэнне выдання кнігі з дапамогай РІВШ давялося выконваць мне як старшыні рэдкалегіі, як і таксама напісанне тэкстаў пра нашу кафедру і міжнародную дзейнасць БДУ ў 1945-1991 гг.

У апошнія гады мы аб’ядналі сілы ў напісанні ўспамінаў пра кафедру і факультэт. Як “бацькам-стваральнікам” нам ёсць што ўспомніць пра гісторыю стварэння і дзейнасці вядучага цэнтра ў падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне міжнародных адносін і развіцця навуковых даследаванняў у знешнепалітычнай сферы. Мой калега дапаўняе і пашырае мае, не пабаюся сказаць, унікальныя веды пра гістарычныя этапы ўжо больш чым 30-гадовай дзейнасці кафедры і больш чым 25-гадовай дзейнасці факультэта міжнародных адносін. У гэтым нам дапамагаюць прафесары В.А.Астрога і С.Ф.Свілас, малодшыя калегі, дацэнты А.В.Гурын і А.В.Дземідовіч. Усе яны належаць да навуковай школы У.Е.Снапкоўскага, які пачаў распрацоўваць гістарыяграфію ўсеагульнай гісторыі і гісторыі міжнародных адносін з 1984 г., калі надрукаваў артыкул у саюзным часопісе “Новая и новейшая история”. Пад яго кіраўніцтвам выпускнік кафедры А.В.Гурын абараніў кандыдацкую дысертацыю пра развіццё міжнародных даследаванняў ў Беларусі і зараз выконвае доктарскую дысертацыю пры навуковым кансультаванні прафесара.

Прафесар У. Е. Снапкоўскі ўдзельнічаў у міжнародных навуковых канферэнцыях у Вялікабрытаніі, Германіі, Латвіі, Літве, Польшчы, Расіі, ЗША, Украіне. Прайшоў навуковыя стажыроўкі ў Хумберсайдскім універсітэце (г. Хал, Вялікабрытанія), Інстытуце Гарымана Калумбійскага ўніверсітэта (Нью-Ёрк, ЗША), Грынвічскім універсітэце (Лондан), Украінскім інстытуце міжнародных адносін, Дыпламатычнай акадэміі МЗС РФ. Удзельнік праграмы ЕС “Эразмус плюс”, прымаючая ўстанова - Вышэйшая школа эканомікі ў Варшаве. Атрымальнік даследчых грантаў праекта Еўрапейскага саюза “МОСТ”, у рамках якіх правёў даследаванні ў Нацыянальным архіве Вялікабрытаніі, Беларускай бібліятэцы і музеі імя Францыска Скарыны і шэрагу бібліятэк Лондана па гісторыі англа-беларускіх адносін у першай палове ХХ ст. Працаваў запрошаным прафесарам польскіх вышэйшых навучальных устаноў. Член рэдкалегій 4-х навуковых перыядычных выданняў у Расіі, Польшчы і Украіне.

Першы з супрацоўнікаў ФМА прафесар атрымаў прэмію імя першага рэктара У. І. Пічэты за падрыхтоўку цыкла вучэбных і навуковых работ па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі. Як ветэран кафедры і факультэта ён носьбіт ганаровага звання “Заслужаны работнік БДУ”. У 2014 г.

У.Е.Снапкоўскі вельмі дастойна прадставіў БДУ на выбарах у члены-карэспандэнты НАН Беларусі па спецыяльнасці "Гісторыя Беларусі". Удзел у выбарах і вынікі галасавання прадэманстравалі дасягненні прадстаўніка кафедры, факультэта міжнародных адносін і ўсяго ўніверсітэта, які стаў стваральнікам навуковай школы знешнепалітычнай гісторыі Беларусі.

Мы разам прайшлі шлях ад стварэння кафедры да сённяшніх дзён, калі яна ўступіла ў новы этап сваёй гісторыі. Некаторыя значныя вехі на гэтым сумесным шляху апісаны ў гэтым артыкуле. Хачу пажадаць майму калегу і даўняму таварышу па працы, 70-гадоваму юбіляру, ад уласнага імя і імя кафедры і факультэта міжнародных адносін БДУ здароўя, дабрабыту, новых творчых здзяйсненняў у навукова-педагагічнай дзейнасці.

*Р.Р. Лазько, доктар гістарычных навук,*
*прафесар-эмірытус Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта*

## 2.2. На пярэднім краі беларускай гістарычнай навукі

Пісаць аб сучасніку няпроста, таму што "большое видится на расстояньи", як напісаў паэт. І асабліва няпроста, калі з героем нарыса яго аўтар, як у нашым выпадку, звязаны сяброўскімі адносінамі. Як аддзяліць вобраз Валодзі Снапкоўскага, якога ведаеш зблізку, ад вобраза выдатнага беларускага гісторыка, прафесара, вядомага з шэрагу яго прац па гісторыі міжнародных адносін, з яго глыбокіх дакладаў на навуковых канферэнцыях? Выйсце мне бачыцца ў спробе сінтэзу двух пазіцый – погляду з блізку, які дазваляе заўважыць рысы характару асобы, і погляду з пэўнага аддалення, які фарміруецца пры вывучэнні прац любога гісторыка, што раскрываюць індывідуальнасць яго светапогляду і творчага метаду, якія вызначылі арыгінальнасць і значнасць яго ўкладу ў навуку.

Уладзімір Снапкоўскі нарадзіўся ў маі 1954 г., як тады прынята было гаварыць, у "простай", але ў гарадской сям'і, у абласным цэнтры Віцебску. Там жа ён скончыў школу. Гэтыя факты дазваляюць зразумець, што сям'я Валодзі Снапкоўскага ў поўнай меры адчувала на сабе ўплывы мадэрнізацыі ў яе сацыялістычным варыянце. Гэтыя ўплывы ўносілі адначасова плюсы і мінусы ў працэс фарміравання будучага беларускага гісторыка. Плюсы заключаліся ў тым, што бацька меў сталы заробак, хоць наўрад ці гэты заробак быў адпаведны патрэбнасцям сям'і, у якой раслі пяцёра дзяцей. Дзеці раслі ў гарадскім асяроддзі і вучыліся ў гарадскіх школах, якія ў 1960-я гады давалі ўсё ж такі лепшую адукацыю, чым сельскія. Дзяцінства на гарадскім бруку стварала для маладога хлопца, стаўшага студэнтам сталічнага ўніверсітэта, магчымасць, якой былі пазбаўлены выхадцы з вёскі, не губляць час на адаптацыю да гарадскога жыцця і пазбегнуць звязаных з ёю спакус. А мінус гарадскога паходжання з пункту гледжання прафесійнага фарміравання маладога гісторыка заключаўся ў слабай прысутнасці ў яго мікрасоцыуме беларускай культуры, якая ў тыя гады ўсё яшчэ заставалася сельскай, традыцыйнай.

Гэта акалічнасць была істотным фактарам яго прафесійнага развіцця ў 1970 – 1980-я гады. Уладзімір Снапкоўскі, аднак, паспяхова пераадолеў негатыўны ўплыў гэтага фактару, што магу сцвярджаць як сведка. Не цяжка заўважыць, што ўсе свае працы таго часу ён напісаў на рускай мове і наўрад ці ў якіх-небудзь адносінах выдзяляў сябе з усёй масы савецкіх гісторыкаў. Але вось успамінаецца адна з першых польска-беларускіх канферэнцый, якая праходзіла ў 1993 г. ў Мінску на базе Інстытута гісторыі НАН Беларусі, дзе малады доктар навук Снапкоўскі з вялікім запалам і на добрай беларуская мове зрабіў даклад аб беларускай эміграцыі. Такім чынам, ўжо тады ён быў гатовы прыняць на сябе і прыняў «сацыяльны» - ды не, возьмем вышэй - *гістарычны заказ* на выступленні ў ролі адказнага прадстаўніка беларускай гістарычнай навукі на яе пераломным этапе, калі яна разрывала сувязі са сваім працяглым прыслужніцтвам і адраджалася менавіта як навука. А ў гэтай адноўленай ролі яна магла існаваць толькі як беларуская навука, што Уладзімір Снапкоўскі зразумеў своечасова.

Наогул можна заўважыць, што Уладзімір Снапкоўскі ў прафесійных адносінах развіваўся даволі хутка і паспяхова: у 1976 годзе скончыў гістарычны факультэт БДУ, у 1979 – аспірантуру Інстытута гісторыі АН БССР, праз некалькі месяцаў абараніў кандыдацкую дысертацыю. А да абароны ім доктарскай дысертацыі прайшло ўсяго толькі 12 год, і гэта пры тым, што на гэтыя гады прыйшліся важныя ступені яго кар’ернага росту, праца на пасадзе вучонага сакратара Аддзялення грамадскіх навук АН БССР. У гэтай дынаміцы адлюстроўваюцца працавітасць, адказнасць, арганізаванасць тады яшчэ маладога даследчыка, яго адданасць служэнню абранай галіне навукі. Як тут не звязаць гэтыя якасці са спадчынай, атрыманай ад сям’і, з уплывам бацькі – удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, прафесійнага пажарніка, служба якога выхоўвала тыя якасці, якія пераймалі і сыны, і сталі важкім складнікам яго прафесійных поспехаў.

Мне давялося ўдзельнічаць у юбілейных навуковых чытаннях, арганізаваных факультэтам міжнародных адносін БДУ у маі 2014 г. у сувязі з 60-годдзем прафесара У.Е.Снапкоўскага. Праслухаўшы даклад юбіляра, магу сцвярджаць, што вучоны ўсведамляе сваё нешэраговае месца ў беларускай гістарыяграфіі міжнародных адносін. Але ўсе ж такі прагучаўшая ў дакладзе аўтахарактарыстыка была далёка не поўнай, а месцамі і павярхоўнай, што можна патлумачыць толькі цяжкасцю гэтага жанру для юбіляра. Разам з тым, яго спроба падсумаваць свае дасягненні і даць перыядызацыю шматгадовай навукова-педагагічнай дзейнасці ў кантэксце гістарычнай эпохі ўяўляецца мне дастаткова ўдалай -- змястоўнай і арыгінальнай. Тое ж адзначалі іншыя ўдзельнікі навуковых чытанняў, прадстаўнікі таго самага пераходнага часу, у якім фарміравўся і прафесар Снапкоўскі.

Хачу падкрэсліць, як успрымалася навуковая творчасць У.Е.Снапкоўскага на перыферыі, у рэгіянальных універсітэтах, з таго часу, як вучоны ўступіў у стадыю сваёй навуковай сталасці, і ўспрымаецца да

сённяшніх дзён. Росквіт навуковай творчасці маладога прафесара напэўна не выпадкова супаў са станаўленнем нашай сучаснай дзяржавы – Рэспублікі Беларусь. Гэты працэс патрабаваў навуковага забеспячэння, менавіта *патрабаваў,* бо не ўсе слаі беларускага грамадства былі гатовыя ўзяць на сябе адказнасць за лёс сваёй маладой дзяржавы, а ў яе геапалітычным асяроддзі знаходзіліся і яе нядобразычліўцы. У гэтай сітуацыі важна было паказаць, што беларускі народ мае свой вялікі дзяржаватворчы патэнцыял, які ў мінулым быў неаднаразова ім рэалізаваны. І тут у навуковай і навукова-папулярнай перыёдыцы пачалі з’яўляцца адзін за другім артыкулы У.Е. Снапкоўскага па гісторыі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага і знешнепалітычнай дзейнасці Беларускай Народнай Рэспублікі. Разам з нешматлікімі працамі іншых аўтараў па гэтай праблематыцы яны стваралі гістарычны грунт пад нагамі ў неабыякавых да лёсу Айчыны грамадзян нашай дзяржавы, дапамагаючы ім на вопыце продкаў упэўніцца ў пасільнасці для іх гістарычных задач, звязаных з будаўніцтвам новай беларускай дзяржавы. Разам з тым, гэтыя артыкулы папярэджвалі і аб дапушчаных у мінулым памылках, указвалі на гістарычныя ўрокі, якія неабходна засвоіць.

Але сапраўдным рубяжом на творчым шляху У.Е.Снапкоўскага было выданне ў 1994 г. манаграфіі, прысвечанай шляху Беларусі ў Арганізацыю Аб’яднаных Нацый (ААН). З’яўляючыся невялікай па аб’ёму (каля 140 старонак), гэта кніга ўяўляе сабой вынік грунтоўнага аналізу вялікага комплексу крыніц савецкага і заходняга паходжання па праблеме, значнасць якой для гістарычнага лёсу Беларусі ў поўным маштабе стала ўсведамляцца толькі тады, у першыя гады існавання суверэннай Рэспублікі Беларусь. Да таго часу панавала схема, адпаведна якой уступленне БССР і УССР у ААН з’яўлялася як бы аўтаматычным вынікам прызнання заходнімі дзяржавамі нашага ўкладу ў перамогу над фашызмам. А прафесар Снапкоўскі ў сваёй працы паказаў, што гэты акт быў вынікам складанай і ўпартай барацьбы вялікіх дзяржаў за ўплывы ў пасляваенным свеце, у ходзе якой сталінскае кіраўніцтва СССР імкнулася забяспечыць сабе выгадныя пазіцыі, мабілізуючы галасы саюзных рэспублік у міжнароднай арганізацыі па справах бяспекі, якой стала ААН.

Такім чынам, крамлёўскае кіраўніцтва, ініцыятар працэса ўступлення БССР у ААН, выкарыстала выдатны ўклад нашай рэспублікі ў перамогу над фашызмам у інтарэсах сваёй вялікадзяржаўнай палітыкі. Але тут у чарговы раз выявілася іронія гісторыі, якая заключалася ў тым, што задумка, звязаная з гэтым міжнародна-палітычным праектам, поўнасцю не супадала з яго вынікам. Выхад БССР на шырокую міжнародную арэну, як паказаў даследчык, адпавядаў інтарэсам беларускага народа, бо спрыяў азнаямленню з ім іншых народаў і краін свету, наладжванню прамых эканамічных і культурных сувязей, хоць і падкантрольных Маскве. У гэтым была адна з важных прычын хуткага і амаль безпраблемнага міжнароднага прызнання Рэспублікі Беларусь як суверэннай дзяржавы пасля распаду СССР.

Вяртаннем аўтара праз даволі працяглы час (у 2022 г.) да вельмі цікавай і маларaспрацаванай у навуковай літаратуры тэмы ўзаемаадносін паміж саюзнымі рэспублікамі і савецкім Цэнтрам стала выданне манаграфіі аб барацьбе СССР за перашапачатковае членства Украінскай ССР і Беларускай ССР у ААН у 1943-1945 гг[1]. У параўнанні з працай 1994 г. вучоны значна пашырыў праблемна-храналагічнае поле даследавання, ўвёўшы параграфы пра пастаноўку сталінскім кіраўніцтвам пытання аб членстве заходніх рэспублік у Камісіі Аб'яднаных Нацый па ваенных злачынствах, рэакцыі ЗША і Вялікабрытаніі на канстытуцыйную рэформу ў СССР 1944 г. Моцным крыніцазнаўчым падложжам стала публікацыя больш чым ста дакументаў і матэрыялаў па праблематыцы множнага прадстаўніцтва савецкіх рэспублік на міжнароднай арэне. Шэраг з іх паходзяць з архіваў Беларусі, Вялікабрытаніі, Расіі і Украіны. Новая манаграфія У.Снапкоўскага атрымала добрыя водгукі ў беларускім і расійскім навуковым другу[2].

Працягам названай вышэй працы ў храналагічных і праблемных адносінах была выдадзеная ў 1997 годзе манаграфія "Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі: 1944–1953 гады". Праграма-мінімум, якую вырашыў у ёй аўтар – расшырэнне даследчыцкага поля адпаведнай праблематыкі і карэкціроўка некаторых ацэнак дзейнасці БССР у ААН, выказаных у кнізе 1985 года. А праграма-максімум, паспяхова рэалізаваная аўтарам, заключалася ў даследаванні малавядомых старонак удзелу БССР у знешнепалітычнай дзейнасці савецкай дзяржавы, менавіта тых, на якіх адбілася фарміраванне геапалітычнага вобліку нашай рэспублікі ў пасляваеннай Еўропе (яе ўдзел у фарміраванні граніц СССР з Польшчай, абмен насельніцтвам з заходняй суседкай і інш.).

У наступныя гады склаліся новыя накірункі навуковых зацікаўленняў У. Е. Снапкоўскага. Іх можна ўмоўна вызначыць як даследаванне двух рубежных этапаў гісторыі ўсходнееўрапейскага сектара Версальскай сістэмы – польска-савецкай вайны, Рыжскага міру 1921 г. і краху польскага звяна гэтай сістэмы ў верасні 1939 г. Займаючыся гэтай праблематыкай, прафесар увёў ва ўжытак беларускай гістарыяграфіі шэраг крыніц польскага, нямецкага паходжання і крыніц, выяўленных ім у расійскіх архівах. Абапіраючыся на іх, гісторык здолеў упэўнена абгрунтаваць шэраг новых ацэнак уплыву на гістарычны лёс Беларусі падзей сусветнай гісторыі ў перыяд ад Першай да Другой сусветных войнаў. Вынікі даследавання гэтай праблематыкі былі прадстаўлены ім у дакладах на шэрагу міжнародных канферэнцый і ў серыі артыкулаў, а пазней пакладзены ў аснову дзвюх

[1] Снапковский В.Е. Союзные республики и советская дипломатия: из истории борьбы СССР за первоначальное членство УССР и БССР в ООН (1943 - 1945 гг.) / БГУ, Институт Европы РАН, Ассоциация внешнеполитических исследований имени А.А. Громыко. Минск, Право и экономика, 2022.

[2] Мезга Н.Н. Страницы борьбы советской дипломатии за членство УССР и БССР в ООН // Современная Европа. 2023. № 3. С. 210 - 213.

манаграфій[3]. Працы У. Снапкоўскага па гэтай праблематыцы належаць да ліку тых, якія фарміруюць новае бачанне падзей верасня 1939 г., дазваляючы беларусам не камплексаваць, калі яны ўсведамляюць, што аб'яднанне беларускага народа лагічна звязанае з пактам Молатава – Рыбентропа ад 23 жніўня. Важна тое, што беларускі народ выкарыстаў шанс для сваёй кансалідацыі, які дала яму гісторыя.

У манаграфіі "Беларуска-польскія адносіны (1918–1989 гг.): Даследаванні, дакументы, ілюстрацыі і карты" (2013) прадстаўлены ключавыя праблемы ўзаемаадносін паміж беларускім і польскім народамі на працягу амаль усяго ХХ стагоддзя. Гэта першае ў беларускай навуковай літаратуры даследаванне асноўных этапаў гэтых адносін і сувязей, якое суправаджаецца распрацоўкай іх перыядызацыі ў 1944–1989 гг. Працягваючы вывучэнне гэтай праблематыкі, беларускі гісторык у новай манаграфіі "Шлях скрозь стагоддзе: беларуска-польскія адносіны (1918 – 2017)", спыніўся на паглыбленым даследаванні ключавых праблем узаемных адносін беларускага і польскага народаў на працягу стагоддзя, разглядаючы іх у шчыльным кантэксце міжнароднай палітыкі. Не абыходзячы "вострых вуглоў" гэтых адносін, а, наадварот, засяроджваючы на іх асноўную ўвагу, аўтар паказаў у сваёй працы, што гэтыя адносіны, пабудаваныя на аснове нацыянальных інтарэсаў, ствараюць падставу для канструктыўнага рэалізму ў працэсе іх нармалізацыі.

Даследаванні У. Е. Снапкоўскага па гісторыі Рыжскага міру, узбагачаючы беларускую гістарычную навуку, расшыралі кругагляды самога даследчыка. У лагічнай сувязі з імі неабходна бачыць падрыхтоўку і выданне чатырохтомнага зборніка дакументаў "Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914 – 1991 гг.)", аўтарам канцэпцыі якога, адным са складальнікаў, навуковым рэдактарам, аўтарам прадмовы і ўводзін да кожнага тома з'яўляецца менавіта прафесар Снапкоўскі. Выданне атрымала высокую ацэнку ў навуковай перыёдыцы[4]. Аб адным можна толькі пашкадаваць: яно стала бібліяграфічнай рэдкасцю адразу ж пасля выхаду ў свет, і, на жаль, не толькі па прычыне вялікага попыту на яго, але і ў выніку яго маленькага накладу (50 экз.). Відаць, фундатары выдання не знайшлі дастаткова сродкаў, каб падтрымаць яго, як яно таго заслугоўвала.

У 2018 г. у выніку творчага супрацоўніцтва У.Снапкоўскага з вядомым польскім гісторыкам Войцехам Матэрскім у Варшаве пад грыфам Інстытута палітычных даследаванняў ПАН выйшаў салідны зборнік дакументаў і матэрыялаў "Польска-беларускі вузел", дзе сабраны больш за 500 архіўных і апублікаваных крыніц за 1918-1921 гг. (ад аднаўлення беларускай і польскай

---

[3] Снапкоўскі У.Е. Беларуска-польскія адносіны (1918 – 1989 гг.): Даследаванні, дакументы, ілюстрацыі, карты. – Мінск: Энцыклапедыкс, 2013; Яго ж. Шлях скрозь стагоддзе: беларуска-польскія адносіны 1918-2017 гг. - Мінск: БДУ, 2017.

[4] Гл. Мязга М., Дуброўка А. Рэцэнзія на кнігу "Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.) : зборнік дакументаў і матэрыялаў : у 4 т. Т. 3 : 1 верасня 1939 г. – 3 ліпеня 1944 г". // Беларускі гістарычны часопіс. 2012. № 4. - С. 76-78.

дзяржаўнасці да Рыжскага міру). У ім прадстаўлена багатая на падзеі і вельмі складаная і супярэчлівая па сваім змесце гісторыя беларуска-польскіх адносін у адзін з пераломных перыядаў XX ст.

Матэрыялы, вывады і абагульненні, якія змяшчаюцца ў публікацыях У. Снапкоўскага, увайшлі ў беларускую і замежную навуковую і вучэбную літаратуру па гісторыі Беларусі, знешняй палітыкі і міжнародных адносінах Беларусі XX - пачатку XXI ст. Ён з'яўляецца адным з распрацоўшчыкаў праекта Канцэпцыі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, якая ўвайшла ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні асноўных кірункаў унутранай і знешняй палатыкі Рэспублікі Беларусь» (2005).

Прафесару Снапкоўскаму даводзілася адстойваць інтарэсы нашай дзяржавы не толькі пяром даследчыка і словам лектара. На працягу шэрагу гадоў ён з'яўляўся членам групы беларускіх і польскіх гісторыкаў, якая займалася выяўленнем і даследаваннем так званых "цяжкіх пытанняў" гісторыі беларуска-польскіх адносін, удзельнічаў ва ўсіх канферэнцыях, праведзеных гэтай групай у Беларусі і ў Польшчы. Дасягнутае ў выніку гэтых сустрэч збліжэнне пазіцый беларускіх і польскіх гісторыкаў па вострых пытаннях беларуска-польскіх адносін спрыяла паглыбленню даверу паміж народамі і паляпшэнню агульнай атмасферы ў адносінах паміж дзвюма суседнімі дзяржавамі, якое назіралася ў тыя гады?

Не бяруся ацэньваць выкладчыцкую працу У.Е.Снапкоўскага – яна лепш вядомая яго калегам па факультэту міжнародных адносін БДУ. Але на фоне яго інтэнсіўнай навукова-даследчыцкай, навукова-рэдакцыйнай і выдавецкай дзейнасці дасягнутыя ім вынікі і ў гэтай сферы выглядаюць як амаль неверагодныя. Гэта ж менавіта ён з'яўляецца распрацоўшчыкам новай навуковай і вучэбнай дысцыпліны – гісторыі знешняй палітыкі Беларусі, па якой выдаў некалькі вучэбных дапаможнікаў[5]. Апошні выйшаў у пачатку 2024 г[6]. Імі карыстаюцца не толькі студэнты-міжнароднікі ў БДУ, але і студэнты-гісторыкі ўсіх універсітэтаў рэспублікі.

Сапраўды, Уладзімір Снапкоўскі – адзін з тых, хто не праспаў свайго часу. Колькі мы ведаем гісторыкаў, якія зніклі з даследчыцкага поля адразу пасля абароны кандыдацкай дысертацыі. Зразумела, час будаўніцтва дзяржавы нялёгкі і не кожнаму спрыяе. Сапраўды, мы не выбіраем свой час, аднак выбіраем сваю ролю і месца ў ім. Уладзімір Снапкоўскі – адзін з тых, хто быў аднойчы пакліканы краінай і застаецца служыць ёй на пярэднім краі гістарычнай навукі. Гэтую службу прафесар Снапкоўскі нясе годна, настойліва і плённа.

---

[5] Снапкоўскі У. Е. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі: Вучэб. дапам. для студэнтаў фак. міжнар. адносін: У 2 ч. Ч. 1. Ад пачаткаў дзяржаўнасці да канца XVIII ст. Мінск: БДУ, 2003; Ч. 2. Ад канца XVIII да пачатку XXI ст. Мн.: БДУ, 2004. 303 с.; Снапковский В. Е. История внешней политики Беларуси. Мн., БГУ, 2013.

[6] Снапкоўскі У. Е. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі. Дапаможнік. Мінск: БДУ, 2023.

*В.А. Астрога, загадчык кафедры мытнай справы факультэта міжнародных адносін БДУ, доктар гістарычных навук, прафесар*

## 2.3. Прафесар У.Е. Снапкоўскі. Шлях ад германскай да беларускай гісторыі: 1976 – 1989 гг.

Прафесар Уладзімір Еўдакімавіч Снапкоўскі шыракавядомая постаць у беларускай гістарычнай навуке. Ён вылучаецца сваім імпэтам і глыбокімі ведамі не толькі па гісторыі знешняй палітыцы і дыпламатыі Беларусі, але і па іншых самых розных аспектах беларускай і ўсеагульнай гісторыіі. Ягоная скіраванасць да аб'ектыўна-крытычнага асвятлення гістарычных фактаў і падзей вядома ўсім. Як навуковец У.Е. Снапкоўскі пачаў фармавацца ў 1970-я гг. у мурах Акадэміі навук БССР, хаця заўсёды як выпускнік гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта меў непарыўную сувязь са сваёй Alma mater.

Аб ягоным прафесійным шляху, навуковай трансфармацыі з гісторыка-германіста ў даследчыка знешняй палітыцы Беларусі на працягу 1970-х – 1980-х гг. хацелася б зараз распавесці.

У лістападзе 1976 г. У.Е. Снапкоўскі, малады настаўнік Пальмінскай сярэдняй школы Гарадокскага раёна Віцебскай вобласці, паступіў у аспірантуру Інстытута гісторыі АН БССР па спецыяльнасці “Усеагульная гісторыя” [1, с.16]. Выбар быў не выпадковы, бо яшчэ ў студэнцкія гады ён спецыялізаваўся па кафедры Новай і навейшай гісторыі і пісаў дыпломную працу пад кіраўніцтвам дацэнта В.І. Сініцы. У хуткім часе ён пачаў працу над кандыдацкай дысертацыяй па гісторыі знешняй палітыкі ГДР у адносінах да ФРГ. Так як, Інстытут гісторыі актыўна супрацоўнічаў па падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі з рознымі рэспубліканскімі і саюзнымі ўстановамі, навуковым кіраўніком У.Е. Снапкоўскага стаў прафесар Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС В.Ц. Фамін [1, с. 85].

Трэба адзначыць, што ў гэты час у беларускай акадэмічнай гістарычнай навуке пачалася хваля цікавасці да падзей замежнай гісторыі. Так, 20 кастрычніка 1969 г. у Інстытуце гісторыи АН БССР быў створаны сектар гісторыі замежных сацыялістычных краін [2, с. 167]. Як адзначаў пазней у адной з сваіх прац сам У.Е. Снапкоўскі – “галоўнымі прычынамі яго стварэння былі палітычныя: пасля падзей 1968 г. у Чэхаславакіі. Савецкае кіраўніцтва зразумела неабходнасць навуковага даследавання «брацкіх» сацыялістычных краін» [3, с. 298]. Не апошнім аргументам у гэтай падзеі было і памежнае становішча БССР як заходняй рэспублікі Савецкага Саюза. З улікам магчымасцяў, у навуковую праблематыку сектара ўвайшлі пытанні найноўшай гісторыі краін Усходняй і Цэнтральнай Еўропы, двухбаковых сувязяў БССР з сацыялістычнымі краінамі і супрацоўніцтва з ААН. Да 1970 г. сектар значна ўмацаваўся і ў яго складзе працавала 7 чалавек, якія даследавалі ў сваёй большасці тэмы, звязаныя з супрацоўніцтвам БССР з краінамі сацыялізму: Польшчай, Чэхаславакіяй, Румыніяй, ГДР, Венгрыяй. Са студзеня 1971 г. ён стаў звацца сектарам гісторыі еўрапейскіх

сацыялістычных краін (СГЕСК). Акрамя праблематыкі міжнародных сувязяў БССР у ім таксама вывучаліся пытанні найноўшай гісторыі Польшчы, Балгарыі, Чэхаславакіі і ГДР, агульныя праблемы краін сацыялістычнага лагера. Але геаграфічна кола вывучаемых краін было абмежавана практычна толькі еўрапейскімі краінамі. У.Е. Снапкоўскі, пазней узгадваў у адным са сваіх артыкулаў, што "нягледзячы на назву, прыярытэтным напрамкам сектара адразу быў вызначаны аналіз замежных сувязяў БССР", а "незабяспечанасць сектара кваліфікаванымі кадрамі па спецыялізацыі асобных краін Усходняй Еўропы, іх адток у ВНУ … цяжкасці з выданнем навуковай прадукцыі па праблематыцы еўрапейскіх сацыялістычных краін прывялі да таго, што з пачатку свайго існавання СГЕСК сканцэнтраваўся на даследаванні двух - і шматбаковых сувязяў БССР з асобнымі краінамі "сацыялістычнай садружнасці" і дзейнасці Рэспублікі ў ААН" [4, с. 5]. У выніку навукова-даследчая праца сектара ўжо першапачаткова ажыццяўлялася па агульнай тэме "Беларуская ССР у міжнародных адносінах". У выніку, вывучэнне міжнародных сувязяў БССР, якія праводзіліся ў сектары, сталі новым перспектыўным навуковым напрамкам.

У 1979 г. У.Е. Снапкоўскі опубликаваў свой першы навуковы артыкул "Некаторыя праблемы міжнароднага прызнання ГДР і нармалізацыі адносін паміж дзюма германскімі дзяржавамі" [1, с. 17]. У тым жа годзе пасля заканчэння аспірантуры, ён становіцца малодшым навуковым супрацоўнікам аддзела гісторыі еўрапейскіх сацыялістычных краін Інстытута гісторыі АН БССР. У сакавіку 1980 г. гісторык паспяхова абараніў у спецсавеце БДУ дысертацыю па тэме "Палітыка ГДР у адносінах да ФРГ – важны элемент разрадкі міжнароднай напружанасці (1970-я гг.)" па спецыяльнасці 07.00.03 Усеагульная гісторыя. У 1981 г. маладога кандыдата навук пераводзяць на пасаду старэйшага навуковага супрацоўніка. У 1983 г. сектар, дзе ён працаваў, перайменавалі ў сектар гісторыі замежных сувязяў БССР. У 1984 г. старая тэма яго старая навуковая тэма была завершана. У перыяд "Перабудовы" сектар і яго супрацоўнікі яшчэ больш адышлі ад праблем навістыкі і наблізіліся да беларускай гісторыі, што адлюстроўвала патрэбы тагачаснага беларускага грамадства, што імкнулася як мага больш даведацца пра сваю гісторыю. У выніку, ў сектары на 1985-1988 гг. была запланавана новая навуковая тэма "Сацыяльна-эканамічныя і культурныя сувязі Беларускай ССР з замежнымі краінамі" [2, с.174].

Шырокі кругляд і глыбокае разуменне працэсаў, якія адбываліся ў гістарычнай і іншых гуманітарных навуках ў 1980-я гг. дала У.Е. Снапкоўскаму ня толькі даследчая праца ў інстытуце, але і дзейнасць на пасадзе вучонага сакратара Аддзялення грамадскіх навук АН БССР у 1982 – 1988 гг. Адначасова, фактычна ў перыяд "Перабудовы" ён з'яўляўся сакратаром партыйнай арганізацыі КПСС апарата Прэзыдыюма АН БССР (1985-1988 гг.). Аднак з 1988 г. У.Е. Снапкоўскі зыходзіць з гэтых пасад і засяроджваецца толькі на навуковай дзейнасці і працуе старэйшым навуковым супрацоўнікам аддзела гісторыі замежных сувязяў БССР

Інстытуца гісторыі, даследуючы праблемы гісторыі знешнепалітычнай дзейнасці Беларускай ССР.

Дарэчы з 1980 г. пачынаецца ягоная выкладчыцкая праца ў Alma mater. Спачатку дацэнтам па сумяшчальніцтву на кафедры Новай і найноўшай гісторыі гістарычнага факультэта БДУ, а пазней з 1993 г. прафесарам кафедры міжнародных адносін гістарычнага факультэта.

У сярэдзіне 1980-х гг. даследаванне "белых плямаў" роднай беларускай гісторыі пачынаюць займаць У.Е. Снапкоўскага ўсё больш і больш і ён паступова адыходзіць ад вывучэння праблем усеагульнай гісторыі, германскай у прыватнасці. Хаця тут нельга не ўзгадаць ягоны вельмі важны для беларускай гістарыяграфіі вялікі панарамны артыкул "Исследование проблем новой и новейшей истории в Белорусской ССР", надрукаваны напачатку 1984 г. у аўтарытэтным савецкім часопісе "Новая и новейшая история" [6]. У ім ён дэталёва ахарактарызаваў развіццё беларускай навістыкі, у першую чаргу навуковую працу на кафедры Новай і найноўшай гісторыі БДУ, дзе склаліся свое навуковыя школы: праблем германскай гісторыі і гісторыі міжнародных адносін у Еўропе ў XIX–XX стст. На сярэдзіну 1980-х гг. гэтая кафедра мела высокі навуковы статус У СССР, што падкрэсліў аўтар, назваўшы яе галоўным цэнтрам у гэтай сферы ў Савецкай Беларусі [2, с.59].

На адыход у гэты час У. Я. Снапкоўскага ад даследавання германскай гісторыі паўплывалі і знешнія палітычныя абставіны. Так, у 1983 г. у сувязі са "складанай і вострай праблематыкай" была адхілена ад выдання ягоная манаграфія "ГДР-ФРГ: тернистые пути разрядки (70-е годы)" [1, с. 27]. Але ўсё ж некалькі пазней, у 1989 г. у суаўтарстве з дацэнтам гістарычнага факультэта БДУ М.Г. Елісеевым ён падрыхтаваў і выдаў манаграфію з германскай гісторыі – "Два германских государства и европейская безопасность: история и современность", аднак гэта было фактычна яго апошняе заўважальнае даследаванне ў галіне навістыкі [7]. Далей У. Е. Снапкоўскі засяроджваецца на гісторыіі знешняй палітыкі і міжнароднай дзейнасці Беларусі. І ў гэтай галіне ўжо адразу мае значныя поспехі. Актыўная даследчая праца дазволіла падрыхтаваць да выдання ў 1985 г. першую манаграфію "Белорусская ССР в ООН (1945–1985 гг.)" [8]. Беларуская гісторыя становіцца для яго прыярытэтам. Тэматыка ААН была прыкметнай у беларускай гістарыяграфіі. Але на той час, як піша аўтар, "беларускія гісторыкі пры вывучэнні дзейнасці БССР у ААН не змаглі выйсці за рамкі традыцыйных падыходаў і сюжэтаў ..., абмяжоўваючыся нарошчваннем строга рэгламентаванага па існуючай схеме фактычнага матэрыялу" [8, с. 6].

У 1989 г. У.Е. Снапкоўскі паступае ў дактарантуру Інстытута гісторыі АН БССР і пачынае працу над доктарскай дысертацыяй па беларускай праблемытыцы "Знешнепалітычная дзейнасць Беларускай ССР (1944-1953 гг.)" [9, с. 311]. Ягоным навуковым кансультантам стаў вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі СССР АН СССР доктар гістарычных навук,

прафесар А.С. Пратапопаў [1, с. 86]. Ён поўнасцю засяроджваецца на падрыхтоўцы доктарскай дысертацыі і ў выніку руплівай працы ў студзені 1993 г. паспяхова яе абараняе.

У.Е. Снапкоўскі, сёння паважаны студэнтамі і калегамі прафесар факультэта міжнародных адносін БДУ, прайшоў на працягу 1970-х – 1980-х гг. свой навуковы прафесійны шлях ад маладога даследчыка германскай гісторыі да спелага апантанага эксперта ў галіне гісторыі знешняй палітыкі і международнага становішча Беларусі. Гэты шлях, на наш погляд, быў аб'ектыўны і заканамерны. Гістарычныя абставіны далі У.Е. Снапкоўскаму такія магчымасці і ён рэалізаваў іх на "Выдатна".

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Снапкоўскі Уладзімір Еўдакімавіч. Да 60-гадовага юбілею і 35-годдзя навукова-педагагічнай дзейнасці : біябібліяграфічны паказальнік / склад. У. Е. Снапкоўскі ; пад рэд. А. А. Чалядзінскага. – Мінск : БДУ, 2015. – 111 с.
2. Острога, В. А. Развитие научных и образовательных центров по Новой и Новейшей истории в Белорусской ССР. 1919–1991 гг. / В. А. Острога; под науч. ред. проф. В. С. Кошелева. – Минск : РИВШ, 2016. – 428 с.
3. Снапкоўскі, У. Е. Знешнепалітычная дзейнасць і міжнародныя сувязі Беларусі ў даследаваннях Інстытута гісторыі НАН Беларусі (1960 – 90-я гг.) / У. Е. Снапкоўскі // Гістарыяграфія гісторыі Беларусі: стан і перспектывы развіцця : Матэрыялы навук. канф., прысвечанай 70-годдзю Інстытута гісторыі НАН Беларусі., Мінск, 6–7 кастрычніка 1999 г. / Ін-т гісторыі НАН Беларусі ; рэдкал. М. П. Касцюк (гал. рэд.). – Мінск, 2000. – С. 297–301.
4. Снапковский, В. Е. Мы многого еще не знаем / В. Е. Снапковский // За передовую науку. – 1989. – 8 декабря. – С. 2–5.
5. Снапкоўскі У.Е. Некаторыя праблемы міжнароднага прызнання ГДР і нармалізацыі адносін паміж дзвюма германскімі дзяржавамі // Весці Акадэміі навук БССР. Серыя грамадскіх навук. — 1979. — № 2.
6. Снапковский, В. Е. Исследование проблем новой и новейшей истории в Белорусской ССР / В. Е. Снапковский // Новая и новейшая история. – 1984. – № 2. – С. 168–179.
7. Елисеев, М. Г. Два германских государства и европейская безопасность: история и современность / М. Г. Елисеев, В. Е. Снапковский. – Минск: Наука и техника, 1989. – 151 с.
8. Снапковский, В. Е. Белорусская ССР в ООН (1945–1985 гг.) / В. Е. Снапковский. – Минск : Наука и техника, 1985. – 104 с.
9. Институт истории Национальной академии наук Беларуси в лицах (1929–2008 гг.) : биобиблиогр. справ. / Корзенко Г. В. [и др.] ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Белорус. наука, 2008. – 423 с.

*М.В.Стралец - доктар гістарычных навук,*
*прафесар Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта*

## 2.4. У.Е. Снапкоўскі як заснавальнік новага кірунку ў беларускай гістарычнай навуцы

Прафесара Уладзіміра Еўдакімавіча Снапкоўскага я ведаю ўжо больш за 40 гадоў, з таго часу, калі ён быў афіцыйным апанентам маёй кандыдацкай дысертацыі (1984 г.). У яго вачах заўсёды чытаецца мэтанакіраванасць, грунтоўнасць, імкненне сканцэнтравацца на сапраўды сур'ёзных справах. Перад намі талент, які заслугоўвае самых гучных эпітэтаў. Таленавітасць, працавітасць і прафісійнае майстэрства доктара гістарычных навук, прафесара У.Е. Снапкоўскага адчуваецца пры азнаямленні з любой з яго навуковых прац. Іх колькасць перавaліла за чатыры сотні. Шэраг яго артыкулаў надрукаваны за мяжой (Аўстрыя, Вялікабрытанія, ЗША, Літва, Польшча, Расія, Украіна). У навукоўца вельмі ўнушальны індэкс цытуемасці. Рэцэнзіі на яго кнігі надрукаваны ў часопісах Рэспублікі Беларусь, блізкага і далёкага замежжа. Рэцэнзентам шэрагу яго апошніх выданняў з'яўляецца і аўтар гэтых радкоў. Аўтары рэцэнзій аднадушныя ў тым, што гэты вучоны-гісторык здольны выразна сфармуляваць навуковую праблему і затым вырашыць яе, прааналізаваўшы велізарны факталагічны масіў і зрабіўшы абгрунтаваныя высновы.

Малады вучоны ўпершыню сур'ёзна заявіў пра сябе як навуковец больш за сорак гадоў таму, бліскуча абараніўшы дысертацыю на саіскание вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па тэме "Палітыка ГДР у адносінах ФРГ – важны элемент разрадкі міжнароднай напружанасці (1970-я гады)". Але ў далейшым ён будзе звяртацца да германскай гісторыі фрагментарна і ў асноўным сканцэнтруецца на гісторыі знешняй палітыкі Беларусі.

Вывучэнне навукоўцам гісторыі знешняй палітыкі Беларусі можна падзяліць на два этапы: савецкі і постсавецкі. Ёсць таксама падставы для падзелу першага этапа на два падэтапы. Першы падэтап меў у якасці галоўнага выніка выхад яго самай першай манаграфіі пад назвай "Белорусская ССР в ООН (1945–1985 гг.)". Канешне, і ў гэтай манаграфіі, і ў кандыдацкай дысертацыі не маглі не адчувацца тыя абставіны, у якіх працавалі айчынныя грамадазнаўцы, поўнасцю падкантрольныя ідэалагічным службам КПСС, зацыкленных на старым палітычным мысленні.

Другі падэтап распачаўся ў разгар гарбачоўскай перабудовы. Галоўнае месца на адрэзку часу заняла праца над доктарскай дысертацыяй па тэме "Знешнепалітычная дзейнасць Беларускай ССР (1944–1953 гг.)". У адрозненне ад першага падэтапа тут была відавочная творчая свабода даследчыка, нашмат лягчэй вырашалася пытанне з допускам у архівы. Калі СССР спыніў сваё існаванне, тэкст дысертацыі быў у асноўным гатовы.

Першыя 13 месяцаў другога этапа былі цалкам прысвечаны дысертацыйным справам. За гэты час навуковец паспеў завяршыць працу над

тэкстам дысертацыі, абмеркавацца і абараніцца. Пасля абароны прафесар ніколі не збаўляў абароты. Высокаякасная навуковая прадукцыя нарастала як снежны ком. Праз год пасля абароны ўбачыла свет манаграфія "Путь Беларуси в ООН. 1944–1945 гг.", дзе зроблены наватарскі аналіз праблемы членства савецкіх саюзных рэспублік у ААН і іх удзелу ў міжнародных пасляваенных канферэнцыях. Упершыню ў гістарыяграфіі постсавецкіх дзяржаў, уключаючы Расію, даследавана праблема першапачатковага членства саюзных рэспублік (на прыкладзе Беларускай ССР і Украінскай ССР) у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. На падставе дакументаў знешняй палітыкі СССР, ЗША, Вялікабрытаніі і іншых дзяржаў, уключаючы БССР і УССР, паказаны складаны і цярністы шлях дзвюх саюзных рэспублік у лік дзяржаў-заснавальнікаў ААН.

1997 г. быў адзначаны выданнем манаграфіі "Знешнеплітычная дзейнасць Беларусі: 1944–1953 гг.". У кнізе па-новаму асэнсаваны пытанні знешнепалітычнай і дыпламатычнай дзейнасці Беларускай ССР у даследаваны перыяд, у тым ліку яе удзел у абмеркаванні праблем міжнароднай бяспекі ў ААН, на Парыжскай мірнай канферэнцыі 1946 г., роля і месца ў ажыццяўленні знешнепалітычнай лініі СССР, узаемаадносіны са спецыялізаванымі ўстановамі ААН. Аўтарам адкрыты шэраг малавядомых беларускім гісторыкам і чытачам старонак, такіх як дапамога ЮНРРА (Адміністрацыі аднаўлення і дапамогі Аб'яднаных Нацый) Беларускай ССР у 1945– 1947 гг., дыпламатычная барацьба вакол вызначэння беларускага ўчастка савецка-польскай граніцы ў 1944–1945 гг., рэпатрыяцыя насельніцтва паміж БССР і Польшчай і інш.

У 2008 – 2014 гг. навуковец шмат увагі надаў выданню гісторыка-дыпламатычнага зборніка "Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.): зб. дак. і матэрыялаў. У 4-х т", дзе ён быў намеснікам кіраўніка Часовага творчага калектыва, адказным сакратаром рэдкалегіі, аўтарам прадмовы і ўводзінаў да ўсіх тамоў, асноўным складальнікам, рэдактарам, аўтарам каментарыяў, перакладчыкам з замежных моў. У гэты самы час ён у складзе супрацоўнікаў кафедры міжнародных адносін БДУ ажыццявіў выданне гісторыка-дыпламатычнага зборніка "Знешняя палітыка Беларусі: Зб. дак. і матэрыялаў. Т. 8 (1996 –2000 гг.)", "Знешняя палітыка Беларусі: Зб. дак. і матэрыялаў. Т. 9 (2001 – 2005 гг.)", Знешняя палітыка Беларусі: Зб. дак. і матэрыялаў. Т. 10 (2006 – 2010 гг.)". У 2012 – 2013 гг. вучоны ў складзе ЧНК на базе кафедры міжнародных адносін рэалізаваў выданне гісторыка-дыпламатычнага зборніка "Государственные границы Беларуси. Сборник документов и материалов. В 2 т. Т. 1. (март 1917 – ноябрь 1926); Т. 2. (ноябрь 1926–декабрь 2010) (с электронным приложением)".

Вучоны з пачатку 1990-х гг. актыўна ўдзельнічае ў міжнародным навуковым супрацоўніцтве, якое пачалося яго творчымі сувязямі з расійскімі міжнароднікамі. У 1998 – 2008 гг. У.Е. Снапкоўскі з'яўляўся ініцыятарам і каардынатарам з беларускага боку навуковага праекта "Беларуска-расійскія адносіны: праблемы і перспектывы", які Факультэт міжнародных адносін

БДУ распрацоўваў разам з Інстытутам міжнародных палітычных і эканамічных даследаванняў Расійскай акадэміі навук.

Па выніках сустрэч з расійскімі вучонымі і экспертамі апублікавана кніга “Беларуска-расійскія адносіны: зб. навук. артыкулаў” (2009), дзе разглядаюцца пытанні фарміравання і развіцця беларуска-расійскіх адносін у 1990-я і пачатку 2000-х гадоў. У працы змешчаны навукова-аналітычныя агляды прэсы і выніковыя дакументы круглых сталоў беларускіх і расійскіх вучоных па актуальных і перспектыўных пытаннях двухбаковых адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй. У выданні прадстаўлена аўтарская канцэпцыя беларуска-расійскіх адносін – канцэпцыя “стратэгічнага партнёрства” і саюзных адносін паміж дзвюма суверэннымі дзяржавамі, якія павінны затавацца самастойнымі суб’ектамі міжнароднага права. Гэта адна з першых спроб навуковага, узважанага і цвярозага адлюстравання гэтых адносін у беларускай гістарыяграфіі.

У 2013 г. выйшла манаграфія У.Е. Снапкоўскага “Беларуска-польскія адносіны (1918–1989 гг.): Даследаванні, дакументы, ілюстрацыі і карты”, дзе прадстаўлены ключавыя праблемы ўзаемаадносін паміж беларускім і польскім народамі на працягу амаль усяго ХХ ст. Гэта першае ў беларускай навуковай літаратуры даследаванне асноўных этапаў гэтых адносін і сувязей з распрацоўкай іх перыядызацыі ў 1944–1989 гг. У 2017 г. у працяг гэтай тэмы выйшла яго новая манаграфія “Шлях скрозь стагоддзе: беларуска-польскія адносіны 1918–2017 гг. Мінск: БДУ”. Тут, як бачым, разглядаюцца падзеі ў двухбаковых адносінах да 2017 года і даецца іх грунтоўная гістарычная перыядызацыя на працягу стагоддзя.

На прафесійны рост Уладзіміра Еўдакімавіча даволі істотна паўплывалі яго стажыроўкі ў аўтарытэтных навуковых цэнтрах Вялікабрытаніі, Злучаных Штатаў Амерыкі, Польшчы, Расіі, Украіны. Тут былі і вывучэнне архіўных (эксклюзіўных) дакументаў і матэрыялаў для будучых навуковых прац, і прадметныя гутаркі з калегамі, імёны якіх заўсёды на слыху ў навуковым свеце.

У 2001 г. У. Снапкоўскі выступіў адным з распрацоўшчыкаў Канцэпцыі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, якая была адобрана калегіяй Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь і ўвайшла пазней у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні асноўных кірункаў унутранай і знешняй палатыкі Рэспублікі Беларусь», прыняты Нацыянальным сходам у 2005 г. Прафесар з’яўляецца аўтарам шэрагу падручнікаў і навучальных дапаможнікаў па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі. 2003–2004 гг. адзначаны публікацыяй першага ў навуковай і адукацыйнай літаратуры падручніка “Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі: Вучэб. дапам. для студэнтаў фак. міжнар. а дносін: У 2 ч. Ч. 1. Ад пачаткаў дзяржаўнасці да канца XVIII ст.; Ч. 2. Ад канца XVIII да пачатку XXI ст”. Выданне ўяўляе сабой навукова-метадычную распрацоўку новай вучэбнай і навуковай дысцыпліны “Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі”, якая чытаецца аўтарам з 1993-1994 навучальнага года на аддзяленні (з 1995 г. на факультэце)

міжнародных адносін БДУ.

У 2007 г. адбылося выданне кнігі “Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь: курс лекцый”, дзе зроблена адна з першых у беларускай навукова-адукацыйнай літаратуры спроб падагуліць 15-гадовы перыяд станаўлення знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. У 2013 г. ўбачыў свет навучальны дапаможнік “История внешней политики Беларуси”, які выйшаў у серыі БДУ “Класічнае ўніверсітэцкае выданне”. У кнізе ўпершыню дадзена сістэматызаванае выкладанне знешнепалітычнай гісторыі Беларусі ад пачаткаў беларускай дзяржаўнасці да пачатку XXI ст. на рускай мове. Дапаможнік уяўляе сабой скарочанае, перапрацаванае і актуалізаванае выданне кнігі “Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі” у 2 частках, якая выйшла ў 2003–2004 гг.

Распрацоўка і ўкараненне ў практыку навуковых даследаванняў і вышэйшай школы Рэспублікі Беларусь новай навуковай і вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі” запатрабавалі сапраўды вялікіх намаганняў з боку прафесара. Не будзе перабольшваннем казаць, што ён уклаў у гэту справу душу і сэрца. Зробленая дае падставы лічыць гэтага гісторыка заснавальнікам новага навуковага кірунку ў беларускай гістарычнай навуцы – знешнепалітычнай гісторыі Беларусі.

Значныя дасягненні ў навуцы і выкладанні дасягнуты прафесарам у апошняе дзесяцігоддзе. Пасля 60-гадовага юбілею ён не збаўляе, а нарошчвае абароты, падвышаючы свой навукова-адукацыйны патэнцыял як выдатнага гісторыка, эксперта-палітолага і акадэмічнага выкладчыка ў галіне міжнародных адносін. Пацвярджэннем яго высокага навуковага статуса і аўтарэтэта сталі вынікі выбараў ў члены-карэспаддэнты НАН Беларусі ў 2014 г. па спецыяльнасці “Гісторыя”. У.Е.Снапкоўскі дастойна прадставіў сябе і сваю навуковую школу на смотры дасягненняў беларускай навукі, заняўшы другое месца па выніках выбараў у Аддзяленні гуманітарных навук і мастацтваў.

Мінулае дзесяцігоддзе адзначана выкананнем праектаў Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў, удзелам у праграмах Еўрапейскага саюза “Эразмус плюс” і “МОСТ”, замежнымі камандзіроўкамі ў Маскву, Кіеў, Лондан, Варшаву, Кракаў, Люблін, Вроцлаў, Торунь, Беласток. Вучоны паспяхова выканаў сваю тэму ў Дзяржаўнай праграме навуковых дасдедаванняў на 2016-2020 гг. і працягвае развіваць праблему суадносін рэспубліканскай і саюзнай дыпламатыі ў знешняй палітыцы СССР у рамках ДПНД на 2021-2025 гг.

Асабліва плённым выдаўся для Уладзіміра Еўдакімавіча 2020-2021 гады, калі з друку выйшлі яго манаграфіі «Белорусская ССР в ООН: отряд советской дипломатии в действии» і “Союзные республики и советская дипломатия: из истории борьбы СССР за первоначальное членство УССР и БССР в ООН (1943 - 1945 гг.)”. Я адгукнуўся на яго працы двумя рэцэнзіямі, дзе адзначыў высокі ўзровень яго піянерскіх даследаванняў у галіне дыпламатыі часоў Другой сусветнай вайны і знешнепалітычнай дзейнасці

БССР у гады халоднай вайны.

За гэтыя два гады прафесар выдаў таксама два навучальных дапаможніка: “Традыцыі і навацыі ў знешнепалітычных даследаваннях Беларусі” і «Анализ внешней политики Республики Беларусь». У першым глыбока абгрунтаваны новы кірунак у гістарычных і міжнародных даследаваннях беларускай гуманітаранай навукі – гісторыя знешняй палітыкі Беларусі. Як асноўны прадмет выкладання на факультэце міжнародных адносін БДУ гэта дысцыпліна чытаецца У.Е.Снапкоўскім з 1993-1994 навучальнага года. Пра вучэбную літаратуру па прадмеце аўтарам сказана вышэй.

Да свайго 70-годдзя вучоны выпусціў новае, перапрацаванае выданне вучэбнага дапаможніка “Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі” (Мінск, БДУ. 2023). Праца з’яўляецца першай у беларускай і замежнай гістарыяграфіі спробай сістэматычнага выкладання гісторыі знешняй палітыкі Беларусі ад пачаткаў беларускай дзяржаўнасці да канца XX ст. Яна храналагічна ахоплівае больш за тысячагадовы перыяд беларускай дзяржаўнасці, пачынаючы ад першых летапісных згадак пра Полацк і Полацкае княства ў 862 г. і заканчваючы спыненнем існавання Беларускай ССР і распадам Савецкага Саюза ў 1991 г. Дадзены навучальны дапаможнік з’яўляецца скарочанай і значна дапрацаванай у адпаведнасці з сучасным станам гістарычнай навукі і ўніверсітэцкай адукацыі версіяй вучэбных выданняў, апублікаваных у 2003-2004 гг. на беларускай, у 2013 г. на рускай мовах. Ён складзены на падставе тыпавой вучэбнай праграмы па дысцыпліне “Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі” для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі, што вучацца па спецыяльнасці “Міжнародныя адносіны”і іншых, якія выкладаюцца на факультэце міжнародных адносін БДУ.

«Анализ внешней политики Республики Беларусь» з’яўляецца першым навучальным выданнем у Беларусі для магістрантаў па праблематыцы знешняй палітыкі незалежнай Беларусі. Паглыбленае даследаванне знешнепалітычнай дзейнасці краіны за 30-гадовы перыяд дазволіла аўтару кнігі прааналізаваць найбольш істотныя характарыстыкі асноў знешняй палітыкі Беларусі, яе мэт, задач, прынцыпаў і прыярытэтаў, ахарактарызаваць важнейшыя канстытуцыйныя і дзяржаўна-прававыя акты ў сферы нацыянальнай бяспекі, знешняй і ваеннай палітыкі. Дапаможнік змяшчае перыядызацыю знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, змястоўныя агляды айчыннай і замежнай літаратуры па адпаведных тэмах, апісвае ключавыя напрамкі двухбаковых адносін і шматбаковых дыпламатыі Рэспублікі Беларусь. Для англамоўных магістрантаў, што вучацца на факультэце міжнародных адносін БДУ, выдадзены дапаможнікі аб асновах знешняй політыкі Рэспублікі Беларусь і яе адносінах з асноўнымі цэнтрамі сілы сучаснага свету: Расіяй, Кітаем і Еўрапейскім саюзам.

Навуковая дзейнасць дапамагае прафесару ў выкладчыцкай працы. У 2022-2023 навучальным годдзе ён склаў вучэбныя праграмы для 4-х новых курсаў для студэнтаў бакалаўрыята і магістратуры, у тым ліку англамоўных

магістрантаў. Карыстаючыся набытымі ведамі з замежнага супрацоўніцтва, камандзіровак і праектаў, ён праводзіць заняткі і друкуе працы на англійскай мове, выкарыстоўваючы ў выкладанні, даследаваннях і камунікацыях беларускую, рускую і польскую мовы. Выніковым быў 2023 год: апублікавана 12 навуковых прац: два навучальных дапаможніка і 10 навуковых артыкулаў. Сярод іх 8 вышла за мяжой (у Расіі, Вялікабрытаніі і ЗША), 5 артыкулаў у ВАКаўскіх выданнях і да іх прыраўненых (Расіі і Вялікабрытаніі). Два артыкулы індэксаваны ў базе Скопус.

У.Е. Снапкоўскі доўгія гады быў членам вучонага савета факультэта міжнародных адносін БДУ (1995-2022), членам камітэта “Правазнаўства і міжнародныя адносіны” камісіі па вылучэнні работ на саісканне прэміі имя першага рэктара БДУ У. І. Пічэты, застаецца членам рэдкалегій навуковых часопісаў па міжнародных адносінах у Польшчы, Расіі і Украіне. З’яўляўся членам рэдкалегіі часопіса «Веснік БДУ” (сер. 3), членам спецыялізаваных саветаў па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па гісторыі знешняй палітыкі і міжнародных адносін и па палітычных навуках пры БДУ (1998-2012). Ён падрыхтаваў аднаго доктара і чатырох кандыдатаў гістарычных навук па спецыяльнасці «Гісторыя знешняй палітыкі і міжнародных адносін». Зараз вучоны кіруе падрыхтоўкай двух дактарантаў (грамадзян Беларусі) і двух аспірантаў (грамадзян КНР).

Навуковыя дасягненні беларускага гісторыка адзначаны прэміяй імя акадэміка В. А. Капцюга Сібірскага аддзялення Расійскай акадэміі навук (2003 г.) за выданне кнігі «Нарысы гісторыі беларусаў Сібіры» і прэміяй Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя акадэміка У.І. Пічэты (2008) за падрыхтоўку цыкла навучальных і навуковых прац па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі. Яму прысвоена ганаровае званне “Заслужаны работнік БДУ”.

Жадаю Уладзіміру Еўдакімавічу моцнага здароўя, дабрабыту і далейшых творчых дасягненняў у развіцці беларускай навукі аб міжнародных адносінах і выкладанні знешнепалітычнай гісторыі Беларусі і іншых навучальных прадметаў, у распрацоўку якіх ён уносіць вялікі асабісты ўклад.

*А.А.Чалядзінскі -галоўныі навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1992-2017), доктар гістарычных навук*

## 2.5. Слова аб юбіляры, калезе, вучоным і выкладчыку

З прыходам на кафедру міжнародных адносін БДУ ў верасні 1993 года маладога доктара гістарычных навук і прафесара Уладзіміра Еўдакімавіча Снапкоўскага, які раней працаваў у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі, была запоўнена вялікая «беларуская» ніша ў выкладанні і даследаванні міжнародных адносін і знешняй палітыкі як прадмета і асобнай навукі. З 1993–1994 навучальнага года ён пачаў выкладаць на Аддзяленні міжнародных адносін гістарычнага факультэта БДУ новую дысцыпліну

«Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі». Памятую, як я разам прафесарамі нашай кафедры А. А. Разанавым, У. Е. Снапкоўскім, А. В. Шарапам і дэцэнтам Л. В. Лойкам абмяркоўваў пытанне, як назваць новы прадмет, які пачынаў выкладаць У. Е. Снапкоўскі. Прапаноўваліся розныя варыянты – ад «Гісторыі геапалітыкі і дыпламатыі Беларусі» да «Гісторыі знешнепалітычнай дзейнасці і міжнародных сувязей Беларусі», аднак у рэшце рэшт пагадзіліся з назвай, якую прапаноўваў сам выкладчык, а потым і распрацоўшчык гэтага курса. Прымаючы яго прапанову, мы зыходзілі з таго, што беларуская дзяржаўнасць існавала стагоддзямі, а Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае праводзіла актыўную і разнастайную знешнюю палітыку, якую працягвала Рэч Паспалітая.

Пра гэта праўда мы даведаліся пазней, калі на нашай кафедры і ў іншых навучальных і навуковых установах пачалі абараняцца курсавыя і дыпломныя работы, а потым і дысертацыі, пісацца артыкулы і манаграфіі пра знешнюю палітыку і дыпламатыю ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Дарэчы, навуковым кіраўніком і кансультантам саіскальнікаў вучоных ступеняў кандыдата і доктара гістарычных навук па гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ (кандыдацкія дысертацыі В.І.Лазоркінай і С.А.Лашкевіча), як і больш блізкай яму тэматыцы знешнепалітычнай дзейнасці БССР (кандыдацкая Р.Г.Раманоўскага і доктарская С.Ф.Свілас) выступаў праф. У. Е. Снапкоўскі.

Пры гэтым, улічваючы запатрабаванасць кафедры, факультэта, усяго ўніверсітэта, як і іншых навучальных і навуковых устаноў нашай краіны ў кадрах высокай кваліфікацыі па гісторыі знешняй палітыкі і дыпламатыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай ён вымушаны быў асвойваць сярэднявяковую і новую гісторыю Беларусі, каб паспяхова і кваліфікавана кіраваць аспірантамі па гэтай новай для яго тэматыцы. І хаця колькасць абароненых пад яго кіраўніцтвам дысертацый складае адзінкі, аднак кожная з іх станавілася з’явай у навуковым жыцці факультэта і не толькі, а яго вучні сёння паспяхова рэалізуюць сябе на выкладчыцкай працы на факультэце міжнародных адносін БДУ, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, на дыпламатычнай службе ў Міністэрстве замежных спраў.

Сапраўды, у распрацоўцы новай вучэбнай і навуковай дысцыпліны «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» мой калега выступаў піянерам, выкарыстоўваючы прынцып гістарызму да ўсіх форм беларускай дзяржаўнасці: ад старажытнабеларускіх княстваў да сучаснай нам Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым праф. У. Е. Снапкоўскі абапіраўся на канстытуцыйныя палажэнні аб шматвекавых традыцыях беларускай дзяржаўнасці, пра што не забываў паўтараць як у лекцыях, так і на навуковых канферэнцыях. Зараз тэзіс аб тым, што беларуская дзяржаўнасць нарадзілася не ў 1917 г., а значна раней, на тысячу гадоў раней, ужо не аспрэчваецца і спадзяюся, што трывала ўвайшоў у школьныя і ўніверсітэцкія падручнікі па гісторыі, Але ў пачатку 1990-х гадоў яго трэба было прадстаўляць, аргументаваць і абараняць у гарачых дыскусіях у студэнцкіх і навуковых аўдыторыях, на старонках перыядычнага друку і электронных СМІ.

Палажэнне аб глыбокіх гістарычных традыцыях дзяржаўнасці Беларусі ў галіне знешняй палітыкі У. Е. Снапкоўскі адлюстраваў у праекце Канцэпцыі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, які быў падрыхтаваны ў 2001 г. групай вучоных факультэта міжнародных адносін БДУ (праф. А. А. Разанаў, я, начальнік Цэнтра міжнародных даследаванняў У. Я. Улаховіч). Праект праўда не быў прыняты ў высокіх інстанцыях у тым выглядзе, што прадставілі эксперты з БДУ. Аднак на яго падставе быў створаны і зацверджаны Закон аб асноўных кірунках унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь (2005 г.). Наш праект пачынаецца сказам аб тым, што пасля дасягнення незалежнасці Рэспубліка Беларусь выйшла на міжнародную арэну ў двух якасцях: як новая незалежная дзяржава і як краіна, што мае глыбокія знешнепалітычныя традыцыі дзяржаўнасці. Аўтарства гэтай наватарскай фармулёўкі належыць У. Е. Снапкоўскаму і яна ўвайшла ў карыстанне на афіцыйным сайце беларускага Міністэрства замежных спраў, прысутнічае ў энцыклапедыях, навуковай і вучэбнай літаратуры.

Для абгрунтавання сваіх пазіцый прафесар пастаянна звяртаецца да першакрыніц, архіўных і апублікаваных дакументаў і матэрыялаў. Яны назапашаны падчас паездак у архівы і бібліятэкі Берліна, Варшавы, Вільнюса, Вроцлава, Кіева, Лондана, Масквы, Нью-Ёрка і іншых гарадоў. Сотні выяўленых ім архіўных дакументаў апублікаваны ў гісторыка-дыпламатычных зборніках «Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў» (1914–1991 гг.)» у 4 тамах, апошніх тамах выдання «Знешняя палітыка Беларусі (1996–2010 гг.)», «Государственные границы Беларуси (1917–2010 гг.)» у 2 т. Спасылкі на дакументы дазвалялі яму абгрунтавана выкладаць свой пункт погляду па гістарычных і актуальных праблемах знешняй палітыкі Беларусі і міжнародных адносін у дыскусіях з калегамі краін «пояса добрасуседства».

Прафесар ужо больш за 30 гадоў чытае асноўныя курсы па прадметах «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» і «Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь», аднак у сваёй лекцыйнай і даследчыцкай дзейнасці ён не абмяжоўваецца выключна беларускай праблематыкай. Раней ім чыталіся лекцыі па гісторыі міжнародных адносін, міжнародных арганізацыях, міжнародных камунікацыях, спецкурсы па гісторыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і знешняй палітыцы Польшчы. Цяпер іх працягваюць яго калегі па кафедры, удзячныя за метадычныя і навуковыя напрацоўкі, зробленыя пачынальнікам гэтых прадметаў. Сёння апроч беларускай тэматыкі праф. У. Е. Снапкоўскі вядзе прадметы па знешняй палітыцы суседніх дзяржаў і месцы краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў міжнародных адносінах сучаснай Польшчы. Ён рыхтуе да публікацыі навуковыя арыкулы і вучэбныя матэрыялы па гэтых дысцыплінах, па якой не хапае навуковых і вучэбных выданняў. У шырыні яго кругагляду і майстэрстве свабоднага валодання гістарычнымі матэрыяламі і фактамі з іншых дысцыплін навукі аб

міжнародных адносінах мы неаднаразова пераконваліся падчас яго публічных выступленняў і адказаў на пытанні.

Уладзімір Еўдакімавіч вылучаецца высокай патрабавальнасцю і адначасова цярплівасцю ў адносінах да студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў. Неаднаразa быў сведкам, як ён старанна і метадычна тлумачыў падапечнаму, як трэба пісаць працу, як выкладаць праблемныя палажэнні рэферата, курсавой ці дыпломнай работы, дысертацыйнага даследавання.

Падчас навуковых чытанняў на факультэце міжнародных адносін, прысвечаных 60-гадоваму юбілею прафесара У. Е. Снапкоўскага (май 2014 г.), я ўжо меў магчымасць выказаць сваё бачанне яго навуковага шляху і вялікага ўкладу ў беларускую навуку міжнародных адносін, назваўшы яго «выдатным беларускім вучоным». Змест складзенага ім біябібліяграфічнага паказальніка, у якім мне выпала ганаровая роля быць навуковым рэдактарам, яшчэ раз гэта даказвае.

За мінулыя дзесяць год вынікі яго плённай працы на ніве ўніверсітэцкай адукацыі і навукі аб міжнародных адносінах сталі яшчэ больш унушальнымі. Вучоны зацвердзўся як стваральнік новага кірунку ў навуцы і вышэйшай адукацыі - знешнепалітычнай гісторыі Беларусі. Дасягненні У.Е.Снапкоўскага былі высока ацэнены членамі Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў падчас выбараў ў члены-карэспандэнты НАН Беларусі ў лістападзе 2014 г. І гэта была высокая ацэнка не толькі яго асабістага ўклада ў беларускую гістарычную навуку і новую навуку аб міжнародных адносінах, якая зацверджаецца сярод сацыяльных і гуманітарных навук. Гэта было прызнаннем з боку акадэмічнай супольнасці дасягненняў кафедры і факультэта міжнародных адносін БДУ, усёй беларускай школы міжнародных адносін, да стварэння якой прафесар меў непасрэднае дачыненне.

У 2014-2024 гг., маючы на ўвазе толькі пачатак юбілейнага года, ён апублікаваў тры манаграфіі, пяць навучальных дапаможнікаў, тры зборніка дакументаў (як адзін са складальнікаў), у тым ліку адзін з іх за мяжой. У пачатку 2024 г. выдавецтва БДУ выпусціла новае, перапрацаванае і скарочанае выданне дапаможніка “Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі”, якое набыло ўсе рысы класічнага падручніка па знешнепалітычнай гісторыі нашай краіны. Беларуская гістарычная навука можа ганарыцца гэта працай, якая ў форме ранейшых дапаможнікаў праклала шлях да стварэння курса па гісторыі беларускай дзяржаўнасці.

У заключэнне дазволю адзінае пажаданне ў адрас універсітэцкага і знешнепалітычнага начальства - наша праца выкладчыкаў і даследчыкаў-міжнароднікаў павінна ацэньвацца не толькі ўзнагародамі і званнямі, калі яна таго заслугоўвае (і гэта несумненна павінна быць), але быць запатрабаванай у паўседзённым жыцці дыпламатаў, дзяржаўных служачых, спецыялістаў у галіне міжнародных адносін. Пажадаю свайму калегу Уладзіміру Еўдакімавічу Снапкоўскаму здароўя, дабрабыту, новых творчых здзяйсненняў і паспяховай рэалізацыі яго задум, планаў і аспірацый.

*А.В.Гурын, кандыдат гістарычных навук,*
*дацэнт, дактарант кафедры міжнародных адносін БДУ*

## 2.6. У.Е. Снапкоўскі і гістарыяграфія навукі аб міжнародных адносінах

Прафесар Уладзімір Еўдакімавіч Снапкоўскі – адзін з заснавальнікаў кафедры міжнародных адносін БДУ- ўнёс значны, асабісты ўклад у фарміраванне сучаснай навуковай школы беларускіх даследчыкаў у галіне гісторыі і сучасных праблем знешняй палітыкі Беларусі, і гэты ўклад па-праву можна назваць вызначальным.

Калі прааналізаваць навуковыя работы У.Е. Снапкоўскага, можна прыйсці да адназначнай высновы: "чырвонай ніццю" праз іх праходзіць ідэя самастойнасці знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь на ўсіх этапах яе развіцця. Адным з першых ён звярнуў увагу на знешнепалітычную дзейнасць старажытнабеларускіх дзяржаў і Вялікага княства Літоўскага, знешнепалітычную актыўнасць БНР і БССР у першыя гады іх існавання і далейшага развіцця, а таксама пасля рэальнага замацавання знешнепалітычных паўнамоцтваў рэспублікі ў 1944 г. Вялікую частку навуковай працы прафесара складае аналіз знешняй палітыкі сучаснай Беларусі. Пры гэтым ён не толькі даследуе тыя ці іншыя значныя падзеі, але і выпрацоўвае рэкамендацыі для органаў дзяржаўнага кіравання па далейшай аптымізацыі знешнепалітычнай актыўнасці краіны. Вельмі каштоўна тое, што гэтыя рэкамендацыі выпрацоўваюцца с пункту гледжання нацыянальных інтэрэсаў Беларусі, уселяк падкрэсліваюць самастойнасць і незалежнасць нашай краіны.

У.Е. Снапкоўскі адным з першых сярод гісторыкаў БССР звярнуў увагу на неабходнасць адмовы ад старых догмаў і стэрэатыпаў, укараненне новых падыходаў у даследчыцкай працы па вывучэнню міжнароднай дзейнасці БССР ("За передовую науку", 1989). З гэтых жа пазіцый ім напісана доктарская дысертацыя "Внешнеполитическая деятельность Белорусской ССР (1944–1953 гг.)". Упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі ў дысертацыі прааналізаваны гістарычныя абставіны канстытуцыйных змяненняў 1944 г., у выніку якіх БССР атрымала знешнепалітычныя паўнамоцтвы, ахарактарызавана складаная дыпламатычная гісторыя ўключэння Беларусі і Украіны ў лік дзяржаў-заснавальніц ААН.

Вучоны-гісторык з'яўляецца складальнікам і рэдактарам зборнікаў дакументаў і матэрыялаў па знешняй палітыцы Беларусі "Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.)", "Знешняя палітыка Беларусі (1996–2010 гг.)", "Государственные границы Беларуси (1917-2010 гг.)" і інш.

Важным укладам у фарміраванне айчыннай навукі міжнародных адносін стала стварэнне У.Е. Снапкоўскім навукова-метадычнага забеспячэння і публікацыя першых падручнікаў па дысцыплінах "Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі" і "Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь". Вучоны ўпершыню зрабіў перыядызацыю гісторыі знешняй палітыкі Беларусі і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, сфарміраваў тэарэтыка-метадалагічныя і вучэбна-метадычныя

падыходы да выкладання гісторыі айчыннай знешняй палітыкі ад пачаткаў беларускай дзяржаўнасці да сённяшняга часу.

Асобую ўвагу хацеў бы звярнуць на працы прафесара Снапкоўскага як гістарыёграфа ўсеагульнай навейшай гісторыі і гісторыі міжнародных адносін. У гэтай сферы ён таксама стаў адным з першых даследчыкаў, які ўвасобіў новыя падыходы ў гістарыяграфічны дыскурс беларускай гістарычнай навукі. Яшчэ ў 1984 г. у аўтарытэтным саюзным часопісу “Новая і навейшая гісторыя” быў апублікаваны яго артыкул “Даследаванне праблем новай і навейшай гісторыі ў Беларускай ССР”. Каштоўнасць гэтай працы заключалася ў тым, што аўтар упершыню паказаў, што значная колькасць даследаванняў па новай і навейшай гісторыі у рэспубліцы тычылася міжнароднай праблематыкі, пры тым, што такія даследаванні ажыццяўляліся не толькі ў Інстытуце гісторыі АН БССР, дзе была адпаведная даследчая адзінка, але і ва установах вышэйшай адукацыі, у першую чаргу ў БДУ.

Значным з пункту гледжання беларускай гістарыяграфіі трэба назваць артыкул У.Е. Снапкоўскага “Аб навуковых даследаваннях аддзела нацыянальных і міжнародных адносін Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі (1960–1990–я гг.)” (“Беларускі часопіс міжнароднага права і міжнародных адносін”, 2000), дзе акрэслены кірункі навукова–даследчай працы беларускіх гісторыкаў праз прызму дзейнасці асобнага даследчага цэнтра ў галіне гісторыі знешнепалітычнай дзейнасці БССР за 30 год. У 1979-2000 гг. гісторык працаваў у складзе гэтага аддзела, у тым ліку ў якасці загадчыка ў апошнія пяць гадоў.

Гістарыяграфічны аналіз знешнепалітычай гісторыі Беларусі змяшчаецца ў кнізе У.Е. Снапкоўскага “Традыцыі і навацыі ў знешнепалітычных даследаваннях Беларусі” (Мінск, 2020), дзе праблемам крыніцазнаўства і гістарыяграфіі прысвечана асобная глава, і іншых яго працах.

Адна з найбольш важных высноў, да якіх прыйшоў аўтар, заключаецца ў тым, што вывучэнне замежных сувязей БССР беларускімі вучонымі савецкага часу нельга ацэньваць адназначна. З аднаго боку, на іх моцна ўплывала дзяржаўная гістарычная палітыка з жорсткім акцэнтам на марксісцка-ленінскую метадалогію. З другога боку, даследчыкамі быў сабраны і старанна абагульнены велізарны фактычны матэрыял, зроблены асобныя высновы, што зусім абгрунтавана можна выкарыстоўваць і сёння. Прафесар У.Е.Снапкоўскі лічыць, і з гэтым нельга не згадзіцца, што, фактычна, на савецкім навуковым падмурку ў перыяд незалежнай Беларусі былі мадэрнізаваны старыя і створаны новыя цэнтры міжнародных даследаванняў.

Гістарыяграфічныя працы У.Е. Снапкоўскага абмяжоўваюцца толькі вышэй названымі; мною адзначаны найбольш знакавыя з іх. На думку аўтара, У.Е. Снапкоўскі – вядучы гістарыёграф навукі міжнародных адносін у Беларусі ў першую чаргу з прычыны таго, што ён з’явіўся першым, хто пачаў вывучэнне гэтай тэматыкі і падрыхтоўку навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Пад яго навуковым кіраўніцтвам аўтарам абаронена першая ў нашай краіне кандыдацкая дысертацыя пра даследаванне міжнародных

адностн у Беларусі ў 1980-2003 гг. У далейшым прафесар усяляк заахвочваў аўтара да прадаўжэння даследаванняў станаўлення і развіцця міжнародных адносін у Беларусі ў канцы XX-пачатку XXI ст. У выніку з'явіўся шэраг нашых публікацый і першая манаграфія па па гэтай тэматыцы. Сёння аўтар з прыемнасцю і творчым задавальненнем працуе пад началам свайго навуковага кансультанта над доктарскай дысертацыяй

Важнай характарыстыкай вялікага вучонага з'яўляецца наяўнасць вучняў, якія ў стане працягнуць яго работу. Адносна гэтай характарыстыкі трэба згадаць не толькі навукоўцаў, якія працавалі непасрэдна пад яго кіраўніцтвам, але і тыя, для каго працы вучонага сталі штуршком для навуковай дзейнасці, і такіх навукоўцаў шмат.

Аўтару гэтага нарыса штуршок у навуку таксама даў У.Е. Снапкоўскі – калі трэба было вызначыць тэматыку будучай кандыдацкай дысертацыі ён звярнуў увагу аўтара на вялікія поспехі айчынных навукоўцаў у галіне міжнародных адносін і іх на той час недасканалую даследаванасць. Трэба сказаць, што на той момант (пачатак 2000-х гг.) айчынныя традыцыі вывучэння і выкладання міжнародных адносін яшчэ толькі складваліся, а сама навука знаходзілася на пэўным раздарожжы: яна адмовілася ад савецкіях традыцый і падыходаў, а новыя яшчэ толькі фарміраваліся. Паколькі на той момант падрыхтоўка спецыялістаў ішла на аснове савецкай і замежнай, у першую чаргу расійскай, літаратуры, айчынныя распрацоўкі савецкага і постсавецкага перыяду заставаліся за полем зроку шырокай грамадскасці. Таму, адной з цэнтральных мэтаў навуковых прац аўтара, выкананых пад кіраўніцтвам У.Е. Снапкоўскага, стала магчымасць зноў успомніць (і не забыць у будучым) імёны як вядомых вучоных, так і звычайных навуковых супрацоўнікаў, якія прысвяцілі сваё жыццё ў навуцы вывучэнню міжнароднай праблематыкі.

Больш глыбокае вывучэнне дасягненняў айчынных навукоўцаў у галіне навукі аб міжнародных адносінах вядзе да высновы, што ў познесавецкія часы ў рэспубліцы склаліся пэўныя традыцыі міжнародных даследаванняў. У постсавецкі перыяд з дасягненнем Беларуссю незалежнасці міжнародныя адносіны сталі самастойнай навуковай галіной з уласнай метадалогіяй, арганізацыйнымі цэнтрамі, навуковымі школамі, колькаснымі і якаснымі дасягненнямі і запатрабаванасцю вынікаў дзяржавай і грамадствам. На гэтым фоне больш змястоўнымі сталі і гістарыяграфічныя агляды даследчыкаў у іх навуковых работах. У тым, што такія даследаванні былі распачаты ў айчыннай навуцы і працягваюцца зараз ёсць значная заслуга прафесара У.Е. Снапкоўскага.

Са свайго боку, боку вучня, навукоўца і калегі, хочацца падзякаваць Уладзіміра Еўдакімавіча за яго плённую навуковую працу, вялікую дапамогу аўтару ў паўсядзённых навуковых даследаваннях, невычарпальную энергію, якою ён шчодра дзеліцца са сваімі вучнямі і калегамі, і пажадацаць здароўя, доўгіх гадоў жыцця, далейшых навуковых дасягненняў, міру і дабрабыту.

*С.А. Лашкевіч- кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры міжнародных адносін БДУ*

## 2.7. Прафесар У.Е. Снапкоўскі як даследчык, выкладчык, навуковы кіраўнік і настаўнік

Доктара гістарычных навук, прафесара кафедры міжнародных адносін БДУ Уладзіміра Еўдакімавіча Снапкоўскага добра ведаюць у Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі як выдатнага гісторыка і спецыяліста па гісторыі знешняй палітыкі і дыпламатыі Беларусі XX–XXI ст. Менавіта па гэтаму перыяду надрукавана пераважная большасць навуковых прац гісторыка. Разам з тым па-за ўвагай даследчыкаў гістарыяграфіі знешнепалітычнай дзейнасці і дыпламатыі Беларусі засталіся яго навуковыя даследаванні перыяду сярэднявечча і новага часу.

Сёння ўпэўнена можна канстатаваць, што У.Е.Снапкоўскі з'яўляецца адным з першых у Рэспубліцы Беларусь, хто распачаў навуковую працу па вывучэнні знешнепалітычнай гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Плённая выкладчыцкая і даследчыцкая дзейнасць на гэтым кірунку прынесла свае вынікі: у беларускай гістарычнай навуцы і навуцы аб міжнародных адносінах створана навуковая школа прафесара У.Е.Снапкоўскага па вывучэнню знешнепалітычнай гісторыі ВКЛ. Да гэтай школы я таксама належу і ганаруся тым, што Уладзімір Еўдакімавіч з'яўляўся маім навуковым кіраўніком па кандыдацкай дысертацыі і настаўнікам на кафедры міжнародных адносін БДУ і па жыцці.

Першае знаёмства з Уладзімірам Еўдакімавічам адбылося ў верасні 1997 г., калі я быў студэнтам 2 курса спецыяльнасці «Міжнародныя адносіны» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і слухаў лекцыйны курс майго будучага навуковага кіраўніка па дысцыпліне «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі». Такі курс лекцый быў распрацаваны прафесарам упершыню ў акадэмічным выкладанні дыпламатычнай гісторыі асобных дзяржаў і сусветнай вучэбна-метадычнай практыцы. Распрацоўшчык гэтай дысцыпліны паставіў сабе за мэту пазнаёміць студэнтаў профільнай спецыяльнасці з асноўнымі кірункамі і асаблівасцямі знешнепалітычнай дзейнасці розных дзяржаўных утварэнняў, якія існавалі на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь, пачынаючы з IX ст. і заканчваючы 90-х гг. XX ст. Дагэтуль у беларускай і сусветнай гістарыяграфіі не існавала спецыялізаваных і сістэматызаваных прац па знешнепалітычнай дзейнасці дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі нашай сучаснай дзяржавы.

Трэба адзначыць выключную важнасць, а таксама моцную зацікаўленасць з боку дзяржаўных установ і навуковага асяроддзя да пазначанай дысцыпліны, паколькі гэта быў першы вопыт выкладання адпаведнага курса ў Рэспубліцы Беларусь. Вывучэнне знешнепалітычных традыцый дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку старажытнабеларускіх дзяржаў-княстваў і ВКЛ, было запатрабавана як беларускай грамадскасцю ў цэлым, так і спецыялістамі ў прыватнасці. Храналагічна вучэбная дысцыпліна была падзелена на некалькі гістарычных перыядаў, якія супадалі з гадамі існавання дзяржаўных утварэнняў

на тэрыторыі Беларусі, і чыталася для студэнтаў факультэта міжнародных адносін у двух семестрах. У першым семестры вывучалася знешнепалітычная гісторыя першых дзяржаў-княстваў на тэрыторыі Беларусі ад узнікнення Полацкага княства і да трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай уключна, у другім, – перыяд існавання беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі і гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў яе знешнепалітычных аспектах у XX ст.

Лагічным вынікам напружанай працы гісторыка па вывучэнню знешнепалітычнай гісторыі Беларусі стала выданне ў 2003-2004 гг. вучэбнага дапаможніка ў двух частках пад назвай «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» [1; 2]. У 2013 г. навучальны дапаможнік быў дапоўнены і выдадзены на рускай мове ў серыя “Класічнае ўніверсітэцкае выданне”, што дазволіла значна большай колькасці навукоўцаў на постсавецкай прасторы не толькі азнаёміцца з высновамі прафесара, але і спрасціла працэс выкладання дысцыпліны для замежных студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў [3].

Менавіта на першых лекцыях Уладзіміра Еўдакімавіча ў мяне з’явілася цікавасць да гісторыі знешнепалітычнай дзейнасці і дыпламатыі ВКЛ у паслялюблінскі перыяд. Было цікава і ў нейкім сэнсе нечакана даведацца, што пасля падпісання Люблінскай уніі Вялікае Княства не толькі не перастала існаваць, але і істотна ўплывала на знешнюю палітыку новастворанай дзяржавы абодвух народаў Рэчы Паспалітай. Асаблівасцю выкладання прафесара была сістэмнасць, магчымасць даступна і простымі словамі данесці да студэнтаў увесь спектр праблем і супярэчнасцяў кожнага гістарычнага перыяду, дэталёвае веданне зместу крыніц і гістарыяграфіі. Яго выключнае майстэрства вядзенне дыскусіі са студэнтамі спалучалася з інтэлігентнасцю і гатоўнасцю выслухаць розныя пункты гледжання. Дадзеныя акалічнасці несумненна аказалі вялікі ўплыў на маё рашэнне звязаць сваю прафесійную будучыню з гістарычнай навукай, а тэматыка знешнепалітычных інтарэсаў ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай стала прадмета маіх навуковых інтарэсаў на бліжэйшыя два дзесяцігоддзі.

На наступных курсах майго навучання на факультэце міжнародных адносін я кансультаваўся ў Уладзіміра Еўдакімавіча па розных вучэбных і навуковых пытаннях знешняй палітыкі і міжнародных адносін, а таксама наведваў курсы лекцый па яго дысцыплінах: «Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь» і «Гісторыя стварэння і дзейнасці ААН і яе спецыялізаваных устаноў».

Пасля паступлення ў аспірантуру БДУ на спецыяльнасці 07.00.15 – гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі праф. У.Е.Снапкоўскі быў прызначаны маім навуковым кіраўніком і я працягнуў ўжо на больш якасным узроўні даследаваць знешнепалітычную гісторыю ВКЛ другой паловы XVI ст. Навуковым кіраўніком была пастаўлена задача паглыблена даследаваць знешнепалітычныя інтарэсы Княства пасля падпісання Люблінскай уніі. Асновай для пачатку вывучэння праблемы былі папярэднія артыкулы навуковага кіраўніка [4–5], а таксама нешматлікія даследаванні беларускіх і замежных гісторыкаў. На нашых кансультацыях неаднаразова гучала сфармуляваная навуковым кіраўніком гіпотэза, што пасля заключэння Люблінскай уніі ВКЛ

працягвала забяспечваць свае знешнепалітычныя інтарэсы пасля вельмі насычанага падзеямі перыяду самастойнасці, а спецыфіка палітычнага становішча Княства ў рамках агульнай Рэчы Паспалітай дазваляла яму адстойваць сваю дзяржаўную пазіцыю. Па сутнасці размова ішла пра знешнепалітычны сепаратызм Княства, які асабліва праяўляўся ў другой палове XVI – першай палове XVII ст. Кіраўніком ставілася задача шукаць у гістарычных крыніцах доказы самастойнасці знешнепалітычнай дзейнасці Княства, што і было паспяхова выканана.

У 2015 г. я абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Дыпламатыя Вялікага Княства Літоўскага ва ўзаемаадносінах Рэчы Паспалітай і Расійскай дзяржавы (1586–1598 гг.)» і застаюся вельмі ўдзячны Уладзіміру Еўдакімавічу за навуковае кіраўніцтва і падтрымку, якую я і зараз адчуваю, працуючы разам з ім на кафедры міжнародных адносін БДУ [5].

Навуковую школу даследчыкаў знешнепалітычнай гісторыі ВКЛ, якую стварыў прафесар, прадстаўляюць іншыя здольныя і таленавітыя даследчыкі: кандыдаты гістарычных навук, дацэнты В.І. Лазоркіна, А.В. Дземідовіч і А.М. Янушкевіч. Нас усіх аб'ядноўвае тое, што прадметам навуковага даследавання з'яўляецца арганізацыя знешняй палітыкі і дыпламатыя Вялікага Княства менавіта ў паслялюблінскі перыяд. Мы таксама кіруемся метадалагічнай ўстаноўкай настаўніка аб неабходнасці пошуку знешнепалітычных традыцый Беларусі, якія фарміраваліся ў рамках папярэдніх гістарычных форм беларускай дзяржаўнасці [6–10].

Дзякуючы сваёй даследчыцкай і выкладчыцкай дзейнасці ў галіне знешнепалітычнай гісторыі Беларусі Уладзімір Еўдакімавіч Снапкоўскі з'яўляецца не толькі прызнаным спецыялістам знешнепалітычнай тэматыкі Беларусі XX–XXI ст., але і стваральнікам навуковай школы даследчыкаў знешняй палітыкі і дыпламатыі Вялікага Княства Літоўскага XVI-XVII ст., якая сфарміравалася ў БДУ і зрабіла значны ўклад у распрацоўку пазначаных гістарычных праблем.

Жадаю паважанаму прафесару і настаўніку моцнага здароўя, шчасця, рэалізацыі новых творчых здзяйсненняў у навукова-педагагічнай дзейнасці.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**

1. Снапкоўскі, У. Е. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі : вучэб. дапам. : у 2 ч. / У. Е. Снапкоўскі. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2003–2004. – Ч. 1 : Ад пачаткаў дзяржаўнасці да канца XVIII ст. – 2003. – 280 с.
2. Снапкоўскі, У. Е. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі : вучэб. дапам. : у 2 ч. / У. Е. Снапкоўскі. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2003–2004. – Ч. 2 : Ад канца XVIII да пачатку XXI ст. ч. 2. - 2004. - 302 с.
3. Снапковский, В. Е. История внешней политики Беларуси : пособие / В. Е. Снапковский. – Минск : БГУ, 2013. – 495 с.
4. Снапкоўскі, У. Дыпламатыя Л. Сапегі на маскоўскім кірунку / У. Снапкоўскі // Вялікі канцлер Вялікага княства: да 450-годдзя з дня нараджэння Льва Сапегі : зб. матэрыялаў I Міжнар. Сапеж. чытанняў

ў Віцебску, II і III Рэсп. Сапеж. чытанняў у Віцебску – Астроўне / склад. і рэд. Г.М. Праневіч. – Мінск, 2008. – С. 21–31.
5. Снапкоўскі, У. Е. Пра калізіі знешнепалітычных інтарэсаў польскай Кароны і Вялікага Княства ў складзе Рэчы Пасалітай / У. Е. Снапкоўскі // Спадчына. – 1995. – № 3. – С. 189–200.
6. Лашкевіч, С. А. Дыпламатыя Вялікага Княства Літоўскага ва ўзаемаадносінах Рэчы Паспалітай і Расійскай дзяржавы (1586–1598 гг.) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.15 / С. А. Лашкевіч. – Мінск, 2013. – 138 л.
7. Лазоркина, О. И. Дипломатическая служба Великого княжества Литовского во внешнеполитическом механизме Речи Посполитой в 1600–1697 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.15 / О. И. Лазоркина ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2009. – 24 с.
8. Дземідовіч, А. В. Адносіны Рэчы Паспалітай са Швецыяй у 1611–1617 гг. / А. В. Дземідовіч // Весці БДПУ. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2017. – № 4. – С. 15–19.
9. Дземідовіч, А. В. Палітычная актыўнасць Вялікага Княства Літоўскага падчас вайны Швецыі з Рэччу Паспалітай 1625– 1629 гг. / А.В. Дземідовіч // Труды БГТУ. – 2017. – № 1.— С.15–20.
10. Янушкевіч, А. М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг. / А. М. Янушкевіч. – Мінск : Медисонт, 2007. – 353 с.

## 2.8. М.В.Стрелец. Интервью с В.Е.Снапковским в связи с 80-летием ООН: Важнейшее направление в деятельности белорусской дипломатии

В 2025 году отмечается 80 лет с того момента, когда началась история Организации Объединённых Наций (ООН). В связи с круглой датой мы взяли интервью у доктора исторических наук, профессора кафедры международных отношений факультета международных отношений Белорусского государственного университета Владимира Евдокимовича Снапковского. Это – главный специалист по истории ООН в нашей стране.

**В.Е.Снапковский**: Михаил Васильевич, благодарю за приглашение поделиться своими мыслями о предстоящем юбилее ООН. Как я понимаю, оно не случайно, а навеяно нашим давним знакомством. Мы прошли хорошую школу изучения международных отношений и внешней политики. Нашими учителями в 1970-80-е годы были прекрасные люди, педагоги и ученые, оставившие неизгладимый след в белорусской науке и университетском историческом образовании, и конечно в наших сердцах и памяти. Профессора Л.М.Шнеерсон и Г.М.Трухнов, доценты М.Г.Елисеев и В.И.Синица… Это мои учителя. Михаил Герасимович Елисеев стал старшим товарищем и я бы даже сказал сегодня, настоящим другом. О них мы помним, вспоминаем на конференциях и в лекциях, в своих статьях и книгах. Вы были и остаетесь инициатором таких волнительных, юбилейных и

памятных мероприятий, в которых всегда стремлюсь принять участие. Ценю Ваш вклад в белорусскую биографистику новейшей истории и международных отношений, которую также пополняю своими воспоминаниями и биографическими очерками.

Правда наши учителя не учили нас истории внешней политики и дипломатии Беларуси. Не было такого курса, дисциплины, научного направления в советской высшей школе. Мне пришлось его создавать, придя на кафедру и факультет международных отношений БГУ. Учился писать учебник по истории внешней политики Беларуси у классиков белорусской исторической школы В.И.Пичеты, В.М.Игнатовского, В.Ю.Ластовского, М.В.Довнар-Запольского. А специалистом по истории ООН стал, опираясь на достижения и наследие академических ученых в области истории и международного права С.Д.Войтовича и Ю.П.Бровки, наших министров иностранных дел К.В.Киселева и А. Е.Гуриновича. Это позволило действительно создать небольшую библиотеку своих книг по истории ООН и деятельности Белорусской ССР во всемирной организации (пять монографий и пять сборников документов). Документальные издания подготовил вместе с коллегами по работе. Два сборника документов о деятельности БССР в ООН в 1945-1991 гг. надеюсь увидят свет. Первый находится в управлении редакционно-издательской деятельности БГУ. Это мое длинное вступление и (бэкграунд) к вашей характеристике как «главного специалиста по истории ООН в нашей стране».

***М.В.Стрелец:*** *Владимир Евдокимович, всё познаётся в сравнении. Предшественница ООН – Лига Наций. Без краха последней не было бы ООН. Создавая ООН, её отцы-основатели заявляли, что не повторят ошибок Лиги Наций, что создаётся весьма эффективный инструмент по поддержанию международного мира и безопасности. Но прошло 80 лет и подобные ожидания не сбылись. Почему? Можно ли считать, что великие державы наступают на те же грабли?*

**В.С.:** Если говорить о предшественнице ООН, Лиге Наций, то это была первая универсальная международная организация. Она была создана после Первой мировой войны как реакция победителей, государств Антанты, на то, чтобы новая мировая война не повторилась. В Статуте ЛН был предусмотрен механизм санкций против государств-агрессоров. Он однако не сработал. Тем не менее так называемые ревизинистские государства опасались санкций и мирового осуждения за свою агрессивную политику, поэтому нацистская Германия, Япония, Италия заблаговременно вышли из состава Лиги Наций. СССР был исключен из Лиги Наций после начала войны с Финляндией в декабре 1939 г. Поэтому И.Сталин извлек из этого исторический урок, потребовав для СССР права вето в Совете Безопасности новой международной организаций, названной ООН. США также были заинтересованы в обеспечении своих интересов правом вето. На этом сошлись интересы «великой тройки» (СССР, США и Великобритании) в создании Объединенных Наций.

Если говорить об ожиданиях спустя 80 лет после возникновения ООН, то я бы оценил ее деятельность положительно. Эта организация изменила мир и современную систему международных отношений. Она содействовала мировому прогрессу, экономическому и социальному развитию, правам человека, деколонизации. ООН пережила холодную войну между сверхдержавами (СССР и США), 30-летний период постбиполярного мира. А сейчас встраивается в новый мировой порядок из нескольких более или менее равнозначных полюсов. Недостатки ООН как вторичного субъекта международного права вытекают из эгоистических интересов прежде всего великих держав, играющих первичную роль в международных отношениях. Это политический реализм, о которого не уйти.

***М.С.*** *А зараз важна разабрацца з імкненнем Крамля вырашыць праблему "множнага прадстаўніцтва саюзных рэспублік на міжнароднай арэне". Першая спроба вырашэння праблемы была зроблена ў 1943 г. Пасля Сталінградскага трыўмфу савецкі лідэр палічыў, што наступіў зручны момант дляываду суб'ектаў савецкай федэрацыі на міжнародную арэну. Усяго іх было 16. У Крамлі адчувалася жаданне мець 17 галасоў у міжнародных арганізацыях і найперш у праектаванай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН). Адзін голас быў ад федэрацыі ў цэлым, гэта значыць ад СССР. Сямнаццаць галасоў думаліся як праграма-максімум. Праграма-мінімум выглядала так: 1 голас ад СССР і 7 галасоў ад заходніх суб'ектаў савецкай фэдэрацыі. Чаму ж не былі выкананы абедзве праграмы? БССР, УССР у складзе чальцоў-заснавальнікаў ААН: заканамернасць ці ўдалы збег акалічнасцяў?*

**В.С.:** Што датычыцца прадстаўніцтва саюзных рэспублік на міжнароднай арэне, то І.Сталін вырашыў зрабіць рэвалюцыю ў міжнародным праве і дыпламатыі, запатрабаваўшы для іх асобнага прадстаўніцтва і права голасу. Да гэтага члены федэратыўнай дзяржавы не маглі самастойна ўдзельнічаць у міжнародных адносінах, а толькі са згоды цэнтральнага, саюзнага ўрада. Былы наркам па справах нацыянальнасцяў у ленінскім урадзе вырашыў выпусціць рэспублікі на міжнародную арэну, каб яны забяспечвалі Савецкаму Саюзу мноства галасоў у міжнародных арганізацыях і на пасляваенных канферэнцыях. СССР з 17 галасамі ў праектаванай ААН мог заблакаваць любое рашэнне Генеральнай Асамблеі, дзе рашэнні прымаліся большасцю ў дзве трэці галасоў, паколькі 17 галасоў складалі трэць ад складу дзяржаў-заснавальніц ААН (усяго 51 дзяржава ў 1945 г.). Не складала цяжкасці знайсці яшчэ некалькі галасоў для пашырэння гэтай «блакіруючай трэці”. ЗША не адразу разгадалі таемныя планы Крамля, а калі зразумелі, у чым справа, актыўна ўспрацівіліся. У.Чэрчыль стаяў крыху ўбаку, зацікаўлены ў множным прадстаўніцтве былых брытанскіх дамініёнаў разам з Індыяй, якая тады яшчэ была калоніяй.

У выніку на Ялцінскай канферэнцыі Ф.Рузвельт і У.Чэрчыль пагадзіліся падтрымаць савецкую прапанову аб членстве ў новай міжнароднай арганізацыі дзвюх саюзных рэспублік (Украіны і Беларусі, у

такім парадку яны названы ў рашэнні канферэнцыі). Каб падкрэсліць іх значэнне ў савецкай федэратыўнай дзяржаве, І.Сталін назваў УССР і БССР "дзвюма асноўнымі савецкімі рэспублікамі". Ф.Рузвельт і У.Чэрчыль задаволілі яго просьбу, а ўся "вялікая тройка" пагадзілася лічыць гэтую праблему "дадатковымі галасамі" для сябе. Прэзідэнт ЗША аказаўся неяк ушчэмленым, таму таксама папрасіў у Ялце пару галасоў, але затым адмовіўся ад іх, сустрэўшы рэзкую крытыку ўнутры краіны. Нашае першапачатковае сяброўства ў ААН - гэта аднак не толькі вынік вялікай гульні «вялікай тройкі», але і прызнанне найперш укладу беларускага народа ў справу Аб'яднаных Нацый і разгром нацысцкай Германіі і яе сатэлітаў.

***М.С.:*** *Ці ёсць падставы лічыць статыстамі дэлегацыі БССР у ААН (1945-1991 гг)? Назавіце, калі ласка, найбольш важныя рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі ААН, у распрацоўцы і прыняцці якіх актыўна ўдзельнічалі гэтыя дэлегацыі.*

**В.С.:** 45-гадовы перыяд дзейнасці БССР у ААН і яе спецыялізаваных установах (ад Сан-Фанціскай канферэнцыі 1945 г. да 45-й сесіі Генеральнай Асамблеі ўключна (снежань 1990 г.) - гэта гады актыўнай працы «беларускага атрада савецкай дыпламатыі». Так названа мая кніга (2021 г.), у назве якой раскрыты глыбокі сэнс таго, што магла і рабіла саюзная рэспублікі на форуме ААН у інтарэсах савецкай знешняй палітыкі і дыпламатыі. БССР, як і ўсе іншыя саюзныя рэспублікі, не была суверэннай і незалежнай дзяржавай у складзе Савецкага Саюза, а вымушана была праводзіць адзіную знешнепалітычную лінію КПСС і савецкай дзяржавы. Калі я ў 1982 г. на міжнароднай канферэнцыі ў Рызе ў гонар 60-годдзя стварэння СССР паспрабаваў выкарыстаць тэрмін "беларуская дыпламатыя", мяне, маладога тады даследчыа, акуратна, але цвёрда папраўілі масцітыя маскоўскія навукоўцы. Яны сказалі, што саюзная рэспубліка не можа мець сваёй дыпламатыі і тым больш знешняй палітыкі. У публікацыі артыкула было пазначана ці дакладней выпраўлена, што аўтар мае на ўвазе «беларускі атрад савецкай дыпламатыі». Гэта тэрмін дакладна выражае сутнасць знешнепалітычнай актыўнасці дэлегацыі БССР у ААН і іншых міжнародных арганізацыях. Зыходзячы з гэтага разумення, лягчэй характарызаваць і ацэньваць ролю і значэнне дзейнасці рэспублікі ў ААН.

Работнікі МЗС БССР (аператыўна-дыпламатычны склад якога налічваў у канцы 1980-х гг. усяго каля 30 чалавек), дзейнічаючы ў строга акрэсленых канстытуцыйна-прававых і палітыка-ідэалагічных рамках савецкай унітарна-федэратыўнай дзяржавы, паспяхова выконвалі свой прафесійны і патрыятычны абавязак. Па ініцыятыве БССР прынята адна з першых рэзалюцый Генеральнай Асамблеі аб выдачы і пакаранні ваенных злачынцаў (1946 г.). Беларускія дэлегацыі актыўна змагаліся за мір, міжнародную бяспеку і раззбраенне, унеслі вялікі ўклад у працэс дэкаланізацыі і падтрымкі незалежнага развіцця дзяржаў Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. У 1974—1975 гг. БССР упершыню была прадстаўлена ў Савеце Бяспекі ААН. На жаль

наступныя спробы ўжо незалежнай Беларусі быць абранай у яго склад у якасці непастаннага члена на два гады не ўвянчаліся поспехам.

***М.С.:*** *Какую роль играет современная Беларусь в ООН? Какой резонанс имели инициативы, выдвинутые Главой белорусского государства Александром Лукашенко с трибуны ООН? О чём шла речь ходе встречи А.Г. Лукашенко с постоянным представителем Республики Беларусь Валентином Рыбаковым в начале февраля 2025 года?*

**В.С.:** После достижения независимости 25 августа 1991 г., когда Декларация о государственном суверенитете БССР получила статус конституционного закона, начался качественно новый период деятельности Беларуси в ООН, как и в целом ее внешней политики. Интересно однако, что официальный справочник ООН датирует официальную дату провозглашения независимости 19 сентября 1991 г., когда было принято решение Верховного Совета о переименовании Белорусской ССР в Республику Беларусь. Но дата нашего первоначального членства остается неизменной – 24 октября 1945 г. когда Устав ООН вступил в силу и этот день отмечается в мире как День Объединенных Наций. Это наш общий праздник, который мы отмечаем вместе с Российской Федерацией, Украиной, другими государствами-основателями ООН.

Роль и место Республики Беларусь в ООН приобрели качественно новое измерение, когда наша страна стала реально суверенным, политически и юридически независимым государством. Я позволю себе цитату из своего учебника 2003 г., где сказано, что “Беларусь после провозглашения независимости вышла на международную арену в двух качествах: нового независимого государства и европейской страны с богатыми историческим традициями внешнеполитической деятельности”. Переплетение истории и модерна создает хорошую базу для проведения дипломатии в национальных интересах.

1990-е годы ознаменовались инициативами, отражающими жизненные и животрепещущие интересы белорусской нации. Это резолюция Генеральной Ассамблеи о поддержке международного сотрудничества в минимизации последствий чернобыльской катастрофы, инициатива о создании в Центральной и Восточной Европе безъядерного пространства, вывод ядерного оружия с территории страны, существенное уменьшение нашего взноса в регулярный бюджет ООН, участие в миротворческих операциях, предложения о цивилизационном разнообразии мира, торговле людьми и другие. Ряд крупных конструктивных инициатив был выдвинут президентом А.Лукашенко на саммитах ООН.

В последние годы он проводит регулярные встречи с постоянным представителем Республики Беларусь в ООН В. Рыбаковым, на которых обсуждаются ситуация в ООН и США (в преддверии, а теперь и после президентских выборов), новая политика администрации Д.Трампа в отношении ООН и других международных структур. США вышли из ВОЗ, приостановили участие в ЮНЕСКО, отказались поддерживать резолюции с

осуждением действий России в Украине. Этот резкий разворот требует внимательного изучения со стороны политиков и аналитиков, что сейчас и происходит. Как известно, БССР вместе с СССР и УССР также выходила из ВОЗ в 1949 г., чтобы затем вернуться в 1992 г. Для Беларуси ООН остается важнейшим и незаменимым международным форумом, который мы создавали 80 лет назад и который сохраняет для нас свое уникальное значение.

Благодарю за беседу. Михаил Стрелец 20.02.2025

*А. А.Дастанка , Ю. І.Малевіч, А. В.Шарапа, А. У.Селіванаў*

## Юбілей Уладзіміра Еўдакімавіча Снапкоўскага: вядомаму беларускаму вучонаму 70 год[7]

22 мая 2024 г. факультэт міжнародных адносін урачыста адсвяткаваў 70-гадовы юбілей вядомага беларускага вучонага, доктара гістарычных навук, прафесара кафедры міжнародных адносін факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Уладзіміра Еўдакімавіча Снапкоўскага.

У. Е. Снапкоўскі нарадзіўся 22 мая 1954 г. у Віцебску. У 1976 г. ён паспяхова скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 1980 г. абараніў у БДУ кандыдацкую дысертацыю аб адносінах паміж ГДР і ФРГ у 1970-я гг., а ў 1993 г. у Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі - доктарскую дысертацыю аб знешнепалітычнай дзейнасці Беларускай ССР у 1944-1953 гг. У 1979—1993 гг. ён працаваў у Інстытуце гісторыі АН БССР (НАН Беларусі) у якасці малодшага, потым старшага і вядучага навуковага супрацоўніка. У 1982—1988 гг. Уладзімір Еўдакімавіч – вучоны сакратар Аддзялення грамадскіх навук АН БССР. З 1 верасня 1993 г. ён з’яўляецца прафесарам кафедры міжнародных адносін, з 1995 па 2000 г. быў загадчыкам аддзела нацыянальных і міжнародных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі (па сумяшчальніцтву).

Прафесар У. Е Снапкоўскі— вядомы і аўтарытэтны беларускі вучоны ў галіне даследавання гісторыі знешняй палітыкі і дыпламатыі Беларусі ў ХХ – пачатку ХХІ ст. Ён з’яўляецца адным са стваральнікаў (“бацькоў-заснавальнікаў”) кафедры і факультэта міжнародных адносін БДУ, стваральнікам беларускай навуковай школы даследчыкаў знешнепалітычнай гісторыі Беларусі. Аўтар каля 400 навуковых і навукова-папулярных прац па

[7] Дастанка, А. А., Малевіч, Ю. І., Шарапа, А. В., Селіванаў, А. У. Юбілей Уладзіміра Еўдакімавіча Снапкоўскага: вядомаму беларускаму вучонаму 70 год // Журнал международного права и международных отношений = Journal of International Law and International Relations. - 2024. - № 1-2. С. 90-91.

міжнароднай тэматыцы (гістарыяграфія і метадалогія даследавання міжнародных адносін у Беларусі, міжнародныя арганізацыі і міжнародная камунікацыя, беларуская дыяспара і эміграцыя, станаўленне сучаснай беларускай эліты, фарміраванне нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў). У перыяд з 1979 па 2023 гг. ім выдадзена 371 навуковая праца, у тым ліку 8 манаграфій, 10 навучальных дапаможнікаў, 11 зборнікаў дакументаў і матэрыялаў, 343 артыкулы ў навуковых часопісах і калектыўных манаграфіях, з іх 57 - у замежных выданнях.

У. Е. Снапкоўскі распрацаваў новую вучэбную і навуковую дысцыпліну “Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі” і ўпершыню выдаў дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па гэтым прадмеце (у дзвюх частках, 2003-2004 гг.). Дапрацаваная версія выдання на руская мове выйшла ў 2013 г. у серыі “Класічнае ўніверсітэцкае выданне”. У пачатку 2024 г. выдавецтва БДУ выпусціла ў свет новае выданне дапаможніка, якое адпавядае высокім стандартам вучэбна-метадычнай і навуковай літаратуры па гісторыі Беларусі і міжнародных адносін.

У 2007 г. У. Е. Снапкоўскі выдаў першы курс лекцый для студэнтаў факультэта міжнародных адносін па знешняй палітыцы Рэспублікі Беларусь, а ў 2021 г. - першы дапаможнік для магістрантаў-міжнароднікаў “Анализ внешней политики Республики Беларусь». Для навучэнцаў англамоўнай магістатуры ім падрыхтаваныя дапаможнікі аб асновах знешняй палітыкі незалежнай Беларусі і яе адносінах з вядучымі дзяржавамі і цэнтрамі сілы сучаснага свету.

Як у Беларусі, так і за мяжамі нашай краіны вядомы даследаванні У. Е. Снапкоўскага па знешнепалітычнай дзейнасці Беларускай ССР, асабліва яго глыбокі наватарскі аналіз праблемы членства савецкіх саюзных рэспублік у ААН. У апошнія гады ўбачылі свет яго грунтоўныя манаграфіі аб дзейнасці БССР у ААН і палітыцы СССР, накіраванай на вывад саюзных рэспублік на міжнародную арэну і іх уключэнне ў склад перашапачатковых дзяржаў-членаў ААН. У гэтых працах на падставе шырокага кола архіўных і друкаваных крыніц паказаны складаны, але паспяховы шлях Беларускай ССР і Украінскай ССР у склад дзяржаў-заснавальніц ААН. Вучоны адкрыў і такую малавядомую беларускім чытачам старонку, як дапамога Адміністрацыі дапамогі і аднаўлення Аб’яднаных Нацый (ЮНРРА) Беларускай ССР у 1945-1947 гг. У. Е. Снапкоўскі плённа распрацоўвае праблематыку сучасных беларуска-расійскіх і беларуска-польскіх адносін, аб чым сведчаць асобныя манаграфіі і серыя навуковых артыкулаў.

Разам са сваім калегамі па кафедры міжнародных адносін Уладзімір Еўдакімавіч актыўна працаваў над падрыхтоўкай да друку зборнікаў дакументаў і матэрыялаў па знешнепалітычнай гісторыі Беларусі ў XX-пачатку XXI ст.: “Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914-1991)” у 4 т., “Знешняя палітыка Беларусі (1996-2010 гг.)”, (т. 8-10), “Государственные границы Беларуси (1917–2010)” (у 2 т.). У выніку архіўных пошукаў і працы з літаратурай, у тым ліку перакладчыцкай і

рэдакцыйнай, ім апублікаваны больш за тры тысячы дакументаў і матэрыялаў з архіваў, а таксама з гісторыка-дыпламатычных выданняў Беларусі і замежных краін.

У. Е. Снапковский актыўна і плённа ўдзельнічаў ў працы вучонага савета факультэта міжнародных адносін БДУ, камітэта “Правазнаўства і міжнародныя адносіны” камісіі па вылучэнні работ на саісканне прэміі имя першага рэктара БДУ У. І. Пічэты, рэдкалегіі часопіса «Веснік БДУ” (сер. 3), спецыялізаваных саветаў па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па гісторыі знешняй палітыкі і міжнародных адносін и па палітычных навуках пры БДУ. Зараз з’яўляецца членам рэдкалегій замежных навуковых часопісаў. Падрыхтаваў аднаго доктара і чатырох кандыдатаў гістарычных навук па спецыяльнасці «Гісторыя знешняй палітыкі і міжнародных адносін».

16. Fundamentals of the foreign policy of the Republic of Belarus: Manual for English-speaking graduate students (Основы внешней политики Республики Беларусь: Учебное пособие для англоязычных аспирантов) / U. E. Snapkouski. - Minsk: BSU, 2022. 60 p. https://elib.bsu.by/handle/123456789/277195

17. Belarus between East and West (relations with Russia, China and the European Union) : Manual for English-speaking for students of the second stage (Master's Degree) in specialty 1-23 80 06 "International Relations" / U. E. Snapkouski Minsk, BSU, 2023 60 p. https://elib.bsu.by/handle/123456789/300152

18. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі: дапаможнік / У. Е. Снапкоўскі. Мінск: БДУ, 2023. 383 с.

19. Мастацтва гульні ў сеткі: з гісторыі валейбольнай секцыі і клуба ветэранаў НАН Беларусі / А.А.Ракіцкі, М.Ф.Коханаў, У.С.Салдатаў, В.І.Клеўзовіч, У.Е.Снапкоўскі, У.П.Пятроў, Д.У.Чэчкоўскі; адказны рэдактар У.Е.Снапкоўскі. – Мінск : Права і эканоміка, 2024 - 78 с. – іл.

## Зборнікі дакументаў

20. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.): зб. дак. і матэрыялаў. У 4-х т. Т. 1. 1 жніўня 1914 – 18 сакавіка 1921 гг., ч. 1. 1 жніўня 1914 – 31 снежня 1919 гг. / склад: А. Ф. Вялікі [і інш.]; рэкал.: С. М. Мартынаў [і інш.]. Мінск : Юніпак, 2008. XLII, 539 с.

21. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.): зб. дак. і матэрыялаў. У 4-х т. Т. 1. 1 жніўня 1914 – 18 сакавіка 1921 гг., ч. 2. 3 студзеня 1920 – 18 сакавіка 1921 гг. /склад: А. Ф. Вялікі [і інш.]; рэкал.: С. М. Мартынаў [і інш.]. Мінск : Юніпак, 2008. 393 с.

22. Знешняя палітыка Беларусі: зб. дак. і матэрыялаў. Т. 8 (1996–2000 гг.). / склад. У. Е. Снапкоўскі і інш. Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2008. 639 с.

23. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.): зб. дак. і матэрыялаў. У 4-х т. Т. III. 1 верасня 1939 г. – 3 ліпеня 1944 г. / склад: А. Ф. Вялікі [і інш.]; рэдкал.: С. М. Мартынаў [і інш.]. Юніпак: Мінск, 2010. 444 с.

24. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.): зб. дак. і матэрыялаў. У 4-х т. Т. II. 19 сакавіка 1921 – 31 жніўня 1939 г. / склад: А. Ф. Вялікі [і інш.]; рэкал.: С. М. Мартынаў [і інш.]. Мінск: Юніпак, 2012 .480 с.

25. Государственные границы Беларуси. Сборник документов и материалов. В 2 т. Т. 1. (март 1917 – ноябрь 1926) / сост. В. Е. Снапковский [и др.]. Минск : БГУ, 2012. 495 с.

26. Государственные границы Беларуси. Сборник документов и материалов. В 2 т. Т. 2. (ноябрь 1926 – декабрь 2010) (с электронным приложением) / сост.: В. Е. Снапковский, А. В. Тихомиров, А. В. Шарапо. Минск : БГУ, 2013. 333 с.

27. Знешняя палітыка Беларусі: зб. дак. і матэрыялаў. Т. 9 (2001–2005 гг.) / склад. У. Е. Снапкоўскі, А. В. Ціхаміраў, А. В. Шарапа; рэдкал.: С. М. Мартынаў (старшыня) [і інш.]. Мінск: БДУ, 2013. 688 с.

28. Знешняя палітыка Беларусі: зб. дак. і матэрыялаў. Т. 10 (2006–2010 гг.) / склад. У. Е. Снапкоўскі, А. В. Ціхаміраў, А. В. Шарапа; рэдкал.: С. М. Мартынаў (старшыня) [і інш.]. Мінск: БДУ, 2014. 607 с.

29. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.): зборнік дакументаў і матэрыялаў. У 4 т. Т. 4 (4 ліпеня 1944 г. – 25 жніўня 1991 г.) / склад: А. Ф. Вялікі, У. Е. Снапкоўскі, А. В. Ціхаміраў, А. В. Шарапа; рэдкал.: С. М. Мартынаў [і інш.]. Мінск: Юніпак, 2015. 448 с.

30. Węzeł polsko-białoruski 1918–1921: Dokumenty i materiały. Wybór i opracowanie Wojciech Materski, współpraca Uładzimir Snapkouski (Białoruś). Warszawa, Instytut Studiów Politycznych Polskiej Akademii Nauk, 2018. 859 s.

## Артыкулы

31. Исследование проблемы новой и новейшей истории в Белорусской ССР / В. Е. Снапковский // Новая и новейшая история. 1984. № 2. С. 168–179.

32. Знешнепалітычныя аспекты суверэнітэту Беларусі: гістарычны агляд / У. Е. Снапкоўскі, Г. Г. Сяргеева // Весці Акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 1992. № 2. С. 35–52.

33. Міжнародныя аспекты вызначэння савецка-польскай мяжы ў 1943–1945 гг. / У. Е. Снапкоўскі // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 3. С. 9–14.

34. Аб дапамозе ЮНРРА Беларусі (1945–1947) / У. Е. Снапкоўскі // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы): Усебеларус. канф.

гісторыкаў. У 2 ч. Ч. 1: Гісторыя Беларусі. Мінск: Універсітэцкае, 1994. С. 214–219.

35. Беларусь у знешнепалітычных планах і дзейнасці ЗША (сярэдзіна 40-х гадоў XX ст.) / У. Снапкоўскі // Беларусіка=Albaruthenica. Кн. 5: Культура беларускага замежжа; Беларуска-амерыканскія гістарычна-культурныя ўзаемадачыненні: Рэд. У. Конан, А. Мальдзіс. Мінск: Навука і тэхніка, 1995. С. 220–229.

36. Беларуская палітычная эміграцыя (1945–1990 гг.) / У. Снапкоўскі // Полымя. 1997. № 2. С. 201–239.

37. Беларуская ССР на міжнароднай арэне (1945–1990 гг.) / В. Е. Снапковский // Беларускі часопіс міжнарод. права і міжнарод. адносін. 1999. № 2. С. 62–67.

38. Typology of the Modern Byelorussian Elite (Тыпалогія сучаснай беларускай эліты ў посткамуністычных дзяржавах) / W. Snapkowski // The Elite in Post-Communist Eastern Europe / Ed. By V. Shlapentokh, Ch. Vanderpool, and B. Doktorov; Texas: A & M University Press, 1999. (Eastern European studies, no. 10). P. 101–119.

39. Аб навуковых даследаваннях аддзела нацыянальных і міжнародных адносін Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі (1960–1990-я гг.) / У. Е. Снапкоўскі // Беларускі часопіс міжнарод. права і міжнарод. адносін. 2000. № 1. С. 72–75. http://elib.bsu.by/handle/123456789/29900

40. А. А. Громыко и внешнеполитическая деятельность союзных республик / В. Е. Снапковский // А. А. Громыко – дипломат, политик, ученый: материалы научно-практической конференции, посвященной 90-летию со дня рождения А. А. Громыко. М.: МГИМО (Университет); Российская политическая энциклопедия (РОССПЭН), 2000. С. 143–156.

41. Беларусь у геапалітыцы і дыпламатыі перыяду Другой сусветнай вайны / У. Е. Снапкоўскі // Беларускі часопіс міжнарод. права і міжнарод. адносін. 2000. № 2. С. 45–54. http://elib.bsu.by/handle/123456789/29967

42. Международные организации в системе международных отношений / В. Е. Снапковский // Беларускі часопіс міжнарод. права і міжнарод. адносін. 2000. № 3. С. 71–77.

43. Внешняя политика Республики Беларусь: первые итоги первого десятилетия / В. Е. Снапковский // Беларускі часопіс міжнарод. права і міжнарод. адносін. 2000. № 4. С. 45–51.

http://elib.bsu.by/handle/123456789/30060

44. Да гісторыі распрацоўкі канцэпцыі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь / У. Е. Снапкоўскі // Приоритеты внешней политики Республики Беларусь. Минск: БГУ, Центр международных исследований, 2001. С. 5–10.

45. Научная летопись четырех столетий белорусского движения в Сибирь / Д. Я. Резун, В. Е. Снапковский // Очерки истории белорусов в Сибири в XIX–XX вв. Новосибирск: Новосибирский гос. ун-т, 2001. С.6–29.

46. Знешнепалітычная дзейнасць Беларускай ССР (1919–1929 гг.) / У. Е. Снапкоўскі // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 3. С. 28–41.

47. Белорусско-российские отношения на рубеже столетий (конец 1999 – начало 2001 гг.) / В. Е. Снапковский // Беларускі часопіс міжнарод. права і міжнарод. адносін. 2001. № 2. С. 49–56.
http://elib.bsu.by/handle/123456789/29318

48. Знешнепалітычная гісторыя Беларусі (канец ХУІІІ – пачатак ХХІ ст.): спроба сінтэтычнага агляду / У. Е. Снапкоўскі // Беларускі часопіс міжнарод. права і міжнарод. адносін. 2003. № 4. С. 34–39. http://elib.bsu.by/handle/123456789/31773.

49. Пяцьдзесят гадоў удзелу Беларусі ў працы ЮНЕСКА / У. Е. Снапкоўскі // Беларускі гістарычны часопіс. 2004. № 5. С. 3–8.

50. O koncepcji polityki zagranicznej Republiki Białoruś / W. Snapkowski // Doktrina. Studia społeczno-polityczne. Num. 3–4, 2006–2007. Siedlce: Wydawnictwo Akademii Podlaskiej, 2007. S. 53–67.

51. Od niebytu państwowego do suwerenności. Ewolucja państwowości białoruskiej w XX wieku i na początku XXI wieku / W. Snapkowski // Suwerenność państwa w dobie integracji i globalizacji. Red. nauk. S. Jaczyński i A. Wielomski. Siedlce: Wydawnictwo Akademii Podlaskiej, 2007. S. 113-119.

52. Białoruś i kwestia białoruska w stosunkach międzynarodowych XIX-XX w. / U. Snapkouski // Racja stanu: Studia i materiały. Połrocznik nr 1 (1) 2007. Instytut Studiów Międzynarodowych Uniwersytetu Wrocławskiego. Wrocław: 2007. S. 29–40.

53. Беларусь в международных отношениях в 1918–1945 гг. / В. Е. Снапковский // История международных отношений: учеб. пособие. В 4 ч. Ч. 2. Минск: БГУ, 2007. С. 306–379.

54. Беларусь в международных отношениях (1946–1991) / В. Е. Снапковский // История международных отношений: учеб. пособие. В 4 ч. Ч. 3 / А. А. Розанов [и др.]; под ред. А. А. Розанова. Минск: БГУ, 2010. С. 429–479.

55. О советско-германском сотрудничестве при подготовке и осуществлении военной кампании СССР против Польши в сентябре 1939 г. / В. Е. Снапковский // Западная Белоруссия и Западная Украина в 1939–1941 гг.: Люди, события, документы. СПб.: «Алетейя», 2011. С. 77–102.

56. О советском требовании включить ряд союзных республик в состав Комиссии Объединенных Наций по военным преступлениям (июль – декабрь 1943 г.) / В. Е. Снапковский // Труды Факультета

международных отношений. Науч. сб. Вып. 2. Минск: БГУ, 2011. С. 29–32. http://elib.bsu.by/handle/123456789/5128

57. Белоруссия в этнополитике нацистской Германии 1939–1944 гг. / В. Е. Снапковский // Этнокультурная идентичность народов Украины, Белоруссии и Польши: механизмы формирования и способы проявления. М.: Институт славяноведения, 2011. С. 311–336.

58. O konfliktności w stosunkach białorusko-polskich / W. Snapkowski // Zeszyty naukowe Wyższej Szkoły Handlowej im. Króla Stefana Batorego w Piotrkowie Trybunalskim. 2011. Nr 7. S. 117-126.

59. Пачатак палітычнай барацьбы ў ААН па пытанні прыёму новых членаў (1946-1947 гг.) / У. Е. Снапкоўскі // Часопіс міжнарод. права і міжнарод. адносін. 2012. № 2. С. 52-62. http://elib.bsu.by/handle/123456789/31234

60. Białoruś–Unia Europejska: trudne drogi rozwoju stosunków / W. Snapkowski // Politeja. Pismo Wydziału studiów międzynarodowych i politycznych Uniwersytetu Jagiełłonskiego. Kraków: 2012. Nr 4/1 (22/1). Studia białoruskie. S. 23-52.

61. Асноўныя этапы развіцця адносін Рэспублікі Беларусь з Еўрапейскім саюзам / У. Е. Снапкоўскі// Республика Беларусь – Европейский союз: проблемы и перспективы сотрудничества. Минск: Беларуская навука, 2013. С. 100–123.

62. Дакументы пра місію паўнамоцнага прадстаўніка ЦК РКП(б) А. А. Іофе ў Беларусь і Літву / У. Снапкоўскі // Ісці на святло лабірынтамі даўніх падзей: зборнік памяці Віталя Скалабана / уклад. А. Сідарэвіч, А. Фядута, М. Шумейка. Мінск : «Лімарыус», 2013. С. 288-329.

63. Białoruś, wojna polsko-sowiecka oraz pokój ryski / U. Snapkouski // Zapomniany pokój. Traktat ryski: Interpretacje i kontrowersje 90 lat póżnej. Warszawa: Centrum Polsko-Rosyjskiego Dialogu i Porozumenia, 2013. S. 251-276.

64. Белорусский вопрос на советско-польских мирных переговорах 1920-1921 гг. / О. Н. Боровская, В. Е. Снапковский, С. А. Третьяк // Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921-1953 гг. В 2 кн. Кн. 1. / Нац. Акад. наук Беларуси, Ин-т истории / редкол. А. А. Коваленя [и др.]. Минск : Беларуская навука, 2014.- С. 151-235.

65. Bezpieczeństwo kulturowe Polski i Białorusi w koncepcjach bezpieczeństwa narodowego dwóch państw / W. Snapkowski // Prawne, instytucjonalne i społeczne uwarunkowania bezpieczeństwa. Red. naukowa S. Bębas, A. Gołębiowski. -Radom: Wydawnictwo Wyższej Szkoły Handlowej, 2014. -S. 317–324.

66. Dwadzieścia lat niełatwych stosunków Republika Białoruś–Unia Europejska / W. Snapkouski // Rozważania nad polityką i bezpieczeństwem współczesnej Europy. Red. nauk.: M. Petrasiak, S. Bębas,

P. Kowalski. -Piotrków Trybunalski: Wyższa Szkoła Handlowa im. Króla Stefana Batorego w Piotrkowie Trybunalskim, 2014. -S. 137-159.

67. Внешняя политика Беларуси: попытка осмысления после 20 лет независимости / В. Е. Снапковский // Solidarnoṥ a demokracja. 25 lat transformacji postkomunistycznej. Pod red. T.Ambroziaka, A.Czwołka, Sz. Gajewskiego, M. Nowak-Paralusz. –Toruń, Wydawnictwo Adam Marszalek, 2015. -S. 349-367.

68. Динамика приоритетов внешней политики Республики Беларусь / В. Е. Снапковский // Беларуска-польскія адносіны: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. круглага стала, Мінск, 30 кастр. 2014 г. / рэдкал.: В. Г. Шадурскі (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2015. —С. 17-24.

69. Историческая политика в Республике Беларусь в период президенства А.Лукашенко / В. Е. Снапковский // Wschodnioznawstwo 2015.- Wrocław: Uniwersytet Wrocławski, 2015. -S. 159-180.

70. Шлях у ААН: Беларуская ССР – заснавальніца Арганізацыі Аб’яднаных Нацый / У. Е. Снапкоўскі // Беларуская думка. -2015.- № 5. -С. 77-82.

71. Pagrindiniai Baltarusijos istorijos politikos raidos etapai ir tendencijos /V. Snapkovskis (Основные этапы и тенденции развития белорусской исторической политики) // Lietuvos ir Baltarusijos istorijos politika [sudare Raimundas Lopata, Inga Vinogradnaite] -Vilnius: Vilniaus universiteto leidykla, 2016. -S. 12-55.

72. Зовнішньополітична діяльність Білоруської РСР (1944-1991) в документах білоруських, російських і українских державних і дипломатичних архівів / В. Снапковській // Спеціальні історичні дисципліни: питання теорії та методики: Збірка наукових праць / Відп. ред. Г.В.Боряк; упоряднік: І.Б.Матяш. -Кіев: Інстітут історіі Украіні НАН Украіні, 2017. - Число 28. Дипломатични архиви: поняття, институцийна історія, інформаційні потенціал. -С. 50-71.

73. Перыядызацыя беларуска-польскіх адносін (1918—2017 гг.): да стагоддзя пачатку міждзяржаўных кантактаў / У. Е. Снапкоўскі // Беларусь между Востоком и Западом: современные тенденции : материалы междунар. круглых столов, Минск, 26 окт. 2017 г. / БГУ, ФМО; редкол. : В. Г. Шадурский [и др.]. — Минск : Изд. центр БГУ, 2017. — С. 64-74.

74. Аб пагадненні паміж урадам Беларускай ССР і ЮНРРА ад 18 снежня 1945 года / У. Снапкоўскі // Беларуская думка. -2018. -№ 12.-С. 46-54.

75. Аналітычныя даклады дзяржаўнага дэпартамента ЗША аб праходжанні савецка-польскай мяжы (1943) / У. Снапкоўскі // Беларусь і суседзі: гістарычны вопыт стасункаў народаў і дзяржаў Цэнтральна-Усходняй Еўропы: матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі

(Гомель, 29—30 мая 2018 года) / [рэдкалегія: Р. Р. Лазько (галоўны рэдактар) і інш.] Гомель: ГДУ, 2018. - С. 99-104.

76. Беларусь як суб’ект і аб’ект міжнароднай палітыкі (1918–1921 гг.) / У. Е. Снапкоўскі // Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў XX ст. : матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 29–30 ліст. 2018 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. Д. Кароль (старшыня) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2018. –С. 245-250.

77. Białoruś w polityce wschodniej Polski (1918-1921) / W. Snapkowski // Zeszyt naukowy Wyzszej Szkoly Handlowej w Radomiu / Redakcja naukowa B. Olbrych, A. Ziolkowski. - Radom: Wydawnictwo Wyzszej Szkoly Handlowej, 2018. - №3. - S. 36 – 46.

78. Незабытая дапамога: дзейнасць ЮНРРА ў Беларусі (1945-1947 гг. / У. Е. Снапкоўскі, Р.Г.Курбека // Часопіс міжнарод. права і міжнарод. адносін. -2018. -№ 3-4. -С. 25-32.

79. Аб дзейнасці Камісарыята замежных спраў ССРБ (студзень – люты 1919 года) / У. Снапкоўскі // Беларуская думка. -2019. -№ 4.-С. 58-65.

80. Аб некаторых ключавых пытаннях знешнепалітычнай гісторыі Беларусі /У. Е. Снапкоўскі // Беларусь в меняющемся мире: история и современность : материалы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 22 февр. 2019 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: М. Э. Чесновский (пред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2019. – С. 21-29. https://elib.bsu.by/handle/123456789/241240

81. Białoruś – Polska: jak wyjść z błędnego koła w rozwoju wzajemnych stosunków / U.Snapkouski // Stosunki Polski z Litwą, Białorusią i Ukrainą 450 lat po Unii Lubelskiej. Lublin: Institut Europy Srodkowej, 2019. s. 141-162.

82. Дыпламатыя БНР: што здолела зрабіць непрызнаная рэспубліка для беларускай дзяржаўнасці / У. Е. Снапкоўскі // Беларуская Народная Рэспубліка ў гісторыі беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці: зб. арт. / уклад. С.А.Траццяк; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. Мінск: Беларуская навука, 2020. С. 79—89.

83. Концепции внешней политики и безопасности Республики Беларусь / В.Снапковский // Republika Białoruś - polityka zagraniczna i bezpieczeństwa. Wybrane aspekty. Red. nauk. E.Genbień, L.Leszcztnko. Warszawa, wyd. Elipsa, 2020. С. 13-34.

84. Białoruś Radziecka i realizacja postanowień traktatu ryskiego / U.Snapkouski // Polacy na Białorusi od Powstania Styczniowego do XXI wieku. Tom IV: Rok 1920 na tle przełomów politycynych XX wieku. Pod red. T. Gawina. Warszawa, Studium Europy Wschodniej Uniwersytetu Warszawskiego, 2020. S. 293-316.

85. Аб вызначальнай ролі знешняга фактара ва ўз’яднанні Заходняй Беларусі з БССР: гістарыяграфічныя і крыніцазнаўчыя рефлексіі / У.Е.Снапкоўскі // Назаўжды разам (да 80-годдзя ўз’яднання

Заходняй Беларусі з БССР): *зб. артыкулаў / рэдкал.: А.А.Каваленя [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі.- Мінск: Беларуская навука, 2021.* С. 218-224.

86. Аб ролі і значэнні ўнутраных і знешніх фактараў у гісторыі знешняй палітыкі Беларусі / У.Е.Снапкоўскі // Исследование международных отношений в Республике Беларусь: состояние и перспективы [Электронный ресурс] : материалы респ. науч.-практ. семинара / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: М. Э. Чесновский (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2021. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

87. Галоўныя кірункі даследаванняў міжнародных адносін у Беларускім дзяржаўным універсітэце / У.Е.Снапкоўскі // Республика Беларусь в современном мире / под ред. Е.В.Пильгун. Минск: Изд. центр БГУ, 2021. С. 84-102. https://elib.bsu.by/handle/123456789/257694

88. Знешнепалітычная гісторыя Беларусі ў працах універсітэцкіх аўтараў (1920-1980-я гг.) / У.Е.Снапкоўскі // Даследаванне міжнародных адносін і развіццё замежных сувязей у Беларускім дзяржаўным універсітэце: 1921-2021 гг.: манаграфія / А.В.Шарапа [і інш.]; пад рэд. А.В. Шарапы (старш.), А.А.Дастанка, У.Е.Снапкоўскага (адк. рэд.), М.Э.Часноўскага. - Мінск: РІВШ, 2021. С. 31-45.

89. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі ў даследчыцкай і выкладчыцкай працы вучоных БДУ (1991-2021 гг.) / У.Е.Снапкоўскі // Там жа. С. 45-68.

90. Перыядызацыя гісторыі знешнепалітычнай дзейнасці Беларускай ССР / У.Е.Снапкоўскі // Гістарычны лёс беларускай савецкай дзяржаўнасці (да 100-годдзя абвяшчэння Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі): зб. артыкулаў /рэдкал.: А.А.Каваленя [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі.- Мінск: Беларуская навука, 2021. С. 183-190.

91. Снапковский, В.Е. Сотрудничество СССР, Украинской ССР и Белорусской ССР в ООН в период советской перестройки / В.Е.Снапковский // Міжднародні зв’язки України: наукові пошуки і знахідки. Вип. 30. Міжвідомчий збірник наукових праць. Відп. ред. С.В.Відняньский. -Київ: Інститут історіі України НАН України, 2021. -С. 113-140.

92. Foreign policy of the Republic of Belarus: milestones and priorities / U. E. Snapkouski // Journal of Belarusian State University. International relations. 2021. № 1. P. 36-43. https://elib.bsu.by/handle/123456789/269682

93. Вызначальны пачатак: аб першых гадах працы кафедры міжнародных адносін БДУ / У. Е. Снапкоўскі // Исследование международных отношений в Республике Беларусь: состояние и перспективы : материалы респ. науч.-практ. семинара, посвящ. 30-летию каф. междунар. отношений Белорус. гос. ун-та, Минск, 6 окт.

2022 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: Е. А. Достанко (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2022. – С. 21-31. ttps://elib.bsu.by/handle/123456789/288647

94. Bilateral relations between Belarus and the United States: a history of hopes and disappointments / U. E. Snapkouski // Journal of Belarusian State University. International relations. 2022. № 1. P. 3-11. https://www.researchgate.net/publication/361782775

95. О некоторых подходах к исследованию международного порядка в области информации и коммуникации / В.Е. Снапковский, Л.А. Федотов // Мировая экономика и международные отношения. 2023. Том 67. № 2. С. 52-62.

96. Столетие белорусской государственности: от советской союзной республики до независимой страны / В.Е. Снапковский // Управление и политика. 2022. Т.1 № 4. С. 25-60.

97. The Belarusian People's Republic in the Politics of the UK (December 1919–July 1920): Based on Documents from the National Archives in London / Alena M. Dubrouka, Uladzimir E. Snapkouski // The Journal of Belarusian Stadies. 2023. № 1. P. 1-39. DOI:10.30965/20526512-bja10018T.

98. Тры дзясяцігоддзі незалежнасці: перыядызацыя гісторыі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь/ У.Е. Снапкоўскі // Беларусь в современном мире = Беларусь у сучасным свеце: материалы XXII Междунар. науч. конф., посвящ. 102-летию образования Белорус. гос. ун-та, Минск, 26 октября 2023 г. / редкол.: Е. А. Достанко (гл. ред.) [и др.]. — Минск: Изд. центр БГУ, 2023. —С. 66-72.

99. Успаміны й рэфлексіі з сустрэчаў зь Янкам Запруднікам і Вітаўтам Кіпелем і думкі пра дасьледаваньне беларускай дыяспары / Ул. Снапкоўскі // Запісы. Беларускі інстытут навукі й мастацтва. Нью-Ёрк-Вільня-Беласток, 2023. № 43. С. 25-39.

100. Беларусь: достижения и дилеммы многовекторной политики и экономической дипломатии / В.Е.Снапковский // Международный бизнес. Журнал МГИМО. 2024. № 4. С. 46-61.

### 3.3. Спіс рукапісных прац, газетных артыкулаў і рэцэнзій на кнігі

### Працы на правах рукапісу (разам 8)

1. Политика ГДР в отношении ФРГ – важный элемент разрядки международной напряженности (70-е годы). Дис. … к-та ист. наук. Мн., Институт истории АН БССР. 1980. 212 маш. стр.
2. Политика ГДР в отношении ФРГ – важный элемент разрядки международной напряженности (70-е годы). Автореф. дис… к-та ист. наук. Мн., БГУ, 1980. 22 с.
3. ГДР – ФРГ: Тернистые пути разрядки (70-е годы). Мн., Институт истории АН БССР, 1983. 185 маш. стр.
4. Белорусская ССР на международной арене. Популярный очерк. Мн., Институт истории АН БССР, 1987. 228 маш. стр.
5. Внешнеполитическая деятельность Белорусской ССР (1944--1953 гг.). Дис…д-ра ист.наук. Мн., Институт истории АН Беларуси, 1992. 410 маш. стр.
6. Внешнеполитическая деятельность Белорусской ССР (1944-1953 гг.). Автореф. дис… д-ра ист. наук. Мн., Институт истории АН Беларуси, 1992. 45 с.
7. Взаимодействие общественных лидеров в посткомунистической Беларуси. Аналитический доклад. Мн., Незав. Ин-т соц.-экон. и политических исследований, 1996. 25 маш. стр.
8. Массы и лидеры: Тенденция становления массового сознания и формирования общественных лидеров в посткомунистической Беларуси // Формирование общественных лидеров в посткоммунистическом обществе. Мат-лы науч.-практич. конф. (Минск, 6-7 июня 1997 г.). Мн., Нез. инст. соц.-экон. и полит. исследований, 1997. 28 маш. стр.

### Газетныя артыкулы (разам 27)

1. Рассказ о дружбе. Рец. на кн. Мірачыцкі Л. П. «Беларуска-чэхаславацкія культурныя і навуковыя сувязі». Мн., 1981 / В. Снапковский // Советская Белоруссия. 1981. 7 окт. С. 3.
2. Мы много еще не знаем: о «белых пятнах» в изучении истории международной деятельности БССР / В. Снапковский // За передовую науку. 1989. 8 дек. С. 2–5; 15 дек. С. 5.
3. Аб сакрэтным пагадненні ведала вузкая кола асоб / У. Снапкоўскі // Навіны Беларускай акадэміі. 1991. 28 чэрвеня. С. 1,3.
4. Белоруссия, Советский Союз, Европа: О внешнеполитических аспектах суверенизации Беларуси / В. Снапковский // Навіны Беларускай акадэміі. 1991. 18 кастрычніка. С. 6; 25 кастрычніка. С. 5.

5. Ад вайны да згоды / У. Снапкоўскі // Культура. 1993. 10 мая. С. 5.
6. Сталін і рэпатрыянты: Гісторыя вяртання савецкіх людзей да «камуністычнага раю» / У. Снапкоўскі // Літаратура і мастацтва. 1993. 17--23 ліпеня. С. 14 – 15.
7. Как проводились чистки / У. Снапкоўскі // Народная газета. 1994. 21 снежня. С. 3.
8. Тайная дыпламатыя вакол «справы ікс» / У. Снапкоўскі (гутарыў М. Гучко) // Мінская праўда. 1994. 2 чэрвеня. С. 2-3.
9. Удзел беларуса ў міжнароднай канферэнцыі / У. Снапкоўскі // Беларус/Belarus. Belarusian Newspaper in the Free World. Нью-Йорк. 1994. Лістапад, № 418. С. 4.
10. Адзінае акно ў знешні свет: Беларуская дыпламатыя ў першае дзесяцігоддзе ААН / У. Снапкоўскі // Звязда. 1995. 20 верасня. С. 3.
11. Барацьба ў Сан-Францыска за ўключэнне Беларусі ў састаў заснавальнікаў ААН / У. Снапкоўскі // Звязда. 1995. 23 чэрвеня. С. 3.
12. Белорусская экономическая элита / У. Снапкоўскі // Нацыянальная эканамічная газета. 1995. 20 красавіка.
13. Демаркация по политическим мотивам: К 50-летию советско-польского договора о государственной границе / В. Снапковский // Во славу Родины. 1995. 16 августа.
14. Канферэнцыя ў Сан-Францыска: Да 50-годдзя падпісання Беларуссю Статута ААН / У. Снапкоўскі // Нацыянальная эканамічная газета. 1995. 28 чэрвеня – 1 ліпеня. С. 29.
15. Наменклатура і эліта: драма беларускіх кіраўнікоў / У. Снапкоўскі // Наша слова. 1995. 14 сакавіка.
16. Новый этап деятельности Беларуси в ООН / В. Снапковский // Нацыянальная эканамічная газета. 1995. 28 ліпеня.
17. У Крамле ёсць стратэгія: Расійскія вучоныя аб расійска-беларускіх адносінах / У. Снапкоўскі // Звязда. 1995. 1 лютага. С. 3.
18. У рэчышчы савецкай знешняй палітыкі: БССР у ААН у 50-80-я гады / У. Снапкоўскі // Звязда. 1995. 19 кастрычніка.
19. Як Беларусь стала заснавальніцай ААН / У. Снапкоўскі // Звязда. 1995. 20 красавіка. С. 3.
20. Беларуская ініцыятыва аб стварэнні бяз'ядзернай зоны ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе: Хто яе аўтар Петр Краўчэнка ці Аляксандр Лукашэнка? / У. Снапкоўскі // Народная воля. 1997. 6 чэрвеня. С. 3.
21. Станут ли страны Прибалтики «кормиться» от двух матерей? / В. Снапковский // Советская Белоруссия. 1997. 19 ноября.
22. Перамены – незваротныя / У. Сідарцоў, У. Снапкоўскі // Настаўніцкая газета. 1999. 23 снежня. С.3.
23. Между Польшей и Россией: "Беларускае пытанне" як еўрапейская праблема / В. Снапковский // Народная воля. 2001. 13 лютага. С.3.

24. Другая сусветная вайна: круглы стол беларускіх і польскіх гісторыкаў / У. Снапкоўскі // Новы час. Масава-палітычная газета. Мінск. №48 (176) 24 снежня 2009. Выступленні па тэмах дыскусіі: 1. Праблема верасня 1939 года ў шырокім разуменні; 2. Палякі і беларусы падчас акупацыі 1939–1945.
25. Рут Уоллер: Помнить вечно (интервью с В.Е.Снапковским) / Н. Романова // СБ. Беларусь сегодня. 2016. 23 апр. С. 1, 6-7.
26. Калі б не выступаў на мітынгах, не стаў бы міністрам: Вялікая гутарка з Пятром Краўчанкам / У.Снапкоўскі // Рэгіянальная газета. Маладзечна. 2020. 4 верасня. С. 18-19.
27. Историк: «Как формировалось национальное самосознание белорусов в XX веке» / В. Снапковский // Комсомольская правда. 2020. 22 авг. Публикация Р. Юдиной.

## Спіс рэцэнзіі на працы У.Е.Снапкоўскага (разам 10)

1. Путь Беларуси в ООН. 1944–1945 гг. / В. Е. Снапковский. Минск: Навука і тэхніка, 1994. 141 с. **Рэц.**: Lindner R. // Jahrbűcher fűr Geschichte Osteuropas. 1997. № 2. S. 335–336.
2. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі: вучэб. дапам. для студэнтаў фак. міжнар. адносін: У 2 ч. Ч. 1. Ад пачаткаў дзяржаўнасці да канца ХУІІІ ст. / У. Е. Снапкоўскі. Мінск: БДУ, 2003. 281 с. **Рец.**: А. Краўцэвіч // Białoruskie Zeszyty Historyczne. Białystok, 2005. № 23. S. 231-235.
3. История внешней политики Беларуси: пособие / В.Е.Снапковский. Минск: БГУ, 2013. 495 с. **Рэц**.: А. Смалярчык // Беларусі гістарычны агляд. 2017. Том 24. № 1-2 (46-47). С. 277-286.
4. Традыцыі і навацыі ў знешнепалітычных даследаваннях Беларусі: дапаможнік / У.Е.Снапкоўскі. Мінск: БДУ, 2020. 295 с. **Рец**.: Пра традыцыі і навацыі ў справе дзяржаўнай важнасці ў эпоху радыкальных перамен: глыбока і кампетэтна / А.В.Гурын, М.В.Стралец // Журнал международного права и международных отношений. -2021. -№ 4. -С. 63-67.
5. Анализ внешней политики Республики Беларусь : пособие / В. Е. Снапковский. – Минск : БГУ, 2021. – 243 с. **Рец.**: 30 год знешняй палітыкі незалежнай Беларусі: цікавы і глыбокі аналіз / А. В. Гурын // Весці Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2023. Т. 68. № 2. С.172-176.
6. Союзные республики и советская дипломатия: из истории борьбы СССР за первоначальное членство УССР и БССР в ООН (1943 - 1945 гг.) / В.Е. Снапковский / БГУ, Институт Европы РАН, Ассоциация внешнеполитических исследований имени А.А. Громыко. Минск, Право и экономика, 2022. 366 с. **Рец.**: Страницы борьбы советской

дипломатии за членство УССР и БССР В ООН / Н.Н. Мезга // Современная Европа. 2023. № 3. С. 210–213.

**7.** Союзные республики и советская дипломатия: из истории борьбы СССР за первоначальное членство УССР и БССР в ООН (1943 - 1945 гг.) / В.Е. Снапковский / БГУ, Институт Европы РАН, Ассоциация внешнеполитических исследований имени А.А. Громыко. Минск, Право и экономика, 2022. 366 с. **Рец.**: Как Советская Белоруссия и Советская Украина стали членами ООН: К мнению Минска и Киева при этом не слишком прислушивались / М.С.Стрелец // Независимое военное обозрение. 2023. 15 июня. Интернет –версия. file:///C:/Users/user/Desktop/рэц%2023/Как%20Советская%20Белорусси я%20и%20Советская%20Украина%20стали%20членами%20ООН%20_ %20Реалии%20_%20Независимая%20газета.html

**8.** Węzeł polsko-białoruski 1918–1921: Dokumenty i materiały. Wybór i opracowanie Wojciech Materski, współpraca Uładzimir Snapkouski (Białoruś). Warszawa, Instytut Studiów Politycznych Polskiej Akademii Nauk, 2018. 859 s.; **Рэц**. Польско-белорусский узел» 1918–1921 гг. в интерпретации современной польской историографии / Ю.А.Борисенок // Славянский альманах 2020. — Вып. 3–4 / глав. ред. К. В. Никифоров. М.: Индрик, 2020. С. 568-578. https://inslav.ru/sites/default/files/Slavic_Almanac_2020_3-4_31_Borisyonok_7 02.pdf.;

**9.** Węzeł polsko-białoruski 1918–1921: Dokumenty i materiały. Wybór i opracowanie Wojciech Materski, współpraca Uładzimir Snapkouski (Białoruś). Warszawa, Instytut Studiów Politycznych Polskiej Akademii Nauk, 2018. 859 s.; **Рэц**. Некананічны прыклад распутвання „гістарычных вузлоў”/ А.Чарнякевіч // Rocznik Centrum Studiów Białoruskich / Гадавік Цэнтра беларускіх студыяў. № 7. Red. naczelny A.Smalianczuk. Warszawa/Варшава: Studium Europy Wschodniej, Uniwersytet Warszawski, 2021. S. 261-267.

10. Снапковский, В. Е. Белорусская ССР в ООН: отряд советской дипломатии в действии / В.Е.Снапковский. Минск: Право и экономика, 2021, 318 с. **Рэц**. Селиванов А.В., Стрелец М.В. Исследование роли БССР в Организации Объединенных Наций / А.В.Селиванов, М.В.Стрелец // Журнал международного права и международных отношений. 2023. № 2 (105). С. 51—55. https://elib.bsu.by/handle/123456789/306150 DOI: 10.33581/2072-0513-2023-2-51-55.

### 3.4. Рэцэнзіі на кнігі У.Е.Снапкоўскага (поўныя тэксты)

***У. Е. Снапкоўскі, Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі: Вучэбны дапаможнік для студэнтаў факультэтаў міжнародных адносін: У 2 частках, ч. 1, Ад пачаткаў дзяржаўнасці да канца XVIII ст., Мінск: БДУ, 2003, сс. 281.***

Беларуская гістарыяграфія папоўнілася кнігай, якая магла з'явіцца толькі ў незалежнай краіне. Знешняя палітыка, а значыць і яе гісторыя могуць быць толькі ў суверэннай дзяржавы. Па гэтай прычыне яе не было ў БССР — сурагаце беларускай дзяржаўнасці, хоць і меўшым сяброўства ў ААН.

Праца складзена з 13 кампактных глаў (кожная займае ад 12 да 20 з нечым старонак), у яе структуры тэматычны прынцып дамінуе над храналагічным, таму асобныя главы перакрываюцца ў часе між сабой. Гэта главы 2-я і 3-я („Беларускія землі і чужаземныя захопнікі ў 13 — першай палове 14 ст." і „Узнікненне ВКЛ і пачатак яго актыўнай тэрытарыяльнай экспансіі [1230-1370-я гг.]"), 5-я і 6-я (Знешняя палітыка ВКЛ [сярэдзіна 15 — сярэдзіна 16 ст.]" і „Войны паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай [канец 15 — першая трэць 16 ст.]"), 10-я і 11-я („Міжнароднае становішча і знешняя палітыка Рэчы Паспалітай і ВКЛ [канец 17 — першая палова 18 ст.]" і „Знешнепалітычныя аспекты рэлігійна-царкоўных адносін у ВКЛ і Рэчы Паспалітай"). Аўтар дапоўніў працу даволі падрабязнай „Храналогіяй найбольш важных падзей..." (заняла 15 старонак), а таксама спісам крыніц і літаратуры.

Навучальны дапаможнік Уладзіміра Снапкоўскага прадстаўляе суб'ектную беларускую гістарыяграфію, знешнепалітычныя дзеянні Полацкага, Турава-Пінскага княстваў, ВКЛ і Рэчы Паспалітай разглядаюцца ў ім праз прызму беларускай гісторыі і беларускай рацыі стану. Такі падыход да ўласнай гісторыі ў любой іншай краіне здаўна з'яўляецца нармальным і ў гісторыкаў адпрацаваны да аўтаматызму як умоўны рэфлекс, але ў сённяшняй Беларусі ён звяртае на сябе ўвагу і вымагае ад даследчыка пэўнай грамадзянскай мужнасці. Як прыклад можна прывесці можа дробную, але важную дэталь — на працягу ўсёй працы Аўтар паслядоўна выкарыстоўвае неафіцыйную, але праўдзівую форму назвы беларускай сталіцы — Менск.

З другога боку варта адзначыць, што Аўтар стараецца не пераступаць межаў навуковасці, таму ягоны суб'ектна-беларускі падыход да гісторыі не мае нічога агульнага з ура-патрыятызмам. Асабліва выразна гэта відаць на аналізе ўзаемадачыненняў з Расеяй. У аўтара не відно і следу векавой гістарыяграфічнай удзячнасці беларусаў расейцам за далучэнне нашай краіны да іх еўразійскай імперыі. Аднак, Ул. Снапкоўскаму гэтаксама нельга закінуць нейкія праявы русафобіі. Беларуска-расейскія ўзаемаадносіны ён разглядае спакойна і разважліва, беручы пад увагу геапалітычныя інтарэсы абедзвюх краін і называючы рэчы сваімі іменамі. Напрыклад, аўтар

параўноўвае розныя ацэнкі барацьбы полацкіх князёў з кіеўскімі: для расейскіх гісторыкаў — то праява полацкага сепаратызму, для беларускіх, у тым ліку Ул. Снапкоўскага — барацьба за незалежнасць, якая мела „прагрэсіўны характар” (с. 22-23).

Вайсковыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў 1654-1668 гг. ацэньваюцца як „руская інтэрвенцыя” (с. 194), „з лета 1660 г. вайна ў Беларусі і Літве ўступіла ў апошнюю стадыю, стала набываць характар усенароднай, вызваленчай” (с. 191). Ужо летам 1654 г., пасля ўварвання расейскіх войскаў на тэрыторыю Беларусі, „на Смаленшчыне, Мсціслаўшчыне, Полаччыне, Магілёўшчыне, Віцебшчыне сталі ўзнікаць сялянскія атрады самаабароны — першыя вядомыя ў гісторыі Беларусі партызанскія атрады (у рускай тэрміналогіі «шиши»)” (с. 184). З’яўленне ў Маскве будучага першага расейскага паэта і выхавальніка царскіх дзяцей Сімяона Полацкага адбылося ў выніку змушанай эміграцыі гэтага полацкага манаха, скампраметаванага калабарацыяй з расейцамі. На думку Аўтара, „ён паклаў пачатак згубнаму для беларускай культуры працэсу культурнай эміграцыі” (с. 220).

Не замаўчаў Аўтар і дзікунскія паводзіны ў полацкім Сафійскім саборы цара Пятра I, які са сваёй світай у 1705 г. непасрэдна ў саборы забіў некалькіх святароў і ўчыніў тут склад пораху, выбух якога разбурыў найстаражытны мураваны храм Беларусі. Гэты расейскі манарх, услаўлены ў афіцыйнай савецкай (у тым ліку савецкай беларускай) гістарыяграфіі, паводзіў сябе ў Беларусі як на акупаванай тэрыторыі, па ягоным загадзе падчас адступлення перад шведамі былі спалены цэлыя гарады: Мсціслаў, Орша, Віцебск, Магілёў (с. 205).

Разам з тым у працы прыводзяцца факты прамаскоўскай арыентацыі часткі праваслаўнага насельніцтва Беларусі, асабліва пасля заключэння Берасцейскай царкоўнай уніі і пачатку прымусовага пашырэння уніяцтва ў Рэчы Паспалітай (с. 218); апісваюцца праекты і спробы заключэння уніі ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай і г.д. Увогуле можна канстатаваць, што ў працы дастаткова выразна адлюстраваная гістарычная розніца расейскіх і ўласна беларускіх нацыянальна-дзяржаўных інтарэсаў.

Апісанне ўзаемаадносін з Польшчай таксама пазбаўленае стэрэатыпаў савецкай гістарыяграфіі, з яе акцэнтаваннем працэсаў паланізацыі і акаталічвання беларусаў (хоць і пра гэта таксама ідзе гаворка). Аўтар шмат у якіх пытаннях выпрацаваў уласны падыход да многіх аспектаў польска-беларускіх узаемадачыненняў, што дадало падручніку рысы навуковай манаграфіі. Узаемаадносіны ВКЛ з Польшчай як у часы персанальных уніяў, так і ў Рэчы Паспалітай разглядаюцца праз прызму інтарэсаў беларуска-літоўскага гаспадарства. Увага акцэнтуецца на імкненнях да захавання самастойнасці ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай. Гэтая самастойнасць перажывала таксама эпоху рэформаў у 18 ст. Нават вядомая Канстытуцыя 3 Мая, на думку Ул. Снапкоўскага, не прывяла да поўнай ліквідацыі асобнасці ВКЛ, пераўтварэння яго ў правінцыю Польшчы. Яна „не знішчала унію «абодвух народаў», як, дарэчы, і не пацвярджала яе; яна яе замоўчвала” (с.

249). „Праведзеныя рэформы не выходзілі, аднак, за рамкі федэратыўнай мадэлі палітыка-тэрытарыяльнай арганізацыі, у межах якой ВКЛ працягвала карыстацца дзяржаўнай аўтаноміяй” (с. 250).

Такім чынам, нягледзячы на ад пачатку зададзены падручнікавы характар працы, яна ўтрымлівае элементы самастойнага навуковага даследавання, што толькі павышае яе вартасць. Аўтар праз свой навучальны дапаможнік уводзіць Беларусь у шэраг „нармальных” паўнавартасных еўрапейскіх дзяржаў. І аказваецца, што традыцыі ў нас не меньш даўнія і трывалейшыя, чым у суседзяў. Напрыклад, Полацкае княства стала самастойнай дзяржавай самым першым сярод усіх усходнеславянскіх. Калі ўлічыць, што Уладзіміра-Суздальская Русь здабыла незалежнасць ад Кіева толькі ў 12 ст., то традыцыя беларускай дзяржаўнасці аказалася на два стагоддзі старэйшая за расейскую.

Агромністы храналагічны працяг аповяду (амаль тысячагоддзе) запатрабаваў ад Аўтара вывучэння вялікай колькасці спецыяльнай літаратуры. Між тым, з першага ж погляду на спіс крыніц і літаратуры, змешчаны ў канцы працы, выяўляецца прыкры і, напэўна, найвялікшы яе хіб. У гэтым спісе няма аніводнай (?!) працы, выдрукаванай лацінскім шрыфтам. Адсутнічаюць нават працы беларускіх гісторыкаў, надрукаваныя ў замежных выданнях. Такая паслядоўнасць у адборы бібіліяграфіі выглядае як прынцып пабудовы падручніка, прыняты, магчыма, не па волі самога Аўтара. Між тым, асноўная маса літаратуры па гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ створана ў Польшчы, нямала яе ёсць у Літве, а разгляд польска-ліцвінскіх уній ці знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай без аналізу польскай літаратуры, то ўжо, прабачце, выглядае як нонсенс. Знаёмства са спісам літаратуры моцна пахіснула маё пачатковае перакананне і ўражанне пра „еўрапейскасць” кнігі. На жаль, мы яшчэ не ў Еўропе.

Напэўна, з-за вялікага аб’ёму матэрыялу, Аўтару не ўдалося выкарыстаць таксама ўсю літаратуру, выдадзеную кірыліцай, нават некаторых прац манаграфічнага характару. Напрыклад, не трапіла ў спіс літаратуры мая манаграфія „Стварэнне ВКЛ” (праўда, у тэксце сустракаюцца цытаты з яе — с. 59, 66).

На думку Ул. Снапкоўскага, пасля канчатковага аб’яднання беларускіх земляў у час гаспадарання Альгерда, яны „занялі ў дзяржаве цэнтральнае, дамінуючае месца. Інтарэсамі гэтых зямель у значнай ступені вызначалася знешняя палітыка ВКЛ як Беларуска-Літоўскай дзяржавы” (с. 83). Аўтар спрабуе ў сваім аповядзе заставацца ў межах сённяшняга геаграфічнага абсягу Беларусі, але гэта не заўсёды яму ўдаецца. Напрыклад, Смаленскае княства ён не разглядае ў шэрагу іншых беларускіх, але не можа абысціся без характарыстыкі смаленскіх міжнародных дамоваў (з Рыгай) і дэталёва апісвае „Смаленскую гандлёвую праўду” 1229 г., у якой „ужо выразна чуюцца гукавыя асаблівасці беларускай мовы” (с. 37-38). Гаворачы пра каланізацыю крывічамі балцкіх зямель, не ўзгадвае пра Вільню, якая, паводле археалагічных даных, была заснавана крывічамі ў 12 ст.

Як ва ўсякай аб'ёмнай працы, у дапаможніку трапляюцца памылкі і недакладнасці. У апісанні пачаткаў ВКЛ відочна механічнае змяшанне трох канцэпцый генезы ВКЛ (традыцыйнай балцкацэнтрысцкай, беларусацэнтрычнай Міколы Ермаловіча і маёй — біэтнічнай), што выклікала супярэчнасці ў аповядзе. Атрымалася, што Міндоўг, хоць і ўцёк у Наваградак з Літвы, але потым далучыў яго да сваіх уладанняў (адкуль быццам уцёк). Трохі далей ужо гаворыцца пра заваяванне Наваградскага княства Літвой (с. 60), але агульная ацэнка пачатку ВКЛ даецца дакладна па маёй кнізе: „Пачаткам ВКЛ стаў палітычны саюз дзвюх галоўных рэгіянальных сіл — усходнеславянскіх панямонскіх гарадоў і найбольш моцных правадыроў балцкіх плямён" (с. 59). Невядома на якой падставе сцвярджаецца, што Міндоўг стаў вялікім князем у 1230-я гады (с. 60). Не згодны, што полацкая зброя ў пачатку 13 ст. была састарэлай у параўнанні з нямецкай (с. 49), што прычынай з'яўлення нямецкай калоніі ў Лівоніі быў выпадак (с. 41, а не вынік агульнаеўрапейскага каланізацыйнага руху 12-13 ст.) і што крыжакі „перабілі прусаў" (с. 49). Даніла Галіцкі каранаваўся ў адзін год з Міндоўгам, а не праз два гады (с. 60), як памылкова пададзена ў Галіцка-Валынскім летапісе.

На захадзе галоўным ворагам ВКЛ быў Тэўтонскі, а не Лівонскі ордэн (с. 68, 69). З працы Ермаловіча некрытычна перанесена меркаванне, што Свідрыгайла „хоць перайшоў у каталіцтва, аднак па-ранейшаму быў адданы сваёй народнасці і веры (выдзелена мною — А. К.)" (с. 105). У апісанні гаспадарання Вітаўта адсутнічаюць звесткі пра цікавы эпізод з вялікай міжнароднай палітыкі гэтага князя — справа чэшскай кароны і чэшскія прыгоды князя Жыгімонта Карыбута. Казімір Ягайлавіч названы братам Ягайлы (с. 107), а сын Казіміра — чэшскі і венгерскі кароль Уладзіслаў II Ягелончык у адным месцы выступае як Уладзіслаў Ягайлавіч (с. 118). Для акрэслення саюзных польска-ліцвінскіх узаемаадносінаў у 15-16 ст. недарэчы ўжыты тэрмін „дуумвірат".

Наўрад ці можна пагадзіцца са сцвярджэннем, што ўжо ў першым перыядзе гісторыі беларускай дзяржаўнасці (9 — сярэдзіна 13 ст.) вызначыліся геапалітычныя мэты і знешнепалітычныя інтарэсы Беларусі (с. 8). Такія мэты і інтарэсы ўсведамляюцца і фармулююцца канкрэтнымі людзьмі, а каб вызначыць іх ужо ў раннім сярэднявеччы трэба было быць не чалавекам, а Богам. У гэтай пасылцы выразна відочная мадэрнізацыя гісторыі. Зусім інакш успрымаецца наступны тэзіс Аўтара пра фармаванне ў тыя часы геапалітычнай традыцыі (выдзелена мной — А. К.) беларускай дзяржаўнасці (с. 8).

Усё-такі на заканчэнне мушу канстатаваць, што першы беларускі падручнік па гісторыі знешняй палітыкі краіны адбыўся, нягледзячы на непазбежныя недахопы, памылкі і нават абрэзаны да калецтва бібліяграфічны апарат. Няпростае заданне стаіць перад Аўтарам у падрыхтоўцы другой часткі яго навучальнага дапаможніка. Там давядзецца разглядаць перыяд

расейскай акупацыі Беларусі і тут гісторыку беларускай знешняй палітыкі прыйдзецца цяжка.

***Аляксандар Краўцэвіч (Гародня )*** А. Краўцэвіч // Białoruskie Zeszyty Historyczne. Białystok, 2005. № 23. S. 231-235.

### *Снапковский, Владимир Е. История внешней политики Беларуси: пособие. Минск: БГУ, 2013. 495 с.*

Аўтар разгляданай кнігі Уладзімір Снапкоўскі, доктар гістарычных навук, паставіў мэту паказаць знешнюю палітыку Беларусі на фоне гісторыі краіны. Выданне ўяўляе сабой дапаможнік для студэнтаў, якія вывучаюць гісторыю, паліталогію, міжнародныя адносіны, а таксама для ўсіх тых, хто цікавіцца гісторыяй знешняй палітыкі і дыпламатыі Беларусі.

Кніга мае храналагічна-праблемную структуру, складаецца з уступу да выдавецкай серыі, непасрэдных уводзінаў, 15 раздзелаў, заканчэння, анатаванай храналогіі найважнейшых падзей гісторыі знешняй палітыкі і дыпламатыі Беларусі, спіса літаратуры, імяннога і геаграфічнага паказальнікаў. Кожны раздзел заканчваецца высновай у выглядзе пераліку асноўных ідэй-тэзісаў і кантрольнымі пытаннямі да патэнцыйных чытачоў (вучняў, студэнтаў). Аналізаваная праца – першае комплекснае і сістэматызаванае даследаванне па гісторыі знешняй палітыкі і дыпламатыі Беларусі ад яе пачаткаў да сучасных падзей. Пытанні знешнепалітычнай і дыпламатычнай дзейнасці разглядаюцца ў кантэксце міжнароднага, палітычнага, этнічнага, эканамічнага і рэлігійнага развіцця. Кніга напісана на рускай мове.

У гісторыі знешняй палітыкі і дыпламатыі Беларусі аўтар вылучае пяць вялікіх храналагічных перыядаў. Першы ахоплівае міжнародную актыўнасць старажытнабеларускіх княстваў у X – першай палове XIII ст. (раздзел I). Другі – дзейнасць Вялікага Княства Літоўскага ад моманту яго ўзнікнення да трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай. У знешняй палітыцы ВКЛ вылучаюцца два этапы: 1) ад узнікнення дзяржавы да Люблінскай уніі 1569 г. (главы II, III, частка IV) і 2) ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай (1569–1795) (другая частка главы IV, главы V–VII). Трэці перыяд ахоплівае 1795–1917 гады, калі беларускія землі знаходзіліся ў складзе Расійскай імперыі (раздзелы VIII, IX). Знешняя палітыка Беларускай Народнай Рэспублікі і Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (1918–1991) пададзена ў главах X–XIV. Пяты перыяд датычыцца знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь у 1991–2012 г. (раздзел XV).

Выкарыстаныя У. Снапкоўскім крыніцы і літаратура выклікаюць пэўныя крытычныя заўвагі. Спецыфіка такога выдання, як дапаможнік, патрабуе ад аўтара пазначэння ў першую чаргу выдадзеных крыніц. Гэта вынікае з агульнага характару даследаваных праблем і шырокіх тэматычных і храналагічных межаў. Аднак у спісе крыніц пазначаны толькі 16 пазіцый.

Большасць з іх (дзевяць) складаюць працы, што выйшлі ў Беларусі пасля 1993 г., шэсць выдадзены яшчэ ў савецкі перыяд і адно выданне, якое з’явілася ў Маскве і Варшаве. Няма ў спісе ніводнай згадкі пра зборнікі дакументаў на польскай ці літоўскай мовах. Абраныя такім чынам крыніцы падштурхоўваюць аўтара да аднабаковага разгляду апісваных падзей. Наўмысны беларусацэнтрызм крыніцазнаўчай базы несумненна адбіўся і на беларусацэнтрычным змесце разгляданага выдання.

Падобным чынам выглядае і спіс літаратуры па пытаннях знешняй палітыкі і дыпламатыі на беларускіх землях у перыяд з X ст. да 1991 г. З 46 пазіцый у бібліяграфіі толькі дзве кнігі выйшлі за межамі Беларусі і СССР: Д. Міхалюк (Białoruska Republika Ludowa 1918–1920. U podstaw białoruskiej państwowości. Toruń 2010) і Н. П. Вакара (Belorussia. The Making of a Nation. Cambrige, Massachusetts 1956). У спісе літаратуры адсутнічаюць элементарныя польскамоўныя выданні па гісторыі ВКЛ, Рэчы Паспалітай Абодвух народаў, паўночна-ўсходніх ваяводстваў, што ўваходзілі ў склад Польскай рэспублікі ў міжваенны перыяд (Заходняя Беларусь). Не згадваюцца працы такіх даследчыкаў, як Ю. Бардах, Г. Блашчак, Е. Ахманьскі, А. Рахуба, Я. Сабчак, А. Е. Закшэўскі.

Аўтар, які даследуе беларускі нацыянальны рух, яго праекты і дзейнасць у дыпламатычнай сферы, павінен быў змясціць у спісе літаратуры наступныя працы: Chojnowski A. Koncepcje polityki narodowościowej rządów polskich w latach 1921–1939 (Ossolineum, 1979), Gierowska-Kałłaur J. Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich (19 lutego 1919 – 9 września 1920) (Warszawa, 2003), Paruch W. Od konsolidacji państwowej do konsolidacji narodowej. Mniejszości narodowe w myśli politycznej obozu piłsudczykowskiego (1926–1939) (Lublin, 1997), Śleszyński W. Bezpieczeństwo wewnętrzne w polityce państwa polskiego na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej (Warszawa, 2007).

Асобна У. Снапкоўскі змясціў бібліяграфію, якая датычыцца знешняй палітыкі сучаснай Рэспублікі Беларусь: 21 выданне, з якіх 5 прац на польскай мове і адна на англійскай.

Несумненная плюс дапаможніка – яго “агульны”, дакладней абагульняючы характар, без чаго было немагчыма абыйсціся пры разглядзе тысячагадовага перыяду беларускай дзяржаўнасці. Праблематыка знешняй палітыкі і дыпламатыі паказана ад пачатку існавання дзяржаўных утварэнняў на беларускіх землях да моманту абвяшчэння ў 1991 г. незалежнай Рэспублікі Беларусь. Але гэта аўтарскае дасягненне часамі ператвараецца ў слабы бок працы. Аўтар шукае беларускую знешнюю палітыку там, дзе яе не было і быць не магло. Аснова правядзення самастойнай знешняй палітыкі – існаванне дзяржавы. Першай беларускай дзяржавай была Беларуская Народная Рэспубліка (1918–1920). У. Снапкоўскі добра ўсведамляе гэтую метадалагічную праблему. Прадметам даследавання ён вызначае знешнепалітычную дзейнасць беларускіх дзяржаў і дзяржаўных утварэнняў, нават тады, калі незалежнай беларускай дзяржавы яшчэ не існавала. Больш за тое, аўтар звяртае ўвагу і на такі аспект у знешняй палітыцы, як механізм

функцыянавання беларускай дзяржаўнасці ў кантэксце адносінаў “цэнтр – перыферыя” (ВКЛ – Рэч Паспалітая, БССР – СССР). У сферы інтарэсаў У. Снапкоўскага апынуліся і знешнепалітычныя праекты беларускага нацыянальнага руху ў XIX–XX ст.

Пачатак знешняй палітыкі і дыпламатыі Беларусі аўтар бачыць ужо ў X ст. у Полацкім княстве – першым дзяржаўным утварэнні на беларускіх землях. Полацк у кнізе паказаны як першае княства, якое, знаходзячыся ў складзе Кіеўскай Русі, змагло выйсці з-пад уплыву Кіева. Сама ж палітыка Полацкага княства функцыянавала ў трыкутніку “Кіеў – Полацк – Ноўгарад”.

Іншай формай беларускай дзяржаўнасці на літоўска-беларускіх землях было Тураўскае княства, якое функцыянавала паміж Бугам і Прыпяццю. Яно знаходзілася на гандлёвым шляху, які ішоў з Кіева да Польшчы і далей на захад Еўропы. Тураўскае княства вяло сваю знешнюю палітыку з суседняй Польшчай, крыжаносцамі, балтыйскімі плямёнамі, а таксама з далёкай Візантыяй і мусульманскім Усходам.

Прыняцце хрысціянства па ўсходнім узоры прывяло да таго, што Полацкае і Тураўскае княствы апынуліся ў сферы палітычнага, культурнага і рэлігійнага ўплыву праваслаўя. Такім чынам пазней “беларускія дзяржаўныя ўтварэнні” сталі схіляцца да Візантыі, а потым да Масквы.

Снапкоўскі сцвярджае, што старажытнабеларускія княствы пазбеглі знішчальных набегаў татар. ВКЛ паўстала як сумесная ініцыятыва Літвы і старажытнабеларускіх княстваў, якія аб’ядналі свае сілы супраць пагрозы крыжаносцаў Літве і татарскай пагрозы беларускім княствам. Гэтае сцверджанне супярэчыць пашыранаму ў польскай гістарыяграфіі меркаванню аб заваяванні аслабленых татарскімі набегамі і міжусобіцамі рускіх княстваў літоўскімі ўладарамі. Падобным чынам асвятляе гэтае пытанне і літоўская гістарыяграфія.

Вялікае Княства Літоўскае – літоўска-беларуская дзяржава – павінна было стаць славянска-літоўскім саюзам супраць, з аднаго боку, татарскай пагрозы, а з другога – небяспекі з боку Ордэна. Ваенна-палітычны саюз фактычна быў адказам на тагачасную міжнародную сітуацыю.

Значную ролю ў павелічэнні тэрыторыі ВКЛ выканаў Гедымін. Ён пашырыў межы сваёй дзяржавы на поўдні і ўсходзе, уключыўшы рускія землі, Падляшша і Валынь. Знешняя палітыка, якую ён праводзіў, фактычна была балансаваннем, з аднаго боку, у трыкутніку “Залатая Арда – Польшча – Масква”, а з другога – паміж каталіцтвам і праваслаўем. Пад час праўлення Альгерда ў склад ВКЛ увайшлі былыя землі Кіеўскай Русі, аслабленай татарскімі набегамі і феадальнай раздробленасцю.

Падпісанне ў 1385 г. Крэўскай уніі стала пачаткам асабіста-дынастычнай уніі, якая дапаўняла ваенна-палітычны саюз ВКЛ і Польскага Каралеўства. Польска-літоўская кааліцыя прывяла да разгрому крыжаносцаў. Вітаўт узмацніў свае пазіцыі ў Літве, але карону так і не атрымаў.

Аўтар паказвае галоўныя напрамкі знешняй палітыкі ВКЛ у перыяд з другой паловы XV да першай паловы XVI ст. Ён звяртае ўвагу на адносіны з

Масквой, крыжаносцамі, Крымскім ханствам, дзяржавамі Заходняй Еўропы. Аналізуючы адносіны з Польшчай, У. Снапкоўскі адзначае ўмацаванне палітычнага саюзу дзвюх дзяржаў.

Перыяд, які пачаўся пасля падпісання Люблінскай уніі 1569 г., паказаны ў выданні як час барацьбы ВКЛ за незалежнасць ад Польскага Каралеўства. Аўтаномія ВКЛ на міжнароднай арэне, розніца знешнепалітычных інтарэсаў паміж Княствам і Каралеўствам вельмі часта і выразна падкрэсліваецца аўтарам даследавання. Вялікая роля ў справе абароны незалежнасці ВКЛ на мяжы XVI–XVII ст. адводзіцца віленскаму ваяводу, канцлеру і гетману вялікаму літоўскаму Льву Сапегу.

У працы паказаны войны Рэчы Паспалітай са Швецыяй, Расіяй, Турцыяй і казакамі Б. Хмяльніцкага ў XVII ст.; адзначаецца, што яны вялі да падзення сумеснай дзяржавы. Рэч Паспалітая Абодвух народаў пераўтварылася ў той час у Польскую Рэч Паспалітую, а ВКЛ стала яе правінцыяй. У працы вельмі дакладна апісаны механізм гэтай уніфікацыі федэратыўнай дзяржавы.

Пасля падпісання Люблінскай уніі ў Рэчы Паспалітай узнік новы сацыяльны пласт – “польскі шляхецкі народ”. Яго аб’ядноўвалі сумесныя прывілеі і правы, сумесная палітычная ідэалогія, каталіцкае веравызнанне і польская мова. Па меркаванні У. Снапкоўскага, падзел грамадства ВКЛ па сацыяльнай, этнічнай  і рэлігійнай прыкметах стаў адной з прычын, якія вялі да аслаблення гэтай дзяржавы  і яе пазіцый у польска-ліцвінскім федэратыўным саюзе, які рухаўся ў кірунку ўніфікацыі. Падзелы Рэчы Паспалітаў ацэньваюцца ў кнізе як ліквідацыя польскай і беларуска-літоўскай дзяржаўнасці.

1772 – 1917 гады – перыяд, калі беларускія землі знаходзіліся ў складзе Расійскай імперыі. Аўтар аналізуе ўнутраную і знешнюю палітыку Расіі ў гэты час, царскую палітыку русіфікацыі беларускага і польскага насельніцтва, адзначае інтэграцыю беларускіх земляў у Расійскую імперыю, паказвае значнасць удзелу беларускага насельніцтва ў паўстанні 1863–1864 г.

У другой палове XIX ст. зарадзіўся беларускі нацыянальны рух са сваім бачаннем незалежнай беларускай дзяржавы, якое рэалізавалася ў выглядзе Беларускай Народнай Рэспублікі.

Аўтар працы сцвярджае, што Беларуская Народная Рэспубліка была першай гістарычнай спробай аднаўлення беларускай дзяржавы ў XX ст. Абвешчаная 25 сакавіка 1918 г. БНР фактычна стала першай беларускай дзяржавай, якая магла праводзіць знешнюю палітыку. Галоўнай задачай дыпламатыі БНР было атрыманне міжнароднага прызнання для беларускай дзяржавы і яе межаў. Аднак вялікіх поспехаў у знешняй палітыцы не было. БНР аказалася палітычна эфемерным утварэннем.

Прычыны дыпламатычнай слабасці БНР аўтар бачыць ў адсутнасці вопыту і ўменняў у яе дзеячаў. Такая выснова, несумненна, правільная. Праблема бачыцца яшчэ і ў агульнай слабасці новай дзяржавы, якая ў тагачасных умовах не магла мілітарна супрацьстаяць больш моцным суседзям.

Стварэнне маскоўскімі ўладамі Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі аўтар лічыць праявай знешняй палітыкі Савецкай Расіі, якая імкнулася на сваіх заходніх межах стварыць з савецкіх рэспублік буферную зону, што аддзяляла б яе ад капіталістычнага Захаду. Такая інтэрпрэтацыя падаецца нам не найлепшай. Існаванне асобных савецкіх рэспублік было хутчэй пытаннем унутранай палітыкі, чым праявай трактавання іх Масквой у якасці самастойных дзяржаўных суб’ектаў. Моцна цэнтралізаваная ўлада ў Савецкай Расіі была рэальнай палітыкай у дачыненні да дэкларацый аб самавызначэнні і самастойнасці асобных рэспублік. Ідэалагічная праграма “самавызначэння народаў” была толькі праграмным варыянтам, які хаваў гэтую ўладу і ўплыў Масквы.

Ужо ў студзені 1919 г. Цэнтральны камітэт Расійскай камуністычнай партыі (бальшавікоў) – ЦК РКП(б) – вылучыў са складу БССР Віцебскую, Смаленскую і Магілёўскую губерні, якія ўключыў у склад Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікі (РСФСР). На астатніх беларускіх землях пасля іх аб’яднання з Літвой узнікла Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (Літбел). Пасля распаду Літбела маскоўскія ўлады падтрымалі ўзніклую Літоўскую рэспубліку. 31 ліпеня 1920 г. зноў была абвешчана незалежнасць БССР. Гэтыя факты пацвярджаюць, што незалежнасць БССР была толькі тэарэтычнай.

Перыяд 1919–1923 гг. Снапкоўскі лічыць першым этапам правядзення міжнароднай дзейнасці БССР у адносінах з дзвюма суседкамі: Польшчай і РСФСР. Функцыянаванне беларускай дыпламатыі ён разглядае у складанай сітуацыі польска-савецкай вайны і фармавання межаў новых дзяржаў. Бачанне ў гэты час дыпламатычнай самастойнасці БССР, на наш погляд, выглядае перабольшваннем. Нягледзячы на тое, што Польшча фармальна прызнала незалежнасць БССР, у дыпламатычных адносінах з усходнім суседам партнёрам Варшавы часцей выступала Масква, чым Мінск.

Узнікненне СССР азначала ўзмацненне цэнтралізацыі ў правядзенні знешняй палітыкі. Пасля 1923 г. знікла нават бачанне дыпламатычнай самастойнасці. Сама незалежнасць БССР мела фармальны і дэкларатыўны характар.

Уступленне Чырвонай арміі 17 верасня 1939 г. на паўночна-ўсходнюю тэрыторыю Польскай Рэспублікі і далучэнне яе да БССР аўтар называе “гістарычнай справядлівасцю для беларускага народа”. Выкарыстанне маральных і ідэалагічных аргументаў для апраўдання імперскай палітыкі СССР, які праз далучэнне Заходняй Беларусі да БССР парушыў усе міжнародныя дамоўленасці, калі напаў на Польшчу, што вяла вайну з гітлераўскай Германіяй, падаецца метадалагічна неапраўданым. А тут асуджаецца імперская палітыка І. Сталіна ў дачыненні да Польшчы і адначасова ўсхваляецца далучэнне паўночна-ўсходніх ваяводстваў Польскай рэспублікі (Заходняй Беларусі) да БССР.

Можна ў значнай ступені зразумець такую двухсэнсоўную пазіцыю аўтара, які ў навучальным дапаможніку, рэкамендаваным для студэнтаў, што

вывучаюць міжнародныя адносіны, і які дарэчы мае грыф "Класічнае ўніверсітэцкае выданне", вымушаны лічыцца з афіцыйнымі падыходамі сучаснай беларускай гістарыяграфіі ў такім лёсавызначальным для гістарычнай палітыкі пытанні, як “уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР”. У сваіх высновах ён, аднак, імкнучыся вытрымаць аб'ектыўнасць і пачуццё гістарычнай праўды, падкрэслівае разам з тым, што акт аб'яднання быў здзейснены сродкамі імперскай палітыкі, стаў вынікам змовы дыктатарскіх рэжымаў Сталіна і Гітлера.

Радасць уз’яднання Усходняй і Заходняй Беларусі была азмрочана перадачай на падставе савецка-літоўскай дамовы ад 10 кастрычніка 1939 г. Віленшчыны разам з Вільняй Літоўскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы. Гэтыя землі беларускі нацыянальны рух лічыў і лічыць спрадвечна беларускімі. Вось ён, кошт, які БССР заплаціла за далучэнне Літвы да СССР. Гэтае рашэнне Сталіна яскрава паказвае інструментальнае трактаванне БССР у межах СССР.

Другая сусветная вайна скончылася вызваленнем беларускіх земляў з-пад нямецкай акупацыі. Пасля гэтага адбылася яшчэ большая інтэграцыя БССР у СССР. Краіна не магла выконваць істотную ролю ў моцна цэнтралізаванай дзяржаве Сталіна. У 1945 г. БССР увайшла у склад Арганізацыі Аб’яднаных Нацый (ААН). Аднак гэта быў хутчэй тактычны крок Сталіна з мэтай павышэння імперскага значэння СССР, чым фактычнае ўзмацненне ролі БССР на міжнароднай арэне.

У 1991 г. Рэспубліка Беларусь абвясціла незалежнасць. Як паўнапраўны суб’ект міжнароднага права яна выйшла на міжнародную арэну. У хуткім часе новая дзяржава набыла прызнанне і наладзіла дыпламатычныя адносіны з большасцю краін свету. Беларусь атрымала новы статус у ААН, відавочна, больш рэальны, чым папярэдні. Яна стала першай краінай, якая, маючы ядзерную зброю, добраахвотна адмовілася ад статусу ядзернай дзяржавы.

Да сярэдзіны 1994 г. знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь вызначалася Вярхоўным Саветам і Саветам Міністраў. Пасля рэферэндуму 1996 г. яе галоўныя вектары рэалізуе прэзідэнт. Адпаведна з Канстытуцыяй прэзідэнт адказвае за знешнюю палітыку, прадстаўляе Беларусь у адносінах з іншымі краінамі і міжнароднымі арганізацыямі, вядзе перамовы, ратыфікуе міжнародныя пагадненні (дамовы), прызначае і адклікае дыпламатаў і амбасадараў. Установай, якая ажыццяўляе ўказанні прэзідэнта ў правядзенні знешняй палітыкі, выступае Міністэрства замежных спраў (МЗС).

У кнізе У. Снапкоўскі адзначыў праблему, з якой сутыкнулася Рэспубліка Беларусь у 1991 г.: дылема “стратэгічнага выбару” паміж Усходам (Расіяй) і Захадам (Еўрапейскі Саюз). Адзін з варыянтаў яе вырашэння – канцэпцыя “роўнай набліжанасці”. Захаванне раўнавагі паміж Усходам і Захадам адлюстроўвае сутнасць такой палітыкі. Гэта дазваляе аптымальна выкарыстоўваць як геапалітычнае становішча Беларусі ў міжнародным транзіце, так і гаспадарчы патэнцыял краіны. Значна лепш

стратэгія “роўнай набліжанасці” была рэалізавана ў адносінах з Расіяй, у той час як з Захадам увесь час узнікаюць перашкоды і цяжкасці.

Аўтар згадвае прыярытэты прэзідэнта Беларусі А. Лукашэнкі ад 1995 г., якія датычацца знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь: узмацненне нацыянальнага суверэнітэту, больш цеснае супрацоўніцтва з краінамі СНД пры паглыбленні сувязяў з Расіяй, развіццё адносінаў з заходнімі краінамі, у тым ліку з дзяржавамі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, стварэнне карысных умоў для супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі.

Акрамя гэтых заяў, галоўным прыярытэтам знешняй палітыкі выступае Расія. У працы паказаны этапы палітычнай, эканамічнай і ваеннай інтэграцыі з гэтай краінай. 21 лютага 1995 г. была падпісана Дамова аб сяброўстве, добрасуседстве і супрацоўніцтве, а 8 снежня 1999 г. прэзідэнты Беларусі і Расіі падпісалі ў Маскве Дамову аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. Гэты дакумент стаў асновай для стварэння 26 студзеня 2000 г. Саюза Беларусі і Расіі, які ў перспектыве павінен прывесці да гаспадарчай і валютнай інтэграцыі абедзвюх краін.

Вялікае значэнне ў беларуска-расійскіх адносінах надаецца ваенна-палітычнаму супрацоўніцтву. Абедзве краіны падпісалі дамову аб ваенным супрацоўніцтве, пагадненне аб рэгіянальнай бяспецы, зацвердзілі канцэпцыю сумеснай абарончай палітыкі.

У кнізе аўтар паказаў адносіны Рэспублікі Беларусь з СНД, суседнімі краінамі, Еўрапейскім Саюзам і ЗША, а таксама шматвектарную палітыку Беларусі (з нееўрапейскімі краінамі). Асобны пункт прысвечаны разгляду ролі Рэспублікі Беларусь у ААН і ўдзелу ў іншых міжнародных арганізацыях.

Нягледзячы на крытычныя заўвагі, варта адзначыць, што праца Уладзіміра Снапкоўскага з’яўляецца вельмі каштоўнай. Яна выступае важным голасам у гістарычным дыскурсе па пытанні дыпламатыі і знешняй палітыкі еўрапейскіх краін. Праца мае наватарскі характар. Галоўная заслуга выдання – глыбокі і дэталёвы навуковы аналіз. Праблема знешняй палітыкі Беларусі прадстаўлена аўтарам на фоне грамадскіх, палітычных, нацыянальных, рэлігійных, прававых і гаспадарчых працэсаў. Асабліва падрабязна і цікава ў кнізе адлюстраваны пытанні знешняй палітыкі і дыпламатыі Вялікага Княства Літоўскага. Кнігу можна лічыць прыкладам таго, як у складаных умовах працы гісторыка ў Беларусі можна ствараць сур'ёзную навучальную літаратуру па гістарычнай тэматыцы, у тым ліку па гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі Беларусі.

Беласток *Анджэй Смалярчык*

История внешней политики Беларуси: пособие / В.Е.Снапковский. Минск: БГУ, 2013. 495 с. **Рэц.**: А. Смалярчык // Беларусі гістарычны агляд. 2017. Том 24. № 1-2 (46-47). С. 277-286.

## *«Польско-белорусский узел» 1918-1921 гг. в интерпретации современной польской историографии*

1918-1921 гг. стали важным рубежом в формировании как польской, так и белорусской государственности. Цели и стремления различных политических сил с обеих сторон подробно отражены в не имеющем аналогов в польской историографии обширном сборнике документов и материалов, опубликованном в Варшаве в 2018 г. под редакцией известного польского историка Войцеха Матерского. Значимость книги не только в том, что в ней впервые напечатаны несколько десятков источников по белорусской тематике, в том числе из архивов США и Великобритании, но и в новой для исторической науки Польши постановке ряда исследовательских проблем. Среди них стоит выделить понятие «польско-белорусского узла» и сравнение попыток восстановления польской государственности с 1916 г. с формированием белорусских государственных структур с 1918 г.

В 2018 г. в Институте политических исследований Польской академии наук был опубликован солидный по объему и качеству исследовательской работы сборник документов и материалов «Польско-белорусский узел 1918-1921». Такой формат издания по белорусской проблематике данного периода для современной польской историографии стал новаторским. В этом несомненная заслуга редактора-составителя книги и автора предисловия к ней — видного историка Войцеха Матерского (р. 1944). 482 документа из архивов Польши, Республики Беларусь, России и других стран, созданных с марта 1918 г. по март 1921 г. и выявленных при участии известного белорусского специалиста В. Е. Снапковского, в хронологическом порядке помещены в основную документальную подборку (s. 53-747). В приложении опубликованы еще 19 источников 1921-1936 гг., время появления которых выходит за избранные временные рамки, ограниченные Рижским миром (s. 748-793). Среди текстов, опубликованных впервые, — интересные материалы архивов институтов Ю. Пилсудского в Нью-Йорке и Лондоне, а также из архивов МИД Великобритании.

Все документы в сборнике напечатаны на польском языке, в оригинале и переводах с русского, белорусского, английского, литовского, немецкого и итальянского: подобное «отступление от классических принципов издания источников» объясняется в предисловии желанием привлечь к чтению не только профессиональных историков, но и более широкий круг польской общественности (s. 45). Белорусские события августа 2020 г., вполне возможно, действительно обратят внимание части польской читающей публики на важную публикацию документов по истории соседней страны, доселе мало известной в условиях традиционной неконфликтной повседневности.

В своем подробном предисловии к книге (s. 7-46) В. Матерский[9] не только обращает внимание на важнейшие источники, с которыми предстоит познакомиться читателю, но и высказывает ряд важных концептуальных обобщений, развивающих тему в рамках современной польской исторической науки и дополнительно любопытных в свете того, что в 2019 г. российская историография пополнилась качественным исследованием Д. А. Коротковой по тому же периоду 1918-1921 гг. и во многом совпадающей проблематике[10]. Одно из таких обобщений — сама постановка вопроса о «польско-белорусском узле» 1918-1921 гг. Такое обозначение множества противоречий, возникших в этот переломный для становления государственности поляков и белорусов период, позволяет объемно представить как остроту разногласий, так и невозможность их преодолеть иначе как превратив узел в гордиев. Именно таким разрешением спора на белорусском направлении стал Рижский мир 1921 г., не только завершивший польско-советскую войну, но и разделивший этническую белорусскую территорию на советскую и польскую части.

По оценке В. Матерского, «1918 г., так же как и три последующих года до Рижского мира, формально определившего характер и форму польско-белорусских отношений, — это период, богатый событиями, исключительно важный для обеих наций, поляков и белорусов. Это время споров об отношении Беларуси к меняющейся концепции организации территориального и структурного упорядочения на северо-западных землях бывшей Российской империи, к возрожденной польской государственности. Это также период своеобразной игры польских политиков белорусской картой с Германией, Россией, Литвой и Антантой, а также с самими белорусами, но это также время непрерывной внутренней конфронтации — прежде всего между федералистами и инкорпораторами» (s. 8).

В. Матерский совершенно верно считает, что книга может служить не только «путеводителем по малоизвестным архивным фондам, а также документальным публикациям, прежде всего белорусским», а также «иллюстрацией, легитимизующей нынешнее состояние знаний» о теме, но и стимулом для дальнейших исследований (s. 7-8). Одним из таких перспективных исследований может стать дальнейшая разработка проблематики «польско-белорусского узла», предполагающая не только выход за пределы хронологических рамок 1918-1921 гг., но и углубленный подход к отраженным в публикации сюжетам. Несмотря на впечатляющий общий объем 501архивного документа, «польско-белорусский узел» рассматривается в публикации, как правило, с политико-дипломатической

[9] Рецензент некорректно считает автором предисловия только В.Матерского. Оно написано двумя составителями и это неоднократно подтверждается в тексте предисловия, где предложения звучат от имени двух составителей (s. 43 – 46).

[10] *Короткова Д. А.* Белорусские земли в советско-польских отношениях. Разменная карта в противостоянии двух держав. 1918–1921 гг. М., 2019.

точки зрения, которая не всегда обеспечивает приемлемую достоверность исторической реальности.

В частности, важнейший для белорусской истории рассматриваемого периода вопрос об этнической территории в предисловии В. Матерского фактически обходится стороной. Правда, утверждается, что в сентябре 1919 г. польские части «достигли рубежа Любань — Борисов — Двинск, осуществляя контроль над большинством белорусских территорий» (s. 24). Можно предположить, что польский историк разделяет официальную точку зрения современной белорусской историографии, согласно которой предметом исторического изучения могут быть, как правило, границы современной Республики Беларусь. Но в условиях 1918-1921 гг. подходы к этнотерриториальной проблеме были иными и притом различными, и эти важные «узелки» обязательно стоит добавить к «польско-белорусскому узлу» при дальнейших исследованиях, в том числе и с той целью, чтобы избежать туманных формулировок. Пример тому — оценка В. Матерским «далеких от однозначности» упоминаний Беларуси в тексте Рижского мирного договора 1921 г.: «Можно отстаивать как позицию, что буква договора касалась исключительно Беларуси в географическом понимании, так и то, что она касалась государства с этим названием» (s. 39). Здесь хорошо понятны рубежи провозглашенной 31 июля 1920 г. из нескольких уездов одной лишь Минской губернии «второй БССР», но неясны и не конкретизированы белорусские пределы «в географическом понимании», равно как и то, как они соотносятся с тогдашней этнической картиной.

Имеет интересную исследовательскую перспективу и тезис В. Матерского о том, что ситуацию с провозглашением в марте1918 г. в Минске Белорусской народной республики (БНР) «можно признать в значительном приближении сравнимой с появлением на польских землях Регентского совета; в обоих случаях объем автономии сочетался скорее с германским (Центральных держав) протекторатом, нежели с процессом, целенаправленно стремящимся к независимости» (s. 16).

Правда, провозглашенное в ноябре 1916 г. Германией и Австро-Венгрией Польское королевство польский историк оценивает довольно высоко: «В ноябре 1917 г. Регентский совет провозгласил первое правительство (премьера Яна Кухажевского), положив начало системе власти, продолжавшейся до окончания войны, правда, зависимой от оккупантов, но имевшей основные признаки отдельной государственности» (s. 9). По отношению же к «квазигосударственным» белорусским структурам применяются несколько иные формулировки: с одной стороны, БНР именуется «иллюзией белорусской государственности», с другой, на взгляд В. Матерского, в случае с провозглашенной 1 января 1919 г. «первой БССР» «фикция советской Беларуси была столь очевидной, что она создавала для большевистских властей реальную проблему» (s. 14, 19). Стоит заметить, что умозрительное разделение на «иллюзию» и «фикцию», т. е. на две различные словесные конструкции, не лишено смысла. Различие между БНР и

белорусскими советскими республиками было существенным. У первой из них, и документы сборника это хорошо показывают, были большие проблемы с военной составляющей формирующейся государственности, за БССР при очевидной буферности всегда стояла военная мощь РККА.

Сами же выводы об «иллюзии» и «фикции» восходят к видению ситуации тогдашними польскими политиками, и в частности Ю. Пилсудским, который и был автором хлесткого высказывания о «белорусской фикции». Оно имело вполне конкретный тактический смысл в условиях, когда польская государственность возрождалась в унитарном варианте и в сложнейших условиях вынуждена была оформлять свои границы, пресекая попытки соседних народов осуществить свои державные проекты. Белорусская государственность в практические расчеты Пилсудского не входила никогда и ни в каком виде.

Даже на уровне умозрительных проектов белорусского «буфера» между Польшей и Советской Россией польские власти не заходили дальше осуществившейся в 1920-1924 гг. в реальности «второй БССР» из уездов Минской губернии. Как справедливо подчеркивает В. Матерский, уже летом 1919 г. «было очевидно, что даже эвентуальное признание белорусской государственности Варшавой может ограничиться Минщиной, оно не охватит исконные белорусские земли Виленщины и Гродненщины» (s. 25). В этом и корень проблемы, мучившей небольшевистских белорусских политиков, недоумевавших, почему Польша медлит с формальным признанием БНР и постоянно откладывает даже разговоры на эту тему.

А после благоприятного для Польши изменения геополитической обстановки, как свидетельствует один из опубликованных в сборнике документов, запись в дневнике чиновника Гражданского управления польскими землями М. С. Коссаковского от 5 марта 1920 г., намерения Варшавы излагались простым языком и открытым текстом: «Пилсудский в Вильно уже отчетливо заявил Ивановскому, что белорусы обязаны порвать с фикцией государственности, забыть, что когда-то существовала Белорусская рада как суррогат правительства, и Ивановский на это вынужден был согласиться» (s. 413). Такая позиция Пилсудского лишала сколько-нибудь серьезных политических перспектив тех белорусских деятелей, которые подобно Вацлаву Ивановскому или Антону Луцкевичу пытались делать ставку на союз с возрождающейся Польшей, — Варшава нуждалась исключительно в их лояльности, но не в их деятельности в национальном белорусском направлении.

Документы сборника убедительно доказывают, что белорусскому национальному проекту активно мешали и в случае необходимости противодействовали сразу как минимум четыре влиятельных течения польской политики: 1) сторонники Ю. Пилсудского, в теории, разделявшие концепцию федерализма, от которой на практике пришлось в итоге полностью отказаться; 2) приверженцы национал-демократов и их лидера Р. Дмовского, отстаивавшие модель инкорпорации в отношении белорусских

земель; 3) польские землевладельцы и часть интеллигенции белорусских территорий, выступавшие, исходя из своих имущественных и ментальных интересов, за несбыточный в политических условиях 1918-1921 гг. вариант возвращения для возрождающейся Польши границ Речи Посполитой 1772 г.; 4) польские коммунисты на советской службе, в своей деятельности не стремившиеся учитывать национальные интересы белорусов.

Именно с точки зрения столь разнородной, но последовательно антибелорусской польской силы стоит рассматривать нашедший отражение и в предисловии В. Матерского тезис более чем столетней давности о слабости белорусского национального движения. По мнению польского историка, белорусское движение к 1918 г. «располагало относительно слабыми политическими элитами, опытность которых трудно сравнить с грузинскими, украинскими или польскими» (s. 13). К тому же «только формирующееся национальное движение […] ограничивалось узкими интеллигентскими кругами» (s. 15). Документы сборника свидетельствуют о том, что такая оценка полностью соответствует взглядам Ю. Пилсудского и его соратников в указанный период. Они не отрицали само существование белорусского движения, как это в спекулятивном виде представил Р. Дмовский 8 октября 1918 г. в своей записке о территории польского государства, направленной президенту США В. Вильсону: «Белорусы представляют собой абсолютно пассивный расовый элемент. Среди них нет никакого национального движения; нет также даже зачатков белорусской литературы» (s. 77).

Взяв на вооружение аргумент о слабости белорусского движения и сведя его к тонкому интеллигентскому слою, Пилсудский развязывал себе руки в белорусском вопросе. Такое упрощение реальной политической ситуации в Беларуси было выгодно и большевикам, в том числе польского происхождения. В. Матерский нащупывает интересную исследовательскую перспективу, оценивая начавшиеся 22 июля 1919 г. тайные переговоры советского представителя и одновременно известного польского революционера Ю. Мархлевского с польской стороной как «неблагоприятные для дела интегральности белорусских земель изменения в отношениях Варшавы и Москвы» (s. 23). Действительно, любое прагматичное, исходившее из реальной ситуации и военной силы сторон советско-польское разграничение в тот период означало раздел белорусского этнографического пространства, которое и состоялось в итоге в марте 1921 г. по условиям Рижского мира.

Тезис же о слабости белорусского движения нуждается как минимум в трех существенных корректировках. Во-первых, сравнивать его с движением других народов ушедшей в историю Российской империи и тем более с ситуацией в Закавказье не всегда уместно, учитывая особый формат развития национальных процессов на белорусских землях.

Во-вторых, в реальности у национального движения белорусов была достаточно обширная социальная база — действительно узкий слой интеллигентов в первом поколении, каковыми были очень многие видные

белорусские политики той эпохи, опирался на широкую крестьянскую основу.

В-третьих, в историографии до сих пор сохраняется очень удобное для советской исторической науки искусственное сведение национального движения белорусов только к несоветской ее части. Национальное движение логичнее рассматривать комплексно, объединяя его небольшевистский и советский варианты, на самом деле имевшие друг с другом много общего. Именно в таком ключе проблема излагается в важном документе, впервые публикуемом в сборнике, — в фрагментах донесения агента польской разведки Раймунда Нихольма от 19 ноября 1920 г. о его беседах в кулуарах мирной конференции в Риге (s. 662-667).

Под именем Нихольма скрывался известный в будущем польский литератор и политик Ежи Стемповский (1883-1969). Он активно общался в Риге как с представителями эмигрантского белорусского правительства во главе с Вацлавом Ластовским, так и с руководителем «второй БССР» Александром Червяковым. Полномочия всех белорусских политиков ни польская, ни советская сторона не признали, их участие в политическом процессе в столице Латвии ограничилось кулуарами. У Нихольма-Стемповского появилась уникальная возможность в приватных беседах сравнить программы и личную политическую компетентность двух направлений белорусской политики.

Касаясь отношений с группой Ластовского, польский разведчик справедливо отметил, что «польско-белорусские отношения вошли тогда в безнадежную фазу». Расчеты этой части политиков на сближение с Польшей не оправдались, в Ригу они приехали с исчерпанными финансами, не имея «никаких инструкций или полномочий». Политическое лицо группы своеобразно: «…все ее члены принадлежат к одному типу людей чувственных, впечатлительных, импульсивных, действующих в соответствии с непредсказуемыми сентиментальными инстинктами […], все производят впечатление людей честных, непродажных, твердо верящих в свое дело. Одновременно и, собственно, благодаря вышеперечисленным чертам, это люди упрямые в своих доктринах, невыносимые в работе и лишенные позитивности. Для того чтобы прийти с ними к согласию на практической почве, требуется немало доброй воли и терпеливости» (s. 663-664). Таким образом, иметь серьезные дела с эмигрантским правительством автор донесения не рекомендует, что полностью соответствовало установкам Ю. Пилсудского.

Совершенно по-иному отражены Нихольмом-Стемповским настроения и перспективы советского белоруса. «Примерно 10 октября я познакомился с председателем белорусского ревкома Червяковым, о котором позже Душевский говорил мне как о своем старом товарище и политическом воспитаннике. Кроме этого, отношений между Червяковым и группой Ластовского не было […]. Душевский приехал в Ригу только после отъезда Червякова. Червяков произвел на меня впечатление человека более

уравновешенного, спокойного и рассудительного […]. Для меня очевидно, что Червяков совсем не коммунист, даже не социалист, но хороший белорусский националист, который из соображений оппортунизма работал с большевиками» (s. 665).

Безусловно, оценка убежденного, как показали дальнейшие события, большевика Червякова как «националиста», а также приведенное в анализирующей донесение Стемповского статье Я. Пискуревича мнение о том, что «в случае удачного завершения переговоров делегации БНР с польской делегацией в Риге Червяков должен был открыто перейти в антибольшевистский лагерь»[11], весьма преувеличены, но замечания польского разведчика о единстве корней небольшевистской и советской версий белорусского движения и их национальной основе принципиально важны.

В значительной степени верным оказался и сделанный осенью 1920 г. прогноз Червякова о перспективах раздела белорусских этнических земель по итогам переговоров в Риге: «Раздел белорусской территории несомненно вызовет в части страны, уступленной Польше, национальное белорусское движение, стремящееся к соединению с советской Беларусью. Размеры этого движения в значительной мере зависят от политики, которую польское правительство будет проводить в своей части страны. Сложно, впрочем, предполагать, чтобы польская политика, до сих пор покровительствовавшая интересам крупных землевладельцев, могла удовлетворить белорусского крестьянина» (s. 666). При этом посланец Минска не исключил, что при грамотно построенной политике поляков на советской стороне даже может появиться движение, призывающее к присоединению к Польше.

Таким образом, благодаря активной работе Стемповского в Риге еще накануне подписания мирного договора 1921 г. у польских спецслужб была достоверная информация, позволявшая сделать необходимые поправки в курс на белорусском направлении. Как известно,эти наработки разведки не пригодились: линия Ю. Пилсудского на игнорирование в практической политике «белорусской фикции» фактически проводилась затем в течение всего межвоенного периода.

Документы сборника позволяют подробно проследить не только разногласия, которые проявлялись между польскими политиками при обсуждении белорусского вопроса, но и отсутствие в Варшаве даже тактического, не говоря уже о стратегическом, решения этой проблемы, которая при подробном знакомстве с источниками не кажется второстепенной для национальных интересов возрождающегося государства. Представляется, что сформировавшиеся уже в 1918-1921 гг. позиции сторон предопределили итоговую неудачу Польши в геополитическом споре с большевиками на белорусском направлении. Важно и то, что на фоне часто снисходительного отношения Варшавы к «польско-белорусскому узлу» в Москве еще со времен Брестского мира был наготове рецепт урегулирования в свою пользу похожих ситуаций. Лично Л. Д. Троцкому принадлежит хладнокровно реализованная

---

[11] *Piskurewicz J.* Tajna misja Jerzego Stempowskiego na Konferencji Pokojowej w Rydze // Rok 1918. Odrodzona Polska i sowiecka Rosja w nowej Europie. Warszawa, 2019. T. II. S. 155.

советскими властями после Рижского мира идея полезности разделения белорусских и украинских земель с целью последующего продвижения большевистских ценностей. Эту дипломатическую новацию он, по словам участника брестских переговоров М. Н. Покровского, огласил еще в феврале 1918 г.: «Тут и произошел эпизод, ради которого стоит обо всем этом писать: когда литовский представитель Мицкявичус-Капсукас горячо возопил против операции, проводимой Альтфатером над его родиной, Троцкий заявил, что для Литвы даже выгоднее быть разрезанной, ибо тогда русская половина станет революционным очагом для немецкой»[12]. Именно эту тактику, о которой затем предупреждал Стемповского Червяков, затем использовал в Риге на переговорах с Польшей близкий к Троцкому советский дипломат А. А. Иоффе, что подтверждают и опубликованные в сборнике В. Матерского документы. Как известно, та же линия «разрезания» во благо «революционного очага» была впоследствии реализована И. В. Сталиным и его соратниками с привлечением приоритетных проектов советской белорусизации и советской украинизации[13].

Таким образом, современная польская историография усилиями В. Матерского пополнилась важным документальным изданием, объемно отражающим современный уровень разработки белорусского вопроса сквозь призму труднейшего для польской государственности периода ее возрождения в 1918-1921 гг[14].

**Ю.А.Борисенок** –Московский государственный университет

Węzeł polsko-białoruski 1918–1921: Dokumenty i materiały. Wybór i opracowanie Wojciech Materski, współpraca Uładzimir Snapkouski (Białoruś). Warszawa, Instytut Studiów Politycznych Polskiej Akademii Nauk, 2018. 859 s. **Рэц**. Польско-белорусский узел» 1918–1921 гг. в интерпретации современной польской историографии / Ю.А.Борисенок // Славянский альманах 2020. —

---

[12] Первые шаги большевистской дипломатии. Дневниковые записи академика М. Н. Покровского / публ. А. В. Есиной // Вестник Российской академии наук. 1993. № 2. С. 158.

[13] *Борисёнок Ю. А.* На крутых поворотах белорусской истории: общество и государство между Россией и Польшей в первой половине XX века. М., 2013. С. 100–104.

[14] Данное утверждение, которое относит публикацию сборника исключительно Войцеху Матерскому и следовательно считает эту публикацию только достижением современной польской историографии, я также считаю недостаточно некорректным. На титульном листе книги стоит моя фамилия с указанием государственной принадлежности (Беларусь). Рецензент в библиографическом описании издания решил опустить по каким-то причинам мою фамилию как второго составителя и второго автора предисловия. Настоящее издание, инициатором которого был я, но которое вышло благодаря Институту политических наук ПАН и конечно усилиям моего уважаемого польского коллеги и друга В.Матерского, принадлежит и современной белорусской историографии. Эта первая документальная публикация документов XX в., подготовленная совместно польским и белорусским историками. Оно включено в список моих основных научных трудов и я горжусь этой работой, при подготовке которой многому научился у выдающегося польского историка В.Матерского.

Вып. 3–4 / глав. ред. К. В. Никифоров. — М.: Индрик, 2020. С. 568-578. https://inslav.ru/sites/default/files/Slavic_Almanac_2020_3-4_31_Borisyonok_702.pdf.

### *Некананічны прыклад распутвання „гістарычных вузлоў”*

*Węzeł polsko--białoruski 1918–1921 Dokumenty i materiały*. Wybór i opracowanie Wojciech Materski, współpraca Uładzimir Snapkouski. Warszawa: Instytut Studiów Politycznych Polskiej Akademii Nauk, 2018. 859 s.

Не так даўно пабачыла свет рэцэнзія прафесара Войцеха Матэрскага на падрыхтаваны Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі зборнік дакументаў „Польшча — Беларусь (1921–1953)” (Мінск, 2012) *Węzeł polsko--białoruski 1918–1921 Dokumenty i materiały*. Wybór i opracowanie Wojciech Materski, współpraca Uładzimir Snapkouski. Warszawa: Instytut Studiów Politycznych Polskiej Akademii Nauk, 2018. 859 s.

Не так даўно пабачыла свет рэцэнзія прафесара Войцеха Матэрскага на падрыхтаваны Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі зборнік дакументаў „Польшча — Беларусь (1921–1953)” (Мінск, 2012)[15]. Рэцэнзент акрэсліў працу беларускіх калег як „монатэмічную”, анахранічную ды ўпрост —несумленную. На ягоную думку, прычына гэтага не толькі ў ідэалагічнай замове: „Беларуская гістарыяграфія функцыянуе ў спецыфіных палітычных умовах, што можа многае растлумачыць. Але не ўсё”. Фактычна, польскі даследчык закідваў беларускім гісторыкам свядомую адмову ад навуковай аб’ектыўнасці на карысць асабістага канфармізму. Здавалася б, што падобны крытычны водгук з боку аднаго з найбольш аўтарытэтных і абазнаных спецыялістаў павінен стаць падставай для дыскусіі ці, прынамсі, выклікаць рэакцыю складальнікаў згаданага зборніка[16]. На жаль, гэтага не адбылося. Чарговы раз спрацавала спраўджаная ў Беларусі практыка ігнаравання апанента[17].

Структура самой кнігі празрыстая. Яна ўключае прадмову; рэестр скарачэнняў; галоўную частку, у якой дакументы прадстаўлены ў

---

[15] Матэрскі, *Да стандартаў савецкай эпохі?* Рэцэнзія на выданне: *Польша — Беларусь (1921–1953): сб. документов и материалов* / сост.: А. Н. Вабищевич [и др.]. Минск 2012, 423 с., „Беларускі гістарычны агляд” 2013, т. 20, сш. 1–2 (38–39) [online], http://www.belhistory.eu/vojcex-materski-da-standartau-saveckaj-epohi [доступ: 27.01.2021].

[16] Сярод шматлікіх прац В. Матэрскага перш за ўсё варта ўзгадаць публікацыі на тэму польска-савецкіх дыпламатычных адносін: *Tarcza Europy. Stosunki polsko--sowieckie 1918–1939* (1994); *Stosunki polsko--sowieckie 1918–1939* (1994); *NKWD o Polsce i Polakach. Rekonesans archiwalny* (1996); *Pobocza dyplomacji. Wymiana więźniów politycznych pomiędzy II Rzecząpospolitą a Sowietami w okresie międzywojennym* (2002); *Na widecie. II Rzeczpospolita wobec Sowietów 1918–1943* (2005) ды інш.

[17] Беларускі зборнік вытрымаў ужо некалькі перавыданняў без змен і дапаўненняў.

храналагічным парадку; дадатак, дзе змешчаны матэрыялы, якія выходзяць за межы акрэсленага перыяду, але сэнсоўна звязаныя з папярэдняй часткай; геаграфічны ды іменны паказальнікі. Усё гэта робіць працу са зборнікам простай ды эфектыўнай. У *Прадмове* складальнікі заўважылі, што пытанне, якое „праілюстраванае змешчанымі ў томе дакументамі, ужо мае сваю літаратуру", таму яны абмяжоўваюцца пералікам, на іх погляд, найбольш істот-ных ды актуальных публікацый (с. 46).

Усе дакументы публікуюцца на польскай мове. Тым самым укладальнікі адышлі ад класічных правілаў публікацыі крыніц, аднак, як яны самі заўважылі, зрабілі гэта наўмысна, з разлікам прыцягнуць шырокае кола чытачоў, а не толькі даследчыкаў дадзенай тэмы (с. 45). Дзеля параўнання заўважу, што ў сваёй рэцэнзіі прафесар В. Матэрскі палічыў расійскую мову беларускага акадэмічнага выдання, якая, паводле ўкладальнікаў, таксама павінна была спрыяць росту зацікаўленасці з боку чытачоў, „прыкметай саветызацыі" нацыянальнай навукі і культуры[18].

Абраныя храналагічныя рамкі апублікаваных дакументаў падаюцца цалкам абгрунтаванымі, ахопліваючы перыяд паміж заканчэннем Першай сусветнай вайны і польска-савецкім ваенным канфліктам, якія адыгралі вызначальную ролю ў нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтве палякаў і беларусаў. Заключнай падзеяй гэтага перыяду разглядаецца Рыжскае мірнае пагадненне, пра што гаворка ідзе ў *Прадмове* (с. 39). Пачатковай — Брэсцкая дамова, падпісаная ў сакавіку 1918 г. паміж савецкай Расіяй ды Нямеччынай і яе хаўруснікамі, пра што чытач можа здагадацца толькі з кантэксту зборніка.

Таксама з *Прадмовы* мы можам даведацца, што „гульня" Берліна з „беларускім пытаннем" пачалася яшчэ раней, а менавіта падчас нямецкай акупацыі ў сярэдзіне 1915 г.?! Фактычна, паўтараецца адзін з тэзісаў „Кароткага нарыса беларускага пытання"[19], аналітычнага матэрыялу, распрацаванага ў міжваенны час на падставе аперацыйных данясенняў II аддзела польскага Генштаба, паводле якога беларускі рух на тэрыторыі Обер-Ост не меў уласнай суб'ектнасці ды зводзіўся да нейкай „нямецкай інтрыгі". Праўда, у адрозненне ад згаданага „Нарыса…" аўтары прадмовы ўпэўнены ў тым, што мэтаю гэтай меркаванай „інтрыгі" быў падзел „адзінага шматнацыянальнага грамадства гэтых зямель, дзеля адмысловай ізаляцыі палякаў" (с. 10–12). Ці сапраўды ў эпоху нарастаючых нацыяналізмаў можна было казаць пра адзіную- шматнацыянальную супольнасць? Пытанне хутчэй рытарычнае.

Затое ў складальнікаў не знайшлося месца нават для кароценькай згадкі „заходнерускай" традыцыі, якая вельмі істотна паўплывала на пераемнасць антыпольскай рыторыкі паміж былой Расійскай імперыяй і выходзячым на палітычную авансцэну беларускім рухам. Таксама варта было б прыгадаць

[18] Матэрскі, *Да стандартаў савецкай эпохі?...*

[19] *Кароткі нарыс беларускага пытаньня*, рэд.: А. Вашкевіч, А. Пашкевіч, А. Чарнякевіч, Мінск 2009, с. 45.

шматтысячнае бежанства, а дакладней прымусовае высяленне жыхароў заходніх беларускіх губерняў царскімі ўладамі ў гады Першай сусветнай вайны, якое не толькі змяніла дэмаграфічную карту рэгіёна, але істотна прычынілася да змены палітычных поглядаў самога насельніцтва. Аўтары абмежаваліся толькі канстатацыяй факта, што на момант распаду Расійскай імперыі „беларускі эмансіпацыйны рух дзейнічаў у вельмі складанай сітуацыі” (с. 13). У выніку гэтага спрашчэння ў разглядзе „польска-беларускага вузла” згубіліся тыя ўнутраныя перадумовы, якія ў далейшым будуць адыгрываць выключную ролю ў стасунку беларускіх дзеячаў да Польскай дзяржавы як палітычнага партнёра.

Замест гэтага складальнікі зборніка галоўную ўвагу звярнулі на знешнія вытокі польска-беларускага канфлікту. Невыпадкова значнае месца ва ўводзінах адводзіцца бальшавіцкаму перавароту ў Расіі ды разгляду нацыянальнай палітыкі бальшавікоў. Але і тут мы не знаходзім нават павярхоўнага аналізу самой праблемы. Маем толькі выснову, што польскія ўлады не мелі магчымасці канкурыраваць з прапагандысцкай рыторыкай бальшавіцкага дэкрэта „Аб зямлі” (с. 13–15).

Разам з тым апісанне ў *Прадмове* вытокаў польска-савецкага канфлікту не адыходзіць ад традыцыйнай для польскай гістарыяграфіі канстатацыі, што польская самаабарона і войска імкнуліся выключна бараніць польскае насельніцтва ад „хаосу” ды бальшавіцкай рэвалюцыі, у той час як польскія палітыкі з непакоем прыглядаліся да „нямецка-беларускай каапераціі” (с. 16). Цікава, што аналізуючы пазіцыю польскага ўрада адносна дыпламатычных крокаў кіраўніцтва Літоўска-Беларускай ССР, аўтары ставяць пад сумненне не толькі легітымнасць апошняга, але і легітымнасць нібыта „створанай немцамі” літоўскай Тарыбы (с. 21).

Падобных палемічных сцвярджэнняў у *Прадмове* даволі шмат. Напрыклад, сцвярджаецца, быццам Першы Беларускі полк у Гародні пачаў фармавацца ўрадам БНР са згоды нямецкіх улад (с. 23); а беларуска-польскія перамовы летам 1919 г., распачатыя ў Парыжы Ігнацыем Падарэўскім ды Антонам Луцкевічам, не знайшлі свайго працягу па прычыне адсутнасці падтрымкі з боку Францыі (с. 23); што „сацыял--дэмакратычная частка беларускага руха” (чытай: беларуская партыя сацыял-дэмакратаў) была схільная да бальшавізму (с. 25). Таксама нельга пагадзіцца з апісаннем абставін г. зв. „інтэрнавання” Антона Луцкевіча ў Варшаве, якое было хутчэй свайго роду палітычнай гульнёй беларускага прэм’ера, чым свядомым крокам польскіх улад (с. 26). Таксама ў *Прадмове* варта было ўзгадаць беларускі антыпольскі партызанскі рух на Віленшчыне ды Гарадзеншчыне ў пачатку 1920-х гадоў, які скончыўся судовымі працэсамі ў Беластоку (1923) і Гародні (1925). Усё ж такі адным з ягоных арганізатараў польскі бок лічыў урад БНР Вацлава Ластоўскага[20].

---

[20] На гэту тэму глядзі- зборнік дакументаў: W. Śleszyński, *Walka instytucji państwowych z białoruską działalnością dywersyjną*. Białystok 2005.

Змешчаныя ў зборніку дакументы паходзяць з розных архіваў Польшчы, Беларусі, Літвы, Расіі, Вялікабрытаніі і нават Злучаных Штатаў Амерыкі. Праўда, пераважная колькасць прадстаўленых матэрыялаў ужо была апублікавана, пра што сведчаць адпаведныя спасылкі. Выключэнне складаюць матэрыялы з Цэнтральнага вайсковага архіва ў Рэмбертове і Архіва новых актаў у Варшаве, а таксама — Архіва Інстытута Юзафа Пілсудскага ў ЗША, фонда Галоўнай ад'ютантуры, прычым на апошні прыпадае амаль 20% усіх дакументаў (74 пазіцыі)[21]. Гэта невыпадкова. Паводле ўкладальнікаў, менавіта вайсковыя інстытуты — II аддзел польскага Генеральнага штаба, Ад'ютантура, Міністэрства вайсковых спраў з'яўляліся галоўнымі інструментамі рэалізацыі планаў Юзафа Пілсудскага ў вырашэнні „беларускага пытання". Яшчэ адной унікальнай першакрыніцай стала публікацыя матэрыялаў брытанскіх дыпламатычных службаў.

З навуковых зборнікаў найбольш шырока на старонках кнігі прадстаўлены выдадзеныя пад рэдакцыяй Сяргея Шупы „Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі" (каля 50 дакументаў)[22]. У гэтым выпадку пераклад дакументаў на польскую мову падаецца цалкам абгрунтаваным, бо знаёміць польскамоўнага чытача з „унутранай кухняй" тагачаснай беларускай палітыкі. Акрамя афіцыйных матэрыялаў беларускага ўрада на старонках выдання публікуюцца вытрымкі з асабістай перапіскі дзеячаў БНР, іх развагі адносна магчымага беларуска-польскага збліжэння і ягоных наступстваў, абмеркаванне стратэгіі і тактыкі падчас перамоў у Рызе ды інш. Гэтыя матэрыялы дапоўнены перадрукам дакументаў з архіваў Мінска і Масквы, якія адлюстроўваюць савецкую пазіцыю па „беларускім пытанні"[23].

Сярод іншага ў зборніку ёсць новыя звесткі адносна пытання, якое даўно цікавіць даследчыкаў, а менавіта прызнання Фінляндыяй незалежнасці БНР — фактычна адзінага афіцыйнага прызнання на міжнародным узроўні. Пра гэта яшчэ 17 снежня 1919 г. з Хельсінкі паведамляў свайму кіраўніцтву лорд Актон. Праўда, брытанскаму дыпламату беларускі ўрад прадстаўляўся не інакш як урад „Заходне-Рускай Рэспублікі" (с. 346). Дарэчы, працяг гэтай гісторыі мы знаходзім ужо сярод дакументаў II аддзела польскага Генштаба, якія захоўваюцца ў Нью--Ёрку. Так, даведаўшыся, што ўраду БНР удалося разарваць дыпламатычную блакаду, польскі прадстаўнік у Фінляндыі пераканаў фінскі бокануляваць гэта прызнанне (с. 363, 379).

Менавіта складальнікі вызначалі, якія крыніцы найбольш поўна перадаюць змест тых ці іншых падзей. Так, напрыклад, у зборніку друкуецца

[21] Centralne Archiwum Wojskowe w Rembertowie, Archiwum Akt Nowych w Warszawie, Instytut Józefa Piłsudskiego (USA).

[22] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі, уклад. С. Шупа. Кніга 1, тт. 1, 2. Вільня ды інш. 1998.

[23] Найбольш цікавымі ў гэтым сэнсе падаюцца ўжо згаданыя зборнікі *Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.)* і *Государственные границы Беларуси*

цэлы шэраг матэрыялаў, прысвечаных дзейнасці г. зв. „бацькі беларускіх паланафілаў" Паўла Алексюка. Гэта справаздачы з сустрэчы беларускай дэлегацыі з Генеральным камісарам Ежы Асмалоўскім вясной 1919 г. (с. 202–203), шматлікія рапарты афіцэраў II аддзела (с. 210–211, 216–217, 219 ды інш.), рапарты самога П. Алексюка пра дзейнасць Беларускай вайсковай камісіі, адрасаваныя польскаму камандаванню (с. 470–471 ды інш.). Пры гэтым выразна не хапае поглядаў „бацькі паланафілаў" на сутнасць беларуска- польскіх адносін, іх ідэалагічнае абгрунтаванне[24].

Яшчэ больш паказальнай выглядае сітуацыя з генералам Станіславам Балаховічам і ягоным „Палескім паходам". Пры тым, што прозвішча С. Балаховіча ўзгадваецца больш за паўсотню разоў, з прадстаўленых дакументаў мы амаль нічога не даведаемся пра ягоныя ўзаемаадносіны з беларускім рухам. Перыяд г. зв. Асобнага атрада БНР у біяграфіі генерала прадстаўлены ў зборніку эпізадычна, напрыклад, праз справаздачу брытанскай вайсковай выведкі (с. 386–388). А вось пра падзеі восені 1920 г. распавядаюць фрагменты працы С. Ліс-Блонскага, які выконваў абавязкі афіцэра сувязі Польскай арміі пры групе С. Балаховіча (с. 640–642, 656–657). Аднак праблема ў тым, што працытаваныя гэтыя фрагменты з'яўляюцца часткай пазнейшых белетрызаваных успамінаў, якія істотна адрозніваюцца ад надрукаваных раней арыгінальных справаздач таго ж аўтара[25].

На жаль, па-за ўвагай укладальнікаў засталася дзейнасць на тэрыторыі Беларусі Першага Польскага корпуса генерала М. Доўбар-Мусніцкага, якому прысвечаны ўсяго два дакументы—фрагмент звароту Народнага Сакратарыята БНР да Рэгенцыйнай Рады і рапарт Дэпартамента па палітычных справах самой Рады (с. 62–65). Як падаецца, гэтага недастаткова для ілюстрацыі той сітуацыі, якая склалася вакол Корпуса і істотным чынам паўплывала на лёс беларуска--польскіх адносін.

Зразумела, што пры велізарным даведкавым апараце зборніка цяжка пазбегнуць некаторых памылак і недарэчнасцей. Напрыклад, згаданы вышэй Павел Аляксюк прадстаўлены ў якасці кіраўніка „эміграцыйнага Беларускага палітычнага камітэта" (с. 203), што не адпавядае рэчаіснасці. Кузьма Цярэшчанка фігуруе як „тайны супрацоўнік бальшавікоў са снежня 1918 г." (с. 247), але гэта патрабуе тлумачэння[26]. Недакладна перакладзена назва дакумента № 188: „Фрагмент пратакола з сустрэчы дэлегацыі БНР на Парыжскай мірнай канферэнцыі…" (с. 310). Насамрэч гэта быў сход у

[24] У якасці прыкладу можна прывесці пратаколы г. зв. „маршалкаўскага суда" па справе С. Ваяводскага, на якім П. Аляксюк вельмі падрабязна апісаў вытокі асабістага канфлікту з гэтым афіцэрам II аддзела-. Гл.: *Sylwester Wojewódzki przed Sądem Marszałkowskim*, Warszawa 1997, s. 97–111.

[25] A. Garlicki, *„Dwójka" o Grupie gen. Bałachowicza* [w] *Państwa europejskie na drodze do niepodległości (w drugiej połowie XIX i XX wieku)*, red. I. StawowyKawka, W. Rojek. Kraków 2003, s. 283–300.

[26] Больш падрабязна гл.: У. Ляхоўскі, А. Чарнякевіч, *Кузьма Цярэшчанка: Acta non verba*, „Arche-Пачатак". 2011, № 11, с. 23–64.

Берліне прадстаўнікоў БНР на Парыжскай мірнай канферэнцыі[27]. Недакладнасць перакладу змяніла не толькі геаграфію падзеі, але і абставіны. З іншага каментара можна зразумець, быццам Антон Луцкевіч сустракаўся з Юзафам Пілсудскім падчас ягонага візіту ў Мінск у верасні 1919 г. (с. 319), але такой сустрэчы не было. Аляксей Азнабішын не быў „баронам” (с. 372); а дзеяч Гродзенскай- управы Курлоў меў імя Яўген, а не Васіль (с. 571). Недакладна тлумачыцца паняцце „варшаўскія беларусы”, бо паводле яго Антон Луцкевіч у ліпені 1920 г. павінен быў знаходзіцца ў Варшаве (с. 580), чаго насамрэч не было. У іншым месцы гэты тэрмін датычыць ужо ўсіх сяброў Найвышэйшай Рады (с. 602). Адзін з лідараў беларускіх эсэраў Тамаш Грыб другі раз арыштоўваўся польскімі ўладамі ў ліпені 1920 г., тады як у каментары ідзе гаворка толькі пра ягоны першы арышт летам 1919 г. (с. 602).

Некаторыя з дакументаў недакладна датаваныя, а таму публікуюцца з парушэннем храналогіі. Так, дакумент № 192 „Тэлеграма беларускіх дзеячаў 1920 г., паводле зместу не мог з’явіцца раней лютага 1921 г. (с. 695–696). Яго трэба датаваць восенню 1920 г. Дакумент № 263 „Мемарыял сябраў Найвышэйшай Рады” трэба датаваць вераснем, а не сакавіком 1920 г. (с. 422). Дакумент № 451 „Ліст Міністра замежных спраў БНР Аляксандра Цвікевіча да старшыні Лігі Народаў…”, які пазначаны сярэдзінай снежня 1920 г., паводле зместу не мог з’явіцца раней лютага 1921 г. (с. 695–696).

Апошні дакумент зборніка — фрагмент Рыжскай дамовы ад 18 сакавіка 1921 г., што з’яўляецца лагічным і абгрунтаваным. Але ў зборніку змешчаны яшчэ *Дадатак*, у якім прадстаўлены каля двух дзясяткаў дакументаў больш позняга часу, але зместам звязаных з папярэднім перыядам. *Дадатак* заканчваецца вытрымкамі са следчай справы ДПУ Аркадзя Смоліча (с. 777–780), „успамінамі” Браніслава Тарашкевіча, якія насамрэч з’яўляюцца часткай ягонай следчай справы ў ДПУ (с. 782–788)[28], і фрагментам з паказанняў Антона Луцкевіча, таксама запісаных падчас допыту ў савецкай вязніцы (с. 790–793). Пры ўсёй значнасці гэтых дакументаў іх з’яўленне ў дадзеным зборніку павінна суправаджацца адпаведнымі каментарамі ўкладальнікаў.

Відавочна, што ўкладальнікі не збіраліся рабіць вычарпальны агляд усіх падзей, якія паўплывалі на „зацягванне” польска--беларускага вузла супярэчнасцей, а абмежаваліся пералікам найбольш істотных момантаў, пакідаючы апошняе слова за крыніцамі.

Перад намі яскравая мазаіка мінулага, складзеная з больш чым пяцісот дакументаў рознага кшталту—мемарыялаў, лістоў, службовых справаздач, фрагментаў успамінаў і паказанняў падчас следства, газетных артыкулаў ды інш. Адпаведна, перад абазнаным у тэме чытачом непазбежна паўстаюць пытанні. Чаму ўкладальнікамі быў абраны той, а не іншы дакумент? Ці

[27] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Кніга 1. Т. 1. Ст. 499.

[28] Валахановіч, У. Міхнюк, *Споведзь- у надзеі- застацца жывым: Аўтабіяграфія Браніслава Тарашкевіча,* рэд. А. С. Ліс. Мінск 1999.

можна было яго дапоўніць або замяніць, пашырыўшы пры гэтым прапанаваны ракурс?

Спіс таго, што не трапіла ў кнігу, а насамрэч заслугоўвала публікацыі, даволі вялікі. Перш за ўсё гэта запісы з гродзенскага „Дзённіка” кіраўніка ўрада БНР Антона Луцкевіча за студзень — сакавік 1919 г., дзе між іншым ён апісаў свае кантакты з польскім камісарам Станіславам Іваноўскім[29], а таксама публіцыстыка А. Луцкевіча таго самага перыяду[30], вытрымкі з ідэалагічнага маніфеста Аляксандра Цвікевіча „Адраджэнне- Беларусі і Польшча”, выдадзенага адразу пасля падпісання Рыжскага трактата[31], ды шмат чаго іншага.

Аднак, як заўважыла адна з рэцэнзентак выдання прафесар Іаана Гяроўска-Калаўр: „Кожны выбар заўсёды з’яўляецца вынікам суб’ектыўнага погляду на праблему і кожны аўтар мае права на ўласны выбар”.

Навуковы характар выдання абумоўлены шырокім выбарам тэм, палемічным характарам прадстаўленых матэрыялаў, якія часта супярэчаць адзін аднаму, і змястоўнымі каментарамі.

**Андрэй Чарнякевіч**, канд. гіст. навук (Варшава)
Чарнякевіч А. Неканані́чны прыклад распутвання „гістарычных вузлоў” // Rocznik Centrum Studiów Białoruskich / Гадавік Цэнтра беларускіх студыяў. № 7. Red. naczelny A.Smalianczuk. Warszawa/Варшава: Studium Europy Wschodniej, Uniwersytet Warszawski, 2021. S. 261-267.

### *Пра традыцыі і навацыі ў справе дзяржаўнай важнасці ў эпоху радыкальных перамен: глыбока і кампетэнтна*

Эфектыўныя знешнепалітычныя даследаванні — справа дзяржаўнай важнасці, без якой нельга ажыццяўляць знешнюю палітыку ні адной краіне. Нягледзячы на тое, што Беларуская ССР ажыццяўляла знешнепалітычную дзейнасць ужо з 1944 г., у савецкія часы такога паняцця, як «знешнепалітычнаягісторыя Беларусі», у навуковай тэрміналогіі не існавала. Таму, калі краіна стала незалежнай, разам з неабходнасцю фарміравання асноў знешняй палітыкі і дыпламатыі грамадскія, дзяржаўныя, культурныя, навукова-адукацыйныя патрэбы актуалізавалі неабходнасць пабудовы гісторыі знешняй палітыкі Беларусі (знешнепалітычнай гісторыі) як новага напрамка навуковых даследаванняў.

У 1993/1994 навучальным годзе ў вучэбным плане па спецыяльнасці «Міжнародныя адносіны» аддзялення міжнародных адносін БДУ з’явілася вучэбная дысцыпліна «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі», якую пачаў вы

---

[29] Луцкевіч, *Дзённік,* „Полымя” 1991, № 4, с. 205–224; тамсама, № 5, с. 168–191.
[30] Гл.: W. Kalinowski [А. Луцкевіч], *Kwestia wschodnia a Białoruś*. Warszawa 1920. 43 s.; ён жа. *Польская акупацыя на Беларусі*. Вільня 1920.
[31] А. Цвікевіч, *Адраджэнне- Беларусі і Польшча*. Менск – Вільня – Берлін 1921. 191 с.

кладаць доктар гістарычных навук, прафесар У. Е. Снапкоўскі. Пазней ім было створана навукова-метадычнае забеспячэнне, апублікаваны першыя падручнікі па дысцыпліне (Снапкоўскі, У. Е. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі: вучэбны дапаможнік для студэнтаў міжнародных адносін: у 2 ч. Мінск: БДУ, 2003—2004; Снапковский, В. Е. История внешней политики Беларуси: пособие. Минск: БГУ, 2013). Гэтая праца грунтавалася на трывалым падмурку: У. Е. Снапкоўскі, які з'яўляецца адным з вядучых спецыялістаў-міжнароднікаў у краіне, пачаў навуковую працу ў гэтай галіне яшчэ ў савецкі перыяд. Ён доўгі час працаваў у адным з цэнтраў міжнародных даследаванняў у савецкай і постсавецкай Беларусі — Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук, потым стаў адным з заснавальнікаў кафедры міжнародных адносін БДУ.

У 2020 г. У. Е. Снапкоўскі апублікаваў у выдавецтве БДУ дапаможнік аб традыцыях і навацыях у знешнепалітычных даследаваннях Беларусі, які з'яўляецца своеасаблівым падсумаваннем яго навуковай працы ў галіне гістарычных і міжнародных даследаванняў[32]. Рэцэнзаваная праца прысвечана станаўленню і развіццю новага напрамку навуковых даследаванняў гістарычнай навукі і новай дысцыпліны ў гістарычнай адукацыі Рэспублікі Беларусь, таму яна заслугоўвае асобнай увагі з боку спецыялістаў і шырокага кола чытачоў, якія цікавяцца праблематыкай міжнарод ных адносін і знешнепалітычнай гісторыі Беларусі.

Каштоўнасць дапаможніка заключаецца ў ажыццяўленні ў сціслай форме комплекснага разгляда тэарэтыкаметадалагічных і вучэбнаметадычных аспектаў вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі». Усебакова паказаны працэс фарміравання знешнепалітычнай гісторыі Беларусі як часткі міжнародных даследаванняў і новага напрамку айчыннай гістарычнай навукі. Асвятляюцца дасягненні, праблемы і перспектывы ўкаранення дадзенага напрамку ў навучальны працэс вышэйшых навучальных устаноў краіны. У шырокім грамадскапалітычным кантэксце аналізуюцца ўзаемаадносіны паміж гістарычнай палітыкай і гістарычнай навукай у Беларусі. Хацелася б таксама адзначыць спецыфічны жанр кнігі, якая спалучае каштоўнасці вучэбнага выдання і навуковай манаграфіі з аўтарскімі рэфлексіямі, якія сягаюць канца 1980-х гг. У рацэнзаванай працы выдзелены чатыры праблемнатэматычных блокі, падзеленыя на адпаведныя главы. Прасочым услед за аўтарам развіццё навуковых ведаў у новай галіне гістарычнай навукі позніх савецкіх часоў і перыяду незалежнасці Беларусі.

***Знешнепалітычная гісторыя Беларусі: гістарыяграфія і крыніцы.*** Трэба пагадзіцца з аўтарам у тым, што «ў савецкія часы такога паняцця, як" знешнепалітычная гісторыя Беларусі", у навуковай тэрміналогіі не існавала. Гісторыя знешняй палітыкі і знешнепалітычная гісторыя Беларусі як раўназначныя паняцці, якія адпавядаюць новаму напрамку ў гістарычных

[32] Снапкоўскі, У. Е. Традыцыі і навацыі ў знешнепалітычных даследаваннях Беларусі: дапаможнік. Мінск: БДУ, 2020. 295 с.

даследаваннях, сфарміраваліся ў пачатку XXI ст. І гэты на прамак, як і адпаведная вучэбная дысцыпліна, набыў неабходную легітымізацыю і інстытуцыянальнае афармленне» (с. 4).

Безумоўна, паняцце «знешнепалітычная гісторыя Беларусі» вельмі моцна звязана з паняццем «гісторыя беларускай дзяржаўнасці». Савецкія гісторыкі сцвярджалі, што ўпершыню беларуская дзяржава была ўтворана толькі 1 студзеня 1919 г. Тым самым паза межамі даследаванняў заставаліся першыя беларускія княствы (Полацкае, Турава-Пінскае, Смаленскае), Вялікае княства Літоўскае (ВКЛ), Беларуская Народная Рэспубліка (БНР). Стваральнікі беларускай гістарычнай школы яшчэ ў 1920-я гг. пераканаўча даказалі, што ўсе пералічаныя княствы можна атаясамліваць з рознымі формамі беларускай дзяржаўнасці, і заклалі традыцыі вывучэння іх міжнароднай дзейнасці. Праз некаторы час яны па гарачых слядах заяўлялі, што лічаць і БНР суб'ектам міжнародных адносін. Між тым для савецкіх гісторыкаў існаваў толькі адзіны суб'ект міжнародных адносін і міжнароднага права — Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (БССР). На Беларусі вяртанне да спадчыны В. Ластоўскага, У. Ігнатоўскага, У. Пічэты, М. Доўнар-Запольскага адбылося напрыканцы 1980-х гг. Ужо больш за тры дзесяцігоддзі вывучэнне знешнепалітычнай дзейнасці беларускіх дзяржаў ажыццяўляецца сур'ёзнымі айчыннымі даследчыкамі ў рэчышчы іх канцэптуальных падыходаў.

Вывучэнне замежных сувязей БССР у савецкі час нельга ацэньваць адназначна. З аднаго боку, на гісторыкаў моцна ўплывала дзяржаўная гістарычная палітыка з жорсткім акцэнтам на марксісцка-ленінскую метадалогію. З другога боку, былі сабраны і старанна абагульнены велізарны фактычны матэрыял, зроблены асобныя высновы, якія можна выкарыстоўваць і сёння. Фактычна на савецкім навуковым падмурку былі мадэрнізаваны папярэднія і створаны новыя цэнтры міжнародных даследаванняў у постсавецкі перыяд. Менавіта так лічыць аўтар дапаможніка, які пачынаў сваю навуковую дзейнасць напрыканцы 1970-х гг.

Адзін з галоўных цэнтраў вывучэння замежных сувязей БССР знаходзіўся ў Інстытуце гісторыі АН БССР. Створаная тут структурная адзінка (сектар, а потым аддзел) у 1960— 1980-я гг. засяродзілася на распрацоўцы знешнепалітычнай дзейнасці і замежных сувязей БССР, асабліва пасля 1944 г., калі саюзнае кіраўніцтва вярнула рэспублікам знешнепалітычныя паўнамоцтвы. У рамках аддзела гісторыі замежных сувязей БССР, як ён стаў называцца з 1983 г., сфарміравалася навуковая школа акадэмічных даследчыкаў знешнепалітычнай і міжнароднай дзейнасці рэспублікі. Да гэтай школы з гонарам адносіць сябе і аўтар (с. 4, 27—36).

У постсавецкі перыяд прафесар У. Е. Снапкоўскі засяродзіўся на вывучэнні кола пытанняў, звязаных з гісторыяй знешняй палітыкі і міжнародных сувязей Беларусі. 28 гадоў таму на аддзяленні міжнародных адносін гістарычнага факультэта БДУ, на базе якога ў 1995 г. быў створаны факультэт міжнародных адносін, па ініцыятыве У. Е. Снапкоўскага стала

выкладацца вучэбная дысцыпліна «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі». Для вучэбнаметадычнага забеспячэння прадмета распрацаваны праграмы і выдадзены першыя ў Беларусі і за яе межамі падручнікі. Дададзім да гэтага вельмі плённае навуковае даследаванне праблем, якія адносяцца да гісторыі знешняй палітыкі Беларусі, вялікую ролю ў апублікаванні велізарнай колькасці адпаведных дакументаў, навуковае кіраўніцтва напісаннем дысертацыйных даследаванняў, падрыхтоўку аналітычных запісак у дырэктыўныя органы, кіраўніцтва адпаведным аддзелам у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі, прапаганду гісторыі знешняй палітыкі і міжнародных сувязей Беларусі ў электронных і друкаваных сродках масавай інфармацыі. У 1993 г. Уладзіміра Еўдакімавіча залічылі прафесарам у склад кафедры міжнародных адносін факультэта міжнародных адносін БДУ, дзе ён працуе па сённяшні дзень. З цікавасцю чытаюцца старонкі, дзе аўтар як вучоны і педагог распавядае пра сваё дачыненне і свой уклад у распрацоўку пералічанага кола пытанняў. Аўтабіяграфічныя рэмінісцэнцыі ўзбагацілі аналіз працэсаў станаўлення і развіцця навуковых ведаў у галіне вывучэння знешнепалітычнай дзейнасці беларускай дзяржавы у XX — пачатку XXI ст. (с. 27—52, 189—196).

Вычарпальна сказана пра дасягненні вучоных у даследаванні знешнепалітычнай дзейнасці Беларусі ў 1990-х — пачатку 2000-х гг. У названы перыяд беларускія даследчыкі надрукавалі шэраг змястоўных гістарыяграфічных прац аб знешнепалітычнай дзейнасці і міжнародных сувязях БССР, у якіх з наватарскіх пазіцый адлюстравалі як дасягненні, так і праблемы і цяжкасці распрацоўкі гэтага новага напрамку ў вывучэнні найноўшай гісторыі Беларусі. Сярод аўтараў гэтых прац на старонках кнігі вылучаюцца В. А. Астрога, А. В. Гурын, С. Ф. Свілас, У. Я. Улаховіч, А. В. Ціхаміраў і інш.

Прадстаўленая інфармацыя пра дасягненні беларускіх навукоўцаў у даследаванні знешнепалітычнай дзейнасці Беларусі XX — пачатку XXI ст., у якую заканамерна ўваходзяць тры формы нацыянальнай дзяржаўнасці (БНР, БССР і Рэспубліка Беларусь), дазваляе сцвярджаць, што да пачатку 2020-х гг. у нашай краіне склаўся буйны і самастойны навуковы напрамак гістарычнай навукі і навукі міжнародных адносін, які можна называць як «гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» або «знешнепалітычныя даследаванні Беларусі» (с. 5—6, 276—278).

Карысным для студэнтаў, выкладчыкаў і даследчыкаў з’яўляецца раздзел кнігі, прысвечаны адлюстраванню праблематыкі знешнепалітычнай дзейнасці Беларускай ССР у матэрыялах беларускіх, расійскіх і ўкраінскіх архіваў (с. 52—69). Па матэрыялах раздзела аўтар робіць выснову аб тым, што «наспеў час для беларускіх, украінскіх, расійскіх даследчыкаў аб’яднаць свае намаганні для падрыхтоўкі калектыўных манаграфій і зборнікаў дакументаў аб знешнепалітычнай і дыпламатычнай дзейнасці СССР, УССР і БССР» (с. 69).

***Гісторыкі і гістарычная палітыка.*** У главе пра гістарычную палітыку і яе ўплыў на беларускіх гісторыкаў распавядаецца пра прыклады прац на гэтую тэму, што было адлюстравана ў аўтарскіх рэцэнзіях, і пра ўласны досвед удзелу У. Е. Снапкоўскага ў распрацоўцы нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі, якую ў 1990-я гг. праводзілі Інстытут гісторыі НАН Беларусі і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Выдзяляюцца асноўныя этапы і тэндэнцыі развіцця гістарычнай палітыкі, адлюстроўваецца роля і месца ў ёй знешнепалітычных пытанняў.

Цікавым з’яўляецца грунтоўны агляд фундаментальнай працы нямецкага гісторыка Р. Ліндproperэра «Гісторык і ўлада: фарміраванне нацыі і гістарычная палітыка ў Беларусі ў XIX і XX стст.», якая стала ўдалай спробай аналізу айчыннай гістарыяграфіі з боку замежнага даследчыка. Беларускі даследчык вылучыў найбольш важныя высновы і заключэнні, да якіх прыходзіць аўтар кнігі. Неразрыўнасць (кантынуітэт) беларускага гістарычнага працэсу ці карціны, як яе называе Р. Ліндproperэр, звязана з традыцыямі перад і раннесавецкага часу. Гэтая карціна складаецца з шэрагу выбраных вузлавых пытанняў беларускай гісторыі. Кантынуітэт беларускай гістарыяграфіі Р. Ліндпэр пацвярджае тэзісам, што канкурэнцыя нацыянальна-гістарычнай канцэпцыі і марксісцка-савецкага разумення свету, якая існавала да канца 1920-х гг., вярнулася ў канцы 1980-х гг. і сёння ўсё яшчэ шырока прадстаўлена ў Беларусі. Відавочна, што кантынуітэт паміж савецкай і постсавецкай гістарыяграфіяй і навуковай культурай аказаўся больш моцным, чым змены, якія прынёс распад краіны.

З боку беларускай гістарыяграфіі існуе дваістая інтэрпрэтацыя мінулага беларускага народа. Гэта вынік супярэчнасці паміж нацыянальнай і імперскай гістарычнымі карцінамі. Таму Беларусь магла ці аглядацца на традыцыі сваёй тысячагадовай дзяржаўнасці, ці аказвацца правінцыяй у густым цені польскай, рускай і савецкай гісторыі. Гэта дваістая культура гістарычнай свядомасці замінае разуменню рэальнай гісторыі беларускіх тэрыторый. Нацыянальная гісторыя, з аднаго боку, царская і савецкая гісторыя — з другога, былі палітычна матываванымі канструкцыямі, якія нярэдка прымусова аспрэчвалі права адзін аднаго на існаванне. Розныя гістарычныя культуры, якія імкнуліся да нацыянальнай ці ан тынацыянальнай інтэграцыі, неслі адпаведна выразныя адзнакі выключэння.

Праз усю кнігу праходзіць тэзіс аб супрацьлегласці нацыянальнай і расійскай/савецкай гістарыяграфіі гісторыі Беларусі. Ва ўсе перыяды даследавання, на думку Р. Ліндпэра, беларускія гісторыкі знаходзіліся ў палітычным полі прыцягнення, уплыву і кантролю. У той час як нацыянальная гістарыяграфія прафілявалася як пераважна гістарыяграфія пратэсту і дыстанцыравання ад улады, савецкія гісторыкі павінны былі адпавядаць ціску падпарадкавання, які аказвалі партыя, пануючая ідэалогія і іх уласная паслухмянасць, якая абганяла дыктат улады.

Для інстытуцыянальнай гісторыі беларускай гістарычнай навукі ў савецкую эпоху вялікая значэнне мела тое, што два яе асноўныя цэнтры —

Інстытут гісторыі Акадэміі навук і гістарычны факультэт БДУ — развіваліся ў рэчышчы палітычных працэсаў свайго часу ці нават абганялі іх. Беларуская гістарыяграфія сфарміравала да сярэдзіны 1980-х гг. функцыянальна працаздольную інстытуцыянальную інфраструктуру. Колькасць гісторыкаў, абароненых дысертацый і публікацый пастаянна ўзрастала. Але прастора дзеянняў для гісторыкаў у даследаванні нацыянальнай гістарычнай тэматыкі ўсё больш звужалася.

Кніга Р. Ліндпэра прыкметна, на думку У. Е. Снапкоўскага, перш за ўсё ахопам перыяду даследавання і навізной узнятых праблем. Гэта першая ў сусветнай гістарычнай навуцы і беларусазнаўстве кніга аб станаўленні і развіцці беларускай гістарычнай навукі і яе ўзаемаадносінах з палітычнай уладай на працягу больш чым стогадовага адрэзку часу. Р. Ліндпэр паставіў і вырашыў праблемы, якія не маглі нават разглядаць беларускія гісторыкі ў савецкі час і да якіх яны толькі пачынаюць падыходзіць зараз. Гэта перш за ўсё пытанне аб адносінах паміж гісторыкамі і ўладай, дакладней, аб залежнасці ці незалежнасці гісторыка ад улады (с. 92).

Акрамя гэтага, у кнізе У. Е. Снапкоўскага прыводзяцца аналіз гістарычнай палітыкі ў Беларусі ў перыяд перабудовы і пасля атрымання незалежнасці, а таксама рэцэнзія на вучэбны дапаможнік па гісторыі Беларусі ў дзвюх частках (пад рэд. Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля). Яго публікацыя ў 1998 г. выклікала рэзананс у навуковых і грамадскіх колах таму, што ён з'явіўся першым у краіне вучэбным дапаможнікам па гісторыі Беларусі для сістэмы вышэйшай адукацыі. Прафесійная супольнасць беларускіх гісторыкаў адгукнулася на вучэбны дапаможнік рэзка адмоўнымі рэцэнзіямі.

У кнізе прыводзіцца адпаведная частка калектыўнай рэцэнзіі, падрыхтаваная спецыялістамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі. На думку рэцэнзентаў, вучэбны дапаможнік змяшчае шэраг памылак і фактычных скажэнняў, а таксама, што больш важна, паслядоўнасць і характар выкладання матэрыялу лагічна вядуць да думкі аб гістарычнай немэтазгоднасці, неабгрунтаванасці, выпадковасці і ўвогуле нелегітымнасці абвяшчэння незалежнай беларускай дзяржавы ў 1991 г. (с. 100).

***Канцэпцыі і прынцыпы знешнепалітычнай гісторыі Беларусі.*** У сваёй працы аўтар разважае аб канцэптуальна-метадалагічных падыходах да асэнсавання такога напрамку ў беларускай гістарыяграфіі, як знешнепалітычная гісторыі Беларусі. Ён дзеліцца ўспамінамі пра дыскусіі наконт назвы напрамку, а таксама адпаведнай навучальнай дысцыпліны сярод прафесараў кафедры міжнародных адносін. Гучалі розныя прапановы: ад «Гісторыі геапалітыкі і дыпламатыі Беларусі» да «Гісторыі знешнепалітычнай дзейнасці і міжнародных сувязей Беларусі». Урэшце пагадзіліся ўзяць самую шырокую, класічную назву «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі», разумеючы, аднак, пры гэтым, што не ва ўсе перыяды беларускай дзяржаўнасці была знешняя палітыка, асабліва ў часы знаходжання беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі.

Аўтар прыводзіць асноўныя канцэпцыі і прынцыпы, на якіх будуюцца даследа ванне і выкладанне знешнепалітычнай гісторыі Беларусі. Па-першае, вывучэнне знешнепалітычнай гісторыі пэўнай дзяржавы будуецца на яе нацыянальнай гістарычнай канцэпцыі, паколькі гэта вонкавая, знеш- няя гісторыя з'яўляецца часткай агульнай гісторыі народа і дзяржавы. Па-другое, аўтар прыводзіць уласную перыядызацыю гісторыі знешняй палітыкі Беларусі, падзяляючы яе на шэраг перыядаў: знешнепалітычная дзейнасць старажытнабеларускіх дзяржаў-княстваў (IX— XIII стст.); знешняя палітыка і дыпламатыя ВКЛ (XIII — канец XVIII ст.); Беларусь у складзе Расійскай імперыі ці бездзяржаўны перыяд у гісторыі Беларусі (канец XVIII — пачатак XX стст.); адраджэнне і развіццё бела- рускай дзяржаўнасці і яе знешнепалітычнай актыўнасці ў форме БНР і БССР (1918— 1991 гг.); станаўленне знешняй палітыкі незалежнай Рэспублікі Беларусь (з 1991 г. па сённяшні дзень) (с. 167—182).

Зроблены агляд шэрагу ключавых пытанняў знешнепалітычнай гісторыі Беларусі сведчыць пра важнае месца гэтага напрамку гістарычных, міжнародных і паліталагічных даследаванняў у айчыннай гістарычнай і, больш шырокім сэнсе, гуманітарнай і сацыяльнай (грамадазнаўчай) навуцы. Аўтар слушна сцвярджае, што знешнепалітычная гісторыя Беларусі — неад'емная частка яе нацыянальнай гісторыі, гісторыі беларускай дзяржаўнасці, палітычнай і дзяржаўна- прававой гісторыі беларускага народа. Аўтарская перыядызацыя базіруецца на больш агульнай перыядызацыі гісторыі беларускай дзяржаўнасці, выпрацаванай засна вальнікамі нацыянальнай гістарычнай школы (В. Ластоўскім, У. Ігнатоўскім, М. Доўнар- Запольскім) (с. 168).

***Аб знешнепалітычнай суб'ектнасці БНР і БССР***. Чацвёртая глава кнігі прысвечана аналізу ролі Беларусі ў міжнародных адносінах першай паловы XX ст. Гэта быў цяжкі перыяд беларускай дзяржаўнасці: беларускія землі пераходзілі ад адной да другой дзяржавы, змянілася некалькі дзяржаўных утварэнняў, БССР страціла міжнародную правасуб'ектнасць у складзе СССР і зноў атрымала яе ў 1944 г. Разважанні аўтара па гэтай тэме ўключаюць непасрэдна гістарыяграфічны аналіз шэрагу падзей і змяненняў міжнародна-прававога статуса беларускіх зямель. Аўтар прыходзіць да высновы, што ні БНР, ні БССР не змаглі ў першыя гады свайго існавання дасягнуць значных поспехаў на міжнароднай арэне і зацвердзіцца як актыўныя і суверэнныя ўдзельнікі міжнародных адносін (с. 220). Аднак паміж гэтымі дзвюма формамі беларускай дзяржаўнасці была істотная розніца ў знешнепалітычнай актыўнасці. БНР з-за адсутнасці кантролю над тэрыторыяй і ўласнага дзяржаўнага апарату, у тым ліку свайго знешнепалітычнага ведамства, не атрымала міжнароднага прызнання і не валодала статусам суб'екта міжнароднага права. БССР, хоць і была моцна залежнай ад іншай дзяржавы — РСФСР, валодала неабходнымі атрыбутамі дзяржаўнасці, кантралявала ўласную тэрыто- рыю, мела дзяржаўны апарат, у тым ліку Наркамат замежных спраў, атрымала абмежаванае міжнароднае

прызнанне, у тым ліку дэ-юрэ з боку Польшчы і Германіі. Усё гэта дае падставы лічыць БССР суб'ектам міжнароднага права. Пры гэтым яе знешнепалітычная актыўнасць была невысокай і кантралявалася Масквой.

Асобны раздзел главы прысвечаны аналізу дакументаў і матэрыялаў брытанскага Міністэрства замежных спраў, якія тычацца БНР і БССР. Аўтар прыходзіць да высновы, што тэма беларускіх тэрыторый як пэўная палітычная праблема, звязана з вывадам акупацыйных нямецкіх войскаў і пагрозай бальшавізму для іх жыхароў, з'явілася ў кабінетах Форын офіса ў лістападзе 1918 г. (с. 257). Пры гэтым брытанскі ўрад негатыўна ставіўся да пытання аб прызнанні БНР, лічачы яе «папяровай рэспублікай», «тэарэтычным утварэннем», «дзяржавай, якая нікога не прадстаўляе», «нямецкай ці польскай інтрыгай» і г. д. Да палітычных і ваенных дзеячаў БНР брытанская дыпламатыя і разведка ставіліся насцярожана, па дазрона і недаверліва. Форын офіс дзейнічаў па палітычных і дыпламатычных правілах тагачасных міжнародных адносін. БНР не была выключэннем сярод шматлікіх паўці квазідзяржаўных антысавецкіх утварэнняў на тэрыторыі былой Расійскай імперыі, якія не атрымалі спадзяванай падтрымкі з боку Вялікабрытаніі і іншых дзяржаў Антанты.

Апошні раздзел дапаможніка асвятляе адно з найбольш важных пытанняў айчын най дыпламатычнай гісторыі — праблему першапачатковага членства БССР у ААН. Уваходжанне Беларусі ў ААН мела вялікае гістарычнае значэнне, цалкам адпавядала нацыянальным інтарэсам беларускага народа. Подпіс БССР пад Статутам ААН азначаў, што сусветнае супольніцтва прызнавала яе суверэннай і незалежнай дзяржавай, якой яна фактычна не была, паколькі з'яўлялася саюзнай рэспублікай у складзе звышцэнтралізаванага Савецкага Саюза. БССР атрымлівала ўсе прывілеі і імунітэты ААН, права выбірацца ў яе галоўныя органы, у тым ліку ў Савет Бяспекі, што было здзейснена ў 1974—1975 гг. Урад рэспублікі атрымаў магчымасць удзельнічаць у абмеркаванні сусветных праблем, даводзіць сваю пазіцыю да міжнароднай супольнасці, уносіць на яе разгляд свае прапановы і заўвагі. Больш за 40 гадоў ААН, па сутнасці, была для Беларусі адзіным акном у знешні свет, дзякуючы чаму пра рэспубліку ведалі ў Еўропе і свеце (с. 272). Аўтар дэталёва разглядае прычыны, з якіх БССР і УССР у выніку доўгай дыпламатычнай барацьбы сталі заснавальніцамі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

***Высновы***. У рэцэнзаванай працы У. Е. Снапкоўскага, як і ў шэрагу іншых яго дапаможнікаў і манаграфій, упершыню ў айчыннай гістарычнай навуцы зроблены комплексны аналіз тэарэтыка-метадалагічных і вучэбна-метадычных аспектаў знешнепалітычных даследаванняў у Беларусі. «Знешне- палітычная гісторыя Беларусі як навуковы напрамак і адукацыйная дысцыпліна сфарма валася ў незалежнай Беларусі. Яе з'ўленне ў гістарычнай навуцы і вышэйшай адукацыі было адказам на грамадска-палітычную і навукова-адукацыйную запатрабаванасць у рэдакцыю ў снежні 2021 г. дах, навыках і ўменнях, якімі павінны былі валодаць дыпламаваныя

спецыялісты ў галіне міжнародных адносін, што атрымлівалі вышэйшую адукацыю ў навучальных установах Беларусі», — да такой слушнай высновы прыходзіць аўтар у сваёй працы (с. 276). З матэрыялаў кнігі вынікае, што гэта новая дысцыпліна ўжо мела свае традыцыі вывучэння гісторыі міжнародных адносін і знешнепалітычнай дзейнасці беларускіх дзяржаў. Яны былі закладзены ў пачатку ХХ ст. заснавальнікамі беларускай гістарычнай школы, якія адлюстроўвалі гэту тэматыку з пазіцый нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі. Новыя метадалагічныя падыходы праяўляліся ў трактоўках знешнепалітычных сюжэтаў гісторыі Полацкага княства, ВКЛ, Рэчы Паспалітай, знаходжання Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. З 1930-х па 1980-я гг. у даследаванні гісторыі Беларусі, у тым ліку яе знешніх аспектаў, дамінавалі расійска-цэнтрычныя, імперыяльныя канцэпцыі. Знешнепалітычная праблематыка, асабліва перыяду Сярэдневякоўя і Новага часу, амаль не развівалася. Вывучаліся міжнародныя сувязі БССР міжваеннага часу і яе знешнепалітычная актыўнасць пасля 1944 г. Метадалагічна даследчыкі былі абмежаваныя сацыяльна-класавым дэтэрмінізмам, а інстытуцыянальна — дыктатам саюзных, цэнтральных навуковых устаноў. Але паступова і тут назапашвалася крытычная маса ведаў, і ў 1980-я гг. тэматыка даследаванняў інструментальна пашыралася, якасна паглыблялася.

У часы незалежнасці напрамак даследаванняў знешнепалітычнай гісторыі Беларусі ў межах спецыяльнасцей «Гісторыя Беларусі» і «Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі» пашырыўся тэматычна, ідучы ўглыб вякоў да Вялікага княства Літоўскага, дасягаючы знешнепалітычнай дзейнасці старажытнабеларускіх княстваў. Сёння гісторыкамі распрацоўваюцца, хаця і з рознай ступенню паўнаты і глыбіні, знешнепалітычныя і дыпламатычныя аспекты ўсіх форм беларускай дзяржаўнасці. Такім чынам, аўтар ставіць на парадак дня актуальныя пытанні далейшага развіцця знешнепалітычнай гісторыі Беларусі як самастойнага напрамку міжнародных даследаванняў. Знаёмства са зместам кнігі дапаможа студэнтам, спецыялістам у галіне міжнародных даследаванняў, шырокаму колу чытачоў лепш зразумець знешнепалітычныя аспекты доўгага і цяжкага шляху нашай краіны да незалежнасці.

**Аляксандр Гурын, Міхаіл Стралец**

Традыцыі і навацыі ў знешнепалітычных даследаваннях Беларусі: дапаможнік / У.Е.Снапкоўскі. Мінск: БДУ, 2020. 295 с. **Рэц**.: Пра традыцыі і навацыі ў справе дзяржаўнай важнасці ў эпоху радыкальных перамен: глыбока і кампетэтна / А.В.Гурын, М.В.Стралец // Журнал международного права и международных отношений. -2021. -№ 4. -С. 63-67.

Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus, Humanitarian Series, 2023, vol. 68, no. 2, pp. 172–176.

ISSN 2524-2369 (Print) ISSN 2524-2377 (Online)
РЭЦЭНЗІІ REVIEWS Паступіў у рэдакцыю 27.11.2022 Received 27.11.2022
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2023-68-2-172-176
*А.В.Гурын,* Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь,
Мінск, Беларусь

## 30 год знешняй палітыкі незалежнай Беларусі: цікавы і глыбокі аналіз

**Уводзіны.** Прафесар Уладзімір Еўдакімавіч Снапкоўскі, адзін з заснавальнікаў кафедры міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, з'яўляецца стваральнікам навуковай школы беларускіх даследчыкаў у галіне гісторыі і сучасных праблем знешняй палітыкі Беларусі. У яго працах разгледжаны самыя розныя праблемы знешнепалітычнай гісторыі: ад знешняй палітыкі дзяржаў сярэднявечча да сучасных праблем міжнародных адносінаў і знешняй палітыкі незалежнай Беларусі. Ужо ў пачатку 2000-х гг. гэтым вучоным і выкладчыкам было створана навукова-метадычнае забеспячэнне і апублікаваны першыя падручнікі па дысцыплінах "Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі" і "Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь". У.Е. Снапкоўскі ў сваёй кнізе "Традыцыі і навацыі ў знешнепалітычных даследаваннях Беларусі" (2020)[33]. упершыню у айчыннай гістарычнай навуцы зрабіў комплексны аналіз тэарэтыка-метадалагічных і вучэбна-метадычных аспектаў знешнепалітычных даследаванняў у Беларусі У 2021 г. аўтар звярнууся ў сваёй творчасці да такой важнай тэмы, як навуковы аналіз знешняй палітыкі незалежнай Беларусі.

Новая кніга У.Е. Снапкоўскага "Аналіз знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"[34] выканана ў выглядзе дапаможніка, прызначанага для магістрантаў спецыяльнасці "Міжнародныя адносіны" і ў першую чаргу накіравана на паглыбленае вывучэнне знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь і выяўленне яе сутнасных характарыстык, навукова-тэарэтычных і канцэптуальных асноў, напрамкаў двухбаковых адносін Беларусі і яе шматбаковага супрацоўніцтва.

Разгледзім асноўны змест, аўтарскія падыходы і вартасці кнігі больш падрабязна.

**Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь аналізуецца як сфера дзяржаўнай дзейнасці і прадмет навуковага вывучэння**. Пры аналізе знешняй палітыкі незалежнай Беларусі аўтар дае яе ўласную перыядызацыю, падзяляючы на перыяды парламенцкай рэспублікі і прэзідэнцкай рэспублікі, і

---

[33] Гл. рэц.: Гурын, А. В. Пра традыцыі і навацыі ў справе дзяржаўнай важнасці ў эпоху радыкальных перамен: глыбока і кампетэнтна / А. В. Гурын, М. В. Стралец // Журн. междунар. права и междунар. отношений. – 2021. – No 4. – С. 63–67.

[34] Снапковский, В.Е. Анализ внешней политики Республики Беларусь / В.Е.Снапковский. – Минск: БГУ, 2021. – 243 с.

выяўляе асаблівасці знешнепалітычнай дзейнасці кожнага з перыядаў. Важным вынікам даследавання тэарэтыка-метадалагічных асноў знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь з’яўляецца апісанне эвалюцыі яе знешнепалітычных прыярытэтаў.

Асноўны змест першага этапа – працэс міжнароднага прызнання Рэспублікі Беларусь, яе выхаду на міжнародную арэну як незалежнай дзяржавы, пашырэння актыўнасці Беларусі на міжнароднай арэне з улікам новага дзяржаўна-палітычнага статусу. 27-гадовы перыяд знешняй палітыкі прэзідэнцкай рэспублікі аўтар падзяляе на тры этапы: першы этап (1994-1999 гг.) – пяцігодка актыўнай інтэграцыйнай палітыкі з Расіяй; другі этап (2000-2014 гг.) - час правядзення шматвектарнай палітыкі; трэці этап (2014 г. – жнівень 2020 г.) -- час набыцця Беларуссю сваёй міжнароднай ідэнтычнасці. На трэцім этапе палітыка шматвектарнасці, якая вызначаецца як імкненне аслабіць празмерную залежнасць ад аднаго ўсходняга вектара (Расійскай Федэрацыі), стала набываць больш рэальныя рысы і набліжацца да збалансаванага развіцця адносін з усімі геаграфічнымі вектарамі знешняй палітыкі дзяржавы.

Аўтар слушна сцвярджае, што нягледзячы на палітычны крызіс жніўня 2020 г. і рэзкае звужэнне знешнепалітычнага курса, трыццацігадовы вопыт самастойнага існавання краіны паказвае, што Рэспубліка Беларусь, як і іншыя постсавецкія дзяржавы, працягвае нялёгкі, супярэчлівы шлях фарміравання незалежнай еўрапейскай дзяржавы (с. 42). Таксама, у першай главе сваёй працы аўтар аналізуе напрамкі навуковых даследаванняў знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Цікавым ўяўляецца даследаванне дасягненняў беларускіх навукоўцаў у гэтай галіне.

**Канцэптуальныя асновы знешняй палітыкі незалежнай Беларусі на розных гістарычных этапах.** Перавагай навуковага аналізу знешняй палітыкі незалежнай Беларусі, які зраблены аўтарам, з’яўляецца даследаванне не толькі кірункаў і зместу, але і яе канцэптуальных асноў на розных гістарычных этапах. У прыватнасці, прааналізаваны фарміраванне асноў знешняй палітыкі Беларусі ў перыяд перабудовы і парламенцкай рэспублікі ў 1989-1994 гг., распрацоўка знешнепалітычнай стратэгіі беларускай дзяржавы ў першы перыяд прэзідэнцкай рэспублікі ў 1994-2010 гг., развіццё дактрынальных асноў знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь у 2010-я гг. Акрамя гэтага, у другой главе ахарактарызаваны тэарэтыка-метадалагічныя аспекты даследавання знешнепалітычнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь.

Аўтар прыходзіць да высноў, што галоўныя прынцыпы знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, зафіксаваныя ў Канстытуцыі і іншых прававых актах, складаюцца з агульнапрызнаных прынцыпаў і норм міжнароднага права, у тым ліку суверэннай роўнасці дзяржаў, неўмяшання ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў і ўліку нацыянальных інтарэсаў краіны. Гэта спрыяе палітычнаму дыялогу з замежнымі дзяржавамі з акцэнтам на кантакты на

найвышэйшым узроўні, прасоўванню інтарэсаў беларускай эканомікі ў мэтах павелічэння аб'ёмаў экспарту, прыцягненню замежных інвестыцый, развіццю інтэграцыйных працэсаў, фарміраванню двухбаковай і шматбаковай дагаворна-прававой базы, пашырэнню канструктыўнага ўзаемадзеяння ў міжнародных арганізацыях. Важным аспектам правядзення прагматычнай і эфектыўнай знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца выпрацоўка перспектыўных стратэгічных мэт, абгрунтаванне іерархіі знешнепалітычных задач, напрамкаў і прыярытэтаў, вызначэнне сіл і сродкаў пры ажыццяўленні знешняй палітыкі, фарміраванне знешнепалітычнай канцэпцыі дзяржавы з улікам неабходнасьці забеспячэння яе нацыянальнай бяспекі.

**Беларусь і Расія: дыялектыка ўзаемаадносін.** У рэцэнзаванай працы шмат увагі надаецца ўзаемадзеянню Беларусі з галоўным стратэгічным партнёрам– Расійская Федэрацыяй. У адпаведнай главе ахарактарызаваны этапы развіцця адносін паміж краінамі, прааналізаваны айчынныя даследаванні беларуска-расійскіх адносін, і, што вельмі каштоўна, падыходы расійскай акадэмічнай супольнасці да даследавання інтэграцыйных працэсаў паміж Расіяй і Беларуссю. Нельга не пагадзіцца з аўтарам ў тым, што "ў расійска-беларускіх адносінах, якія складваюцца ў рамках інтэграцыйных праектаў і саюзных дамоўленасцей, прысутнічае ўзаемная зацікаўленасць, але напрамкі іх рэалізацыі, тым больш фінальная геапалітычная мэта, істотна адрозніваюцца. Паводле меркавання большасці расійскіх экспертаў, Беларусь з'яўляецца неад'емнай часткай так званага "рускага свету", дзякуючы Расіі забяспечваецца яе эканамічны рост, абслугоўваюцца яе спецыфічныя правы ў сістэме міжнародных адносін на працягу ўсяго перыяду з моманту набыцця незалежнасці. У беларускіх палітычных і дзелавых колах падобная ацэнка геапалітычнай ролі краіны не падзяляецца і ставіцца акцэнт на роўнапраўных міждзяржаўных адносінах" (с. 104).

Адносіны Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі з'яўляюцца дастаткова даследаванымі ў айчыннай навуцы аб міжнародных адносінах. Пра іх розныя аспекты (палітычныя, эканамічныя, ваенна-палітычныя, супрацоўніцтва на міжнароднай арэне) пісалі А.І. Гардзейчык, С.А. Кізіма, А.А. Разанаў, У.Е.Снапкоўскі, А.У. Ціхаміраў, А.А.Чалядзінскі, М.Э. Часноўскі, В.Г. Шадурскі, А.В. Шарапа і інш. Аднак абароненых кандыдацкіх дысертацый на гэту тэму у нашай краіне няшмат, а доктарскіх па спецыяльнасці "Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі" ўвогуле няма, што застаецца важнай задачай даследчыкаў знешнепалітычнай тэматыкі.

Вынікі вывучэння У.Е.Снапкоўскім беларускай гістарыяграфіі аб адносінах Беларусі і Расіі паказваюць, што сцвярджэнні даследчыкаў пра ўплыў на інтэграцыйны працэс як аб'ектыўных (гістарычнае мінулае, цесныя ўзаемасувязі, палітычная і сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў свеце, уздзеянне знешніх сіл і г.д.), так і суб'ектыўных (падыходы лідэраў дзяржаў, палітычныя сілы, грамадская думка, экспертная супольнасць, СМІ і г.д.)

фактараў цалкам абгрунтаваныя і справядлівыя. Характэрнай асаблівасцю большасці прац беларускіх аналітыкаў з'яўляецца разгляд ўзаемаадносін Мінска і Масквы з пазіцый нацыянальных інтарэсаў Беларусі. Пры гэтым сам аўтар вылучае ўласную канцэпцыю развіцця беларуска-расійскіх адносін, лічачы, што найбольш прымальнай і выгоднай для абедзвюх краін мадэллю двухбаковых адносін, якая ўлічвала б гістарычны вопыт узаемасувязяў беларускага і рускага народаў і сучасны міжнародны кантэкст, было б стратэгічнае супрацоўніцтва або сяброўскія партнёрскія адносіны пры захаванні суверэнітэту і незалежнасці абедзвюх дзяржаў.

**Паміж Усходам і Захадам: асаблівасці геапалітычнага становішча Беларусі.** У чацвёртай главе кнігі прааналізаваны асаблівасці адносін Беларусі да асноўных актараў сістэмы міжнародных адносін універсальнага і рэгіянальнага ўзроўняў (акрамя ўжо разгледжанай расійскай тэматыкі). Гэта адносіны Беларусі і Злучаных Штатаў Амерыкі, беларуска-польскія адносіны, этапы і асноўныя накірункі ўзаемадзеяння Рэспублікі Беларусь і Кітая.

Складаны і няроўны шлях прайшлі адносіны Беларусі з ЗША ў 1991-2020 гг.. На працягу першага этапу (1991-1996 гг.) яны дынамічна развіваліся ў розных галінах; ЗША з'яўляюцца адной з першых дзяржаў свету і першай з пастаянных членаў Савета Бяспекі ААН, хто прызнаў незалежнасць Рэспублікі Беларусь і ўстанавіў з ёй дыпламатычныя адносіны. Пасля рэферэндуму 1996 г. адносіны паміж дзвюма дзяржавамі пагоршыліся. Вашынгтон стаў праводзіць палітыку выбарчага ўздзеяння, якая спалучала абмежаваны дыялог на ўзроўні міністэрстваў і ведамстваў з падтрымкай гуманітарных кантактаў і структур грамадзянскай супольнасці, а таксама развіццём гандлёвых сувязяў. Пікам пагаршэння адносін стаў 2008 г., калі Мінск рэзка адрэагаваў на ўвядзенне эканамічных санкцый супраць айчынных прадпрыемстваў. Адмоўная рэакцыя ЗША на вынікі прэзідэнцкіх выбараў 2010 г.стала дадатковым сур'ёзным раздражняльнікам ў двухбаковых адносінах. З 2013 г. да першай паловы 2020 г. Мінск і Вашынгтон прайшлі пачатковы этап нармалізацыі адносін, аднак далейшы працэс нармалізацыі быў перапынены палітычным крызісам і рэакцыяй ЗША на ўнутрыпалітычныя падзеі ў краіне. Непрызнанне вынікаў прэзідэнцкіх выбараў і аднаўленне эканамічных санкцый супраць беларускіх прадпрыемстваў павярнулі назад паступальны працэс нармалізацыі беларуска-амерыканскіх адносін.

Вопыт цыклічнага развіцця адносін Беларусі і Польшчы, на думку аўтара, паказвае рэгулярныя рэзкія ваганні, перыяды ўздымаў і спадаў. Як правіла, прычынай пагаршэння станавіліся ўнутрыпалітычныя падзеі ў Беларусі, якія выклікалі адваротную негатыўную рэакцыю заходніх дзяржаў, у тым ліку Польшчы. Асабліва моцна на адносіны дзвюх краін паўплывалі падзеі 2020 г., пасля якіх беларуска-польскія адносіны аказаліся адкінутымі

да стану найбольш горшых часоў і іх нармалізацыя запатрабуе шмат сілаў і ўвагі, асабліва з боку Беларусі.

У адрозненне ад адносін з заходнімі краінамі сувязі Беларусі з КНР з'яўляюцца на парадак больш пасляховымі і выніковымі. Яны сталі актыўна развівацца з першых гадоў незалежнасці, аднак прыярытэтным напрамкам знешняй палітыкі Мінска сталі з другой паловы 1990-х гг., калі прэзідэнт А. Лукашэнка зрабіў стаўку на Пекін з улікам важнай міжнароднай ролі Кітая ў сусветнай палітыцы і ўзнікшых цяжкасцей у адносінах з заходняй супольнасьцю. Кітай у сваю чаргу таксама праявіў цікавасць да развіцця адносін з невялікай, але стратэгічна важнай усходнееўрапейскай дзяржавай, якая мяжуе з краінамі ЕС і НАТА на захадзе і з Расеяй і Украінай на ўсходзе і поўдні. Першапачаткова двухбаковыя адносіны былі больш сканцэнтраваныя на палітычных пытаннях і ўзаемападтрымцы на міжнароднай арэне. У новым стагоддзі яны набылі прагматычны характар, у іх узмацніўся гандлёва-эканамічны вектар. Да канца першага дзесяцігоддзя XXI ст. беларуска-кітайскія адносіны павысіліся да ўзроўню стратэгічнага партнёрства (с. 176).

**Беларусь і міжнародныя арганізацыі.** У пятай главе манаграфіі апісваецца шматбаковая дыпламатыя Беларусі на прыкладзе яе адносін з Еўрапейскім Саюзам, удзелу ў праграме "Усходняе партнёрства" і дзейнасці Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Аўтар выводзіць за дужкі ў сваёй працы адносіны Беларусі і ААН, аналізу якіх ён прысвяціў вялікую колькасьць сваіх даследаванняў[35].

Дваццацігадовая гісторыя адносін паміж Беларуссю і ЕС, на думку аўтара, падзяляецца на два перыяды: да і пасля лістапада 1996 г. На працягу першага перыяду беларуска-еўрапейскія адносіны развіваліся з нарастаючым дынамізмам і ў 1995 г. былі ўвянчаны падпісаннем Пагаднення аб партнёрстве і супрацоўніцтве. Другі перыяд пачаўся пасля лістападаўскага рэферэндуму 1996 г., вынікі якога не былі прызнаныя ЕС. Пасля гэтага ў беларуска-еўрапейскіх адносінах наступіў адкат, назіралася чаргаванне пацяплення і ахаладжэння. У снежні 2010 г. адносіны з ЕС, як і ўвогуле з дзяржавамі Захаду, аказаліся адкінутым да самага нізкага ўзроўню з лістападаўскага рэферэндуму 1996 г. Бакам спатрэбілася нямала часу і цярпення, каб вярнуцца да больш-менш прымальнага ўзроўню адносін. У 2013-2019 гг. яны былі вымушаныя зноў прайсці неабходную фазу нармалізацыі і аднаўлення даверу.

Зыходзячы са стратэгічнай мэты забеспячэння добрасуседства на сваіх знешніх межах, ЕС увесь час імкнуўся праводзіць палітыку ўцягвання

[35] Снапковский, В.Е. Белорусская ССР и ООН (1945–1985 гг.) / В.Е. Снапковский. – Мн.: Наука и техника, 1985. – 104 с.; Снапковский, В.Е. Путь Беларуси в ООН: 1944–1945 гг. / В.Е. Снапковский. – Мн.: Наука и техника, 1994. – 141 с.; Снапкоўскі, У.Е. 50 гадоў дзейнасці Беларусі у ААН / У.Е. Снапкоўскі // Беларусь. – 1995. – № 10. – С. 1–3; Снапкоўскі, У.Е. Традыцыі і навацыі ў знешнепалітычных даследаваннях Беларусі / У.Е. Снапкоўскі. – Мн.: БДУ, 2020. – 295 с. і інш.

Беларусі ў праграму Усходняга партнёрства і канкрэтныя рэгіянальныя праекты. Для беларускага кіраўніцтва, якое не ставіла сваёй нават доўгатэрміновай мэтай уступленне ў ЕС, галоўнымі мэтамі ўдзелу ва Усходнім партнёрстве з'яўляліся магчымасці пашырэння супрацоўніцтва з ЕС у сферах эканомікі і энергетыкі, павелічэння гандлёвага абароту, атрымання еўрапейскіх інвестыцый і тэхналогій. Палітычная цікавасць заключалася ў пашырэнні манеўравання на еўрапейскай і сусветнай арэне, наданні беларускай знешняй палітыцы рэальнай шматвектарнасці. А. Р.Лукашэнка выкарыстаў абвастрэнне стасункаў Расіі з Захадам пасля канфліктаў Масквы з Грузіяй і Украінай для ўмацавання незалежнага статусу Беларусі на міжнароднай арэне і правядзення больш самастойнай, манеўранай палітыкі ў стасунках з Крамлём.

Удзел Беларусі ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва адкрывае для Беларусі магчымасць уключэння ў міжрэгіянальныя праекты супрацоўніцтва з улікам выгоднага транзітнага становішча паміж Усходам і Захадам, стварэння спрыяльных умоў для гандлю і інвестыцый, актывізацыі ўзаемадзеяння ў мытных справах, партнёрства ў пытаннях рэгіянальнай і глабальнай бяспекі, развіцця дыялогу па знешнепалітычных пытаннях. Геапалітычны вектар Беларусі, на думку У.Е. Снапкоўскага, накіраваны на геастратэгічны рэгіён ШОС, дае падставы выказаць меркаванне, што краіна ў бліжэйшы час зможа павысіць свой статус у гэтай арганізацыі, стаўшы адным з паўнапраўных «канструктараў» сучаснай еўразійскай геапалітычнай прасторы (с. 225).

**Высновы.** Галоўная каштоўнасць кнігі прафесара У.Е. Снапкоўскага заключаецца ў тым, што у ёй зроблены не толькі аналіз дасягненняў і праблем, поспехаў і няўдач, памылак і пралікаў у знешняй палітыцы незалежнай Беларусі, але і прысутнічае своеасаблівы погляд у будучыню. З гісторыі краіны добра бачна, што не на ўсіх этапах знешнепалітычны курс быў у поўнай меры ўзважаны і прагматычны, асабліва ў тым, што тычыцца асноўных знешнепалітычных кірункаў. У прыватнасці, большую частку часу айчынная знешняя палітыка не была сапраўды шматвектарнай, што неабходна для такой дзяржавы як Беларусь, з геапалітычнага пункту гледжання. Несумненна, кіраўніцтва краіны ўвесь час прадпрымала намаганні захаваць незалежнасьць і не стаць геапалітычнай ускраінай Захаду ці Усходу, але відавочна, што ў выпадку перакосу знешняй палітыкі ў адным з кірункаў логіка развіцця міжнародных адносін можа прывесці да страты некаторых атрыбутаў дзяржаўнага суверэнітэту, калі не ўвогуле незалежнасці. Таму аналіз трыццацігадовай гісторыі знешняй палітыкі Беларусі як ніколі карысны для цвярозых палітыкаў, грамадскіх дзеячаў і навукоўцаў.

Акрамя навуковага аналізу праблем знешняй палітыкі Беларусі ў кнізе зроблены змястоўны гістарыяграфічны агляд найбольш важных і значных работ па знешняй палітыцы Рэспублікі Беларусь, выдадзеных у краіне і свеце

за апошнія 25 гадоў. Нягледзячы на тое, што кніга У.Е. Снапкоўскага “Аналіз знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь” выканана ў выглядзе дапаможніка, яна па сваім фармаце, творчых задумах, аналітычных падыходах і багатым навуковым апараце з’яўляецца глыбокім манаграфічным даследаваннем. Таму гэта праца можа быць карысна не толькі для навучэнцаў, але і для выкладчыкў, навуковых работнікаў, дыпламатаў, дзяржаўных служачых і ўсіх, хто цікавіцца сучаснымі міжнароднымі адносінамі і знешняй палітыкай нашай краіны. Напэўна не ўсе пагадзяцца з аўтарскімі падыходамі, ацэнкамі і высновамі. Але ў гэтым ёсць галоўная задума аўтара: будзіць думку, аналізаваць, разважаць, сумнявацца, сапастаўляць знешнепалітычныя з’явы і працэсы і рабіць адпаведныя высновы і абагульненні. Думаецца, што аўтару будуць карысныя пэўныя слушныя заўвагі, якія лягуць у аснову яго будучых даследаванняў і аналітычных распрацовак.

Информация об авторе

Гурин Александр Валерьевич – кандидат исторических наук, доцент, заведующий отделом докторантуры и аспирантуры Академии управления при Президенте Республики Беларусь (ул. Московская. 17, 220007, Минск, Республики Беларусь). E-mail: guryn@pac.by

Анализ внешней политики Республики Беларусь : пособие / В. Е. Снапковский. – Минск : БГУ, 2021. – 243 с. **Рец.**: 30 год знешняй палітыкі незалежнай Беларусі: цікавы і глыбокі аналіз / А. В. Гурын // Весці Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2023. Т. 68. № 2. С.172-176. https://vestihum.belnauka.by/jour/article/view/977/857

Современная Европа. 2023. № 3. С. 210–213.

РЕЦЕНЗИИ

**УДК 930:94:327.82(47+57):327.7:341.123:94:327(477):94:327(476)«1945»:929**

## СТРАНИЦЫ БОРЬБЫ СОВЕТСКОЙ ДИПЛОМАТИИ ЗА ЧЛЕНСТВО УССР И БССР В ООН

**© 2023 МЕЗГА Николай Николаевич**,
Заведующий кафедрой всеобщей истории
Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины,
246019, Беларусь, Гомель, ул. Советская, 104.
E-mail: miazgamm65@gmail.com

Поступила в редакцию 19.11.2022 После доработки 20.12.2022 Принята к публикации 09.02.2023

**Ключевые слова**: СССР, Антигитлеровская коалиция, БССР, УССР, ООН, Вторая мировая война, международные отношения

**DOI:** 10.31857/S020170832303018X **EDN:** bvgyia

В 2022 г. была опубликована работа белорусского историка, профессора факультета международных отношений Белорусского государственного университета В. Е. Снапковского «Союзные республики и советская дипломатия: из истории борьбы СССР за первоначальное членство УССР и БССР в ООН (1943-1945 гг.)». Автор – известный исследователь проблем истории международных отношений, в частности внешней политики Беларуси. В. Е. Снапковский обратился к проблеме включения советских республик в число стран–учредителей Организации Объединенных Наций. По этому вопросу шла острая дипломатическая борьба. Автор монографии отмечает, что его замысел заключался в восполнении пробела в ее изучении. Включение советских республик в состав ООН было крупным достижением советской дипломатии в годы Второй мировой войны и имело важное значение для дальнейшего развития белорусской и украинской государственности. Предметом своего исследования В. Е. Снапковский избрал дипломатическую историю. Это определяет содержание рецензируемой монографии как историко-дипломатического исследования.

Структурно монография делится на две главы. В первой главе В. Е Снапковский проводит детальный анализ дипломатической борьбы вокруг вопроса о включении советских республик в состав ООН. Он определяет, что начальной точкой усилий советской дипломатии, направленной на придание им международно-правового статуса, является требование Москвы включить республики в состав Комиссии Объединенных Наций по военным преступлениям в июле 1943 г. [Снапковский, 2022: 17–18]. Важнейшим шагом В. Е. Снапковский считает проведение в СССР конституционной реформы в начале 1944 г. В результате республики Советского Союза юридически получили внешнеполитические полномочия. В монографии отмечается противоречивость и неопределенность их международного статуса, несмотря на внесенные в Конституцию поправки [Снапковский, 2022: 30]. Обращаясь к мотивам советского руководства, В. Е. Снапковский делает вывод, что решение о наделении советских республик международной правосубъектностью связано со стремлением сталинской дипломатии использовать их в своей внешней политике, в частности, для множественного представительства СССР в ООН и других международных организациях [Снапковский, 2022: 17, 41]. Что касается реакции союзников СССР по Антигитлеровской коалиции на выход союзных республик на международную арену, то убедителен изложенный в монографии тезис об подозрительности и тревоге. Дипломатия США не рассматривала главный мотив советского решения - получить при помощи союзных республик голоса на международных конференциях и в международных организациях. Американцы больше склонялись к тому, что причиной было стремление сделать СССР более привлекательным для инкорпорации в его состав новых стран.

В первой главе монографии подробно изучен переговорный процесс по вопросу включения советских республик в число основателей ООН и

освещена тактика советской дипломатии. В.Е.Снапковский отмечает, что предложение СССР 28 августа 1944 г. в Думбартон-Оксе о членстве советских республик в ООН стало неожиданностью для союзников. Первоначально Советский Союз заявил о необходимости включения всех 16 республик в состав организации, что в будущем открывало возможности для уступок с целью достижения компромисса. 7 сентября 1944 г. И. Сталин в послании Ф. Рузвельту обозначил предел уступок - членство Украины и Белоруссии в составе ООН [Снапковский, 2022: 69–70]. В. Е. Снапковский обращает внимание на уязвимость советской позиции, частично созданную Москвой. СССР рассматривал подписание Декларации Объединенных Наций как важнейший критерий для членства государств в ООН, однако союзные республики ее не подписывали. Интересно, что американская формулировка по этому вопросу была более благоприятной [Снапковский, 2022: 60].

В монографии проиллюстрировано, с какими сложностями столкнулась советская дипломатия по вопросу о членстве союзных республик в ООН. Вплоть до Ялтинской конференции никаких положительных изменений в решении проблемы не было [Снапковский, 2022: 80]. К моменту встречи «большой тройки» в Крыму стороны определились с возможными уступками для достижения компромисса [Снапковский, 2022: 89]. В монографии обосновано положение, согласно которому основное противодействие советскому предложению оказывали США, а роль Великобритании была пассивной.

В монографии подробно рассмотрена дискуссия по вопросу о членстве советских республик в ООН на Ялтинской конференции. Полученное на ней Советским Союзом согласие США и Британии поддержать на конференции в Сан-Франциско приглашение Белоруссии и Украины в качестве учредителей ООН имело определяющее значение для решения вопроса. В. Е Снапковский раскрывает причины, которые побудили Ф. Рузвельта и У. Черчилля пойти на встречу советской стороне. Это было связано с положением на фронте, с заинтересованностью США во вступлении СССР в войну против Японии [Снапковский, 2022: 108–109]. Автор монографии указывает на благосклонную позицию премьер-министра Британии в вопросе включения советских республик в число учредителей ООН. Уступка не бала односторонней: взамен СССР принял американскую формулировку по голосованию в Совете Безопасности.

Рассматривая дальнейший ход дипломатической борьбы, В. Е. Снапковский останавливается на новых противоречиях между союзниками после Ялтинской конференции. Они связаны с различными интерпретациями ялтинских соглашений. Советское руководство отстаивало позицию, согласно которой в Ялте участники переговоров договорились о приглашении Беларуси и Украины на учредительную конференцию ООН в Сан-Франциско. Американские и британские дипломаты настаивали на том, что вопрос о приглашении республик в число учредителей должен быть решен на самой конференции [Снапковский, 2022: 133–134]. Автором

монографии обоснован вывод, что к началу работы конференции у СССР и его западных союзников сохранились принципиальные расхождения по белорусско-украинскому вопросу [Снапковский, 2022: 140].

Глубокому анализу в монографии подвергнут ход переговоров на конференции в Сан-Франциско. Британская позиция рассматривается как более благоприятная для СССР, что связано с приглашением доминионов Соединенного Королевства в число учредителей ООН. Исследованы дипломатические комбинации, к которым прибегла советская делегация, чтобы добиться положительного решения вопроса об участии Беларуси и Украины в конференции. В частности, показано, как советские дипломаты связывали белорусско-украинский вопрос с аргентинским. Это позволило СССР добиться поддержки латиноамериканских стран [Снапковский, 2022: 159].

В качестве важнейшего результата усилий советской дипломатии следует рассматривать, по мнению автора монографии, не только членство УССР и БССР в составе организации, но и признание республик субъектами международного права [Снапковский, 2022: 159]. В.Е. Снапковский подчеркивает, что инициатива в постановке вопроса членстве в ООН исходила не от союзных республик, а от центрального советского руководства, стремящегося к более широкой международной поддержке и обеспечению геополитических интересов СССР как великой державы. Несмотря на это, включение УССР и БССР в состав ООН соответствовало национальным интересам их народов [Снапковский, 2022: 162–163].

Вторая глава рецензируемой работы представляет собой подборку документов по теме исследования. Среди 105 публикуемых документов значительная часть – это материалы, выявленные В. Е. Снапковским в архивах Беларуси, России, Украины, Великобритании и впервые введенные в научный оборот. Публикуемые документы значительно расширяют знания о процессах принятия решений руководством СССР, США, Великобритании по вопросу включения в состав учредителей ООН Белоруссии и Украины.

Рецензируемая монография подготовлена с использованием широкого круга исторических источников. Ее автор глубоко изучил и обобщил белорусскую, российскую, украинскую и западную историографию по теме. Это позволило В. Е. Снапковскому внести существенный вклад в изучение истории советской внешней политики в годы Второй мировой войны, открыть новую страницу в изучение такого аспекта советской дипломатии, как борьба за включение Белоруссии и Украины в число учредителей ООН, а также начального этапа внешнеполитической деятельности БССР и УССР в связи с созданием международной организации.

**Список литературы**

Снапковский В. Е. (2022) *Союзные республики и советская дипломатия: из истории борьбы СССР за первоначальное членство УССР и БССР в ООН (1943–1945 гг.).* БГУ, Институт Европы РАН, Ассоциация

внешнеполитических исследований имени А. А. Громыко. «Право и экономика», Минск Беларусь. 366 с.

**Pages of The Struggle of Soviet Diplomacy for the Membership of the Ukrainian SSR and the Belarusian SSR in the UN**

N.N.Miazga Head of the Department of General History Francisk Skorina Gomel State University, 104, Sovetskaya street, Gomel, Belarus, 246019 ***E-mail***: miazgamm65@gmail.com

Review of the book: Snapkovsky V. E. (2022) The Union Republics and Soviet Diplomacy: from the History of the USSR's Struggle for the initial Membership of the Ukrainian SSR and the Belarusian SSR in the UN (1943–1945)]. BGU, Institut Evropy RAN, Assotsiatsiya vneshnepoliticheskikh issledovaniy imeni A. A. Gromyko, Pravo i ekonomika, Minsk, Belarus. 366 p.

***Keywords:*** USSR, Anti-Hitler Coalition, BSSR, USSR, UN, World War II, international relations.

**DOI:** 10.31857/S020170832303018X **EDN:** bvgyia

**REFERENCES**

Snapkovsky V.E. (2022) *Soyuznyye respubliki i sovetskaya diplomatiya: iz istorii borby SSSR za pervonachalnoye chlenstvo USSR i BSSR v OON (1943–1945 gg.)* [The Union Republics and Soviet Diplomacy: from the History of the USSR's Struggle for the initial Membership of the Ukrainian SSR and the BSSR in the UN (1943–1945)], BGU, Institut Evropy RAN, Assotsiatsiya vneshnepoliticheskikh issledovaniy imeni A.A. Gromyko, Pravo i ekonomika, Minsk, Belarus.

Союзные республики и советская дипломатия: из истории борьбы СССР за первоначальное членство УССР и БССР в ООН (1943 - 1945 гг.) / В.Е. Снапковский / БГУ, Институт Европы РАН, Ассоциация внешнеполитических исследований имени А.А. Громыко. Минск, Право и экономика, 2022. 366 с. **Рец.**: Страницы борьбы советской дипломатии за членство УССР и БССР В ООН / Н.Н. Мезга // Современная Европа. 2023. № 3. С. 210–213.

### 3.5. Навуковая школа праф. У. Е. Снапкоўскага

Вучоныя, якія абаранілі кандыдацкія і доктарскую дысертацыю па спецыяльнасці 07. 00. 15 – гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі пад навуковым кіраўніцтвам і пры навуковым кансультаванні доктара гістарычных навук, прафесара У. Е. Снапкоўскага.

1. Гурын Аляксандр Валер'евіч. Даследаванне гісторыі міжнародных адносін у Беларусі ў 1980–2003 гг. Аўтарэф. дыс… к-та гіст. нав. па спецыяльнасці 07.00.15 – гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі. Мінск, БДУ, 2005. 20 с.
2. Романоўскі Раман Генадзевіч. Удзел Беларусі ў дзейнасці ЮНЕСКА (1984–2001 гг.). Аўтарэф. дыс… к-та гіст. нав. па спецыяльнасці 07.00.15 – гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі. Мінск, БДУ, 2006. 20 с.
3. Лазоркина Ольга Игоревна. Дипломатическая служба Великого княжества Литовского во внешнеполитическом механизме Речи Посполитой в 1600–1697 гг. Автореф. дис… к-та ист. наук по специальности 07.00.15 – история международных отношений и внешней политики. Минск, БГУ, 2009. 24 с.
4. Лашкевіч Сяргей Анатольевіч. Дыпламатыя Вялікага Княства Літоўскага ва ўзаемаадносінах Рэчы Паспалітай і Расійскай дзяржавы (1586–1598 гг.). Аўтарэф. дыс… к-та гіст нав. па спецыяльнасці 07.00.15 – гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі. Мінск, БДУ, 2015. 24 с.
5. Свилас Светлана Францевна. ЮНЕСКО в системе внешнеполитической деятельности Белорусской ССР (1954–1964 гг.). Автореф. дис… д-ра ист. наук по специальности 07.00.15 – история международных отношений и внешней политики.. Минск, БГУ, 2018. 47 с.
6. Мазарчук Дмитрий Валерьевич. Становление английской дипломатической службы (конец XV – первая половина XVI в.). Автореф. дис… д-ра ист. наук по специальности 07.00.15 – история международных отношений и внешней политики. Минск, БГУ, 2025. 44 с.
7. Чжоу Лэчжэн. Внешнеполитический курс и концепции КНР в области международных отношений в 1990-е-начале 2020-х гг. Автореф. дис… к-та ист. наук по специальности 07.00.15 – история международных отношений и внешней политики. Минск, БГУ, 2025. 26 с.

Да навуковай школы У. Е. Снапкоўскага належыць Янушкевіч Андрэй Мікалаевіч (2014-2017 гг.), які завяршыў навучанне ў дактарантуры пры кафедры міжнародных адносін без прадстаўлення дысертацыі да абароны. Тэма доктарскай дысертацыі "Дыпламатычная служба Вялікага княства Літоўскага ў другой палове XVI-пачатку XVII стагоддзя".

Дрожжа Людміла Чэславаўна падрыхтавала да абароны дысертацыю "Польска-савецка-германскія адносіны 1932–1939 гг. у польскай і беларускай

гістарыяграфіі (1970-я – 2000-я гг.)”. Автореф. дыс… к-та гіст. нав. па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання. Минск, БДУ, 2025. 26 с.

Да сваёй навуковай школы прафесар залічвае супрацоўнікаў, з якімі звязаны даўгалетнімі (хаця і не толькі імі) вузамі даследчай і выкладчыцкай працы ў галіне знешнепалітычнай гісторыі Беларусі: дацэнтаў кафедры міжнародных адносін БДУ, кандыдатаў гістарычных навук Ціхамірава Аляксандра Валянцінавіча і Дземідовіч Алену Васільеўну. Некалькі яго аспірантаў не змаглі давесці да канца свае дысертацыі.

У. Е. Снапкоўскі - афіцыйны апанент (рэцэнзент) кандыдацкай дысертацыі Лукаша Стаськевіча (Łukasz Staśkiewicz) (Пазнанскі ўніверсітэт, Польшча) па тэме „Wielowektorowa polityka zagraniczna Białorusi - relacje z krajami Azji, Afryki i Ameryki Łacińskiej (1990-2015)” (Шматвектарная знешняя палітыка Беларуси- адносіны з краінамі Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі) na Katedrze Studiów Wschodnich Wydziału Historii Uniwersytetu im. Adama Mickiewicza w Poznaniu pod kierunkiem prof. UAM dr hab. Marka Figury. (Poznań). 29.11.2021.

### 3.6. Літаратура аб жыцці і дзейнасці


1. Аляхновіч У. Беларускі вучоны – «Чалавек года» // Звязда. 1999. 23 снежня. С. 4.
2. Тихомиров А., Снапковский Владимир Евдокимович // Дипломатический словарь-справочник. Дыпламатычны слоўнік-даведнік. В 2 т. Т. 2. Под ред. Л. В. Лойко. Минск, РИВШ, 1999. С. 140.
3. Корзун А. Беларускага прафесара Уладзіміра Снапкоўскага цяпер ведае ўвесь свет // Народная воля. 2000. 4 студзеня. С. 4.
4. Еловик Е. «Человек года» живет в Минске // 7 дней. 2000. 8 января. С. 5.
5. Снапкоўскі Уладзімір Еўдакімавіч // Прафесары і дактары навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта / Склад. А. А. Яноўскі. – Мінск: БДУ, 2001. С. 258. Партр.
6. Снапкоўскі Уладзімір Еўдакімавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мінск: БелЭн, 2001. Т. 6. Кн. 1. Пузелі – Усая. С. 371. Партр.
7. Снапкоўскі Уладзімір Еўдакімавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 15: Следавікі - Трыо / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш. Мінск : БелЭн, 2002. С. 66.
8. Снапкоўскі Уладзімір Еўдакімавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Віцебска: у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]; склад. А. І. Мацяюн; маст. Э. Э. Жакевіч. Мінск: БелЭн, 2003. Кн. 2. С. 537–538. Партр.
9. Снапковский, В. Е. Внешнеполитическая деятельность Белорусской ССР (1944-1953 гг.): автореф. дис. … д-ра ист. наук. Минск: 1992. 45 с. // Корзенко, Г. В., Зенькович, Ю. В. Аннотированный указатель диссертаций по историческим наукам, защищенных в Республике Беларусь (1991-2005 гг.). Минск: Беларуская навука, 2006. С. 86-87.
10. Snapkowski Włodzimierz // Złota Księga Nauki Polskiej – Naukowcy Zjedonoczonej Europy. Gliwice: Helion, 2006. S. 747.
11. Снапкоўскі Уладзімір Еўдакімавіч // Корзенко, Г. В. Историки Беларуси в начале XXI столетия: Биобиблиографический справочник. Минск: Беларуская навука, 2007. С. 363–364. Партр.
12. Снапковский Владимир Евдокимович // Институт истории НАН Беларуси в лицах (1929-2008 гг.): Биобиблиографический справочник / Корзенко Г. В. [и др.]. Минск: Беларуская навука, 2008. С. 311-312. Партр.
13. Снапковский Владимир Евдокимович // Республика Беларусь. Энциклопедия. В 6 т. Т. 6. Пейзаж - Снегирев. Минск: БелЭн, 2008. С. 746.
14. Снапковский Владимир Евдокимович // Регионы Беларуси: энциклопедия. В 7 т. Т. 2. Витебская область. В 2 кн. Кн. 2. К-Я / редкол.: Т. В. Белова (гл. ред) [и др.]. Минск: БелЭн, 2011. С. 479.

15.Снапковский Владимир Евдокимович // Кто есть кто в Республике Беларусь. Люди дела / под ред. И. В. Чекалова. Минск: Энциклопедикс, 2013. С. 221-222.
16.Snapkowski Włodzimierz // Złota Księga Nauk Humanistycznych. Gliwice:Helion, 2013. S. 359-360.
17.Шарапа, А. В. Уладзімір Еўдакімавіч Снапкоўскі (Артыкул да 60-годдзя з дня нараджэння) // Веснік БДУ. Навуковы часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя 3. Гісторыя. Эканоміка. Права. Мінск, 2014. № 2. С. 101–102. Партр.
18.Стралец, М. В. Снапкоўскі У.Е. як заснавальнік новага кірунку ў беларускай гістарычнай навуцы / М. В. Стралец // Советский этап в истории Беларуси: сборник научных статей участников Республиканской научно-теоретической конференции, Минск, 5 декабря 2019 г. / Белорусский национальный технический университет ; редкол.: В. А. Бобков [и др.]. – Минск : БНТУ, 2019. – С. 186-192.
19.Лазько, Р., Свилас, С. Адкрываючы новыя далягляды ў знешнепалітычных даследаваннях Беларусі (да 65-годдзя Уладзіміра Еўдакімавіча Снапкоўскага) / Р.Лазько, С.Свілас // Беларускі гістарычны часопіс. 2019. № 6. С. 40-42.
20.Дастанка, А. А., Малевіч, Ю. І., Шарапа, А. В., Селіванаў, А. У. Юбілей Уладзіміра Еўдакімавіча Снапкоўскага: вядомаму беларускаму вучонаму 70 год // Журнал международного права и международных отношений = Journal of International Law and International Relations. - 2024. - № 1-2. С. 90-91.
21. Уладзімір_Еўдакімавіч_Снапкоўскі // https://be.wikipedia.org/wiki/Уладзімір_Еўдакімавіч_Снапкоўскі.
22.Снапкоўскі Уладзімір Еўдакімавіч // Анлайн-энцыклапедыя «Беларусь у асобах і падзеях».
23.Снапкоўскі Уладзімір Еўдакімавіч // Кафедра міжнародных адносін факультэта міжнародных адносін БДУ.

## 3.7. Анкета для біябібліяграфічнага паказальніка «Гісторыкі Беларусі. Хто ёсць хто ў гістарычнай навуцы»*

1. Ф., І., Імя па бацьку – Снапкоўскі Уладзімір Еўдакімавіч (Снапковский Владимир Евдокимович).
2. Дата нараджэння – 22 мая 1954 г.
3. Сацыяльнае паходжанне – са служачых; нарадзіўся ў сям'і пажарніка і хатняй гаспадыні ў г. Віцебску.
4. Адукацыя – вышэйшая. У 1971 г. паступіў на гістарычны факультэт БДУ, які скончыў у 1976 г. Атрымаў кваліфікацыю настаўніка гісторыі і грамадазнаўства.
5. Навуковы кіраўнік дыпломнай работы – старшы выкладчык кафедры новай і навейшай гісторыі гістарычнага факультэта БДУ, кандыдат гістарычны навук Сініца Вадзім Іванавіч. Тэма дыпломнай работы «Сацыяльна-палітычныя погляды Джона Лока». У час вучобы ва ўніверсітэце найбольшы ўплыў на фармаванне гістарычнага светапогляду аказалі выкладчыкі кафедры новай і навейшай гісторыі гістарычнага факультэта, на якой праходзіў спецыялізацыю: загадчык кафедры, доктар гістарычных навук прафесар Шнеерсон Леў Міхайлавіч, доктар гістарычных навук, прафесар Трухноў Рыгор Маркавіч, дацэнт кандыдат гістарычны навук Елісееў Міхаіл Герасімавіч. Сапраўдная любоў да гісторыі прышла на 3-м курсе, калі праслухаў курс лекцый праф. Л. М. Шнеерсона па новай гісторыі краін Заходняй Еўропы і Амерыкі перыяду 1870–1918 гг.
6. Скончыў вочную аспірантуру (1976–79 гг.) пры Інстытуце гісторыі АН БССР (НАН Беларусі). У сакавіку 1980 г. абараніў у спецсавеце пры БДУ дысертацыю на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па тэме «Палітыка ГДР у адносінах ФРГ – важны элемент разрадкі міжнароднай напружанасці (1970-я гады)» (спецыяльнасць 07.00.03 – Усеагульная гісторыя). Навуковым кіраўніком з'яўляўся доктар гістарычных навук прафесар Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС Фамін Васіль Цімафеевіч, ураджэнец Беларусі, спецыяліст па знешняй палітыцы нацысцкай Германіі. Афіцыйныя апаненты – вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН Украінскай ССР доктар гістарычных навук прафесар Куленіч Іван Маркавіч; дацэнт гістарычнага факультэта БДУ кандыдат гістарычны навук Елісееў Міхаіл Герасімавіч. Вядучая ўстанова – Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут.
7. У 1989–1992 гг. вычыўся ў дактарантуры пры Інстытуце гісторыі НАН Беларусі. У студзені 1993 г. абараніў у спецсавеце пры Інстытуце гісторыі НАН Беларусі дысертацыю на саісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук па тэме «Знешнепалітычная дзейнасць Беларускай ССР (1944–1953 гг.)» (спецыяльнасць 07.00.02 – Айчынная гісторыя). Навуковы

* Анкета ў значна скарочаным выглядзе апублікавана ў працы Г. В. Карзенкі (Г. В. Корзенко) «Историки Беларуси в начале XXI столетия: Биобиблиографический справочник». Минск, 2007. С. 363-364.

кансультант – вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута расійскай гісторыі РАН доктар гістарычных навук прафесар Пратапопаў Анатоль Сяргеевіч. Афіцыйныя апаненты – гал. нав. супр. Інстытута гісторыі НАНБ, доктар гістарычных навук, прафесар, акадэмік НАН Беларусі Ігнаценка Іларыён Мефодзьевіч; прафесар юрыдычнага факультэта БДУ доктар юрыдыяных навук Броўка Юрый Пятровіч; прафесар Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук Варабей Мікалай Сідаравіч. Вядучая ўстанова – БДУ.

8. Навуковыя і навукова-педагагічныя званні. Кандыдат гістарычны навук з 1980 г., доктар гістарычных навук з 1993 г., Маю атэстаты аб прысваенні вучоных званняў: старшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці «Гісторыя СССР» (выдадзены ВАК СССР у студзені 1991 г.) і прафесара па кафедры міжнародных адносін (выдадзены Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у кастрычніку 1995 г.).

9. Месца працы. З верасня 1993 г. прафесар кафедры міжнародных адносін Факультэта міжнародных адносін БДУ. 220095, Мінск, вул. Акадэмічная, 25. Тэл. 284-18-00, факс. 284-00-04.

10. Навуковая і службовая кар’ера. У жніўні – кастрычніку 1976 г. працаваў настаўнікам гісторыі і грамадазнаўства Пальмінскай сярэдняй школы Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл., куды быў накіраваны па размеркаванні пасля заканчэння БДУ. У 1979–81 гг. – малодшы, 1981–82 гг. - старшы навуковы супрацоўнік, 1988–1989 гг. – старшы навуковы супрацоўнік, 1989–1992 гг. дактарант, 1992–1995 гг. - старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАНБ, у 1982–1988 гг. вучоны сакратар Аддзялення грамадскіх навук НАН Беларусі. У час працы ў Прэзідыуме НАН Беларусі з 1985 па 1988 гг. быў сакратаром партыйнай арганізацыі КПСС-КПБ Прэзідыума НАН Беларусі. У 1995–2000 гг. загадчык аддзела нацыянальных і міжнародных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі (па сумяшчальніцтве). Кіраўнік навуковых тэм, што ўваходзілі ў Планы важнейшых навукова-даследчых работ у галіне прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навук па Рэспубліцы Беларусь на 1996–2000 гг.: «Беларусь у сістэме міжнародных адносін у Еўропе ў XX ст.»; «Сучасная беларуская дыяспара ў сумежных дзяржавах». У 1980–1993 гг. выкладаў па сумяшчальніцтву розныя курсы па новай і навейшай гісторыі краін Еўропы і Амерыкі, Азіі і Афрыкі на кафедры новай і навейшай гісторыі гістарычнага факультэта БДУ. У 1994–1998 гг. прафесар (па сумяшчальніцтву) Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта і Беларускага ўніверсітэта культуры.

Член Рады Беларускай асацыяцыі гісторыкаў, член Беларускай асацыяцыі палітычных навук, член Вучоных саветаў Факультэта міжнародных адносін БДУ і Інстытута гісторыі НАН Беларусі, член спецыялізаваных Вучоных саветаў па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый: 1) па палітычных навуках; 2) па гісторыі знешняй палітыкі і міжнародных адносін пры БДУ. Ажыццяўляю навуковае кіраўніцтва аспірантамі і саіскальнікамі Факультэта міжнародных адносін БДУ і

Інстытута гісторыі НАН Беларусі, якія займаюцца даследаваннем гісторыі і сучаснай праблематыкі знешняй палітыкі і дыпламатыі Беларусі, а таксама беларускай дыяспары.

11. Галіна навуковых інтарэсаў. Займаюся вывучэннем гісторыі знешняй палітыкі і дыпламатыі Беларусі ў XX і папярэдніх стагоддзях, а таксама сучаснай праблематыцы знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Даследую гісторыю і сучасны стан беларускай эміграцыі (пераважна палітычнай), беларускай дыяспары ў Сібіры, міжнародныя адносіны ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, дзейнасць Беларусі ў міжнародных арганізацыях ў XX – пачатку XXI ст. Працую ў галіне гістарыяграфіі ўсеагульнай гісторыі і гісторыі Беларусі, паліталогіі (станаўленне сучаснай беларускай эліты) і сацыялогіі (міжнародная камунікацыя).

12. Колькасць падрыхтаваных кандытатаў навук – няма.

13. Асноўныя творы. Аўтар больш чым 170 навуковых і навукова-папулярных публікацый па вышэйзгаданай праблематыцы. А) Манаграфіі: 1) Белорусская ССР в ООН (1945–1985 гг.). Мінск : Навука і тэхніка, 1985. 104 с.; 2) Два германских государства и европейская безопасность: история и современность. Минск : Навука і тэхніка, 1989. 152 с. (соавтор – М. Г. Елисеев); 3) Путь Беларуси в ООН. 1944–1945 гг. Мінск : Навука і тэхніка, 1994. 141 с.; 4) Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі: 1944–1953 гг. Мінск : Беларуская навука, 1997. 207 с.

Б) Вучэбныя праграмы: 1) Праграма курса «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі». Для студ. вну Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «Міжнародныя адносіны». Мінск : БДУ, 1996; 2) Міжнародныя арганізацыі: Праграма курса і планы семінарскіх заняткаў. Для студэнтаў факультэта міжнародных адносін спецыяльнасці Г. 10.01.00 «Міжнародныя адносіны». Мінск : БДУ, 2000. (Разам з Часноўскім М. Э.).

В) Найбольш важныя артыкулы:

1. Исследование проблем новой и новейшей истории в Белорусской ССР // Новая и новейшая история. 1984. № 2;
2. Знешнепалітычныя аспекты суверэнітэту Беларусі: Гістарычны агляд // Весці Акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. нав. 1992. № 2 (суаўтар – Г. Г. Сяргеева);
3. Элита // Неман. 1995. № 7;
4. Эміграцыя: Фарміраванне і дзейнасць арганізацый беларускай эміграцыі. Сацыяльна-палітычныя плыні (1918–1939 гг.) // Полымя. 1995. № 11;
5. Дыпламатыя // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3: Гімназія-Кадэнцыя. Мінск: БелЭн, 1996. (суаўтар Ул. Канановіч);
6. Беларуская палітычная эміграцыя (1945–1990 гг.) // Полымя. 1997. № 2;
7. Проблемы формирования белорусско-российских межгосударственных отношений // Российско-белорусские отношения: проблемы и перспективы: материалы «круглого стола» рос. и белорус. ученых, Москва, 2–3 февр. 1998 г. М.: ИМЭПИ РАН, АОЗТ, «Эпикон», 1998;

8. Беларуская ССР на міжнароднай арэне (1945–1990 гг.) // Белорусский журн. междунар. права и междунар. отношений. 1999. № 2;
9. Міжнародныя арганізацыі і Беларусь // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 5. М-Пуд. Мінск: БелЭн, 1999;
10. Няспраўджаныя амбіцыі і абяцанні (Да выхаду вучэбнага дапаможніка для студэнтаў ВНУ па гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да нашых дзён) // Штогоднік Інстытута гісторыі НАН Беларусі. 1999 год. Мінск : ІГ НАНБ, 1999 (суаўтары – М. Біч, Г. Галенчанка, І. Ігнаценка);
11. Typology of the Modern Byelorussian Elite // The Elite in Post-Communist Eastern Europe / Ed. By V. Shlapentokh, Ch. Vanderpool, and B. Doktorov; Texas: A & M University Press, 1999. (Eastern European studies, no. 10);
12. Эліта і мова // Аняменне: з хронікі знішчэння беларускай мовы. Вільня: Gudas, 2000;
13. Беларусь у геапалітыцы і дыпламатыі перыяду Другой сусветнай вайны // Белорусский журн. междунар. права и междунар. отношений. 2000. № 2;
14. Внешняя политика Республики Беларусь: первые итоги первого десятилетия // Белорусский журн. междунар. права и междунар. отношений. 2000. № 4;
15. Знешнепалітычная дзейнасць Беларускай ССР (1919–1929 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 3;
16. Беларуская дзяржаўнасць і дыпламатыя ў XX ст. // Белорусский журн. междунар. права и междунар. отношений. 2001. № 1;
17. Белорусско-российские отношения на рубеже столетий (конец 1999 – начало 2001 гг.) // Белорусский журн. междунар. права и междунар. отношений. 2001. № 2.

14. Атрыманыя гранты. Удзельнічаў ў шэрагу міжнародных навуковых праектаў. У 1994–96 гг. – вядучы навуковы супрацоўнік (па сумяшчальніцтву) Інстытута Еўропы РАН. У 1994–95 гг. удзельнік міжнароднага праекта «Фарміраванне эліты ў посткамуністычнай Еўропе» (галоўная арганізацыя – Мічыганскі ўніверсітэт, ЗША). Удзельнік Міжнароднай канферэнцыі па гэтай тэме ў Мічыганскім універсітэце. У 1996 г. прайшоў 3-месячную стажыроўку ў Хумберсайдскім універсітэце (г. Хал, Англія) па курсу «Масавая і міжнародная камунікацыя» у межах праграмы Еўрапейскага Саюза «Темпус». У 1998 г. на працягу 3-х месяцаў з'яўляўся запрошаным вучоным Інстытута Гарымана Калумбійскага ўніверсітэта (Нью-Ёрк, ЗША) у межах урадавай праграмы ЗША «Актуальныя праблемы», дзе вывучаў сучасную палітыку Захаду і ЗША адносна Беларусі. У 2002 г. прайшоў месячную стажыроўку ў Грынвічскім універсітэце (Лондан, Англія) у межах праграмы Еўрапейскага Саюза «Темпус» «Стварэнне новых модуляў у еўрапейскіх даследаваннях».

Удзельнік Міжнароднай канферэнцыі «Беларусь і яе значэнне для Расіі, Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Захаду» (Гарвардскі ўніверсітэт, ЗША, 1999 г.), дзе выступіў з дакладам аб беларуска-расійскіх адносінах. З'яўляюся

каардынатарам навуковага праекта «Беларуска-расійскія адносіны: праблемы і перспектывы», які Факультэт міжнародных адносін распрацоўвае з 1998 г. разам з Інстытутам Міжнародных палітычных і эканамічных даследаванняў Расійскай Акадэміі навук.

Гранты Беларускага Рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў: Праект «Гісторыя беларускай дыяспары ў Сібіры» (2000–2002 гг.)» і праект «Праблемы распрацоўкі і рэалізацыі шматбаковай дыпламатыі Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе» (2000–2002 гг.). Грант ГКНТ РБ «Распрацоўка праекта Канцэпцыі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь» (2001).

За выдатныя дасягненні ў навуковых даследаваннях і выкладчыцкай працы прызнаны Міжнародным біяграфічным цэнтрам у Кембрыджы (Вялікабрытанія) Міжнародным чалавекам года на 2000–2001 гг. Мой біяграфічны артыкул уключаны ў прэстыжныя энцыклапедычныя выданні: «2000 выдатных вучоных XX ст.» і «2000 выдатных асоб XX ст.» («2000 Outstanding Scholars of the XX Century» і «2000 Outstanding People of the XX Century»), якія выдадзены Міжнародным біяграфічным цэнтрам у Кембрыджы ў 2000–2001 гг.

15. Літаратура (аб вучоным). Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мінск, 2001. Т. 6. Кн. 1. С. 371; Прафесары і дактары навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта / Склад. А. А. Яноўскі. – Мінск, БДУ, 2001. С. 258. Партр.

Ул. Снапкоўскі

5. 12. 2002

## ТЭМАТЫЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК ПРАЦ У.Е.СНАПКОЎКАГА[36]

***Аддзяленне грамадскіх навук АН БССР*** 9-11, 13-14, 18, 20, 21, 24
***Адносіны ГДР–ФРГ*** 1–4, 6, 28
***Адносіны Рэспубліка Беларусь – Еўрапейскі Саюз*** 139, 141, 229,233, 238, 249, 258, 260, 267, 268, 279, 375
***Беларуска-амерыканскія адносіны і сувязі*** 53, 150, 192, 286, 309, 360
***Беларуска-германскія адносіны і сувязі*** 33, 62, 102, 121, 124, 135, 140, 161, 170, 187, 194, 213, 216, 221, 222, 242, 244, 255, 259
***Беларуска-польскія адносіны і сувязі*** 49, 51, 85, 126, 127, 153, 154, 162, 175, 190, 191, 201, 209, 210, 218, 225, 226, 240, 244, 246, 247, 250, 257, 259, 261, 266, 269-271, 277, 289, 297, 298, 301, 304, 305, 316, 317, 321, 332, 333, 349, 350, 355, 371, 388
***Беларуска-расійскія адносіны і сувязі*** 31, 71, 81, 82, 90, 103, 111, 116, 138, 177, 192, 205, 223, 235, 239, 263, 269-271, 312, 327, 328, 345, 351, 363, 372, 375, 380
***Беларуская гістарыяграфія знешнепалітычнай дзейнасці Беларусі*** 15, 101, 107, 110, 113, 131, 134, 136, 178, 189, 209, 274, 283, 287, 290, 300, 305, 306, 311, 313, 315, 318, 331, 333, 335, 339, 344-346, 352, 365, 366, 382
***Беларуская гістарыяграфія ўсеагульнай гісторыі і міжнародных адносін*** 15, 29, 131, 144, 167, 178, 189, 248, 287, 308, 331, 339, 344, 370, 378, 387
***Беларуская дыяспара і палітычная эміграцыя*** 59, 60, 70, 77, 120, 123, 127, 129, 212, 215, 236, 374, 377, 388
***Беларуская ССР у ААН*** 16, 19, 25, 26, 54-56, 84, 86, 88, 105, 106, 128, 129, 147, 148, 151, 165, 168, 176, 224, 245, 256, 288, 295, 299, 300, 321, 322, 337, 338, 343, 353, 357, 358, 369, 385, 386
***Беларусь і ЮНРРА*** 36, 37, 43, 72, 148, 218, 307, 313, 314
***Вучэбныя праграмы*** 66-68, 79-80, 119, 139, 142, 144, 155, 172, 173
***Гістарычная палітыка*** 109, 110, 113, 145, 195, 209, 251, 275, 285, 292, 294, 296, 305, 320, 331, 333
***Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі як вучэбная і навуковая дысцыпліна*** 134, 136, 158, 265, 287, 306, 311, 320, 331, 334, 335, 339,-345, 346, 364
***Замежныя публікацыі*** 51, 61, 76, 77, 82, 100, 105, 115, 120, 153, 154, 169, 190, 195, 201-204, 209, 225, 236, 240-242, 244, 246,247, 258, 267, 269, 270, 278, 279, 281, 282, 285, 296, 297, 300, 303, 308, 316, 317, 318, 322, 323, 329, 332, 343, 347, 349, , 351, 357, 363, 367,369, 370, 372, 374, 376, 377, 379, 388
***Знешнепалітычная дзейнасць БССР*** 12, 16, 22, 23, 15, 22, 23, 25-27, 30, 38-40, 50, 54-56, 72-73, 84, 86-88, 91, 102, 105-106, 110, 114-115, 118, 127-130, 133,135, 147, 148, 158, 159, 163, 165, 168, 175, 179, 180, 193, 222, 224, 228, 237, 240, 250, 256, 259, 261, 263, 266, 269, 270, 271, 277, 280, 298, 300, 301, 303, 304, 310, 311, 317, 319, 321, 322, 331, 332, 334, 337, 338, 340, 347, 350,353, 354, 355, 357, 358, 362-364, 369, 381, 385, 386, 388

---

[36] Лічба адпавядае нумару ў спісе навуковых публікацый У.Е.Снапкоўскага.

***Знешняя палітыка Беларусі да 1918 г. (Полацкае княства, ВКЛ, Рэч Паспалітая)*** 52, 63, 130, 132, 137, 143, 145, 146, 149, 174, 197, 320, 331
***Знешняя палітыка і дыпламатыя БНР*** 60, 115, 157, 160, 193, 194, 202, 207, 208, 252, 261, 269-271, 298, 304, 310, 317, 318, 326, 327, 355, 371, 377
***Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь*** *44-46, 48, 54, 69, 86, 104, 115, 117, 132, 139,* 141, 152, 155, 164, 166, 168, 171, 198-200, 203, 220, 231 233, 235, 243, 254, 264, 265, 272, 273, 276, 281, 282, 284, 293, 302, 312, 328, 348, 351, 360, 361, 365, 373, 375, 376, 379, 380, 383, 385
***Міжнародныя арганізацыі і Беларусь*** 86, 108, 119, 138, 139, 141, 166, 181-186, 199, 206, 245, 322, 324, 325, 337, 343, 353, 357, 358, 369, 386
***Міжнародная камунікацыя і культурнае супрацоўніцтва*** 76, 79, 80, 243, 254, 367
***Нацыянальная ідэнтычнасць беларусаў*** 34, 35, 39, 75, 89, 99, 109, 112, 113, 156, 169, 204, 242, 251, 255, 278, 351
***Персаналіі гісторыкаў, палітыкаў і дыпламатаў*** 94, 95, 98, 105, 197, 210, 220, 224, 234, 235, 248, 263, 287, 302, 308, 315, 322, 335, 338, 341, , 353, 358, 359, 362, 369, 370, 372, 387
***Праблема першапачатковага членства савецкіх саюзных рэспублік у ААН*** 32, 50, 53, 61, 72, 74, 102, 105, 128, 135, , 163, 165, 176, 224, 280, 286, 288, 295, 299, 303, 322, 325, 331, 337, 357
***Рэпарацыі, рэпатрыяцыя і перамешчаныя асобы*** 33, 57, 91, 122, 123, 129, 212, 214, 215, 386
***Рэцэнзіі і водгукі*** 3, 5, 6, 12, 22, 26, 29, 110, 113, 188, 201, 205, 356
***Эліта і лідэры*** 58, 65, 83, 100, 112
***Энцыклапедычныя артыкулы*** 44, 46, 57, 62-64, 73, 74, 86-88, 90-98, 121-128, 147-152, 160-167, 171, 181-186, 198, 212-219, 311.

Навуковае выданне

*Серыя “Вучоныя Беларусі”*

Аўтар і складальнік
**Снапкоўскі Уладзімір Еўдакімавіч**

**Прафесар У.Е.Снапкоўскі.**
**У авангардзе знешнепалітычных**
**даследаванняў Беларусі**

Рэдактар *В.Р. Гаўрыленка*

Падпісана да друку 01.09.2025 Фармат 60x84 1/16 Папера афсетная
Друк лічбавы Ум.-др.арк 12,5 Ул.-выд.арк. 12,8 Наклад 50 экз. Заказ 7413
ВТАА «Права і эканоміка» 220072 Мінск Сурганава 1, корп. 2
Тэл. 8 029 684 18 66
Надрукавана на выдавецкай сістэме Gestetner
у ВТАА «Права і эканоміка» Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ВВРДВ,
выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь 17 лютага 2014 г.
у якасці выдаўца друкаваных выданняў за № 1/185